С. М. Цемушаў Ю. М. Бохан







# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## са старажытных часоў да канца XV ст.

6

# Беларускія землі ў XI ст.



# Беларускія землі ў XII ст.



## Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага
## (другая палова XIII — пачатак XIV ст.)




**ТЭРЫТОРЫІ**

- непасрэдна падуладныя Міндоўгу ў сярэдзіне XIII ст.
- Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў у сярэдзіне XIII ст.
- захопленыя крыжакамі ў другой палове XIII ст.
- заваяваныя Тэўтонскім ордэнам каля 1313 г.
- 1320 г. Даты далучэння тэрыторый да ВКЛ
- Паходы літоўскіх князёў у другой палове XIII ст.

**ГРАНІЦЫ**

- Літоўскага каралеўства ў 1253—1260 гг.
- ВКЛ пры Віценю каля 1310 г.
- рускіх зямель, якія сплачвалі даніну Залатой Ардзе

Лічбамі на карце пазначаны:
1 — Пскоўская зямля; 2 — Таропецкае княства;
3 — Полацкае княства; 4 — Віцебскае княства;
5 — Мазавецкае княства (васал Польшчы);
6 — Менскае княства; 7 — Свіслацкае княства;
8 — Тураўскае княства.

# Пашырэнне межаў ВКЛ у XIV ст.




ТЭРЫТОРЫІ
- ВКЛ у пачатку XIV ст.
- заваяваныя крыжакамі ў першай палове XIV ст.
- далучаныя да ВКЛ пры Гедзіміне
- далучаныя да ВКЛ пры Альгердзе
- Маскоўскага княства ў канцы XIII ст.
- далучаныя да Масквы
- якія знаходзіліся пад уплывам Арды

Спрэчныя тэрыторыі паміж
- ВКЛ і Маскоўскім княствам
- ВКЛ і Польшчай
- Граніцы ВКЛ у 1377 г.
- Лінія падзелу паміж Альгердам і Кейстутам
- 1362 г. Даты далучэння тэрыторый да ВКЛ
- 1362 Паходы Альгерда з пазначэннем гадоў

Лічбамі на карце пазначаны:
1 — Пскоўская зямля; 2 — Ржэўская зямля; 3 — Карачаўскае княства; 4 — Навасільскае княства; 5 — Малдаўская зямля; 6 — Валахія.

УДК 94(476)(075.3)
ББК 63.3(4Беи)я72
Б43

А ў т а р ы:
С. М. Цемушаў – слова да вучняў, уводзіны, абагульненні, слоўнік, метадычнае забеспячэнне, §§ 1–15, 26;
Ю. М. Бохан – абагульненні, слоўнік, §§ 16–30

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» (доктар гістарычных навук, прафесар *С. В. Марозава*);
рэктар установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, доктар гістарычных навук, прафесар *Д. У. Дук*

*Папярэдняе выданне выйшла ў 2016 г. у 2-х частках.*

**Цемушаў, С. М.**
Б43 Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / С. М. Цемушаў, Ю. М. Бохан ; пад рэд. І. А. Марзалюка. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2023. — 224 с. : іл.
ISBN 978-985-553-785-5.

**УДК 94(476)(075.3)**
**ББК 63.3(4Беи)я72**

**ISBN 978-985-553-785-5**

© Бохан Ю. М., Цемушаў С. М., 2016
© Цемушаў С. М., Бохан Ю. М., 2023, са зменненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2023

Правообладатель Издательский центр БГУ

С. М. Цемушаў Ю. М. Бохан

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
# са старажытных часоў да канца XV ст.

**Вучэбны дапаможнік для 6 класа**
**ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы**
**агульнай сярэдняй адукацыі**
**з беларускай мовай навучання і выхавання**

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук,
прафесара І. А. Марзалюка

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2023

Правообладатель Издательский центр БГУ

# Змест

Як працаваць з вучэбным дапаможнікам ........ 5
Уводзіны ........ 7

**Раздзел I. Беларускія землі ў старажытныя часы і ў Раннім сярэднявеччы** ........ 12

§ 1. Найстаражытнейшыя людзі на беларускай зямлі ........ 12
§ 2. Змены ў новым каменным веку ........ 19
§ 3. Пачатак выкарыстання металаў на беларускіх землях ........ 25
§ 4. Насельніцтва беларускіх зямель бронзавага і жалезнага вякоў ........ 32
§ 5. Рассяленне славян ........ 38
§ 6. На шляху да дзяржавы ........ 44
Абагульненне ........ 51

**Раздзел II. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі ў IX — сярэдзіне XIII ст.** ........ 55

§ 7. Дзяржава ва ўсходніх славян ........ 55
§ 8. Полацкае княства ў X–XI стст. ........ 61
§ 9. Полацкая зямля ў XII — першай палове XIII ст. ........ 67
§ 10. Тураўскае княства ........ 73
§ 11. Беларускія землі ва ўмовах палітычнай раздробленасці ........ 79
§ 12. Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст. ........ 84
§ 13. Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель і ўзнікненне гарадоў ........ 90
§ 14. Хрысціянства на беларускіх землях ........ 98
§ 15. Культура беларускіх зямель у Высокім сярэднявеччы ........ 105
§ 16. Паўсядзённае жыццё нашых продкаў у IX — першай палове XIII ст. ........ 112
Абагульненне ........ 117

**Раздзел III. Беларускія землі ў перыяд узнікнення і ўмацавання Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIII — канец XIV ст.)** ........ 120

§ 17. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) ........ 120

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 18. Умацаванне велікакняжацкай улады. Барацьба з крыжакамі ........ 126
§ 19. Княжанне Ягайлы. Крэўская унія і яе значэнне ........ 135
§ 20. Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага ........ 141
§ 21. Гаспадарчае развіццё і культура ........ 147
§ 22. Насельніцтва і рэлігіі ў ВКЛ ........ 154
Абагульненне ........ 160

**Раздзел IV. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV — XV ст.** ........ 164

§ 23. Княжанне Вітаўта ........ 164
§ 24. «Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва ........ 170
§ 25. Дынастычная вайна 1432–1439 гг. Змены ў дзяржаўным ладзе ........ 174
§ 26. Знешняя палітыка ВКЛ у другой палове XV ст. ........ 180
§ 27. Развіццё феадальнага грамадства ........ 185
§ 28. Развіццё гарадоў ........ 190
§ 29. Этнічнае развіццё беларускіх зямель. Царква і рэлігія ........ 196
§ 30. Культура беларускіх зямель у канцы XIV — XV ст. ........ 202
Абагульненне ........ 208

Слоўнік гістарычных паняццяў ........ 212
Асноўныя даты па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. ........ 222



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Як працаваць з вучэбным дапаможнікам

Юныя сябры! Вы трымаеце ў руках вучэбны дапаможнік па гісторыі нашага краю са старажытных часоў да канца Сярэднявечча. З яго дапамогай вы даведаецеся аб жыцці людзей на беларускіх землях у найбольш ранні перыяд гісторыі.

Старажытны, або першабытны, перыяд — гэта першая ступень у гісторыі народаў свету. У тыя часы на беларускіх землях рассяліліся першыя людзі. А ў самым пачатку наступнага перыяду — Сярэднявечча — на сучаснай тэрыторыі Беларусі з'явіліся нашыя непасрэдныя продкі — славяне. Як вы ўбачыце, перыяд Сярэднявечча для Беларусі быў багаты на падзеі. Гэта быў час утварэння першых дзяржаў, страты і набыцця імі незалежнасці. Да ліку найбольш важных падзей належыць і распаўсюджанне хрысціянства.

Спадзяёмся, што вучэбны дапаможнік будзе добрым спадарожнікам у вашым знаёмстве з найбольш старажытнай і сярэднявечнай гісторыяй; палегчыць гэтую справу дазволіць веданне яго асаблівасцей.

Перш чым пачынаць працаваць з дапаможнікам, уважліва азнаёмцеся з яго зместам. Кніга складаецца з чатырох вялікіх раздзелаў. Раздзелы падзяляюцца на параграфы, якія змяшчаюць некалькі пунктаў, абазначаных лічбамі.

Кожны параграф пачынаецца з пытанняў у рубрыцы «Успомніце», якія дапамогуць аднавіць у памяці раней вывучаны матэрыял, а пасля звязаць яго з тэкстам параграфа. У рубрыцы «Вы даведаецеся» змяшчаецца галоўная ідэя параграфа, якая тлумачыцца ў асноўным тэксце.

Тэкст кожнага параграфа падзяляецца на асноўны і дадатковы. Асноўны ўключае матэрыял, які абавязковы для засваення. Звяртайце ўвагу на асобыя вылучэнні шрыфту. Даты, імёны, паняцці, якія абавязкова трэба запомніць, выдзелены ***паўтлустым курсівам***. Інфармацыя, якую неабходна выкарыстаць для характарыстыкі гістарычных асоб, падзей, адзначана *курсівам*. Таксама *курсівам* вылучаны паняцці, азначэнні якіх вы знойдзеце ў канцы

Правообладатель Издательский центр БГУ

вучэбнага дапаможніка, у «Слоўніку гістарычных паняццяў». Улічвайце тое, што асноўныя гістарычныя паняцці, абавязковыя для засваення, выдзелены ў ім **колерам**.

Дадатковы матэрыял вы знойдзеце ў рубрыцы «Цікава ведаць». Вашай увагі таксама патрабуюць малюнкі і картасхемы. Малюнкі дазваляюць зазірнуць у далёкае мінулае, а картасхемы даюць магчымасць вызначыць месца гістарычных падзей, тэрыторыі сярэднявечных дзяржаў.

Пасля тэксту кожнага параграфа на каляровай плашцы ідуць вывады, якія адлюстроўваюць самае важнае, што патрэбна засвоіць.

Звярніце ўвагу на тое, што пытанні ёсць у тэксце кожнага параграфа і пасля яго. Паспрабуйце адказаць на кожнае з іх. Гэта дазволіць больш удумліва і поўна засвоіць новы матэрыял, звязаць яго з тымі ведамі, якія вы набылі раней.

Храналагічная табліца «Асноўныя даты па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.» у канцы вучэбнага дапаможніка дазволіць запомніць найбольш значныя падзеі і суаднесці іх у часе.

Умоўныя абазначэнні дапамогуць арыентавацца ў тэксце вучэбнага дапаможніка.

У вучэбным дапаможніку выкарыстаны наступныя ўмоўныя абазначэнні:

— цікава ведаць;

с. 4 — звярніцеся да атласа «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. 6 клас»;

— наведайце славутыя мясціны;

— адкажыце на пытанні;

— спасылкі (QR-коды) на дадатковыя заданні.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# Уводзіны

**Успомніце.** *1. Што вывучае навука гісторыя? 2. Якія перыяды сусветнай гісторыі вам ужо знаёмыя?*

**Вы даведаецеся.** Мы прызвычаіліся да таго, што бачым вакол у паўсядзённым жыцці. Але так было не заўсёды. У мінулым жыццё чалавека вельмі адрознівалася ад нашага. Паступова ў развіцці чалавецтва адбываліся вельмі важныя змены. Яны не абмінулі і беларускія землі. Значныя пераўтварэнні ў грамадстве, у спосабах вытворчасці, у прыладах працы дазваляюць вылучаць перыяды гісторыі. На якія ж перыяды падзяляецца гісторыя Беларусі? З дапамогай чаго мы даведваемся пра змены і асаблівасці жыцця нашых продкаў?

**1. Навошта ведаць гісторыю сваёй зямлі?** Кожны чалавек павінен паважаць традыцыі сваіх продкаў, ганарыцца іх учынкамі і дасягненнямі. Гісторыя не праходзіць бясследна. Яе подых можна адчуць паўсюль: у назвах гарадоў, вуліц, рэк, азёр, у нашых і знаёмых нам імёнах і прозвішчах, у мастацкіх творах і інш.

? *Даведайцеся, наколькі старажытны населены пункт, у якім вы жывяце.*

? *Ці ведаеце вы паходжанне свайго імя?*

Гісторыя працягвае жыць з намі і ўсталёўвае трывалую сувязь пакаленняў. Веданне гісторыі — даніна памяці нашых продкаў. Сваёй руплівай працай яны стваралі наш з вамі дабрабыт.

Векавы досвед нашых продкаў дапаможа нам пазбегнуць памылак у будучыні. Гісторыя дае нам прыклады, як прасцей вырашаць канфлікты і розныя праблемы ў жыцці грамадства. Гісторыя нашай

Правообладатель Издательский центр БГУ

Старажытны час

**КАМЕННЫ ВЕК**
**100—35 тыс. гадоў таму — канец 3-га тысячагоддзя да н. э.**

«Стужка

зямлі таксама дазваляе зразумець, як лепш пабудаваць стасункі з суседзямі.

У гісторыі былі не толькі поспехі і мірнае будаўніцтва, але і страты, і найбольш жахлівая для чалавецтва з'ява — вайна. Каб не дапусціць памылак мінулага, трэба добра ведаць гісторыю.

**2. Гісторыя Беларусі — частка сусветнай гісторыі.** На працягу ўсёй сваёй гісторыі беларускія землі былі цесна звязаны з суседнімі тэрыторыямі. Адтуль да нас прыйшлі першыя людзі. У сваім далейшым развіцці яны прайшлі тыя ж перыяды, што і насельніцтва іншых зямель.

Першапачаткова беларускія землі ўвайшлі ў склад супольнай дзяржавы ўсходніх славян, цэнтр якой знаходзіўся ў Кіеве. Пазней нашы продкі апынуліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Гэтая дзяржава ахапіла землі Беларусі, Літвы, Украіны, часткова Расіі. Іх усіх звязваў агульны лёс.

Беларускія землі ў Сярэднявеччы адчувалі ўплыў з Усходу і з Захаду. Так, з канца X ст. нашы продкі прынялі хрысціянства візантыйскага ўзору. А з канца XIV ст. дзяржаўная ўлада аддала перавагу каталіцтву.

Людзі з нашых зямель упісалі свае імёны ў гісторыю іншых краін. І да нас прыходзілі таленавітыя ў розных галінах людзі. Яны ўнеслі традыцыі сваіх краін у скарбніцу беларускай культуры. Таму гісторыя Беларусі з'яўляецца неад'емнай часткай сусветнай гісторыі.

**3. На якія перыяды падзяляецца гісторыя Беларусі.** Перыядызацыя гісторыі — гэта падзел яе на пэўныя адрэзкі часу — перыяды. На працягу кожнага перыяду пачыналася, развівалася


Правообладатель Издательский центр БГУ




часу»

і заканчвалася якая-небудзь важная падзея або з'ява. Старажытная гісторыя Беларусі падзяляецца на ***каменны***, ***бронзавы*** і ***жалезны вякі***. У сваю чаргу, каменны век падзяляецца на старажытны, сярэдні і новы каменны век.

На змену старажытнаму часу прыйшлі ***Сярэднія вякі***. Яны працягваліся ***з канца V ст. і да канца XV ст.*** Сярэднявечча таксама падзяляецца на тры перыяды.

Першы перыяд — ***Ранняе сярэднявечча (канец V–IX ст.)***. Ён ахопліваў час рассялення славян на тэрыторыі Беларусі. Другі перыяд — ***Высокае (Развітое) сярэднявечча (X–XIII стст.)***. Гэта час існавання на тэрыторыі Беларусі старажытнарускіх княстваў і ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага.

Трэці перыяд — ***Позняе сярэднявечча (XIV–XV стст.)***. У гэты перыяд дасягнула свайго росквіту Вялікае Княства Літоўскае. У яго склад увайшлі ўсе беларускія землі.

? *Якімі падзеямі завяршаецца перыяд Сярэднявечча?*

**4. Адкуль мы ведаем гісторыю мінулага.** Сапраўднае навуковае вывучэнне гісторыі магчымае толькі на падставе канкрэтных крыніц. Для разумення кожнага з перыядаў большае значэнне мае пэўны від крыніц. Для першабытнага часу і Ранняга сярэднявечча гэта *рэчавыя крыніцы*. Іх знаходзяць пры археалагічных раскопках. Але здараюцца і выпадковыя адкрыцці.

Са з'яўленнем пісьменнасці людзі пачалі запісваць звесткі аб жыцці. Першыя надпісы нашых продкаў вядомыя з канца X ст.,


Правообладатель Издательский центр БГУ

а найбольш старажытная кніга ўсходніх славян дайшла да нас з першай чвэрці XI ст. У канцы таго ж стагоддзя былі складзены і першыя гістарычныя творы. Паведамленні ў іх запісваліся па гадах (на старажытнарускай мове — «летах»), таму іх назвалі *летапісамі*. Найбольш старажытны з летапісаў, што захаваліся, быў складзены *манахам* Нестарам у Кіеве каля 1113 г. Ён называецца «Аповесць мінулых гадоў». У гэтым творы расказваецца пра з'яўленне славян на тэрыторыі Беларусі, пра першых полацкіх князёў, пра пачатак раздраблення Полацкага княства.

? *Чаму менавіта манахі займаліся складаннем летапісаў?*

Працягам «Аповесці мінулых гадоў» з'явіліся пазнейшыя мясцовыя летапісы: Кіеўскі, Галіцка-Валынскі, Наўгародскія, Суздальскі і інш. Магчыма, свой летапіс быў складзены і ў Полацку.

Летапісы складаліся і ў Вялікім Княстве Літоўскім. Найбольш вядомыя з іх — «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Хроніка Быхаўца», «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага».

З цягам часу з'явіліся і іншыя пісьмовыя крыніцы. Гэта былі апавяданні пра выдатных людзей царквы (***жыціі***), зборнікі законаў (Руская Праўда), граматы, дагаворы. Звесткі



Старажытнарускі шлем канца X – пачатку XI ст., выпадкова знойдзены ў 2019 г. каля Бабруйска



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

? *Які вершаваны твор (з тых, што вы вывучаеце па прадмеце «руская літаратура») ілюструе гэты малюнак?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вялікую цікавасць выклікае летапіс, які называецца Радзівілаўскім. Ён быў створаны ў канцы XV ст., аднак захаваў больш ранні тэкст — пачатку XIII ст. У свой час гэты твор належаў аднаму з князёў Радзівілаў, таму і атрымаў сваю назву. Акрамя тэксту летапісу пра гісторыю ўсходніх славян можна даведацца з невялікіх каляровых малюнкаў. Іх называюць *мініяцюрамі*. Усяго ў летапісе іх больш за 600. На думку гісторыкаў, гэта сапраўдныя «вокны, скрозь якія можна глядзець на зніклы свет Старажытнай Русі».

аб гісторыі беларускіх зямель траплялі і ў іншаземныя крыніцы: польскія хронікі, скандынаўскія *сагі*.

З развіццём гаспадаркі і культуры на беларускіх землях назапашвалася ўсё больш рэчавых і пісьмовых крыніц. Дзейнасць вялікіх князёў літоўскіх знайшла адлюстраванне ў ***прывілеях*** (граматах). У іх вызначаліся правы пэўных груп насельніцтва і ўсіх жыхароў дзяржавы. У 1468 г. быў зацверджаны першы звод законаў ВКЛ — Судзебнік.

На працягу ўсёй гісторыі нашы продкі пакідалі сляды сваёй дзейнасці. Дзякуючы ім зараз мы даведваемся аб жыцці чалавека на тэрыторыі Беларусі ў розныя перыяды.

**Пытанні і заданні**

**1.** Чаму трэба вывучаць гісторыю сваёй Айчыны?
**2.** Дакажыце, што гісторыя Беларусі з'яўляецца часткай сусветнай гісторыі.
**3.** Запішыце ў сшытку па гісторыі храналагічныя межы каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў, а таксама перыядаў Сярэднявечча. Выкарыстайце «стужку часу» на с. 8–9.
**4.** Прывядзіце прыклады рэчавых гістарычных крыніц.
**5.** Якія пісьмовыя крыніцы даюць больш інфармацыі па гісторыі эпохі Сярэднявечча?
**6.** Падлічыце, колькі прыблізна гадоў працягваліся ў гісторыі Беларусі: а) бронзавы век; б) жалезны век; в) Сярэднявечча.
**7.** Паразважайце, якія крыніцы больш каштоўныя для вывучэння гісторыі Беларусі: пісьмовыя ці рэчавыя.

Правообладатель Издательский центр БГУ



# РАЗДЗЕЛ I

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СТАРАЖЫТНЫЯ ЧАСЫ І Ў РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

### § 1. Найстаражытнейшыя людзі на беларускай зямлі

**Успомніце.** *1. Дзякуючы чаму першабытны чалавек здолеў выжыць ва ўмовах ледавіковай эпохі? 2. Хто такія неандэртальцы і краманьёнцы?*

**Вы даведаецеся.** Вельмі працяглы час старажытныя людзі не маглі сяліцца на тэрыторыі Беларусі. Гэта было немагчыма з-за ледавіка, які пакрываў беларускія землі. Таксама жыццю першабытнага чалавека пагражалі дзікія жывёлы, хваробы і, галоўнае, недахоп ежы. Калі ж на нашай зямлі з'явіліся першыя людзі? Як было арганізавана жыццё чалавека ў тыя далёкія часы?

**1. Прырода беларускіх зямель у старажытнасці.** Прыродныя ўмовы на тэрыторыі Беларусі ў першабытнасці вельмі адрозніваліся ад сучасных. Доўгі час беларускія землі былі непрыдатнымі для жыцця чалавека. У далёкім мінулым адбываліся моцныя пахаладанні. Яны прыводзілі да ўтварэння *ледавікоў* — вялікіх напластаванняў лёду. Неаднойчы ледавікі прасоўваліся з поўначы, з боку Скандынавіі, на тэрыторыю Беларусі. З цягам часу яны павольна адступалі.

с. 2

Апошні раз ледавік прыйшоў на беларускія землі 18 тыс. гадоў назад. Калі ж 15 тыс. гадоў назад на Зямлі пацяплела, пачаў раставаць і ледавік. Яшчэ праз тысячу гадоў ён пакінуў тэрыторыю Беларусі і канчаткова растаў каля 12 тыс. гадоў назад.

Разам з пацяпленнем змянялася прырода. Зямля вызвалілася з палону вечнай мерзлаты. Яшчэ некаторы час па беларускіх землях



Правообладатель Издательский центр БГУ




Зʼяўленне людзей на тэрыторыі Беларусі

**?** *Падумайце, чаму першыя людзі аказаліся спачатку на паўднёвым усходзе Беларусі.*

блукалі маманты, шарсцістыя насарогі, аўцабыкі, бізоны, коні, высакародныя, вялікарогія і паўночныя алені. Дзеля палявання на іх і прыходзілі першыя людзі.

**2. Калі чалавек упершыню апынуўся на тэрыторыі Беларусі?** Магчыма, першымі людзьмі, якія зʼявіліся на тэрыторыі Беларусі, былі неандэртальцы. Сведчаннем гэтаму могуць быць тры старажытныя прылады працы, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі. Імі карысталіся прыблізна 100–35 тыс. гадоў таму.

с. 3



Неандэрталец



Краманьёнец

**?** *Параўнайце твары неандэртальца і краманьёнца. У чым можна ўбачыць адрозненні?*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Старажытнае жытло

? *Як вы думаеце, колькі часу займала будаўніцтва такога жытла?*

Аднак упэўнена сцвярджаць можна толькі пра прыход на нашы землі краманьёнцаў. *Краманьёнец*, ці чалавек сучаснага тыпу, з'явіўся ў Еўропе прыкладна ***40–35 тыс. гадоў таму***.

Пра з'яўленне людзей мы ведаем дзякуючы пакінутым імі ***стаянкам*** — месцам пасялення. Найбольш старажытная стаянка была знойдзена на беразе Прыпяці, каля вёскі *Юравічы* Калінкавіцкага раёна на Гомельшчыне. Археолагі знайшлі там месца забою і перапрацоўкі паляўнічай здабычы. Людзі з'явіліся тут у ***24-м тысячагоддзі да н. э.***

с. 3

Другая стаянка старажытнага каменнага веку адкрыта на беразе р. Сож, каля вёскі Бердыж Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці. Там людзі жылі ў ***22–21-м тысячагоддзі да н. э.***

На месцах старажытных стаянак выяўлена шмат крамянёвых прылад працы і касцей жывёл. Гэта былі галоўным чынам косці мамантаў, але не толькі. Тагачасныя людзі палявалі таксама на старажытных коней, паўночных аленяў і шарсцістых насарогаў.

У Бердыжы археолагі знайшлі рэшткі двух паглыбленых у зямлю жытлаў. У іх сярэдзіне распальвалася вогнішча. Сцены былі складзены з чарапоў, сківаў і іншых буйных касцей мамантаў. Жытлы пакрываліся шкурамі і былі падобныя да буданоў (шалашоў).

**3. Засяленне тэрыторыі Беларусі.** Засяленне тэрыторыі Беларусі людзьмі было галоўнай з'явай пасляледавіковай эпохі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Калі ледавік адышоў, утварыліся рэкі. Яны сталі шляхамі для новага рассялення людзей. Паляўнічыя, рыбаловы і збіральнікі рухаліся па Дняпры, Прыпяці і Сажы. Нарэшце былі заселены даліны рэк і роўныя прасторы паміж імі.

? *Прасачыце шляхі рассялення чалавека па картасхеме на с. 13.*

Умовы надвор'я сталі яшчэ больш спрыяльнымі ў канцы сярэдняга каменнага веку — у 5-м тысячагоддзі да н. э. Колькасць насельніцтва беларускіх зямель павялічылася. Шмат стаянак размясцілася на берагах рэк. У гэты час утварылася першае сталае насельніцтва.

? *Узгадайце, які час ахоплівае каменны век.*

Найбольш старажытны перыяд у гісторыі чалавецтва атрымаў назву «каменны век». Тлумачыцца гэта тым, што людзі ў той час рабілі прылады працы ў асноўным з каменю. Часцей за ўсё гэта быў крэмень. Ён лёгка расшчапляецца на вострыя кавалкі.

З крэменю нашы далёкія продкі навучыліся вырабляць вострараканечнікі. Гэта прылады сэрцападобнай формы, абабітыя па краях. Імі зручна было праколваць і рэзаць шкуры жывёл. Вострараканечнік можна было прымацаваць сухажыллямі і смалой да палкі. Так



Скрабок



Вострараканечнік



Разец

? *Падумайце, для якой працы маглі выкарыстоўваць гэтыя прылады.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Ці знаходзілі ў вашай мясцовасці косці мамантаў або іншых старажытных жывёл, а таксама стаянкі людзей каменнага веку? Падрыхтуйце кароткае паведамленне на гэтую тэму.*

? *Якія меркаванні наконт прычын вымірання мамантаў вы ведаеце?*

атрымліваліся простыя дзіды (коп'і). Старажытныя людзі выкарыстоўвалі таксама скрабкі для апрацоўкі шкур і *разцы* для рэзання.

Найбольш жаданай здабычай людзей у старажытным каменным веку былі маманты, але 10–12 тыс. гадоў таму яны вымерлі. Замену гэтым велізарным жывёлам складана было знайсці. Старажытныя паляўнічыя перайшлі да палявання на паўночных аленяў. Аднак гэтыя больш дробныя і хутканогія жывёлы патрабавалі новых спосабаў палявання. Так пакупова, разам са змяненнем прыроды, адбывалася і развіццё людзей.

**4. Заняткі і лад жыцця старажытных людзей.** У тыя далёкія часы чалавек цалкам залежаў ад прыроды. У яе людзі бралі ў гатовым выглядзе ўсё неабходнае для жыцця. Не было ні земляробства, ні жывёлагадоўлі. Каб выжыць, людзі займаліся паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам. Здабыча ўсяго неабходнага для жыцця ў прыродзе ў гатовым выглядзе называецца *прысвойвальнай*, або *спажывецкай, гаспадаркай*.

У сярэднім каменным веку адбываўся сапраўдны росквіт прысвойвальнай гаспадаркі, перш за ўсё збіральніцтва. Аднак доўгі



Паляванне краманьёнцаў на маманта. Мастак *Здэнек Бурыян*

? *Якія прыёмы палявання паказаны на малюнку? Складзіце расказ аб гэтым паляванні. Якую трагедыю адлюстраваў на малюнку мастак?*



Правообладатель Издательский центр БГУ




«Стужка часу». Перыяды каменнага веку

час старажытныя людзі існавалі за кошт палявання. Гэты занятак не мог даць чалавеку надзейнае, штодзённае харчаванне. Часта здаралася, што людзі падоўгу галадалі.

Вельмі зручнай прыладай для палявання яшчэ з канца старажытнага каменнага веку стаў лук. З яго дапамогай стала магчыма паляваць на дробных і хуткіх жывёл, на ляту біць птушак. Лук — гэта найбольш старажытны механізм, які вынайшаў чалавек. З яго дапамогай стала прасцей здабываць агонь і свідраваць камяні. Выяўленне спосабу свідравання каменю лічыцца адным з найвялікшых вынаходніцтваў новага каменнага веку.

Людзі не маглі ўцалець у складаных умовах каменнага веку паасобку. Вельмі рана яны пачалі жыць групамі і сталі аб'ядноўвацца




? *З дапамогай схемы высветліце, якія заняткі былі распаўсюджаны ў першабытны час.*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Спосаб свідравання з дапамогай лука

? *Падумайце, для чаго было патрэбна свідраванне камянёў.*

ў *роды*. Некалькі родаў складалі *племя*. Такая форма арганізацыі грамадства ў гісторыі называецца *першабытным ладам*.

Нягледзячы на роўнасць усіх людзей, ужо ў першабытнасці пачалі вылучацца правадыры. Гэта былі найбольш фізічна моцныя, кемлівыя або вопытныя людзі.

З канца 5-га тысячагоддзя да н. э. на поўдні Беларусі пачалі вырабляць гліняны посуд, які быў вельмі неабходны ў жыцці чалавека. Яго рабілі ў кожным паселішчы ўручную, з кавалкаў ці доўгіх жгутоў гліны. Паверхню пасудзін пакрывалі ўзорам (арнаментам). Затым іх абпальвалі на вогнішчы. Першапачаткова гліняныя гаршкі мелі круглае або завостранае дно.

*Выкажыце сваё меркаванне, чаму гаршкі рабілі менавіта такой формы.*

**Першабытны лад** (грамадства)

| Роўнасць усіх людзей | Выкарыстанне вельмі простых прылад прац° | Адсутнасць дзяржа |
|---|---|---|

? *З дапамогай схемы сфармулюйце азначэнне паняцця «першабытны лад».*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, дакладна можна казаць, што людзі на тэрыторыі Беларусі жылі з 24-га тысячагоддзя да н. э. Разам са з'яўленнем чалавека на беларускай зямлі пачаўся адлік яе гісторыі. Першыя людзі знаходзілі простыя спосабы ўзяць у прыроды тое, што патрэбна для жыцця. Выжыць людзям дапамагала аб'яднанне ў калектывы — роды і плямёны.

**Пытанні і заданні**

1. Чаму тэрыторыя Беларусі доўгі час не магла быць заселена людзьмі?
2. Калі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся першыя людзі? Што пра гэта сведчыць?
3. Чаму каменны век атрымаў такую назву? Што было для яго характэрна?
4. Калі на тэрыторыі Беларусі склалася першае сталае насельніцтва?
5. Растлумачце, якая гаспадарка называецца прысвойвальнай. Якія заняткі яна ўключала?
6. У якія групы ці калектывы аб'ядноўваліся людзі ў старажытнасці? Чаму гэта адбывалася?
7. Падумайце, чаму спажывецкая гаспадарка не дазваляла чалавеку забяспечыць сабе надзейнае, штодзённае харчаванне.

## § 2. Змены ў новым каменным веку

**Успомніце.** *1. У якіх рэгіёнах Зямлі раней узнікла земляробства? 2. Якія жывёлы былі прыручаны першымі?*

**Вы даведаецеся.** У канцы каменнага веку чалавек знайшоў спосабы пераадолець поўную залежнасць ад прыроды. Гэта стала велізарным крокам у развіцці чалавецтва. У чым заключаліся гэтыя спосабы? Якія наступствы мела іх з'яўленне?

**1. Як зарадзілася вытворчая гаспадарка.** Пры прысвойвальнай гаспадарцы людзі цалкам залежалі ад прыроды. Здаралася, што яны падоўгу не маглі знайсці харчавання. Таму з цягам


Правообладатель Издательский центр БГУ



Паселішча людзей новага каменнага веку. Мастак *Здэнек Бурыян*

**?** *Якія заняткі старажытных людзей адлюстраваны на малюнку?*

часу людзі навучыліся самі рабіць тое, што неабходна для жыцця. Яны прыручалі і гадавалі жывёл, вырошчвалі ядомыя расліны. Такая гаспадарка называецца вытворчай. Яе пашырэнне дазволіла людзям пераадолець непастаянства прыроды. З'явілася магчымасць назапашваць больш ежы. Харчаванне стала разнастайнейшым.

*Вытворчая гаспадарка* — гэта гаспадарка, пры якой асноўнымі крыніцамі забеспячэння людзей прадуктамі харчавання з'яўляюцца жывёлагадоўля і земляробства. Пры гэтым не былі цалкам забытыя і галоўныя заняткі папярэдняга часу: паляванне, збіральніцтва і інш. Аднак яны мелі ўжо другараднае значэнне.

**?** *Паразважайце, у чым галоўнае адрозненне вытворчай гаспадаркі ад прысвойвальнай.*

**2. З'яўленне жывёлагадоўлі.** Вялікую ролю ў гаспадарцы старажытных часоў адыгрывала паляванне. Падчас яго людзі часам адлоўлівалі дзіцянят звяроў і захоўвалі ім жыццё. На стаянцы жывёлы прывыкалі да чалавека. Больш свойскімі станавіліся тыя, што нараджаліся ў паселішчах людзей. Хутка асвойваліся ў няволі цяляты,



Спосаб мацавання сякеры



Правообладатель Издательский центр БГУ

ягняты і асабліва свінні. Першым чалавек прыручыў сабаку, які стаў надзейным памочнікам паляўнічага і чуйным вартаўніком.

*Калі ў вашай мясцовасці адбыўся пераход да земляробства і жывёлагадоўлі? Складзіце аб гэтым расказ, выкарыстоўваючы назвы рэк ці населеных пунктаў вашай мясцовасці.*

Раней жывёлагадоўля з'явілася на поўдні сучаснай Беларусі. Гэта адбылося ў перыяд новага каменнага веку, у ***3-м тысячагоддзі да н. э.*** Дзякуючы жывёлагадоўлі чалавек атрымаў магчымасць мець запасы харчавання. Свойскія жывёлы сталі дапамагаць людзям і ў гаспадарцы, у тым ліку ў земляробстве.

**3. Першыя земляробы.** Земляробства зарадзілася амаль адначасова з жывёлагадоўляй. Для яго развіцця ў большай ступені патрабаваліся спрыяльныя ўмовы надвор'я і добрая глеба. Таму земляробства спачатку ўзнікла на поўдні Беларусі — на Палессі.

с. 4

Першапачаткова апрацоўка зямлі ажыццяўлялася з дапамогай матык. Такое земляробства называецца матычным. Аднак шырокага распаўсюджання *матычнае земляробства* на тэрыторыі Беларусі атрымаць не магло. Звязана гэта з тым, што амаль уся плошча была занята лясамі.



Старажытная матыка з рогу.
Ветка Гомельскай вобл.



Барана-сукаватка. Рэканструкцыя



Крамянёвы серп

*Уявіце сябе старажытным земляробам. Як бы вы выкарыстоўвалі прылады працы, якія прадстаўлены на ілюстрацыях?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

У лясных краях выкарыстоўвалася *падсечна-агнявое земляробства*. Падсека, або ляда,— гэта ўчастак, на якім высякаўся лес. Дрэвы спачатку падсякалі (адсюль назва — «падсека»). Праз некаторы час яны высыхалі, і іх спальвалі. У попел сеялі зерне і баранавалі поле кавалкам сукаватага дрэва — бараной-сукаваткай. Ураджай збажыны зжыналі з дапамогай сярпоў. Першыя два-тры гады збіралі добры ўраджай, але потым глеба спусташалася, і даводзілася пераходзіць на новы ўчастак.

Лепшы ўраджай глеба давала тады, калі для яе ўзрыхлення сталі выкарыстоўваць драўлянае *рала*. Так узнікла *ворыўнае земляробства*. Аднак яго пашырэнне адбылося значна пазней.

У той час у Еўропе асноўнымі земляробчымі культурамі былі пшаніца і ячмень. Тэрыторыя Беларусі аказалася больш прыдатнай для ячменю. Пазней пачалі вырошчваць жыта, проса і лён.

**4. Як узнікла маёмасная няроўнасць у грамадстве.** Група людзей, якія вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы, складала *абшчыну*. Спачатку ўсе, хто ў яе ўваходзіў, былі родзічамі, таму абшчына амаль супадала з родам. З-за гэтага яе называюць *родавай абшчынай*.

Першапачаткова ў абшчыне існавала калектыўная ўласнасць на ежу і на ўсю здабычу. Размяркоўваліся яны ўраўняльна. Аднак з цягам часу сітуацыя змянілася. Дзякуючы земляробству і жывёлагадоўлі людзі сталі добра забяспечваць сябе прадуктамі харчавання. Назапашваліся лішкі. Дзякуючы ім з'явілася магчымасць вызваліць некаторых людзей ад пастаяннага здабывання ежы.




*Растлумачце лагічны ланцужок.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У перыяд новага каменнага веку родавая абшчына стала аб'ядноўваць вялікую колькасць людзей. Ускладнілася і іх працоўная дзейнасць. З развіццём земляробства і жывёлагадоўлі спатрэбіліся сховішчы для сабранага ўраджаю, хлявы для жывёлы, умацаванні для абароны ад хцівых суседзяў. Таму для кіравання складаным жыццём абшчыны сталі неабходныя спецыяльныя людзі. Так вылучыліся *старэйшыны* і правадыры. Яны атрымалі права распараджацца маёмасцю абшчыннікаў. Гэта дазволіла ім разбагацець. У самой абшчыне з'явіліся бедныя і багатыя сем'і. Так пачыналася *расслаенне грамадства*.

Багатыя абшчыннікі не жадалі аддаваць сваю маёмасць і імкнуліся распараджацца ёй па ўласным жаданні. Так узнікала ўяўленне аб *прыватнай уласнасці*, якую можна было абмяняць, падараваць, пакінуць у спадчыну.

> ? *Паспрабуйце растлумачыць, як з'яўленне багацця магло выклікаць войны.*

Асобныя абшчыны і плямёны станавіліся багацейшымі за іншыя. Праз гэта адбываліся сутычкі. Так узніклі войны. У выніку перамогі маглі быць захоплены палонныя. Іх выкарыстоўвалі для працы ў гаспадарцы старэйшын і ваенных кіраўнікоў. Да рабоў ставіліся амаль як да членаў сям'і. З цягам часу яны маглі нават зрабіцца свабоднымі. Такую форму залежнасці называюць *патрыярхальным (хатнім) рабствам*. Важна таксама, што войны ўмацоўвалі ўладу правадыроў.

**5. Першыя прыклады мастацтва.** Ужо ў старажытным каменным веку зарадзілася мастацтва. У гэты час з'явілася скульптура — створаная з розных матэрыялаў аб'ёмная выява. З канца каменнага веку вядомы касцяныя статуэткі мамантаў, насарогаў, коней, бізонаў. Да таго ж часу належаць і скульптурныя выявы жанчын. Магчыма, яны сімвалізавалі маці — прадаўжальніцу роду.

Цікавыя статуэткі мужчын знойдзены на стаянцы каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна на Віцебшчыне. Яны адносяцца да часу новага каменнага веку і пачатку бронзавага веку. Магчыма, гэта былі ўвасабленні духаў — ахоўнікаў і памочнікаў у паляванні.

с. 4



Правообладатель Издательский центр БГУ



Стварэнне Венеры. Мастак *Здэнек Бурыян*

? *Як вы думаеце, з якой мэтай першабытныя мастакі стваралі статуэткі?*

У старажытнасці выраблялі ўпрыгажэнні з зубоў ваўка, лісы, дзіка або мядзведзя, касцяных пласцінак, хрыбтоў рыб. Іх насілі на шыі або нашывалі на вопратку. Гэта былі *амулеты*, якія быццам бы засцерагалі іх уладальніка ад небяспекі.

Разам з пашырэннем земляробства старажытныя насельнікі беларускіх зямель сталі аздабляць гліняны посуд арнаментам. Ён складаўся з фігур, такіх як круг, ромб, крыж. Яны сімвалізавалі Сонца, плоднасць, вечнасць прыроды, яе кругазварот.

? *Падумайце, чаму з'яўленне арнаменту звязваецца з пашырэннем земляробства.*



Статуэткі людзей са стаянкі Асавец-2. Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці



Гліняны посуд бронзавага веку з арнаментам. Сябровічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці

? *Як вы думаеце, з якой мэтай быў нанесены арнамент? Што ён азначае?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У 3-м тысячагоддзі да н. э. на поўдні сучаснай тэрыторыі Беларусі з'явіліся жывёлагадоўля і земляробства. Гэтыя вялікія адкрыцці чалавецтва мелі вельмі важныя наступствы. З'явіліся запасы прадуктаў, пачалося расслаенне грамадства. Змены, што адбываліся ва ўяўленнях чалавека аб навакольным свеце ў той час, знаходзілі ўвасабленне і ў першабытным мастацтве.

**Пытанні і заданні**

**1.** Што такое вытворчая гаспадарка?

**2.** Як на беларускіх землях з'явілася жывёлагадоўля?

**3.** У чым асаблівасці з'яўлення земляробства на тэрыторыі Беларусі?

**4.** Як паўплывала з'яўленне земляробства і жывёлагадоўлі на развіццё грамадства?

**5.** Раскажыце пра ўзнікненне расслаення грамадства і патрыярхальнага (хатняга) рабства.

**6.** Прывядзіце прыклады першабытнага мастацтва з тэрыторыі Беларусі. Як яно звязана з развіццём вытворчай гаспадаркі?

**7.** Дакажыце, што з'яўленне вытворчай гаспадаркі — гэта найвялікшая падзея ў гісторыі чалавецтва.

## § 3. Пачатак выкарыстання металаў на беларускіх землях

**Успомніце.** *1. Які час ахоплівалі перыяды бронзавага і жалезнага вякоў? 2. Пра што расказвалі міфы старажытных егіпцян і грэкаў?*

**Вы даведаецеся.** Наступным вялікім вынаходніцтвам чалавека стала стварэнне прылад працы (а таксама і зброі) з металаў. Калі металічныя рэчы з'явіліся на беларускіх землях? Калі насельніцтва беларускіх зямель навучылася здабываць жалеза? Якія важныя наступствы гэта мела?

**1. Першыя прылады працы з металу.** У ***пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э.*** на тэрыторыю Беларусі трапілі першыя вырабы

? *Падумайце, што магло прапанаваць для абмену старажытнае насельніцтва Беларусі.*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Бронзавы кельт (сякера). Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці

с. 5

? *Як вы думаеце, для чаго выкарыстоўвалася гэтая сякера?*

з медзі і бронзы. Гэта былі сякеры, наканечнікі коп'яў, сярпы, шылы і ўпрыгажэнні. Так пачаўся бронзавы век.

У першабытны час медныя руды на тэрыторыі Беларусі былі недаступныя для людзей. Нешматлікія металічныя рэчы шляхам абмену траплялі на беларускія землі з Урала, Каўказа і Прыкарпацця.

Медныя вырабы не былі лепшымі за крамянёвыя. Аднак медзь у спалучэнні з волавам давала больш трывалы сплаў — бронзу. Да таго ж ён плавіўся на звычайным вогнішчы. Выкарыстанне бронзавых прылад павысіла выніковасць працы. Невыпадкова ў бронзавы век распаўсюдзіліся бронзавыя сярпы. Яны з поспехам выкарыстоўваліся ў земляробстве. Пры гэтым на тэрыторыі Беларусі вядомая толькі адна знаходка бронзавага мяча. Вырабы з бронзы вельмі цаніліся. Аднак крамянёвыя прылады яны замяніць не маглі.

У бронзавым веку крамянёвыя прылады працы сталі больш дасканалымі. Іх свідравалі, шліфавалі, яны сталі невялікімі па памеры. Крэмень для вырабу прылад працы першабытныя «шахцёры» здабывалі ў 2-м тысячагоддзі да н. э. у найпрацейшых шахтах, падобных да калодзежаў.



Краснасельскія крэменездабыўныя шахты. Рэканструкцыя



Правообладатель Издательский центр БГУ

Шмат шахтаў было адкрыта каля пасёлка Краснасельскі, недалёка ад Ваўкавыска на Гродзеншчыне. Глыбіня шахты складала 3–5 м. Знойдзеныя ў адкладах мелу кавалкі крэменю змяшчалі ў скураны мяшок, які на вяроўцы выцягвалі наверх. З крэменю выраблялі сякеры і іншыя прылады, якія распаўсюджваліся ў Панямонні і за яго межамі. У адной шахце археолагамі выяўлена пахаванне «шахцёра». Каля яго былі знойдзены касцяная іголка для сшывання скураных мяшкоў і гліняная пасудзіна.

*Складзіце расказ пра працу старажытнага «шахцёра». Узгадайце, якімі прыладамі працы ён карыстаўся, як асвятляў шахту, як спускаўся ў яе і падымаўся з яе.*

**2. Як здабывалася жалеза.** Наступны пасля бронзавага веку перыяд атрымаў назву жалезнага веку. Ён пачаўся каля ***700 г. да н. э.*** і доўжыўся да пачатку Сярэднявечча. Адкрыццё жалеза стала пачаткам велізарнага тэхнічнага перавароту. Гэта азначае, што новыя, больш дасканалыя, прылады працы, якія выраблялiся з жалеза, хутка выцеснілі састарэлыя, зробленыя з камянёў. Жалезныя прылады працы і зброя істотна змянілі жыццё людзей.

У адрозненне ад медзі, жалезная — балотная і азёрная — руда часта сустракаецца на тэрыторыі Беларусі. Асабліва багатае на яе Палессе. Таму ў Беларусі шмат населеных пунктаў, назва якіх утворана ад слова «руда».

? *Ці ёсць у вашай мясцовасці такія населеныя пункты?*

Злучэнні жалеза стагоддзямі асядалі бурай каламуццю на дно балот ці азёр, утвараючы руду. Людзі знаходзілі яе па бурым колеры



Жалезныя прылады працы

? *Як называецца кожны з гэтых прадметаў працы?*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Старажытныя майстры каля печы-домніцы. Рэканструкцыя

? *З дапамогай малюнка раскажыце, як атрымлівалі жалеза ў старажытнасці.*

травы. Аднак балотная руда ўтрымлівае мала жалеза. Да таго ж выплаўка жалеза патрабавала даволі высокай тэмпературы. Неабходна было арганізаваць вельмі складаны працэс, каб у найпрасцейшых *печах-домніцах* атрымаць спачатку порыстую масу — крыцу. Пасля коўкай — моцнымі ўдарамі молата — трэба было ачысціць яе ад дамешкаў.

З жалеза нашы продкі сталі рабіць зброю, прылады працы, бытавыя рэчы: сякеры, нажы, наканечнікі коп’яў і стрэл, сярпы, рыбалоўныя кручкі, шылы, спражкі і інш.

**3. Якое значэнне мела адкрыццё жалеза.** Жалезныя прылады працы дазвалялі лягчэй і больш якасна выконваць складаную працу земляробаў. Гэта было асабліва важна для беларускага ляснога краю. Жалезная сякера давала магчымасць хутчэй расчышчаць дзялянкі для земляробства. З дапамогай рала з жалезным наральнікам лепш апрацоўвалася глеба, а сярпы і косы дазвалялі хутка і з меншымі стратамі сабраць вырашчанае.

Усё гэта значна павялічыла ўраджаі. З’явіліся і лішкі прадуктаў. Іх можна было абмяняць у суседзяў на іншыя прадукты, якасныя рамесныя вырабы ці прадметы раскошы. Так пашырыліся ўзаемаадносіны паміж плямёнамі.


Правообладатель Издательский центр БГУ




? *Растлумачце лагічны ланцужок.*

Пры дапамозе жалезных сякер нашы продкі сталі ўзводзіць больш трывалыя жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Дасканалейшай стала і зброя. Па гэтай прычыне часцей адбываліся войны, якія станавіліся больш жорсткімі.

Здабыча жалеза і выраб з яго разнастайных рэчаў патрабавалі спецыяльных навыкаў і майстэрства, таму ад іншых гаспадарчых спраў аддзялілася кавальскае рамяство.

У жалезным веку паўсюль на тэрыторыі Беларусі сталі ўзнікаць умацаваныя паселішчы, або, як іх называюць вучоныя, ***гарадзішчы***. У гарадзішчах хаваліся людзі з навакольных неўмацаваных паселішчаў падчас небяспекі.

с. 5

Распаўсюджанне гарадзішчаў менавіта ў жалезным веку не было выпадковым. Жалезныя прылады працы дазволілі збіраць большыя ўраджаі. Таму ў асобных абшчынах і плямёнах стала назапашвацца маёмасць і прадукты харчавання. Гэта прываблівала грабежнікаў, для абароны ад якіх і ствараліся гарадзішчы. Акрамя абароны гарадзішчы маглі будавацца і для іншых спраў. Тут маліліся племянным багам, тут жа наладжвалі племянныя сходы.

Для гарадзішчаў выбіраліся месцы, ужо абароненыя прыродай, звычайна на высокіх берагах рэк. Дадаткова яны ўмацоўваліся землянымі валамі, равамі, драўлянымі агароджамі ці сценамі.

Такім чынам, адкрыццё жалеза істотна змяніла чалавечае грамадства, дало штуршок для яго развіцця.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Як зарадзіліся міфы і ў што верылі першабытныя людзі.** Назіраючы за прыроднымі з'явамі, чалавек намагаўся іх растлумачыць. У старажытнасці людзям не хапала ведаў, каб правільна зразумець прычыны змены пораў года, дня і ночы, росту раслін і з'яўлення дажджу і грому. Усё гэта тлумачылі складзеныя чалавекам міфы.

> ? *Знайдзіце і перакажыце беларускі міф аб паходжанні свету ці асобных прыродных з'яў і аб'ектаў.*

> *Высветліце, якія старажытныя міфы і паданні звязаны з вашым населеным пунктам, раёнам, вобласцю. Якія яны даюць уяўленні аб мінулым вашага краю?*

*Міфам* называецца такі аповед, у якім людзі перадаюць сваё разуменне навакольнага свету і яго паходжання, месца ў ім чалавека і жыцця багоў і герояў. Складзеныя нашымі продкамі міфы расказвалі пра Вялікую Багіню — маці-зямлю, ад якой пайшло ўсё існае. Яны апавядалі пра стварэнне грому і маланкі нябесным багам, пра паходжанне рэк, азёр і балот і г. д.

Міфы ў тыя далёкія часы былі вельмі блізкія да рэлігійных уяўленняў. Зараз немагчыма дакладна сказаць, у якіх багоў верылі людзі ў бронзавым веку, тым больш у каменным. У той час людзі надзялялі душой усіх жывых істот і нежывыя прадметы. Багі адказвалі



Пахаванне паляўнічага на мамантаў.
Мастак *Здэнек Бурыян*

? *Што на малюнку сведчыць аб тым, што першабытныя людзі верылі ў замагільнае жыццё?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

за кожную з'яву ці стыхію прыроды, таму іх было шмат. Аднак людзі больш шанавалі тых багоў, ад якіх, як яны верылі, залежаў іх дабрабыт. Так, разам з распаўсюджаннем земляробства на першае месца выйшлі багі Сонца і дажджу.

Верылі нашы далёкія продкі і ў замагільнае жыццё. Аб гэтым сведчаць пахавальныя *абрады*. Смерць, асабліва нечаканая і раптоўная, заўсёды палохала людзей. Таму людзі спрабавалі яе растлумачыць як пераход у іншы свет.

Водгалас старажытных міфаў і рэлігійных уяўленняў захаваўся ў беларускіх казках, абрадах, арнаментах народнай вышыўкі.

З верай старажытных людзей у замагільнае жыццё звязана з'яўленне пахавальных абрадаў. У розныя часы на тэрыторыі Беларусі былі вядомыя два тыпы абраду пахавання. Адзін — закопванне цела памерлага ў зямлю, другі — спальванне нябожчыкаў. Над пахаваннем маглі насыпаць *курган*. Лічылася, што агонь валодае ачышчальнай сілай. З гэтай прычыны яму і аддавалі нябожчыка. У старажытнасці верылі, што жыццё працягваецца «на тым свеце». Таму памерламу пакідалі рэчы, якімі ён карыстаўся пры жыцці. Гэта маглі быць упрыгажэнні, зброя, прылады працы і інш.

*Аб чым яшчэ сведчылі розныя рэчы ў пахаваннях?*

Такім чынам, са з'яўленнем спосабу здабычы жалеза і вырабу з яго прылад працы і зброі грамадства выйшла на новы этап свайго развіцця. У бронзавым і жалезным вяках узніклі міфы, рэха якіх дайшло да нашых часоў.

**Пытанні і заданні**

1. Што стрымлівала распаўсюджанне медных і бронзавых вырабаў на Беларусі ў старажытныя часы?
2. З якіх матэрыялаў рабілі зброю і прылады працы ў бронзавым веку?
3. Як здабывалі жалеза на тэрыторыі Беларусі ў старажытнасці? Якія рэчы рабілі з жалеза?
4. Якое значэнне мела адкрыццё жалеза?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** У сувязі з чым у жалезным веку сталі ўзнікаць гарадзішчы?
**6.** Чаму з'явіліся міфы і рэлігійныя вераванні? Пра што расказвалі міфы і ў што верылі старажытныя людзі?
**7.** Як вы думаеце, ці маюць рацыю тыя вучоныя, якія лічаць, што ў гісторыі Беларусі не трэба вылучаць перыяд бронзавага веку?

## § 4. Насельніцтва беларускіх зямель бронзавага і жалезнага вякоў

**Успомніце.** *1. Хто такія індаеўрапейцы? 2. Калі існавала Рымская імперыя?*

**Вы даведаецеся.** У бронзавым і жалезным вяках тэрыторыя Беларусі была ўжо шчыльна заселена людзьмі. Хто былі гэтыя людзі? Як яны жылі? Чым займаліся і што пакінулі пасля сябе?

с. 8

**1. Пранікненне індаеўрапейцаў на тэрыторыю Беларусі.** На працягу 3-га — першай паловы 2-га тысячагоддзя да н. э. шматлікія плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў рассяліліся на вялікай тэрыторыі ад Еўропы да Індыі. Гэта былі *індаеўрапейцы*. Магчыма, першапачаткова яны жылі на ўсходзе Малой Азіі побач з Іранам. Прыкладна ў *сярэдзіне 3-га тысячагоддзя да н. э.* першыя індаеўрапейцы прыйшлі і на тэрыторыю Беларусі.

На прасторах Еўропы сфарміравалася некалькі груп народаў. Сярод іх былі германцы, *балты* і *славяне*.

> ? *Успомніце, калі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся жывёлагадоўля і земляробства.*

Менавіта дзякуючы індаеўрапейцам на тэрыторыі Беларусі атрымалі шырокае распаўсюджанне новыя формы гаспадаркі: жывёлагадоўля і земляробства.

**2. Плямёны балтаў.** У старажытнасці на тэрыторыі Беларусі рассяліліся плямёны балтаў. Сваю гісторыю яны вядуць з канца новага каменнага веку. Падчас рассялення некаторыя індаеўрапейскія плямёны занялі тэрыторыю ва Усходняй Еўропе і на ўзбярэж-


Правообладатель Издательский центр БГУ




Балты ў пачатку Сярэднявечча

**?** *Як вы думаеце, якая з груп балтаў мела лепшыя ўмовы для развіцця? Дакажыце сваё меркаванне.*

Магчыма, балты былі вядомыя пад імем «неўры». Неўраў, якія жылі дзесьці на поўдні сучаснай Беларусі, згадваў «бацька гісторыі» Герадот у V ст. да н. э. Ён расказваў, што неўры раз у год на некалькі дзён ператвараліся ў ваўкоў. Легенды аб ваўкалаках і пазней былі распаўсюджаны на беларускіх землях.

*Зразумела, што гэтая легенда не адпавядае рэчаіснасці. Чым жа, на вашу думку, было выклікана яе з'яўленне?*

жы Балтыйскага мора. Яны размаўлялі на падобных мовах, мелі аднолькавы лад жыцця. З-за блізкасці да Балтыйскага мора гісторыкі сталі называць іх балтамі.

У бронзавым веку (2-е тысячагоддзе да н. э.) балты займалі найбольш шырокую тэрыторыю. Яна распасціралася ад вярхоўяў ракі Волгі на ўсходзе і амаль да ракі Одэр на захадзе. На поўначы землі балтаў даходзілі да Фінскага заліва, на поўдні — да Сярэдняга Падняпроўя.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Жыллё балтаў. Рэканструкцыя

У II–V стст. балты перажывалі свой «залаты век». У гэты час дасягнулі росквіту іх рамяство і гандаль. Аднак тэрыторыя, якую яны займалі, паменшылася.

У 1-м тысячагоддзі да н. э. балты падзяліліся на заходніх, усходніх і дняпроўскіх. Заходнія балты займалі тэрыторыю ад Панямоння да Ніжняй Віслы. Пазней, у Раннім сярэднявеччы, сярод іх найбольш моцнымі былі прусы, яцвягі і куршы.

Усходнія балты жылі ў Прыбалтыцы па берагах рэк Нёман, Заходняя Дзвіна, Вілія. Да іх належала племя літва.

Пра дняпроўскіх балтаў мала што вядома. Усе яны растварыліся сярод славян, якія прыйшлі пазней.

На тэрыторыі Беларусі пражывалі продкі літвы, яцвягаў і іншых балцкіх плямёнаў. Старажытныя балты сталі продкамі сучасных літоўцаў і латышоў. Аказалі яны ўплыў і на фарміраванне беларускага *этнасу (народа)*.

Балты на тэрыторыі Беларусі жылі ў адкрытых неўмацаваных *селішчах* і ўмацаваных гарадзішчах. Апошнія размяшчаліся на ўзвышаных месцах ці асобных узгорках на крутых берагах рэк і азёр. Іх памеры былі зусім невялікія.

Свае наземныя жытлы балты будавалі са слупоў. Зверху збудаванні накрываліся дахам. Драўляныя сцены часта абмазваліся глінай. Пасярэдзіне жытлаў размяшчаліся адкрытыя вогнішчы.

Балты былі добрымі земляробамі і жывёлаводамі. Рымскія гісторыкі адзначалі, што балты сеялі збожжа і вырошчвалі іншыя



Правообладатель Издательский центр БГУ

культуры, працуючы больш рупліва, чым германцы. Важную ролю ў гаспадарцы балтаў адыгрывалі паляванне і рыбалоўства. Аднак жывёлагадоўля ў балтаў пераважала над паляваннем. Балты гадавалі свіней, авечак, коней і кароў.

**3. Удзел у гандлі. Рамёствы і мастацтва.** На землях балтаў не было радовішчаў медзі. Мясцовыя жыхары куплялі або выменьвалі яе ў суседзяў. Што яны маглі прапанаваць узамен? Балтам надзвычай пашанцавала. На балтыйскім узбярэжжы знаходзіцца найбольш буйное радовішча *бурштыну*. Яго справядліва называлі «паўночнае золата». За бурштын еўрапейскія і ўсходнія гандляры гатовыя былі прапанаваць добрую цану.

Яшчэ ў бронзавым веку ўзнік «бурштынавы шлях». Ён звязваў Прыбалтыку з Міжземнамор'ем. Магчыма, нейкія адгалінаванні гэтага шляху праходзілі праз тэрыторыю Беларусі.

? *Знайдзіце гэты шлях на карта-схеме на с. 33.*

Але не толькі бурштынам гандлявалі балты. З Прыбалтыкі на поўдзень вывозіліся коні, жывёла, шкуры жывёл, мёд, воск.

У часы Рымскай імперыі ў першыя стагоддзі нашай эры на свае тавары балты выменьвалі тысячы манет. У Прыбалтыцы было знойдзена мноства манетных скарбаў. Адзінкавыя рымскія манеты



Бронзавая падвеска-лунніца з чырвонай эмаллю. III–IV стст.



Балцкія фібулы (зашпількі для плашча)

Правообладатель Издательский центр БГУ

і скарбы выяўлены і на тэрыторыі Беларусі. Да балтаў паступалі і іншыя тавары: гліняны посуд, шкляныя пацеркі, бронзавыя вырабы.

Апрацоўка жалеза, бронзаліцейная справа, выраб глінянага посуду, апрацоўка дрэва, каменю, косці, прадзенне і ткацтва былі найбольш важнымі заняткамі балтаў. У кожным балцкім паселішчы займаліся гэтымі рамёствамі.

Балты з вялікім густам і майстэрствам стваралі бронзавыя і сярэбраныя ўпрыгажэнні. Мясцовыя майстры творча перапрацоўвалі ўзоры ювелірных вырабаў, якія траплялі да іх ад суседзяў. У выніку ў мастацтве склаўся асаблівы «балтыйскі стыль».

Тысячы гадоў жылі балты на тэрыторыі Беларусі. У другой палове 1-га тысячагоддзя н. э. месца балтаў на беларускіх землях занялі славяне. Балты былі або выціснуты, або ўключаны ў новае грамадства. Але культура і дасягненні балтаў не зніклі бясследна. Славяне запазычылі ў іх каштоўны вопыт жыцця ў лясным краі, узоры ўпрыгажэнняў, захавалі балцкія назвы рэк і азёр.

**4. Суседская абшчына і развіццё грамадства.** У ходзе перасялення народаў асобныя роды перамешваліся. У выніку радавая абшчына змянілася суседскай. У *суседскую абшчыну* акрамя родзічаў уваходзіла значная колькасць суседзяў. Аб'ядноўвала іх сумесная праца і валоданне агульнай маёмасцю: зямлёй, выпасамі,ляснымі ўгоддзямі.

У жалезным веку дзякуючы развіццю гаспадаркі ў абшчынах сталі заставацца лішкі прадуктаў. Гэта стварыла ўмовы для з'яўлення *знаці* (знатных людзей). Да яе спачатку належалі людзі, якія вылуча-

Разбагацець можна было, старанна працуючы на зямлі. Яшчэ большае багацце прыносіў гандаль. Значна прасцей, але больш рызыкоўна было ўдзельнічаць у рабаўніцкім набегу. Багаты чалавек мог ладзіць піры для супляменнікаў, утрымоўваць рабоў і нават мець уласныя воінскія атрады. У той час лічылася, што калі чалавек багаты, значыць, да яго ставяцца з прыхільнасцю багі.

*Паразважайце, як у перыяд жалезнага веку можна было выкарыстаць назапашанае багацце.*



Правообладатель Издательский центр БГУ




? *Растлумачце лагічны ланцужок. Кім маглі быць людзі, якія не ўдзельнічалі ў вытворчасці?*

ліся сваімі якасцямі, карыснымі для ўсяго грамадства. Яны былі найбольш паважанымі людзьмі сярод супляменнікаў і мелі на іх вялікі ўплыў. Знатнымі маглі стаць мудрыя старцы ці багатыя людзі.

Такім чынам, доўгі час на тэрыторыі Беларусі жылі плямёны балтаў. Яны стварылі сваю непаўторную культуру, якую часткова запазычылі славяне. У той жа час адбывалася развіццё грамадства, што выявілася ва ўзнікненні суседскай абшчыны.

**Пытанні і заданні**

**1.** Калі на тэрыторыю Беларусі патрапілі індаеўрапейцы?
**2.** На якія групы і плямёны падзяліліся балты? Знайдзіце іх тэрыторыі на картасхеме на с. 33.
**3.** Якія паселішчы будавалі балты? Апішыце іх жытлы.
**4.** Прывядзіце доказы таго, што рамяство і гандаль балтаў дасягнулі высокага ўзроўню.
**5.** Запоўніце ў сшытку табліцу. Зрабіце выснову.

| **Гандаль балтаў** | |
|---|---|
| **Тавары, якія ўвозіліся** | **Тавары, якія вывозіліся** |
| | |

Правообладатель Издательский центр БГУ

**6.** З-за чаго радавая абшчына змянілася суседскай? Якія яшчэ змены адбыліся ў развіцці грамадства?
**7.** Як вы думаеце, што канкрэтна з досведу жыцця балтаў у лясным краі маглі запазычыць славяне, якія прыйшлі пазней?

## § 5. Рассяленне славян

**Успомніце.** *1. На якія тры групы падзяліліся славяне ў Раннім сярэднявеччы? 2. Якую тэрыторыю засялілі славяне ў Раннім сярэднявеччы?*

**Вы даведаецеся.** У першых стагоддзях Сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі адбыліся значныя змены. На беларускіх землях рассяліліся нашы непасрэдныя продкі славяне. Якія адносіны ў іх склаліся з мясцовым балцкім насельніцтвам? Як яны ўладкавалі сваё жыццё?

**1. Адкуль з'явіліся славяне.** Продкі славян калісьці складалі адно цэлае з продкамі германцаў і балтаў. Славяне доўга жылі на сваёй прарадзіме, удалечыні ад міжземнаморскіх цэнтраў цывілізацыі.

*Прарадзіма* — гэта тэрыторыя, якую першапачаткова насяляў той ці іншы народ. Дзе знаходзілася прарадзіма славян, дакладна невядома. Яна была недзе ў Цэнтральнай або Усходняй Еўропе. Немагчыма таксама дакладна сказаць, калі славяне вылучыліся ў асобны народ. Некаторыя вучоныя мяркуюць, што гэта адбылося ў *сярэдзіне 1-га тысячагоддзя да н. э.* Беларускія археолагі знайшлі сведчанні прысутнасці славян на тэрыторыі Палесся з ***канца IV ст.*** Але толькі ў VI ст. славяне сталі вядомыя пад сваім уласным імем.

> ? *Паразважайце, ці мог існаваць народ без свайго імя.*

Славянамі называлі сябе людзі, якія «валодалі словам», гэта значыць, разумелі адно аднаго. Суседнія народы маглі называць славян іншымі імёнамі. Магчыма, найбольш ранняя назва славян — венеды. А ў VI ст. былі вядомы дзве групы славян — склавіны і анты.

с. 6



Правообладатель Издательский центр БГУ




Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі

**?** *Уважліва разгледзьце картасхему і адкажыце, якія тэрыторыі Беларусі былі заселены славянамі пазней за іншыя.*

**2. Якімі шляхамі рассяляліся славяне на тэрыторыі Беларусі.** З тэрыторыі сваёй прарадзімы славяне шырока рассяляліся ў Еўропе. Натуральнымі дарогамі для іх з'яўляліся рэкі. У ***VI ст.*** яны з'явіліся ў Сярэднім Падняпроўі і тады ж пачалі свой рух на беларускія землі. Але, як ужо згадвалася, прысутнасць славян на поўдні Беларусі адзначалася яшчэ з канца IV ст.

Засяленне славянамі беларускіх зямель не было простым і хуткім. Адзін са шляхоў вёў з поўдня. Славяне прасоўваліся ўздоўж Дняпра, Прыпяці і іх прытокаў.

**?** *Як вы думаеце, чаму перасяленцы павінны былі рухацца па рэках?*

У паўночную і цэнтральную частку Беларусі славяне прыйшлі з поўначы Усходняй Еўропы. Туды ж славяне трапілі, магчыма, з тэрыторыі вакол ракі Віслы.

с. 8



Правообладатель Издательский центр БГУ




| | |
|---|---|
| РАДЗІМІЧЫ | Саюзы плямёнаў усходніх славян |
| яцвягі | Балцкія плямёны |

Усходнеславянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі

*Ці была нязменнай тэрыторыя рассялення асобных саюзаў плямёнаў?*

*Які саюз плямёнаў заняў найбольшую частку тэрыторыі Беларусі?*

На новых месцах славяне выбіралі для пасялення сухія месцы на ўзвышшах. Тут яны сутыкнуліся з мясцовымі плямёнамі балтаў. Стасункі славян з балтамі на тэрыторыі Беларусі спачатку былі пераважна мірныя. Балцкія плямёны былі невялікімі, і славян прыходзіла зусім няшмат. Таму месца хапала ўсім. Славяне растварыліся сярод мясцовага насельніцтва.

З канца VII — пачатку VIII ст. на тэрыторыю Беларусі пранікла новая хваля славянскіх перасяленцаў. Сутыкненні славян з балтамі ў гэты час сталі больш частымі.

Засяленне беларускіх зямель славянамі працягвалася не адно стагоддзе. Ранейшыя жыхары вымушаны былі пакінуць абжытыя месцы. Тыя, хто застаўся, паступова зліваліся са славянамі. Гэтаму


Правообладатель Издательский центр БГУ



Славянскае гарадзішча VII–IX стст.

*Як вы думаеце, навошта славяне так добра ўмацоўвалі свае гарадзішчы?*

спрыяла тое, што славяне, як і балты, з’яўляліся язычнікамі. У іх быў падобны лад жыцця. Ствараліся змяшаныя славяна-балцкія сем’і, балты пераймалі звычаі славян. У выніку адбылася славянізацыя балтаў.

На поўдні Беларусі лепш за ўсё даследаваны славянскія паселішчы ў горадзе Петрыкаве на рацэ Прыпяць і каля вёскі Хотамель на рацэ Гарынь. На ўскраіне горада Петрыкава беларускія археолагі выявілі славянскае селішча VI–VII стст. *(Чым гарадзішча адрозніваецца ад селішча?)* Яго жыхары выплаўлялі жалеза з балотнай руды і ляпілі посуд з гліны. Каля вёскі Хотамель знойдзены гарадзішча, селішча і могільнік, у якім хавалі памерлых. У добра ўмацаваным валамі і ровам гарадзішчы людзі ратаваліся ў выпадку небяспекі.

*Растлумачце паняцце «гарадзішча-сховішча», якое выкарыстоўваюць гісторыкі.*

**3. Славянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі.** Узаемадзеянне з балтамі надало своеасаблівасць славянскім саюзам плямёнаў на тэрыторыі Беларусі. Яны склаліся ў *VIII–IX стст.* і захоўвалі адметныя рысы і пазней. Гэтыя асаблівасці заключаліся ў некаторых адрозненнях у мове, міфалогіі, побыце.

*З гістарычных картаў ці энцыклапедыі даведайцеся, калі прыйшлі на тэрыторыю вашага краю славяне. Які ўсходнеславянскі саюз плямёнаў (ці племя балтаў) размяшчаўся на тэрыторыі вашага краю?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

с. 5



Скроневае кальцо крывічанак



Крывічанка. Рэканструкцыя

*Што дазваляе сцвярджаць, што гэта менавіта крывічанка?*

На беларускіх землях у Раннім сярэднявеччы размясціліся тры славянскія саюзы плямёнаў: палачане, дрыгавічы і радзімічы. На крайнім паўднёвым захадзе сучаснай Беларусі жылі таксама і валыняне.

Палачане з’яўляліся часткай буйнога славянскага саюзу плямёнаў крывічоў. Іх назва, магчыма, паходзіць ад імя старэйшыны Крыва або ад слова «крэўныя», гэта значыць сваякі па крыві. Крывічы засялілі велізарную тэрыторыю, што абумовіла іх падзел на асобныя групы: пскоўскую, полацкую і смаленскую.

Полацкія крывічы, альбо палачане, засялілі ўсю паўночную частку сучаснай Беларусі. Галоўным іх горадам быў Полацк. Сваю назву ён атрымаў ад ракі Палаты́, каля вусця якой і быў заснаваны. Ад назвы горада або ракі сталі звацца і крывічы-палачане.

Увесь поўдзень Беларусі заняў іншы ўсходнеславянскі саюз плямёнаў — дрыгавічы. Спачатку яны пасяліліся ў сярэднім цячэнні Прыпяці, у балоцістай мясцовасці. Адгэтуль і іх назва (ад слова «дрыгва» — балота). Найстарэйшым горадам дрыгавічоў быў Тураў.

Усходнія землі Беларусі ў Раннім сярэднявеччы засялялі радзімічы. У асноўным

Адной з найбольш важных асаблівасцей крывічоў было пахаванне імі памерлых у доўгіх курганах. У народзе іх звалі «валатоўкамі». Існавала паданне, што ў іх быццам бы былі пахаваны волаты — асілкі высокага росту. На самай справе пад курганамі-насыпамі магло быць пахавана адзін за другім да 20 чалавек. Верагодна, у адным доўгім кургане хавалі блізкіх сваякоў. У тыя язычніцкія часы ўсходнія славяне спальвалі сваіх памерлых.

*З якім уяўленнем быў звязаны гэты звычай?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

яны жылі вакол ракі Сож. У «Аповесці мінулых гадоў» захавалася цікавае апавяданне аб паходжанні радзімічаў і вяцічаў. Нібыта некалі з Польшчы ва Усходнюю Еўропу прыйшлі браты Радзім і Вятка. Яны засталіся на новых землях і сталі родапачынальнікамі двух плямёнаў — радзімічаў і вяцічаў. Пазней на землях радзімічаў паўстануць гарады Гомель, Чачэрск, Крычаў.



Радзімічанка. Рэканструкцыя

У кожнага саюзу плямёнаў былі свае жаночыя ўпрыгажэнні. Найбольш характэрнымі ўпрыгажэннямі славянак былі кольцы, якія мацаваліся каля скроняў. Так, палачанкі насілі бранзалетападобныя скроневыя кольцы. Дрыгавічанкі аздаблялі свае скроні драцянымі кольцамі, на якія мацаваліся невялікія металічныя пацеркі з зерню — напаянымі на паверхню дробнымі срэбнымі шарыкамі. Найбольш прыгожыя — сяміпрамянёвыя — былі скроневыя кольцы ў радзімічанак.



Сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы радзімічанак

Да IX ст. усходнеславянскія плямёны прайшлі значны шлях у сваім развіцці. У некаторых з іх ужо з'явіліся свае княжанні.

Такім чынам, у Раннім сярэднявеччы славяне засялілі большую частку тэрыторыі Беларусі. Мясцовае насельніцтва злілося са славянамі. Далейшае развіццё славян прывяло да стварэння на беларускіх землях трох саюзаў плямёнаў: палачан, дрыгавічоў і радзімічаў.

**Пытанні і заданні**

**1.** Раскажыце, што вы даведаліся аб паходжанні славян.
**2.** Ад чаго паходзіць назва «славяне»?
**3.** Якімі шляхамі засялялі славяне сучасную тэрыторыю Беларусі?


Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Якія адносіны склаліся ва ўсходніх славян з балцкімі плямёнамі?
**5.** Якія ўсходнеславянскія саюзы плямёнаў сфарміраваліся на тэрыторыі Беларусі? Чым яны адрозніваліся паміж сабою?
**6.** Запоўніце ў сшытку табліцу.

| Прыкметы для параўнання | Палачане | Дрыгавічы | Радзімічы |
|---|---|---|---|
| Паходжанне назвы | | | |
| Тэрыторыя рассялення | | | |
| Галоўныя гарады | | | |
| Асаблівасці | | | |

**7.** Як вы думаеце, чаму на тэрыторыі Беларусі адбылася славянізацыя балтаў, а не наадварот?

## § 6. На шляху да дзяржавы

**Успомніце.** *1. Што такое дзяржава? 2. Якія прычыны прыводзілі да ўзнікнення дзяржавы? 3. Якая гаспадарка называецца натуральнай?*

**Вы даведаецеся.** Падчас свайго рассялення на новыя землі славяне мелі згуртаванае грамадства. У іх былі свае правадыры і вайсковая сіла. Што ж уяўляла сабой грамадства славян? Чаму яны аказаліся больш моцнымі за іншыя народы? Якія змены ў грамадстве і гаспадарцы падрыхтоўвалі стварэнне дзяржавы?

**1. Князі і вайсковая сіла.** Славянам, якія перасяляліся на новыя землі, даводзілася часта ваяваць. Войны былі больш паспяховымі, калі на чале войска аказваўся таленавіты кіраўнік. Такога племяннога правадыра славяне звалі ***князем***. Яго выбіралі з ліку знатных людзей.

Калі вайна была ўдалай, славяне захоплівалі ваенную здабычу. Права размяркоўваць яе належала князю. Сабе ён мог пакінуць



Правообладатель Издательский центр БГУ

большую частку. Але і раздаючы рэшту, князь славіўся як шчодры дабрачынца.

Князь арганізоўваў абарону сваіх супляменнікаў ад нападаў ворагаў. З цягам часу да яго сталі звяртацца з просьбай здзейсніць справядлівы суд. За выкананне гэтых важных для ўсяго грамадства абавязкаў земляробы падносілі князю дары. Гэтыя добраахвотныя прынашэнні з часам ператвараліся ў даніну. *Даніна* — гэта натуральны падатак (футра, мёд, прадукты харчавання і г. д.), які насельніцтва абавязана было штогод выплачваць на карысць вярхоўнай улады — князя.

> ? *На думку гісторыкаў, найважнейшым шляхам узнікнення даніны было заваяванне. Падумайце, як гэта адбывалася.*

У асяроддзі князя пакупова склалася група яго сталых баявых паплечнікаў і дарадчыкаў — ***дружына***. Гэтыя людзі жылі каля князя, дапамагалі яму ва ўсіх яго справах. Князь забяспечваў іх усім неабходным, даваў коней і зброю. Дружына дазваляла князю яшчэ больш умацаваць сваю ўладу сярод насельніцтва. Узнікненне дружыны з'яўляецца важным крокам на шляху да дзяржавы.

У час славянскага перасялення часта адбываліся ваенныя сутыкненні. Здаралася, што варагавалі паміж сабой асобныя славянскія плямёны. Таму ўсе мужчыны ў выпадку неабходнасці павінны былі браць у рукі зброю. Яны складалі ваеннае апалчэнне. І земляроб, і рамеснік падчас вайны ператвараліся ў ваяроў. Ваеннае апалчэнне славяне маглі стварыць і для захопу новай тэрыторыі, і для



Дружына ў паходзе. Мініяцюра з летапісу

? *Якое ўзбраенне дружыннікаў паказана на малюнку?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Адно племя магло выставіць няшмат ваяроў. Ад моцных ворагаў не магла абараніць і княжацкая дружына. Таму ўзнікала неабходнасць у аб'яднанні плямёнаў у саюзы. Але, здаралася, і яны аказваліся слабымі. Напрыклад, з летапісу вядома, што на крывічоў нападалі *варагі*. Так усходнія славяне называлі скандынаваў-вікінгаў. Патрабавалася больш моцная арганізацыя, каб супрацьстаяць ворагам. У выніку знешняя ваенная небяспека стала адной з прычын стварэння дзяржавы.

*Што вы ведаеце пра вікінгаў? Адкуль яны ажыццяўлялі свае паходы? Як яны перасякалі вялікія адлегласці?*

рабаўніцкага набегу. Але ваеннае апалчэнне не было такім жа моцным на полі бою, як княжацкая дружына.

**2. Што такое веча.** Спачатку князь у славян быў толькі вайсковым кіраўніком. Яму падпарадкоўваліся падчас вайны. Усе важныя справы ў славянскім племені вырашаліся на народным сходзе — ***вечы***.

У вечы мог удзельнічаць кожны свабодны мужчына. Аднак асаблівай пашанай на гэтых племянных сходах карысталіся старэйшыны. Першапачаткова старэйшынамі былі пажылыя людзі, старыя. Яны мелі вялікі жыццёвы досвед. Але з цягам часу старэйшынамі ўсё часцей рабіліся знатныя людзі.

Славянскія плямёны жылі на вялікай тэрыторыі. Агульнае веча збіраць было цяжка. Людзі не маглі адрывацца ад сваёй працы



Княжы суд. Мастак *Андрэй Рабушкін*

*Як вы думаеце, без чыёй дапамогі князь не мог бы ўпэўнена адчуваць сябе на вечы?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Веча магло разглядаць любыя пытанні. Аднак часцей супляменнікі збіраліся толькі для вырашэння найбольш важных спраў. Да іх належалі пытанні вайны і міру. На вечы з ліку знатных людзей выбіраўся князь. Да веча чалавек мог звярнуцца ў пошуках абароны і справядлівага суду.

дзеля вырашэння малаважных пытанняў. Таму ўсе бягучыя справы разбіраў *савет старэйшын*.

З цягам часу пастаяннае кіраванне племенем перайшло да князя. У князя была рэальная сіла — дружына, з дапамогай якой ён мог прымусіць яму падпарадкоўвацца.




Арганізацыя кіравання ва ўсходніх славян

? *З дапамогай схемы растлумачце, хто кіраваў грамадствам і як утвараліся яго ўзброеныя сілы.*

**3. Племянныя княжанні — крок да дзяржавы.** Славянскія саюзы плямёнаў, у якіх існавала княжацкая ўлада, у летапісах завуцца княжаннямі. Гісторыкі такія аб'яднанні вызначаюць як *племянныя княжанні*. У іх яшчэ захоўваўся народны сход — веча. Але найбольш важныя рашэнні прымаліся князем і племяннай знаццю.

Вялікае значэнне для племянных княжанняў мелі войны. Дзякуючы войнам князі ўмацоўвалі ўладу ў сваім племені. Сваё высокае становішча яны перадавалі ў спадчыну. Князь мог падпарадкаваць і іншыя плямёны. Так узнікалі буйны́я аб'яднанні плямёнаў. Падобныя саюзы ўжо набліжаліся да дзяржавы.

Паводле летапісу, племянное княжанне было ў палачан і дрыгавічоў. Палачане ў канцы IX — першай палове X ст. падпарадкоўваліся Кіеву, аднак захоўвалі ўнутраную самастойнасць. У другой


Правообладатель Издательский центр БГУ

палове X ст. у іх быў свой князь. Яго звалі Рагвалод. Летапіс сцвярджае, што Рагвалод прыйшоў «з-за мора». Магчыма, ён быў скандынавам. У той жа час князем дрыгавічоў называецца Тур.

**4. Чым займаліся старажытныя славяне.** У гаспадарцы ўсходніх славян панавала земляробства. Менавіта яно давала славянам асноўныя прадукты. Таму славяне збожжа называлі «жытам» — ад слова «жыць».

? *Падумайце, ад чаго паходзіць рускае слова «рожь».*



**Жалезная матыка**
Неглыбока рыхліла глебу

**Рала**
Рыхліла глебу, праводзіла ў ёй баразёнкі

**Саха**
Рыхліла глебу і адвальвала пласт зямлі ўбок

Земляробчыя прылады працы

? *Падумайце, што значна аблягчала працу земляроба з ралам і сахой.*

Асноўнай формай земляробства ў славян у IV–IX стст. было ляда (падсека). Ужо ў Раннім сярэднявеччы з'явілася ворыўнае земляробства. Славяне засявалі толькі адну палову поля. Другая частка або трэць «адпачывала». На адным участку маглі сеяць ярыну, а на іншым — азімыя. Такая сістэма звалася *двухполлем* або *трохполлем*. Для ўзрыхлення глебы выкарыстоўвалі рала, якое цягнулі валы. У далейшым сталі выкарыстоўваць *саху*.


Правообладатель Издательский центр БГУ



Прасліцы

Важнае значэнне мела і жывёлагадоўля. Славяне на тэрыторыі Беларусі, як і ў іншых краях, гадавалі кароў, коз, авечак, свіней, а таксама коней. Вядомая была славянам і птушкагадоўля.

Займаліся славяне і разнастайнымі рамёствамі. Рамеснікі выраблялі прылады працы і зброю, посуд і ўпрыгажэнні. Славянскія жанчыны ўмелі прасці і ткаць. Аб гэтым сведчаць паўсюдныя знаходкі гліняных *прасліц*. З IX ст. усходнія славяне пры вырабе глінянага посуду выкарыстоўвалі ганчарны круг. Але яшчэ доўга просты посуд з гліны ляпілі рукамі, а затым абпальвалі ў печы.

Славяне заўсёды сяліліся каля вадаёмаў — рэк і азёр. Таму важнай складовай часткай іх гаспадаркі было рыбалоўства. У тыя далёкія часы лясы пакрывалі ўсю тэрыторыю Беларусі. У лясах людзі збіралі ягады і грыбы. Славяне, як да іх і балты, палявалі на зуброў, ласёў, аленяў, дзікоў, птушак, пушных звяроў. Пашырана было *бортніцтва* — збор мёду дзікіх пчол.

*Ці знойдзены ў вашым краі язычніцкія свяцілішчы? Зрабіце кароткае паведамленне аб іх.*

Паступова ўсходнія славяне ўцягваліся ў гандаль з суседзямі і больш аддаленымі краінамі. На продаж яны маглі прапанаваць футра, мёд і воск.

**5. У што верылі старажытныя славяне.** У пачатку сваёй гісторыі славяне былі язычнікамі. Яны верылі, што ўвесь навакольны свет — і лясы, і палі, і рэкі — населены духамі. Славяне пакланяліся агню, Сонцу, Месяцу, дрэвам, камяням, ручаям, азёрам і рэкам. Асабліва шанаваным на беларускіх землях быў дуб.

Язычнікі-славяне ўшаноўвалі мноства багоў. *Мнагабожжа* — вера ў шматлікіх багоў — гэта найбольш важная рыса ***язычніцтва***. Багі былі адказныя за розныя бакі жыцця чалавека і прыродныя з’явы.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Ідалы. Мастак *Мікалай Рэрых*

? *Якую асноўную рысу язычніцтва паказвае карціна?*

Кожнае племя мела спецыяльнае месца, дзе маліліся багам і прыносілі ім ахвяры. Гэтае месца называюць *свяцілішчам (капішчам)*. Звычайна ў цэнтры свяцілішча стаяў ідал, а вакол гарэлі вогнішчы. Агонь маглі падтрымліваць пастаянна. *Ідал* — гэта вобразная выява бога. Часцей за ўсё ідалаў рабілі з дрэва, каменю і металаў.

Такім чынам, у Раннім сярэднявеччы ўсходнія славяне наблізіліся да стварэння дзяржавы. Гэтаму спрыялі і ўнутранае развіццё, і знешнія абставіны. Усходнія славяне стварылі свой непаўторны свет, населены багамі і духамі. Вера ў іх дазваляла знайсці тлумачэнне ўсяму, што адбывалася ў жыцці чалавека і ў прыродзе.

**Пытанні і заданні**

1. Якім чынам умацоўвалася ўлада князя ва ўсходнеславянскім грамадстве?
2. З чаго складаліся вайсковыя сілы ўсходніх славян?
3. Якія пытанні вырашаліся на вечы?
4. Што ўяўлялі сабой племянныя княжанні?
5. Пералічыце асноўныя гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян. Што новага адбылося ў іх развіцці да канца IX ст.?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**6.** Што сведчыць пра тое, што ўсходнія славяне былі язычнікамі?
**7.** Як вы думаеце, чаму ва ўсходнеславянскіх плямёнаў умацавалася ўлада князёў, а не веча?

## Абагульненне

У першым раздзеле вы даведаліся аб найбольш старажытнай гісторыі нашых продкаў — ад з'яўлення першага чалавека да стварэння племянных княжанняў на тэрыторыі Беларусі. Гэта быў найбольш працяглы перыяд у гісторыі. Падчас яго змены адбываліся вельмі павольна.

Ад часу з'яўлення першых стаянак на тэрыторыі Беларусі да пачатку вырабу жалезных прылад працы прайшло больш за 23 тысячагоддзі. У гэты прамежак часу чалавек перайшоў ад прысвойвальнай да вытворчай гаспадаркі. Жывёлагадоўля і земляробства зрабілі жыццё чалавека больш устойлівым і спрыяльным. Гэтыя важныя змены прывялі да далейшых пераўтварэнняў. Змянілася само грамадства. Паступова радавую абшчыну змяніла суседская. Адбывалася расслаенне грамадства, з'явіліся бедныя і багатыя. Багатыя людзі станавіліся больш уплывовымі.

Удасканальваліся прылады працы. На змену прымітыўным каменным скрабкам і разцам прыйшлі жалезныя сякеры і нажы. Гэтыя прылады працы і зброя дазволілі чалавеку дамагчыся яшчэ большых поспехаў у прыстасаванні да прыроды.

У старажытны перыяд людзі верылі ў існаванне мноства духаў і бостваў. З дапамогай гэтых вераванняў яны спрабавалі растлумачыць паходжанне свету і з'яў прыроды. Чалавека стала цікавіць прыгажосць навакольнага свету. І ўжо ў каменным веку зарадзілася мастацтва. Людзі пачалі ствараць прыгожыя рэчы і аздабляць тыя прадметы, якімі карысталіся.

З канца каменнага веку на тэрыторыі Беларусі пачалі рассяляцца індаеўрапейцы. Да іх адносіліся плямёны балтаў, якія ў бронзавым і раннім жалезным вяках займалі беларускія землі. У Раннім сярэднявеччы беларускія землі засялілі славяне. Іх гаспадарка

Правообладатель Издательский центр БГУ

і грамадства знаходзіліся на больш высокім узроўні развіцця. У выніку балты былі выцеснены альбо змяшаліся са славянамі. Культура і дасягненні балтаў не зніклі бясследна. Славяне запазычылі ў іх каштоўны досвед жыцця ў лясным краі, узоры ўпрыгажэнняў, захавалі балцкія назвы рэк.

На тэрыторыі Беларусі ў VIII–IX стст. пражывалі ўсходнеславянскія саюзы плямёнаў: палачане, радзімічы і дрыгавічы. У іх было шмат агульнага ў гаспадарцы і культуры. Адрозненні былі нязначнымі — напрыклад, у жаночых упрыгажэннях.

Усходнеславянскае грамадства хутка развівалася. Гэта стала магчымым дзякуючы павышэнню прадукцыйнасці працы славян-земляробаў. Багатыя людзі (знаць) карысталіся ўсё большым уплывам сярод сваіх суплямённікаў. З іх асяроддзя выбіраўся князь. Вакол князёў згуртоўваліся групы іх баявых паплечнікаў і дарадцаў — дружыны. У той жа час захоўваліся народныя сходы (веча) і апалчэнні ўсіх дарослых мужчын. Так паступова ўсходнія славяне набліжаліся да стварэння дзяржавы.

**Заданне 1.** Абапіраючыся на прыведзеныя даты, складзіце кароткі расказ аб гісторыі беларускіх зямель са старажытнасці да пачатку нашай эры.

24-е тысячагоддзе да н. э.
22–21-е тысячагоддзі да н. э.
14 тысяч гадоў назад
3-е тысячагоддзе да н. э.
Сярэдзіна 3-га тысячагоддзя да н. э.
Пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э.
Каля 700 г. да н. э.
VI ст.

**Заданне 2.** Пакажыце на насценнай карце або картасхемах вучэбнага дапаможніка:

1) асноўныя напрамкі засялення тэрыторыі Беларусі людзьмі ў каменным веку;


Правообладатель Издательский центр БГУ

2) месцы першых стаянак чалавека каменнага веку (Юравічы, Бердыж);
3) месцазнаходжанне Красносельскіх шахтаў па здабычы крэменю;
4) тэрыторыю рассялення балтаў у бронзавым і жалезным вяках;
5) шляхі рассялення славян на тэрыторыі Беларусі;
6) тэрыторыю рассялення ўсходнеславянскіх саюзаў плямёнаў палачан, радзімічаў і дрыгавічоў.

**Заданне 3.** Перанясіце табліцу ў сшытак і запоўніце яе.

**Асаблівасці перыядаў каменнага веку**

| Перыяд | Час | Прылады працы | Спосабы здабычы харчавання | Найбольш важныя падзеі, з'явы |
|---|---|---|---|---|
| Старажытны каменны век | | | | |
| Сярэдні каменны век | | | | |
| Новы каменны век | | | | |

**Заданне 4.** Растлумачце лагічныя ланцужкі:
- з'яўленне земляробства і жывёлагадоўлі → расслаенне грамадства;
- выкарыстанне жалезных прылад працы → з'яўленне лішкаў прадуктаў;
- развіццё вытворчай гаспадаркі → з'яўленне знаці (знатных людзей).

**Заданне 5.** Параўнайце наступныя з'явы:
- прысвойвальную і вытворчую гаспадаркі;
- радавую і суседскую абшчыны;

Правообладатель Издательский центр БГУ

- матычнае і ворыўнае земляробства;
- дружыну і ваеннае апалчэнне.

**Заданне 6.** Вызначце прычыны:
- узнікнення маёмаснай няроўнасці;
- будаўніцтва гарадзішчаў;
- замены каменных прылад працы жалезнымі;
- з’яўлення княжацкай улады.

**Заданне 7.** Складзіце расказ па адной з наступных тэм (на выбар): «Паляванне на маманта»; «Выраб глінянага посуду»; «Будаўніцтва гарадзішча»; «Жыццё ў славянскім паселішчы»; «Праца земляроба»; «Узнікненне гарадзішчаў».

**Заданне 8.** Прывядзіце 2–3 доказы таго, што:
- гісторыя Беларусі з’яўляецца складовай часткай сусветнай гісторыі;
- у VI–IX стст. удасканальваліся сельскагаспадарчыя прылады працы і адбывалася развіццё земляробства ва ўсходніх славян;
- усходнія славяне ў IX ст. наблізіліся да стварэння дзяржавы.

Для замацавання сваіх ведаў рэкамендуем наведаць з настаўнікам ці бацькамі:

- Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь;
- Парк-музей валуноў у Мінску;
- Дзіцячы музей міфалогіі і лесу ў г. Заслаўе Мінскага раёна;
- капішча (валуны) у в. Бікульнічы Полацкага раёна.


Правообладатель Издательский центр БГУ



РАЗДЗЕЛ II

# ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў IX — СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

## § 7. Дзяржава ва ўсходніх славян

**Успомніце.** *1. Якія аб'яднанні папярэднічалі стварэнню дзяржавы ва ўсходніх славян? 2. Як сярод насельніцтва з'явіліся багатыя і знатныя людзі?*

**Вы даведаецеся.** У канцы IX ст. ва Усходняй Еўропе ўзнікла значная па тэрыторыі дзяржава ўсходніх славян — Старажытная Русь. У яе складзе апынулася і большасць беларускіх зямель. Неўзабаве на іх узніклі асобныя дзяржавы. Навошта была патрэбная дзяржава? Што мы ведаем пра яе ўзнікненне ва ўсходніх славян?

**1. Як узнікла дзяржава ва ўсходніх славян.** У VIII–IX стст. у жыцці ўсходніх славян адбываліся важныя змены. Яны былі звязаны з вылучэннем правадыроў і знаці, узнікненнем маёмаснай няроўнасці — з'яўленнем бедных і багатых. Гэта прыводзіла да пачашчэння канфліктаў паміж людзьмі. Да таго ж узмацнілася знешняя небяспека з боку суседніх ваяўнічых народаў. Усё гэта патрабавала стварэння моцнай улады.

У вырашэнні важных пытанняў усходнія славяне заўсёды прыслухоўваліся да найбольш дасведчаных людзей — старэйшын. З цягам часу сваё больш высокае становішча старэйшыны сталі перадаваць у спадчыну. Так утварылася знаць. Знатныя людзі самі не ўдзельнічалі ў вытворчасці прадуктаў, але збіралі ў сваіх руках значнае багацце. Адбывалася гэта таму, што знаць атрымлівала большую частку ваеннай здабычы, у тым ліку рабоў. Тыя працавалі


Правообладатель Издательский центр БГУ

> *Прапануйце яшчэ свае здагадкі, якім чынам у тагачасным грамадстве маглі вылучацца знатныя людзі.*

на сваіх гаспадароў, выраблялі для іх усё неабходнае. У неўраджайныя гады знатныя людзі маглі даваць пазыку сваім супляменнікам, таму тыя аказваліся ў залежным стане.

Узрастанне ролі ваеннай справы, неабходнасць прыняцця хуткіх рашэнняў (што не маглі зрабіць ні савет старэйшын, ні тым больш веча) узмацнялі ўладу князя. Вакол яго стала фарміравацца дружына. З ёю князь хадзіў у паходы. Яна ж дазваляла падпарадкоўваць насельніцтва.

Плямёны, на чале якіх аказваліся моцныя князі, ператварыліся ў племянныя княжанні. Сваю ўладу ў іх князі перадавалі ў спадчыну, хаця кіраўніцтва ажыццяўлялі разам з вечам і знаццю. З цягам часу ўзнікалі і больш шырокія аб'яднанні з некалькіх плямёнаў, сярод якіх маглі быць і неславянскія. Калі верыць летапісу, цэнтрамі такіх аб'яднанняў былі Ноўгарад і Кіеў. У канцы IX ст. яны былі аб'яднаны пад уладай аднаго правіцеля. Так паўстала *Старажытнаруская дзяржава* ўсходніх славян. Вучоныя называюць яе таксама *«Старажытная Русь»*, ці *«Кіеўская Русь»*.

знікненне княжацкай улады → Фарміраванне вакол князя дружыны → знікненне племянных княжанняў

Паслядоўнасць развіцця дзяржаўнасці

*Растлумачце, чым была выклікана неабходнасць кожнага з этапаў станаўлення дзяржаўнасці.*

**2. Першыя дзяржавы на беларускіх землях.** Гістарычныя крыніцы паведамляюць аб існаванні племянных княжанняў у палачан і дрыгавічоў у IX–X стст. Менавіта яны сталі зародкамі дзяржаў на нашых землях.

> *Знайдзіце тэрыторыі згаданых «плямёнаў» на карце.*


Правообладатель Издательский центр БГУ

Беларускія землі ўваходзілі ў склад Старажытнарускай дзяржавы. «Аповесць мінулых гадоў» сведчыць, што яшчэ да стварэння дзяржавы наўгародскі князь *Рурык* пасадзіў сваіх людзей у Полацку. Яго пераемнік князь *Алег* — стваральнік Старажытнарускай дзяржавы — падпарадкаваў таксама радзімічаў. У сярэдзіне X ст. Кіеў распаўсюдзіў сваю ўладу і на дрыгавічоў.

с. 9–10

Кіеўскі князь Алег прымусіў радзімічаў плаціць яму даніну ў 885 г. Але і праз сто гадоў пасля радзімічы захоўвалі самастойнасць. Паводле летапісу, у 984 г. кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч адправіў у паход на радзімічаў свайго ваяводу па мянушцы Воўчы Хвост. Той перамог радзімічаў на рацэ Пішчане. З таго часу доўга захоўвалася прымаўка: «Радзімічы воўчага хваста бегаюць».

Аднак зямля палачан апераджала іншыя землі ўсходніх славян у сваім эканамічным і палітычным развіцці. Гэтаму спрыяла размяшчэнне Полацка на важным гандлёвым шляху па Заходняй Дзвіне. Гэта давала магчымасць выкарыстоўваць у сваіх інтарэсах наймітаў-*варагаў*, атрымліваць «мыта» (пошліну за правоз тавараў) і спаганяць даніну з суседніх плямёнаў. Дзякуючы гэтаму палачане хутка аднавілі сваю незалежнасць.



Уладзімір і Рагнеда. Мастак *Мікалай Дудчанка*

? *Знайдзіце на карціне ўказанні на прычыны канфлікту Уладзіміра з Рагнедай.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Магчыма, у ***960-я гг.*** уладу ў Полацку ўсталяваў князь ***Рагвалод***. Ён праводзіў незалежную ад Кіева палітыку. Але ўжо каля ***980 г.*** Рагвалод з двума сынамі быў забіты наўгародскім князем Уладзімірам, які неўзабаве стаў і кіеўскім князем. Пад яго ўладай былі сабраны ўсе ўсходнеславянскія саюзы плямёнаў.

Уладзімір прымусова зрабіў сваёй жонкай дачку Рагвалода ***Рагнеду***. Ад яе ў кіеўскага князя нарадзілася некалькі сыноў (сярод іх — будучы кіеўскі князь Яраслаў Мудры). Праз некалькі гадоў Уладзімір забыўся пра сваю полацкую жонку і пабраўся шлюбам з візантыйскай прынцэсай. Абражаная Рагнеда зрабіла спробу забіць мужа. Князь хацеў пакараць ганарлівую палачанку. За яе заступіўся адзін з іх сыноў — Ізяслаў. Уладзімір быў уражаны мужным учынкам сына і аддаў таму ўладу ў Полацку. Так у ***988 г.*** была адноўлена самастойнасць Полацкага княства.

Полацкае княства — гэта першая дзяржава на беларускіх землях. Полацкія князі змаглі абараніць сваіх падданых ад знешніх ворагаў і стварыць спрыяльныя ўмовы для жыцця краіны.

**3. Месца беларускіх зямель у складзе Старажытнарускай дзяржавы — агульнай дзяржавы ўсходніх славян.** Становішча беларускіх зямель у Старажытнарускай дзяржаве не было аднолькавым. Адны з іх былі цесна звязаны з Кіевам. Другія траплялі ў залежнасць ад кіеўскага князя часова.

Пра станаўленне Полацкага княства вы ўжо ведаеце. Іншым быў гістарычны лёс зямель дрыгавічоў. Тут узнікла Тураўскае княства. Яно доўгі час знаходзілася пад уладай кіеўскага князя. Некалькі разоў яго атрымлівалі князі з роду Рурыкавічаў, якія неўзабаве займалі галоўны прастол Старажытнай Русі — Кіеў.

> ? *З дапамогай картасхемы на с. 59 высвятліце месцазнаходжанне Полацка і Турава адносна Кіева.*

Землі радзімічаў непасрэдна падпарадкоўваліся Кіеву. Затым яны аказаліся ў складзе Чарнігаўскага і часткова Смаленскага княстваў. Берасцейшчына належала Валынскаму княству.

Такім чынам, сучасныя беларускія землі ў перыяд Старажытнай Русі з часам увайшлі ў склад некалькіх княстваў.



Правообладатель Издательский центр БГУ




Старажытная Русь у канцы IX – X ст.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вялікая па сваёй тэрыторыі Старажытнаруская дзяржава з цягам часу распалася на некалькі самастойных княстваў. Сярод іх былі Полацкае і Тураўскае. Княствы праводзілі самастойную палітыку. Іх уладары варагавалі паміж сабой. Тым не менш Старажытная Русь захоўвала адноснае адзінства. Нават у перыяд палітычнай раздробленасці землі ўсходніх славян за мяжою лічылі адзінай дзяржавай — Руссю.

Усе старажытнарускія княствы звязвала адзіная царкоўная арганізацыя. Яна склалася пасля прыняцця ў *988 г.* у Кіеўскай Русі хрысціянства. Кіраўнік царквы Русі — *мітрапаліт* — знаходзіўся ў Кіеве. Ва ўсіх княствах уладарылі прадстаўнікі княжацкага роду Рурыкавічаў. Іх агульным продкам быў Рурык. Яны з'яўляліся даволі блізкімі сваякамі і заўсёды памяталі пра гэта. Неаднойчы княствы ладзілі сумесныя замежныя паходы супраць ворагаў на захадзе і на поўдні Русі.

Аб адзінстве Русі сведчаць і шмат іншых фактаў: падобныя гаспадарчая дзейнасць і лад жыцця, цесныя гандлёвыя сувязі, агульныя паходжанне і гістарычны лёс.

Шмат чаго было агульнага і ў культуры ўсходнеславянскага насельніцтва. Гэта дазволіла вучоным сцвярджаць, што існавала ўсходнеславянская супольнасць (часам яе называюць «старажытнаруская народнасць»). Яна стала падмуркам для трох усходнеславянскіх народаў — беларускага, рускага і ўкраінскага. Насельніцтва Старажытнай Русі называла сябе «русамі», «рускімі». У яго былі агульныя традыцыі, святы, вераванні. Старажытнарускія пісьмовыя крыніцы — летапісы, жыціі, аповесці — сведчаць пра тое, што і літаратурная мова ва ўсходніх славян была агульнай.

Разам з тым пражыванне людзей на вялікіх абшарах абумовіла асаблівасці гутарковай мовы ў крывічоў, палян, дрыгавічоў, вяцічаў і інш. З цягам часу яны сталі пранікаць і ў пісьмовыя творы. На асобных тэрыторыях складваліся і свае дзяржавы. Так на падставе старажытных традыцый самастойнага палітычнага развіцця паўстала Полацкае княства, або, як адзначана ў летапісе, — зямля. Яна на роўных выступае ў адносінах з Кіеўскай зямлёй і іншымі землямі Старажытнай Русі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, беларускія землі ў Высокім сярэднявеччы з'яўляліся складовай часткай Старажытнай Русі. Між тым вельмі рана выявілася імкненне да самастойнасці Полацкага княства. Яно займала значную частку сучаснай тэрыторыі Беларусі.

**Пытанні і заданні**

1. Якім чынам адбывалася ўмацаванне ўлады князя і фарміравалася знаць?
2. Навошта было патрэбнае ўмацаванне вярхоўнай (княжацкай) улады, або стварэнне дзяржавы?
3. Калі і як беларускія землі ўвайшлі ў склад Старажытнарускай дзяржавы?
4. Як узнікла ўласная дзяржава на тэрыторыі Беларусі?
5. У якім дачыненні да Кіева знаходзіліся саюзы плямёнаў: палачан, радзімічаў, дрыгавічоў?
6. Назавіце факты, якія сведчаць аб адносным адзінстве Старажытнарускай дзяржавы.
7. Як вы думаеце, чаму Полацкае княства раней за іншыя землі Старажытнай Русі стала выяўляць імкненне да самастойнасці?

## § 8. Полацкае княства ў X–XI стст.

**Успомніце.** *1. Як звалі першага вядомага з крыніц полацкага князя? 2. Па якіх рэках і морах праходзіў гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі»?*

**Вы даведаецеся.** У X–XI стст. на тэрыторыі Беларусі ўзнікла і дасягнула свайго росквіту моцнае і незалежнае Полацкае княства. Гэта была першая дзяржава на беларускай зямлі. Хто ж стаяў на чале гэтай дзяржавы? Якімі дзеяннямі гэтыя магутныя і мудрыя князі ўзвышалі сваё княства?

**1. Старажытны Полацк.** Полацк у Высокім сярэднявеччы быў вядомы ў Заходняй і Паўночнай Еўропе як сталіца буйнога княства. У скандынаўскіх сагах ён ставіцца на адзін узровень з Кіевам і Ноўгарадам. Упершыню Полацк згадваецца ў летапісе пад ***862 г.*** Але славянскае паселішча на яго месцы існавала больш чым на сто гадоў раней.

Правообладатель Издательский центр БГУ




˜ эрыторыя ў IX—X стст.
˜ эрыторыя ў XI—XIII стст.
Сафійскі сабор
Мураваныя цэрквы
Курганы
Луг

План старажытнага Полацка

? *На падставе картасхемы дакажыце, што Полацк займаў выгаднае становішча.*

Горад быў заснаваны крывічамі пры ўпадзенні ракі Палатьі ў Заходнюю Дзвіну. Ад назвы невялікай ракі атрымаў сваё імя і горад. Месца было зручнае для жыцця і вядзення гаспадаркі, а таксама для абароны ад ворагаў.

Геаграфічнае палажэнне Полацка дазваляла яму падтрымліваць гандлёвыя сувязі і з еўрапейскімі краінамі, і з Візантыяй, і з краінамі Усходу. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца скарбы арабскіх і еўрапейскіх манет IX–XI стст., якія былі знойдзены на Полацкай зямлі.

Выгаднае геаграфічнае становішча спрыяла хуткаму росту Полацка. Ён стаў цэнтрам самага магутнага на тэрыторыі сучаснай Беларусі Полацкага княства.

**2. Пачатак полацкай княжацкай дынастыі.** Полацкае княства першым з усіх старажытнарускіх зямель атрымала сваю княжацкую дынастыю. Як вы ўжо ведаеце, з 988 г. прастол у Полацку займаў Ізяслаў Уладзіміравіч. Праз сваю маці — Рагнеду — ён быў нашчадкам Рагвалода, ранейшага незалежнага ўладара Полацка. Пасля сябе Ізяслаў пакінуў уладу сваім сынам, і ў далейшым у Полацку кіравалі «Рагвалодавы ўнукі».

Так з канца X ст. на галоўным прастоле Полацкай зямлі і пазней на прастолах асобных яе валасцей усталявалася ўлада дынастыі Рагвалодавічаў. Тагачасныя летапісцы добра разумелі, што ёсць Рагвалодавічы — нашчадкі Рагвалода і Ізяслава, і ёсць Яраславічы — нашчадкі Яраслава Мудрага. Гэта былі дзве часткі аднаго княжац-


Правообладатель Издательский центр БГУ




? *Растлумачце, чаму дынастыю полацкіх князёў называюць Ізяславічамі і Рагвалодавічамі.*

кага роду Рурыкавічаў. Кожная з іх замацавала сваю ўладу над асобнай зямлёй і на працягу двух стагоддзяў змагалася за ўладу над падуладнымі ім тэрыторыямі.

**3. Умацаванне Полацкага княства.** У ***1003 г.*** у Полацкай зямлі пачаў княжыць ***Брачыслаў Ізяславіч***. У той час ён быў яшчэ дзіцём.

с. 11

У сталым узросце Брачыслаў мусіў уступіць у барацьбу з Ноўгарадам. У 1021 г. ён напаў на Ноўгарад і разрабаваў яго. Аднак на зваротным шляху полацкага ўладара нагнаў кіеўскі князь Яраслаў Мудры. Брачыслаў атрымаў паражэнне, аднак у той час Яраславу Уладзіміравічу вельмі патрэбныя былі саюзнікі. Таму ён прымірыўся са сваім пляменнікам Брачыславам. Больш за тое, полацкі князь атрымаў два гарады — Віцебск і Усвяты. Побач з імі праходзілі вельмі важныя для Полацка волакі, якія злучалі дзве ракі — Дняпро і Заходнюю Дзвіну. *Волак* — гэта сухапутная частка воднага гандлёвага шляху, па якой даводзілася цягнуць караблі. На волаках зручна было спаганяць мыта з гандляроў.

? *Знайдзіце згаданыя гарады на карце. Звярніце ўвагу на асаблівасці іх геаграфічнага становішча.*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Волакам валакуць.
Мастак *Мікалай Рэрых*

? *Якія прыстасаванні выкарыстоўваюцца для аблягчэння руху ладзей па сушы?*

У выніку мяжа Полацкага княства значна адсунулася на ўсход. Пашырыў Брачыслаў тэрыторыю свайго княства і на поўнач, на землі балтаў. Каб замацаваць новыя ўладанні, на поўначы быў пабудаваны горад Брачыслаўль (Браслаў).

Аб войнах Брачыслава вядома няшмат. Пэўна, больш увагі падчас свайго ўладарання ён надаваў пашырэнню хрысціянства на ўласных землях і іх гаспадарчаму асваенню.

с. 11

**4. Пачатак уладарання Усяслава Брачыславіча.** Полацкае княства Брачыслаў перадаў свайму сыну ***Усяславу*** (гады ўладарання — ***1044–1101***). Усяслаў Брачыславіч увайшоў у гісторыю як найбольш таленавіты ўладар. Ён здолеў значна ўзмацніць і пашырыць сваё княства.

Дзякуючы энергічнай дзейнасці князя Усяслава межы Полацкай зямлі пашырыліся. На поўдні было падпарадкавана адно з дрыгавіцкіх плямёнаў. Тут на рацэ Свіслач быў пабудаваны горад Менск

«Аповесць мінулых гадоў» расказвае, што маці нарадзіла князя Усяслава ад чаравання. У той час людзі верылі, што ён мог абярнуцца воўкам і з'яўляцца то каля сцен Ноўгарада, то каля Кіева і нават каля далёкай Тмутаракані. Сучаснікі празвалі князя «валхвом» (вешчуном), у рускіх былінах ён застаўся вядомы як Волх Усяславіч. Пазней князя празвалі Чарадзеем.

*Няшмат імён князёў захавалася ў народнай памяці. Сярод іх — Усяслаў Полацкі. Аб чым гэта сведчыць?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

(сучасная назва — Мінск). З часоў уладарання Усяслава даніну Полацку выплачвалі некаторыя балцкія плямёны.

Аднак у насычаным жыцці князя Усяслава былі і паражэнні. У 1065 г. ён напаў на Пскоў, але не здолеў яго ўзяць. На наступны год полацкі князь захапіў Ноўгарад. Кіеўскі князь і яго браты — сыны Яраслава Мудрага — не маглі пакінуць гэта без пакарання. Яны пачалі вайну супраць Усяслава.

**5. Бітва на Нямізе.** У пачатку 1067 г. князі Яраславічы з вялікім войскам падышлі да паўднёвых межаў Полацкага княства. Тут яны захапілі і разбурылі Менск. Напад ворагаў аказаўся нечаканасцю для Усяслава. Са сваёй дружынай ён спяшаўся на дапамогу абаронцам Менска, але не паспеў.

Войскі праціўнікаў сустрэліся на рацэ Нямізе. ***3 сакавіка 1067 г.*** адбылася вырашальная бітва. Войска полацкага князя па сваёй колькасці значна саступала войску трох магутных князёў. У выніку Усяслаў быў разбіты. З вялікім трагізмам апісвае бітву на Нямізе аўтар паэмы «Слова пра паход Ігаравы»: «На Нямізе — снапы сцелюць з галоў, малоцяць цапамі булатнымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела».

Аднак, перамогшы ў бітве, князі Яраславічы яшчэ не выйгралі вайну. Збегшы пасля бітвы, Усяслаў быў здольны працягваць барацьбу. Тады князі Яраславічы запрасілі полацкага князя на перамовы. Яны абяцалі яму бяспеку, пакляўшыся цалаваннем крыжа. Полацкі князь пераправіўся праз Дняпро на ладдзі і прыйшоў



Бітва на Нямізе. Мініяцюра з летапісу

? *Як вы думаеце, з якога боку прадстаўлена дружына полацкага князя?*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

? *Якія падзеі з жыцця Усяслава адлюстроўвае мініяцюра?*

да Оршы. Тут Яраславічы, парушыўшы крыжацалаванне, схапілі Усяслава з двума яго сынамі. На некаторы час Усяслаў Полацкі аказаўся ў турме («порубе») у Кіеве.

У 1068 г. у Кіеве адбылося паўстанне. Гараджане абвясцілі кіеўскім князем Усяслава. Сем месяцаў займаў ён кіеўскі прастол, пасля чаго паспрабаваў вярнуць свае княства. За Полацк Усяславу давялося яшчэ тры гады весці ўпартую барацьбу. І яшчэ дзесяць гадоў пасля працягвалася вайна Полацка з суседзямі. Толькі ў канцы XI ст. усталяваўся мір.

**6. Найвышэйшы ўздым Полацкага княства.** У XI ст. Полацкае княства дасягнула найвышэйшага ўздыму. Гэтаму спрыяла тое, што амаль усё стагоддзе Полацкам кіравалі толькі два князі — Брачыслаў Ізяславіч і Усяслаў Брачыславіч. Пры гэтым яны на роўных змагаліся з кіеўскімі князямі.



Так выглядаў Сафійскі сабор у XI ст. Макет рэканструкцыі

Сведчаннем узрастання магутнасці Полацкага княства стала будаўніцтва ў ***50-я гг. XI ст.*** велічнага Сафійскага сабора. Гэта быў трэці — пасля Кіева і Ноўгарада Вялікага — *сабор* імя Святой Сафіі ў Старажытнай Русі.

У гэты ж час Полацк і іншыя гарады краю ўзбагаціліся дзякуючы развіццю рамяства і гандлю. Полацкая зямля дасягнула вяршыні сваёй магутнасці.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Гісторыя Полацкага княства канца X — XI ст. — яркая старонка ў гісторыі Беларусі. Славутыя полацкія князі — Брачыслаў Ізяславіч і Усяслаў Брачыславіч — шмат зрабілі для ўмацавання і пашырэння межаў сваёй дзяржавы.

**Пытанні і заданні**

1. Што дазволіла ўзвысіцца Полацку? Што сведчыць аб яго значнасці?
2. Як пачалася полацкая княжацкая дынастыя?
3. Раскажыце, што вы даведаліся пра дзейнасць князя Брачыслава.
4. Чым стаў вядомы Усяслаў Брачыславіч у першы перыяд свайго праўлення?
5. Раскажыце пра прычыны, ход і вынікі бітвы на Нямізе.
6. Зрабіце вывад аб гістарычным значэнні дзейнасці князя Усяслава.
7. Як вы думаеце, чым была выклікана варожасць паміж полацкімі і кіеўскімі князямі?

## § 9. Полацкая зямля ў XII — першай палове XIII ст.

**Успомніце.** *1. Якія старажытныя імперыі спынілі сваё існаванне ў выніку распаду? 2. У чым выяўлялася раздробленасць у заходнееўрапейскіх краінах?*

**Вы даведаецеся.** Перыяд раздробленасці пачаўся ў Полацкім княстве рана — у 1101 г. Што садзейнічала яго пачатку? Як раздрабленне паўплывала на знешнепалітычнае становішча Полацкай зямлі і яе ўнутранае развіццё?

**1. Пачатак раздробленасці Полацкай зямлі.** Буйны́я княствы Старажытнай Русі, такія як Кіеўскае, Чарнігаўскае, Смаленскае і Полацкае, называліся ў летапісах ***землямі***. У XII ст. яны сталі распадацца на больш дробныя княствы — ***воласці***.

с. 12

Магчыма, яшчэ да сваёй смерці Усяслаў Брачыславіч пачаў выдзяляць частку сваіх зямель сынам. А з ***1101 г.*** Полацкая зямля канчаткова раздрабілася на асобныя княствы — воласці. Так

Правообладатель Издательский центр БГУ

у гісторыі Полацкай зямлі раней за іншыя старажытнарускія княствы пачаўся перыяд палітычнай раздробленасці.

І раней са складу таго ці іншага княства галоўны князь вылучаў частку ўладанняў сваім сынам. Аднак адзінства дзяржавы-княства не парушалася. Калі ж князі асобных княстваў сталі зусім незалежныя адзін ад другога, тады і пачалася раздробленасць. Князь галоўнага горада княства-зямлі толькі лічыўся старэйшым. Цяпер яму падпарадкоўвалася адна частка былога княства. Астатнія часткі стварылі новыя княствы, у якіх узніклі свае кіруючыя дынастыі.

Малодшыя князі павінны былі аддаваць частку падаткаў з насельніцтва свайго княства старэйшаму князю. Аднак ім самім таксама патрабаваліся грошы. Неабходна было забяспечваць дружыну, умацоўваць свой горад, будаваць цэрквы. Таму выплаты галоўнаму гораду прыпыняліся.

*Уявіце сябе на месцы князя. Якія яшчэ спосабы здабыцця грошай вы б знайшлі?*

Што садзейнічала з'яўленню раздробленасці? Перш за ўсё гэта звычай размеркавання князямі сваіх уладанняў паміж сынамі. Апынуўшыся ў асобным горадзе з воласцю, яны намагаліся праводзіць усё больш незалежную палітыку. Трэба таксама ўлічваць натуральны характар гаспадаркі. Спрыяла палітычнаму раздрабленню і з'яўленне прыватнай уласнасці на зямлю. ***Баяры*** — былыя княжацкія дружыннікі — атрымлівалі ад князя зямлю ва ўласнасць. Гэтую ўласнасць яны не жадалі страчваць. Таму былі зацікаўлены ў тым, каб князі не пакідалі сваіх валасцей. Тады баярам таксама не трэба было пераязджаць на новыя месцы за сваім князем.

Звычайнай з'явай перыяду палітычнай раздробленасці сталі *міжусобныя войны*. Каб пашырыць свае ўладанні, князі ваявалі паміж сабой.

Распад буйны́х княстваў-земель на больш дробныя княствы-воласці быў галоўнай сутнасцю раздробленасці. Так у складзе Полацкай зямлі з'явіліся Полацкая, Менская, Віцебская, Друцкая і іншыя воласці. Першапачаткова іх было шэсць — па колькасці сыноў Усяслава Брачыславіча. З цягам часу вылучыліся новыя воласці.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Пры гэтым князі асобных валасцей па чарзе ўсаджваліся на галоўны прастол зямлі — Полацк.

Здаралася, што некаторыя княствы-воласці самі намагаліся стаць землямі са сваімі валасцямі. Такую спробу зрабіла Менскае княства.

**2. Часовы ўздым Менскага княства.** Менскае княства першым вылучылася са складу Полацкай зямлі. Усяслаў Брачыславіч аддаў гэтую воласць свайму сыну **Глебу** (гады кіравання — *1101–1119*). Глеб быў незадаволены залежнасцю ад Полацка. Ён разарваў з ім сувязі, а пазней нават ваяваў з полацкім князем Давыдам.



Пячатка менскага князя Глеба

с. 12

Між тым Глеб пашырыў межы сваіх уладанняў. Ён падпарадкаваў гарады Друцк, Оршу і Копысь.

> ? *Знайдзіце згаданыя гарады на карце. Ці захавала Менскае княства свае межы пасля ўладарання князя Глеба?*

Узмацненне менскага князя занепакоіла кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха. У 1116 г. Глеб разрабаваў Слуцк, які падпарадкоўваўся ў той час Кіеву. У адказ Уладзімір Манамах з вялікім войскам аблажыў Менск. Глеб вымушаны быў прасіць міру. Манамах зняў аблогу, а менскі князь абяцаў ва ўсім «паслушаці» кіеўскага



Брама Менска XII–XIII стст.
Рэканструкцыя *Юрыя Зайца*

Правообладатель Издательский центр БГУ




Паход супраць Полацка ў 1127 г.

*Ацаніце маштаб праведзенай вайсковай аперацыі. Як гэта характарызуе ўладу кіеўскага князя?*

князя. Аднак ужо на наступны год Глеб зноў пачаў вайну. І зноў Менск быў абложаны. Глеба ўзялі ў палон і адвезлі ў Кіеў. Тут менскі князь памёр у 1119 г. Ён быў пахаваны з належнай князю пашанай у Кіева-Пячэрскім манастыры.

*Чый лёс такім чынам паўтарыўся?*

Такім чынам, спроба ўзвышэння Менска не ажыццявілася.

**3. Адносіны паміж Полацкам і Кіевам.** Пасля аслаблення Менскага княства кіеўскі вялікі князь звярнуў увагу і на галоўны горад зямлі — Полацк. У той час амаль усе старажытнарускія княствы падпарадкоўваліся Кіеву з яго магутным князем Мсціславам Вялікім, старэйшым сынам Уладзіміра Манамаха.



Правообладатель Издательский центр БГУ




Генеалагічная схема «Полацкія князі ў XII ст.»

У *1127 г.* Мсціслаў арганізаваў вялікі паход у Полацкую зямлю. З некалькіх бакоў сюды накіраваліся сем князёў са сваімі дружынамі. Яны занялі Ізяслаў (Заслаўе) і Лагойск. Небяспека навісла над самім Полацкам. Палачане вырашылі прагнаць свайго князя Давыда Усяславіча, каб прадухіліць захоп і рабаванне горада. На княжанне быў пасаджаны князь Барыс Усяславіч. Гэта на некаторы час задаволіла кіеўскага князя.

Але нядоўга Полацк заставаўся ў спакоі. У *1129 г.* Мсціслаў захапіў у палон непакорлівых полацкіх князёў і выслаў іх у Візантыю. У гарадах Полацкай зямлі кіеўскі князь пасадзіў сваіх людзей. Аднак у 1132 г. Мсціслаў Вялікі памёр. Старажытная Русь канчаткова распалася на асобныя самастойныя княствы. Гэта дазволіла князям Ізяславічам вярнуць свае ўладанні.

**4. Веча ў Полацкай зямлі.** Народныя сходы — вечы — збіраліся яшчэ ў старажытных славянскіх плямёнах. Яны дзейнічалі нават тады, калі племя мела свайго князя. У Полацку веча паступова ўзмацнялася на працягу XII ст. Адначасова аслаблялася княжацкая ўлада. Так, менавіта веча ў 1127 г. выгнала полацкага князя Давыда. Падчас знаходжання полацкіх князёў у выгнанні ў Візантыі веча ўзяло на сябе кіраванне зямлёй.

У другой палове XII — пачатку XIII ст. полацкае веча магло здымаць і прызначаць князя, заключаць дагаворы з іншымі гарадамі і дзяржавамі. Вырашала веча і найбольш важныя судовыя справы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Аднак нельга пераацэньваць значэнне веча. У мірныя, спакойныя часы яно зусім не выяўляла сябе. Не чуваць было аб вечы і ў гады кіравання моцных князёў. Толькі ў час войнаў, змены княжацкай улады, абвастрэння канфліктаў у грамадстве, пры неабходнасці прыняцця важных рашэнняў насельніцтва праз веча выказвала свае патрабаванні.

Полацкія князі вярнуліся на радзіму да 1140 г. Аднак міжкняжацкія ўсобіцы спрыялі далейшаму ўмацаванню ролі веча. У 1151 г. палачане выгналі Рагвалода Барысавіча і запрасілі на прастол менскага князя Расціслава Глебавіча. Але ў 1159 г. палачане зноў аддалі перавагу Рагвалоду. Барацьба Рагвалода Барысавіча з менскімі Глебавічамі каштавала жыцця многім палачанам. Як вынік — у 1162 г. полацкія вароты аказаліся зачыненымі перад князем. Лёс княжацкага прастола гараджане вырашалі і пазней.

*Паразважайце, што станоўчага і што адмоўнага было ад улады веча.*

Праз аслабленне княжацкай улады дакладна невядома, хто княжыў у Полацку ў першай палове XIII ст. У выніку Полацкая зямля страціла свой уплыў на землях балтаў і згубіла свае тэрыторыі.



Выгляд Полацка ў XII–XIII стст. Рэканструкцыя *Віктара Сташчанюка*

? *Якія пабудовы стваралі непаўторнае аблічча сярэднявечнага горада?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, у выніку раздробленасці Полацкая зямля страціла сваю былую магутнасць. Асобныя княствы-воласці Полацкай зямлі не былі здольныя супрацьстаяць больш моцным суседзям. Саслабела і княжацкая ўлада. Значную ролю ў кіраўніцтве стала адыгрываць веча.

**Пытанні і заданні**

1. Калі і чаму пачалася палітычная раздробленасць Полацкай зямлі?
2. Што такое землі і воласці? На якія княствы-воласці раздрабілася Полацкая зямля?
3. Якую палітыку праводзіў Глеб Менскі? Якім быў вынік такой палітыкі?
4. Якія адносіны склаліся паміж Полацкам і Кіевам у 20-я гг. XII ст.?
5. З якой прычыны ўзмацнілася веча ў Полацку? Якімі справамі яно займалася?
6. Аб якім праве веча сведчаць наступныя летапісныя звесткі: «Не едзь, княжа, веча [сабралася] супраць цябе ў горадзе [Полацку], і дружыну тваю забіваюць, а цябе [самога] хочуць схапіць»?
7. Як вы думаеце, па якіх прычынах Полацкае княства ў XII ст. не здолела захаваць ранейшай магутнасці?

## § 10. Тураўскае княства

**Успомніце.** *1. Які ўсходнеславянскі саюз плямёнаў рассяліўся на поўдні Беларусі ў Раннім сярэднявеччы? 2. Што ўяўлялі сабой усходнеславянскія племянныя княжанні?*

**Вы даведаецеся.** Полацкае княства было не адзіным дзяржаўным утварэннем на тэрыторыі Беларусі ў Высокім сярэднявеччы. Другі значны цэнтр дзяржаўнасці ўзнік на поўдні. Што гэта быў за цэнтр? Якія асаблівасці выявіліся ў яго развіцці?

**1. Старажытны Тураў.** Жыццё паўднёвай часткі сучасных беларускіх зямель у Сярэднявеччы ішло асобна ад поўначы. На поўдні галоўным горадам быў Тураў. Зараз гэта невялікі гарадок, што

Правообладатель Издательский центр БГУ



Старажытны Тураў. Рэканструкцыя

*Якія штучныя і натуральныя ўмацаванні абаранялі горад Тураў?*

стаіць на шырокай Прыпяці. А ў свой час ён быў цэнтрам асобнага княства. Яго князі, атрымаўшы досвед кіравання ў Тураве, неаднаразова пераходзілі на кіеўскі прастол. А пазней тураўскія князі кідалі выклік магутным кіеўскім князям.

Горад Тураў быў заснаваны ў цэнтры зямлі дрыгавічоў. Першапачаткова ён быў галоўным племянным цэнтрам. Развіццю горада садзейнічала выгаднае геаграфічнае становішча. Ён размяшчаўся на гандлёвым шляху з Паўднёвай Русі ў Польшчу, а навокал раскінуліся ўрадлівыя землі.

*З дапамогай картасхемы на 1-м форзацы дакажыце, што Тураў займаў выгаднае геаграфічнае становішча.*

Упершыню ў летапісе Тураў згадваецца ў ***980 г.***: «Рагвалод жа прыйшоў быў з-за мора і меў воласць сваю ў Полацку. А Тур (сеў) у Тураве, ад яго ж і тураўцы празваліся». Такім чынам, назва горада звязваецца з імем сучасніка Рагвалода — князя Тура.

Як вы ўжо ведаеце, у сярэдзіне X ст. землі дрыгавічоў былі падпарадкаваны Кіеву. Згодна з летапісам, у ***988 г.*** кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч накіраваў у найбольш буйны́я гарады ўсходніх славян сваіх сыноў у якасці намеснікаў. Так, Полацк атрымаў Ізяслаў, а Тураў — Святаполк. Куды

*Выкажыце сваё меркаванне, ад чаго магло паходзіць самое імя «Тур».*



Правообладатель Издательский центр БГУ

падзеўся Тур, ці існаваў ён у сапраўднасці — застаецца нявысветленым. З гэтага часу можна казаць аб існаванні Тураўскага княства, але яно цалкам падпарадкоўвалася Кіеву, было ягонай воласцю. Тураўскае княства атрымала поўную незалежнасць толькі ў сярэдзіне XII ст.



Манета кіеўскага і тураўскага князя Святаполка

**2. Адносіны паміж Туравам і Кіевам.** Тураўскае княства было вельмі цесна звязана з Кіевам. Невыпадкова некалькі князёў мянялі тураўскі прастол адразу на кіеўскі. Так, пасля смерці Уладзіміра ў 1015 г. кіеўскім князем стаў тураўскі князь Святаполк. Тураўскае княства ён захаваў за сабой. Святаполк, празваны Акаянным (ад імя біблейскага Каіна) за забойства сваіх братоў Барыса і Глеба, быў пераможаны Яраславам Мудрым і памёр на чужыне ў 1019 г.

Пазней Тураўскае княства дасталося Ізяславу — сыну кіеўскага князя Яраслава Мудрага. Пасля смерці бацькі ў 1054 г. Ізяслаў сам стаў князем у Кіеве, пры гэтым княжанне ў Тураве ён захаваў за сабою.

У трэці раз, у 1093 г., тураўскі князь Святаполк, сын Ізяслава Яраславіча, стаў князем у Кіеве. Некаторы час ён захоўваў сваю ўладу і над Туравам. У далейшым тураўскі прастол займалі нашчадкі і Уладзіміра Манамаха, і Святаполка Ізяславіча. Яны варагавалі паміж сабой, і гэтая варожасць перадалася іх дзецям і ўнукам.

? *Знайдзіце згаданых князёў на генеалагічнай схеме на с. 76.*

Здаралася, і ў XII ст. тураўскія князі аказваліся на кіеўскім прастоле. Аднак Кіеў тады ўжо страціў сваю былую магутнасць.

Такім чынам, тураўскія князі ў XI — першай палове XII ст. часта займалі велікакняжацкі прастол у Кіеве. Пры гэтым падчас знаходжання ў Кіеве яны кіравалі Туравам праз прызначаных *пасаднікаў*.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Асаблівасцю менавіта Тураўскага княства былі вялікія паўнамоцтвы такіх намеснікаў князя.

**3. Як Тураўскае княства набыло самастойнасць.** З пачаткам раздробленасці Старажытнай Русі Кіеў ужо не мог патрабаваць паслушэнства ад іншых гарадоў. Аднак яго князі па-ранейшаму лічылі сябе старэйшымі і жадалі распараджацца княствамі-валасцямі па сваёй волі.

У ***1157 г.*** новым кіеўскім князем стаў Ізяслаў Давыдавіч. Ён вырашыў аддаць Тураў свайму саюзніку. У той час улада ў Тураве




Генеалагічная схема старажытнарускіх князёў

? *Знайдзіце на схеме князёў, якія займалі тураўскі прастол.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

належала ***Юрыю Яраславічу***, унуку Святаполка Ізяславіча. Аддаваць княства, дзе ўладарылі яго продкі, князь Юрый не жадаў. Моцную падтрымку яму аказала мясцовае насельніцтва.

Кіеўскі князь сабраў вялікае войска, з якім у ***1157 г.*** рушыў да Турава. Відаць, перамога здавалася яму лёгкай. Аднак нечакана тураўцы аказалі ўпартае супраціўленне. Аблога горада працягвалася 10 тыдняў. У выніку кіеўскі князь вымушаны быў адысці ні з чым. У 1160 г. войска на чале з кіеўскім князем зноў спрабавала захапіць Тураў, але пацярпела няўдачу.

Так мужная абарона горада ягонымі жыхарамі на чале з князем Юрыем Яраславічам дазволіла адстаяць незалежнасць Тураўскай зямлі. Гэта адна з гераічных старонак нашай гісторыі.

с. 12

Юрый Яраславіч княжыў у Тураве прыблізна да 1167 г. Пасля Тураўскай зямлёй кіравалі яго сыны. Тут сфарміравалася свая княжацкая дынастыя.




Тураўскае княства ў XII — пачатку XIII ст.

? *Паміж якімі княствамі размяшчалася Тураўскае княства?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Гарады і валасці Тураўскай зямлі.** Як і ў іншых старажытнарускіх княствах, у складзе Тураўскай зямлі вылучыліся валасці. Акрамя Тураўскай воласці, якая належала старэйшаму князю, з цягам часу з'явіліся Пінская і Дубровіцкая валасці. Некаторы час да Тураўскай зямлі належала Чартарыйская воласць (зараз тэрыторыя Украіны).

Паступова ў Тураўскай зямлі ўзмацніўся горад Пінск. Упершыню гэты горад згадваецца ў летапісе ў 1097 г. Ён, як і Тураў, быў заснаваны каля ракі Прыпяць, але бліжэй да яе вытоку. Тут у Прыпяць упадала рака Піна, якая і дала назву гораду.

Узвышэнне Пінска было звязана з тым, што стары дрыгавіцкі цэнтр — Тураў — знаходзіўся ў небяспечнай блізкасці да Кіева. За Кіеў увесь час адбывалася міжусобная барацьба. Даставалася і Тураву, які жадаў падпарадкаваць кожны новы кіеўскі князь. У Пінску ж нашчадкі Юрыя Яраславіча адчувалі сябе спакайней. Гэта дало падставу некаторым гісторыкам называць Тураўскую зямлю Турава-Пінскім княствам.

Між тым да пачатку XIII ст. Тураўскае княства, хоць і захоўвала самастойнасць, вымушана было падпарадкоўвацца то галіцкім, то чарнігаўскім князям. У канцы XII — першай палове XIII ст. тураўскія князі часта прымалі ўдзел у паходах кіеўскіх князёў. Да Турава з павагай ставіліся ўладары суседніх земель. Невыпадкова два з тураўскіх князёў былі пахаваны ў Кіеве. Магчыма меркаваць, што цесныя сувязі паміж Туравам і Кіевам захоўваліся і ў гэты час.

Такім чынам, на поўдні Беларусі ў Высокім сярэднявеччы Тураў стаў другім пасля Полацка цэнтрам развіцця дзяржаўнасці. Галоўнай яго асаблівасцю была цесная сувязь з Кіевам.

**Пытанні і заданні**

1. У чым асаблівасці геаграфічнага становішча Турава? Як яны паўплывалі на развіццё Турава?
2. З якога часу існавала Тураўскае княства?
3. У чым асаблівасці палітычнага ладу Тураўскага княства?
4. Якімі былі адносіны паміж Кіевам і Туравам?


Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Дзякуючы чаму Тураўскае княства адстаяла сваю самастойнасць?
**6.** У чым прычыны ўзвышэння горада Пінска?
**7.** Як вы думаеце, чаму Турава-Пінскае княства прыйшло ў заняпад?

## § 11. Беларускія землі ва ўмовах палітычнай раздробленасці

**Успомніце.** *1. Як называліся саюзы плямёнаў славян, якія рассяліліся ў межах беларускіх зямель? 2. Якія плямёны жылі на беларускіх землях да прыходу славян?*

**Вы даведаецеся.** Асноўную частку тэрыторыі Беларусі ў Высокім сярэднявеччы займалі Полацкае і Тураўскае княствы. Астатнія беларускія землі падчас палітычнай раздробленасці апынуліся ў складзе розных княстваў. Што гэта былі за княствы? Якое месца ў іх займалі сучасныя беларускія землі?

**1. Раздробленасць Полацкай і Тураўскай зямель.** Як і ў іншых старажытнарускіх княствах, раздробленасць выявілася на тэрыторыі Беларусі. З папярэдніх параграфаў вы даведаліся пра тое, што Полацкая і Тураўская землі распаліся на асобныя княствы, якія называліся валасцямі. У гэтых княствах-валасцях кіравалі свае дынастыі князёў. Ва ўнутранай палітыцы яны былі цалкам самастойнымі.

У адносінах з іншымі землямі і суседнімі дзяржавамі Полацкае і Тураўскае княствы прадстаўляў той князь, які сядзеў на галоўным прастоле зямлі. «Стольны» князь распараджаўся ваеннымі сіламі ўсёй зямлі, на ягонае імя збіралася даніна. Таксама рашэнні веча старэйшага горада былі абавязковымі для насельніцтва ўсёй зямлі.

*Даведайцеся, да якога княства належаў ваш населены пункт у XI ст. і ў перыяд палітычнай раздробленасці (XII – першая палова XIII ст.).*

**2. Беларускія землі ў складзе Смаленскага і Чарнігаўскага княстваў.** Як вы ўжо ведаеце, у канцы Ранняга сярэднявечча



Правообладатель Издательский центр БГУ

с. 12

тэрыторыю па рацэ Сож — Пасожжа засялялі радзімічы. Зараз гэтая тэрыторыя знаходзіцца ў складзе Беларусі і Расіі.

Адным з галоўных цэнтраў радзімічаў быў Гомей (зараз Гомель). Славянскае паселішча на месцы Гомея ўзнікла яшчэ ў канцы IX ст. Пазней на працягу X ст. сфарміраваўся горад. Аднак упершыню Гомей упамінаецца ў летапісе толькі ў 1142 г. У XII ст. у землях радзімічаў былі вядомы і іншыя гарады: Чачэрск, Прапойск (Слаўгарад), Крычаў, Мсціслаў.

Спачатку радзімічы былі падпарадкаваны Кіеву. У XI ст. іх землі ўвайшлі ў склад Чарнігаўскага княства. У пачатку ж XII ст. узнікла Смаленскае княства. Доўгі час на чале яго знаходзіўся моцны князь Расціслаў Мсціславіч (1125–1159). Ён праводзіў палітыку пашырэння межаў свайго княства. Гэтаму садзейнічала тое, што прастол у Кіеве займаў ягоны бацька — Мсціслаў Вялікі. Расціслаў далучыў да свайго княства паўночныя землі радзімічаў з гарадамі Мсціславам, Крычавам і Прапойскам. Гэта стала вынікам вайны паміж Смаленскім і Чарнігаўскім княствамі ў 1127 г. Аднак яшчэ доўгі час Чарнігаў не мог змірыцца з такой стратай. Іншыя гарады ў зямлі радзімічаў — Гомей, Чачэрск — заставаліся ў складзе Чарнігаўскага княства.

У другой палове XII ст. значна ўзмацніўся Гомей (Гомель). Горад стаў цэнтрам Ніжняга Пасожжа, сталіцай асобнага княства-воласці Чарнігаўскай зямлі. Некаторы час Гомеем валодаў князь Ігар Святаславіч — герой «Слова пра паход Ігаравы».

**3. Лёс Берасцейшчыны.** Землі ў сярэднім цячэнні ракі Заходні Буг знаходзіліся на крайнім захадзе ўсходнеславянскага свету. Галоўным горадам тут было Берасце, якое і дало назву ўсяму краю — «Берасцейшчына» (Брэстчына).

? *Знайдзіце тэрыторыю Берасцейшчыны на картасхеме на с. 82. Звярніце ўвагу на асаблівасці яе становішча.*

Горад Берасце (сучасны Брэст) узнік як крэпасць на мяжы з польскімі плямёнамі. Першая згадка пра гэты горад адносіцца



Правообладатель Издательский центр БГУ



Старажытнае Берасце. Рэканструкцыя

да *1019 г.* Тады ў Берасці схаваўся пераможаны Яраславам Святаполк Акаянны.

? *Што вы пра яго ведаеце?*

Неаднойчы кіеўскія князі ваявалі за Берасце з Польшчай. Горад атрымаў назву ад аднаго з відаў дрэў або ад кары бярозы — бяросты.

Пазней у Сярэднім Пабужжы ўзніклі гарады: Драгічын, Мельнік, Камянец і Кобрын. Усе яны аб'ядноўваліся вакол Берасця. Але самастойнае княства з цэнтрам у Берасці не склалася. Гэта была крэпасць на памежжы, таму ў горадзе значнай уладай карыстаўся ваенны кіраўнік — *ваявода*.

У XI ст. Берасце падпарадкоўвалася непасрэдна Кіеву, магло належаць тураўскім князям. З сярэдзіны XII ст. яно ўвайшло ў склад Уладзіміра-Валынскага (з 1199 г. — Галіцка-Валынскага) княства.

**4. Узнікненне гарадоў і княстваў у Панямонні.** Тэрыторыя ўздоўж ракі Нёман з яе прытокамі называецца Панямоннем. Гэты лясны край славяне пачалі асвойваць пазней за іншыя тэрыторыі Беларусі. З поўдня і паўднёвага ўсходу сюды прыходзілі валыняне і дрыгавічы.

Найбольш старажытнымі гарадамі Панямоння былі Гародня (Гродна), Новагародак (Навагрудак), Слонім і Ваўкавыск. Яны ўзніклі ў канцы X — пачатку XI ст. Гэтыя гарады ў XII ст. сталі цэнтрамі

Правообладатель Издательский центр БГУ




Заходнія землі Старажытнай Русі

**?** *Абапіраючыся на картасхему, паразважайце, як геаграфічнае становішча заходніх беларускіх зямель паўплывала на іх палітычнае развіццё.*

асобных княстваў — Гарадзенскага, Новагародскага, Ваўкавыскага, Слонімскага.

Ужо ў 1116 г. згадваецца князь Гародні Усеваладка. Ён ажаніўся з дачкой самога кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха. Князі Гародні хадзілі паходамі на поўнач — супраць літвы, і на поўдзень — на Галіч. Гародня падтрымлівала цесныя сувязі з Кіевам. Гарадзенскія дружыны неаднаразова ўдзельнічалі ў сумесных паходах супраць качэўнікаў-полаўцаў.

Са з'яўленнем князя ў Гародні быў пабудаваны двухпавярховы мураваны княжацкі палац (церам). Тады ж у горадзе з'явілася раскошна аздобленая царква. Багатымі дамамі быў забудаваны і Навагародак. Некаторыя з іх мелі два паверхі і зашклёныя вокны. Сцены асобных пабудоў нават упрыгожваліся ***фрэскамі***.

Гарады Панямоння мелі сувязі і з далёкай Візантыяй. Аб гэтым сведчаць знаходкі каштоўнага шклянога посуду, аздобленага золатам і эмаллю.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Гаршкі з курганоў Літвы

У гэтым памежным краі значная ўвага надавалася ваеннай справе. Мясцовыя кавалі рабілі добрую зброю. Воіны мелі моцнае засцерагальнае ўзбраенне — шаломы, кальчугі, панцыры з жалезных пласцінак.

Побач з Панямоннем рассяляліся балцкія плямёны літва і яцвягі. Пісьмовыя звесткі пра гэтых суседзяў Русі вельмі скупыя. Так, напрыклад, першая згадка пра літву ў заходніх хроніках адносіцца да 1009 г.

Усходнія балты не ўвайшлі ў склад Старажытнарускай дзяржавы. Аднак яны мусілі плаціць даніну кіеўскім князям, а ў перыяд раздробленасці — Ноўгараду і Полацку. Неаднойчы старажытнарускія князі хадзілі паходамі на літоўскія плямёны, каб падпарадкаваць іх. Але тыя здолелі абараніць сваю самастойнасць. Тым не менш балты знаходзіліся пад моцным уплывам славян. Нават на месцы Вільні знойдзена ранняе славянскае паселішча.

У XIII ст. прыбалтыйскае насельніцтва сутыкнулася з сур'ёзнай небяспекай. Іх землямі зацікавіліся нямецкія рыцары і каталіцкае духавенства. Гэта патрабавала стварэння больш моцнай арганізацыі для адпору заваёўнікам.

У балтаў да XIII ст. не было гарадоў і пісьменнасці, але ўжо існаваў падзел на знаць і просты народ. Адна група родных балцкіх плямёнаў аб'ядналася на чале з князем і стала называцца аўкштайтамі. Другое падобнае аб'яднанне атрымала назву «жамойты».

Пад 1235 г. летапіс паведамляе пра «Літву Міндоўга». Князь Міндоўг здолеў падпарадкаваць сабе іншых літоўскіх князёў і стаў вялікім князем. Так пад уплывам усходніх славян пачалося фарміраванне Вялікага Княства Літоўскага. Яцвягі ж не здолелі стварыць сваёй дзяржавы і ўвайшлі ў склад суседніх дзяржаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, беларускія землі ў перыяд раздробленасці ўваходзілі ў склад некалькіх дзяржаў-княстваў. Акрамя Полацкага і Тураўскага княстваў гэта былі Смаленскае, Чарнігаўскае і Валынскае княствы. Узніклі княствы і на тэрыторыі Панямоння. Усходнія славяне аказвалі ўплыў на развіццё балцкіх плямёнаў Усходняй Прыбалтыкі.

**Пытанні і заданні**

**1.** Як склаўся лёс тэрыторыі рассялення радзімічаў у Высокім сярэднявеччы?
**2.** Якія гарады ўзніклі на тэрыторыі Пасожжа?
**3.** У чым асаблівасці становішча Берасцейшчыны?
**4.** Якія гарады і княствы ўзніклі ў Панямонні?
**5.** У чым заключаюцца асаблівасці развіцця Панямоння?
**6.** Якія адносіны складваліся ў балцкіх плямёнаў з суседзямі?
**7.** Паразважайце, што было агульнага ў развіцці дзяржаўнасці на ўсёй тэрыторыі Беларусі, заселенай усходнімі славянамі.

## § 12. Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст.

**Успомніце.** *1. Што такое духоўна-рыцарскі ордэн? 2. З якой мэтай ажыццяўляліся крыжовыя паходы?*

**Вы даведаецеся.** Палітычная раздробленасць значна аслабіла магчымасць усходніх славян супрацьстаяць знешняй небяспецы. Старажытнарускія князі шмат ваявалі паміж сабой, не звяртаючы ўвагі на пагрозу з боку новых ворагаў. Што гэта былі за ворагі? Якія наступствы мелі іх напады?

**1. Калі ва Усходняй Прыбалтыцы з'явіліся крыжакі?** У канцы XII ст. у Еўропе заставалася мала абласцей, якія яшчэ не ўвайшлі ў склад дзяржаў. Да таго ж амаль уся тэрыторыя Заходняй Еўропы была падзелена паміж феадальнымі ўладальнікамі. Насельніцтва гэтых зямель вызнавала хрысціянства. Выключэннем была Усход-


Правообладатель Издательский центр БГУ

няя Прыбалтыка. Тут жылі язычніцкія плямёны ліваў, латгалаў, земгалаў, эстаў (чудзі).

> ? *Якія са згаданых плямёнаў адносяцца да балтаў?*

У канцы XII ст. у вусці Заходняй Дзвіны з'явіліся першыя германскія *місіянеры*. Гэта былі шчырыя вернікі, што прысвяцілі сваё жыццё пашырэнню хрысціянства. Аднак за імі прыходзілі прагныя да багацця людзі. Для іх «выратаванне душ» язычнікаў служыла толькі падставай для ўсталявання ўласнага панавання.

У 1201 г. брэменскі місіянер Альберт з дапамогай нямецкіх рыцараў заснаваў у вусці Заходняй Дзвіны горад Рыгу. Альберт быў прызначаны лівонскім біскупам (пазней — *арцыбіскупам*). Лівоніяй у той час называлі землі сучасных Латвіі і Эстоніі, якія насяляла фінскае племя ліваў. У 1202 г. тут быў створаны ваенна-манаскі Ордэн мечаносцаў (Ордэн братоў мяча). Яму даручалася дапамагаць біскупу ў хрышчэнні мясцовых плямёнаў. А на іх землях нямецкія рыцары планавалі ўтварыць феадальную гаспадарку, дзе яны былі б гаспадарамі, а падпарадкаванае насельніцтва — слугамі.

**2. Адбіццё нападаў нямецкіх рыцараў.** Полацкае княства першым сутыкнулася з нямецкімі місіянерамі, што прыйшлі ва Усходнюю Прыбалтыку. Спачатку полацкі князь не ўбачыў небяспекі ў іх дзейнасці, дазволіўшы «несці крыж» да язычнікаў.

> ? *Чаму для гэтага патрабаваўся дазвол полацкага князя?*

Хутка за місіянерамі з'явіліся і рыцары. Яны сілай зброі, прымусам распаўсюджвалі хрысціянства і лічылі, што робяць добрую справу. Хутка і папа рымскі заклікаў еўрапейскіх рыцараў да крыжовых паходаў у Прыбалтыку. Іх удзельнікам — ***крыжакам*** — даравaліся грахі, і яны мелі магчымасць замацаваць заваяваныя землі ў маёмасць.

Амаль кожны год рыцары нападалі на неабароненыя паселішчы язычніцкіх плямёнаў. Здараліся і паражэнні, калі даведзеныя да крайнасці прыбалты падымалі паўстанні. Але рыцары хутка аднаўлялі сілы. З Заходняй Еўропы да іх прыходзілі новыя «барацьбіты за веру».



Правообладатель Издательский центр БГУ



Рыцар Ордэна мечаносцаў

с. 13

Каб замацавацца ў новых месцах, крыжакі хутка будавалі невялікія мураваныя замкі. Замкі былі апорнымі пунктамі для іх далейшага прасоўвання на ўсход і падпарадкавання чужых зямель.

Задоўга да з’яўлення ў Прыбалтыцы крыжакоў мясцовыя плямёны выплочвалі даніну Полацку. Магчыма, менавіта ў пунктах збору даніны з зямлі латгалаў узніклі гарады Герцыке і Кукенойс. Яны сталі цэнтрамі асобных княстваў у складзе Полацкай зямлі.

Герцыке і Кукенойс стаялі на шляху крыжацкіх заваяванняў. Іх князі змагаліся з нямецкім націскам, пакуль мелі сілы. Аднак рыцары аказаліся мацнейшымі.

У больш моцным Герцыкскім княстве валадарыў князь Усевалад. Як піша нямецкая хроніка, ён быў сынам «караля Полацка». У барацьбе з крыжакамі Усеваладу дапамагалі літоўцы. Ён быў жанаты з дачкой літоўскага князя. Аднак у 1214 г. крэпасць Герцыке была спалена. Усевалад вымушаны быў падпарадкавацца рыжскаму біскупу.

У Кукенойсе ў пачатку XIII ст. кіраваў князь ***Вячка*** (Вячаслаў). У яго, наадварот, склаліся вельмі дрэнныя адносіны з літоўцамі. У барацьбе з імі ён нават быў гатовы карыстацца дапамогай крыжакоў. Рыжскаму біскупу Вячка аддаў палову сваіх зямель, але хутка зразумеў, што крыжакі — кепскія саюзнікі. У 1208 г. ён знішчыў рыцараў, якія знаходзіліся ў яго горадзе. Вячка разлічваў на дапамогу полацкага князя Уладзіміра. Не дачакаўшыся яе, ён спаліў свой горад і адышоў у Ноўгарад. Наўгародскі князь даручыў Вячку абараняць горад Юр’еў і землі эстаў ад нямецкіх рыцараў. Падчас аблогі рыцарамі Юр’ева ў 1224 г. Вячка сярод апошніх абаронцаў загінуў.

*Падумайце, чаму Герцыке і Кукенойс не здолелі адбіцца ад крыжакоў.*

Пасля захопу зямель латгалаў крыжакі падступілі да межаў Полацкага княства. Полацк апынуўся ў складаным становішчы. З аднаго боку, крыжакі прысвоілі даніну ліваў, якая раней выплочвалася По-



Правообладатель Издательский центр БГУ

лацку. Каб аднавіць яе спагнанне, полацкі князь *Уладзімір* яшчэ з 1203 г. ладзіў паходы на Рыгу. З другога боку, полацкія купцы былі зацікаўленыя ў падтрыманні міру на Заходняй Дзвіне. Таму ў 1210 г. Полацк і Рыга заключылі мір. Па яго ўмовах для полацкіх купцоў быў адкрыты свабодны шлях па Дзвіне.

? *Падумайце, хто яшчэ быў зацікаўлены ў развіцці гандлю па Заходняй Дзвіне.*

Але полацкі князь не змірыўся са стратай прыбалтыйскіх зямель. Ён рыхтаваў сілы для рашучага наступу на крыжакоў. Спрыяльны момант надышоў у *1216 г.* Полацкага князя гатовыя былі падтрымаць эсты і літоўцы. У Полацк сабраліся воіны з Менска, Смаленска, Віцебска, Друцка і з Літвы. Аднак Уладзімір раптоўна памёр, калі ўжо ўзыходзіў на карабель.

У выніку Полацкае княства саступіла ў барацьбе з крыжакамі. Былі страчаны даніна з прыбалтыйскіх плямёнаў і цэлыя княствы — Герцыкскае і Кукенойскае.

**3. Саюз Полацка з Ноўгарадам.** Наўгародская зямля, таксама як і Полацкае княства, адчувала небяспеку з боку крыжакоў. Да таго ж на землі Ноўгарада з прагнасцю глядзелі шведы. Агульная справа вымагала аб’яднання сіл.

Саюз Полацка і Ноўгарада, як у той час было прынята, быў замацаваны шлюбам. Малады наўгародскі князь Аляксандр Яраславіч ажаніўся з дачкой полацкага князя Брачыслава Аляксандрай.

Невыпадкова ў славутай бітве князя Аляксандра са шведамі на рацэ Няве ў ліпені 1240 г. удзельнічаў нейкі палачанін, які меў імя Якаў. Летапіс адзначыў, што Якаў



Неўская бітва 15 ліпеня 1240 г.
Воін з узнятым мячом — Якаў Палачанін.
Мініяцюра з летапісу XVI ст.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Палачанін у жорсткай рукапашнай схватцы «...мужна біўся, і пахваліў яго князь».

Не выключана, што полацкія воіны змагаліся ў дружыне наўгародскага князя Аляксандра Неўскага і ў бітве на Чудскім возеры ў 1242 г.

**Націск крыжакоў**

- Захоп крыжакамі тэрыторыі Усходняй Прыбалтыкі
- Страта Полацкам даніны з прыбалтыйскіх плямёнаў
- Аб'яднанне літоўскіх плямёнаў пад уладай аднаго князя

**?** *З дапамогай схемы сфармулюйце асноўныя вынікі наступу крыжакоў.*

**4. Мангольскае нашэсце і беларускія землі.** Менавіта ў той час, калі Усходнюю Прыбалтыку заваёўвалі еўрапейскія крыжакі, ля межаў Русі з'явіўся новы вораг — ***манголы***. На Русі і ў Еўропе іх называлі «татары». Яны прыйшлі з далёкіх стэпаў Манголіі і ўжо захапілі шмат краін на Усходзе. Надышла чарга і Старажытнай Русі. У *1237–1241 гг.* велізарная мангольская арда на чале з ханам Батыем зруйнавала мноства старажытнарускіх гарадоў. У снежні 1240 г. манголы ўзялі «маці гарадоў рускіх» Кіеў. Страшная небяспека наблізілася і да беларускіх зямель.

с. 13

У глыб беларускага ляснога краю манголы не пайшлі. Таму Полацкая зямля і княствы ў Панямонні не зведалі жорсткасці мангольскіх воінаў. Тым не менш заваёўнікі спалілі Гомель і Магілёў. Магчыма, не абмінула бяда гарады Тураўскай зямлі.

Падчас рабавання Валынскай зямлі манголы ўзялі і яе паўночную крэпасць — Берасце. Як паведамляе летапіс, каля горада «быў смурод ад вельмі вялікай колькасці забітых». Гэта стала вынікам мангольскага паходу напачатку *1241 г.*

І пасля заканчэння нашэсця Батыя пагроза для ўсходнеславянскіх зямель заставалася. У прычарнаморскім стэпе, Паволжы



Правообладатель Издательский центр БГУ



Узяцце манголамі старажытнарускага горада

? *З дапамогай чаго манголы захоплівалі гарады?*

і Сярэдняй Азіі манголы стварылі адну з найбуйнейшых дзяржаў Сярэднявечча — Залатую Арду. З яе тэрыторыі адбываліся грабежніцкія набегі, у тым ліку далёка ў глыб тэрыторыі Беларусі і нават Літвы.

**Мангольскае нашэсце**

| Спусташэнне манголамі старажытнарускіх гарадоў | Усталяванне залежнасці старажытнарускіх зямель ад Арды | Адасабленне беларускіх зямель ад іншых зямель Старажытнай Русі |
|---|---|---|

? *З дапамогай схемы раскажыце аб наступствах мангольскага нашэсця.*

Аднак асноўная тэрыторыя Беларусі не трапіла ў залежнасць ад Арды. Гэтая цяжкая залежнасць, названая гісторыкамі «ігам» (ярмом), заключалася ў выплаце даніны і прызначэнні ардынскімі ханамі князёў на прастолы.

*Даведайцеся, ад якіх ворагаў найбольш моцна пацярпеў ваш край у X – першай палове XIII ст. Якія легенды і паданні, прысвечаныя гэтым падзеям, захаваліся ў вашай мясцовасці?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, раздробленасць аслабіла старажытнарускія княствы якраз у той час, калі з'явіліся новыя ворагі – крыжакі і манголы. У выніку знешняя небяспека значна змяніла аблічча Усходняй Еўропы. Менавіта гэта прывяло да ўзмацнення новай палітычнай сілы – Літвы.

**Пытанні і заданні**

1. З якімі мэтамі з'явіліся ва Усходняй Прыбалтыцы нямецкія місіянеры і рыцары?
2. Якім чынам крыжакі замацоўвалі сваю ўладу на заваяваных тэрыторыях?
3. Чаму сутыкненне Полацка з крыжакамі стала непазбежным? Якія вынікі яно мела для Полацкай зямлі?
4. Раскажыце аб барацьбе Полацкага княства з крыжакамі. У якіх падзеях, звязаных з барацьбой супраць нямецкіх рыцараў, магчыма, вызначыліся палачане?
5. Якія беларускія гарады пацярпелі ад манголаў? Якія наступствы мела мангольскае нашэсце?
6. Як вы думаеце, у чым прычыны паражэння старажытнарускіх княстваў у вайне з крыжакамі і манголамі?

## § 13. Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель і ўзнікненне гарадоў

**Успомніце.** *1. Што такое падсечна-агнявое земляробства? 2. Што было характэрна для феадалізму ў Заходняй Еўропе?*

**Вы даведаецеся.** Гаспадарка ўсходніх славян у Сярэднявеччы развівалася вельмі павольна. Прытым у грамадстве адбываліся значныя зрухі. У Заходняй Еўропе гэта быў час росквіту феадальных адносін. Ці адбывалася тое ж самае ў Высокім сярэднявеччы і на беларускіх землях? Якую ролю ў той час адыгрывалі гарады?

**1. З якіх заняткаў складалася гаспадарка нашых продкаў.** У тыя далёкія часы вельмі цяжка было пражыць паасобку. Для



Правообладатель Издательский центр БГУ

вядзення сельскай гаспадаркі часта патрабаваліся сумесныя работы. Таму ўсходнія славяне жылі калектывамі — суседскімі абшчынамі. Абшчына ва ўсходніх славян называлася *«верв»*. Уся зямля, якая апрацоўвалася, а таксама выкарыстоўвалася для выпасу жывёлы, належала абшчыне.



**Драўляная саха**
рыхліла і праводзіла ў глебе баразёнкі



**Саха з жалезнымі нарогамі**
рыхліла глебу і адвальвала пласт зямлі ў бакі



**Старажытны плуг**
глыбока рыхліў глебу і пераварочваў пласт зямлі

Развіццё сельскагаспадарчых прылад працы

? *Як вы думаеце, ад чаго залежала выкарыстанне тых ці іншых прылад працы?*

Галоўнымі заняткамі ўсходніх славян былі земляробства і жывёлагадоўля. У X–XIII стст. на беларускіх землях былі распаўсюджаны многія вядомыя ў наш час культуры — пшаніца, проса, жыта, боб, гарох, грэчка. Для вырабу тканіны вырошчвалі лён і каноплі. Ураджай збіралі жалезнымі сярпамі ці косамі, зерне малацілі драўлянымі цапамі і малолі на муку пры дапамозе каменных жорнаў. Гадавалі кароў, коней, свіней, коз, авечак, а таксама трымалі курэй, гусей.

Важнымі заняткамі для нашых продкаў заставаліся паляванне і рыбная лоўля. Палявалі на ласёў, зуброў, аленяў, дзікоў, мядзведзяў і інш. Здабывалі таксама футра пушных звяркоў. Лясныя багацці — ягады, грыбы — дапаўнялі стол земляроба.

Шырока было распаўсюджана бортніцтва. Збор мёду дзікіх пчол быў не менш складаным, чым паляванне. Мёд і воск тады высока цаніліся: на іх быў вялікі попыт у Візантыі і іншых краінах.

с. 14



Правообладатель Издательский центр БГУ



Вертыкальны ткацкі станок. Рэканструкцыя

Самыя простыя рэчы, неабходныя ў паўсядзённым побыце, выраблялiся ў кожнай хаце. Так, напрыклад, амаль усе жанчыны ўмелi прасцi i ткаць. Складаныя рэчы, асабліва з металу, рабiлi рамеснiкi. Вясковыя жыхары амаль цалкам маглi забяспечыць сябе ўсiм неабходным для жыцця. Такiм чынам, на беларускiх землях доўгi час панавала *натуральная гаспадарка*.

**2. Данніцкія абавязкі насельніцтва.** Князь i набліжаныя да яго людзi павiнны былi знайсцi спосабы для ўласнага забеспячэння. Акрамя таго, сродкi патрабавалiся для вядзення войнаў, прыёму замежных пасольстваў i iнш. Галоўным шляхам задавальнення гэтых патрэб з’яўляўся збор данiны.

Першапачаткова князь збiраў данiну з падуладнага насельнiцтва ў ходзе *палюддзя*. Разам з дружынай ён аб’язджаў паселiшчы падуладнай тэрыторыi. Тут ён прымаў паднашэннi прадуктамi харчавання, футрам i рамеснымi вырабамi. Адначасова князь чынiў суд.

> ? *Выкажыце сваё меркаванне пра паходжанне назвы «палюддзе».*

Палюддзе патрабавала асабiстай прысутнасцi князя. Але з цягам часу з-за павелiчэння падуладнай тэрыторыi гэта стала складаным. Таму з сярэдзiны X ст. данiну насельнiцтва стала прывозiць у асобыя пункты — *пагосты*. Потым збор данiны стаў праводзiцца ў гарадах. Тут галоўнай дзяржаўнай асобай пры князю быў *тысяцкi*.

Акрамя гэтага князь атрымлiваў грошы ў выглядзе гандлёвага мыта i за ажыццяўленне суду. З прыняццем хрысцiянства дзясятую частку сваiх даходаў — дзесяцiну — князь стаў аддаваць царкве.

У часы Сярэднявечча найбольшай каштоўнасцю была зямля. Але без земляробаў, якiя яе апрацоўваюць, яна не мела сэнсу. Таму землеўласнiкi намагалiся замацаваць за сабой не толькi зямлю, але i тых, хто на ёй працаваў.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Сядзіба баярына. Рэканструкцыя

Вярхоўным уласнікам усёй зямлі ў дзяржаве лічыўся князь. Свае і дзяржаўныя патрэбы (доўгі час яны не падзяляліся) ён задавальняў за кошт падуладнага насельніцтва. У Старажытнай Русі была асобная частка земляробаў, якія непасрэдна залежалі ад князя. Гэта былі *смерды*. Яны мелі асабістую свабоду, аднак зямля, на якой яны працавалі, належала князю. Смерды былі галоўнымі плацельшчыкамі даніны і павінны былі адпраўляцца на вайну на ўласных конях.

У часы раздробленасці князі сталі часцей раздаваць землі з сёламі сваім старэйшым дружыннікам — *баярам*. Так узнікла баярскае землеўладанне. За атрыманую зямлю яе ўладальнікі павінны былі служыць князю. Гэта нагадвала адносіны сеньёра і васала ў Заходняй Еўропе. Аднак адрозненняў было значна больш. Так, на сваіх

| Свабодныя | Часткова свабодныя | Часова несвабодныя | Залежныя (рабы) |
|---|---|---|---|
| Абшчыннікі («людзі») | Смерды | За́купы | Халопы (чэлядзь) |

Катэгорыі насельніцтва Высокага сярэднявечча

**?** *Як вы думаеце, якая з катэгорый насельніцтва была найбольш шматлікай?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

землях баяры маглі выкарыстоўваць працу рабоў — *халопаў*. *Чэлядзь* (іншая назва рабоў) выконвала розныя работы ў гаспадарцы заможных людзей. Так феадальныя адносіны спалучаліся з рабаўладальніцкімі.

У Высокім сярэднявеччы феадальнай ці рабскай залежнасцю была ахоплена нязначная колькасць насельніцтва. У асноўным земляробы былі свабоднымі абшчыннікамі. Аднак паступова яны траплялі ў залежнасць. Гэта адбывалася рознымі шляхамі. Напрыклад, у сувязі з неўраджаем земляроб мог звярнуцца да багатага чалавека і ўзяць у таго ку́пу (пазыку). Такі залежны чалавек называўся *за́купам*. Калі ён аказваўся няздольным аддаць пазыку, то станавіўся залежным на ўсё жыццё.

**3. Як узніклі і развіваліся першыя гарады.** Іншаземцаў, якія наведвалі нашыя землі ў Сярэднявеччы, заўсёды здзіўляла вялікая колькасць гарадоў. Самым старажытным беларускім горадам з'яўляецца Полацк. Упершыню ён упамінаецца пад 862 г.

Слова «горад» паходзіць ад слоў «гарадзіць», «абгароджваць», што тлумачыць яго галоўную задачу — быць сховішчам для людзей. Першапачаткова гэта і было ўмацаванае паселішча. Найбольш трывала ўмацоўваўся цэнтр горада —

*Даведайцеся, да якога часу адносіцца першае згадванне вашага населенага пункта ў пісьмовых крыніцах. Ці адпавядае дата, зафіксаваная ў пісьмовых крыніцах, археалагічным дадзеным?*

На беларускіх землях у старажытнарускі перыяд усе гарады былі драўлянымі. З дрэва будавалі ўмацаванні, хаты, масцілі ім вуліцы. Толькі зрэдку ў гарадах сустракаліся будынкі з каменю і цэглы. У асноўным гэта былі цэрквы. Галоўная царква горада называлася саборам. І зусім рэдка з цэглы будаваліся княжацкія палацы — церамы. Напрыклад, двухпавярховы цагляны церам быў пабудаваны ў XII ст. у Гародні. Частка горада, дзе знаходзіўся княжацкі палац (церам) і дамы дружыннікаў (грыдніцы), магла быць трывала ўмацавана. Такі абаронены валамі, равамі і сценамі цэнтр старажытнага горада называўся дзядзінец. Тут першапачаткова жыла малодшая княжацкая дружына — «дзецкія», магчыма, адсюль і назва. Навокал дзядзінца размяшчаліся дамы рамеснікаў і гандляроў. Гэтае неўмацаванае паселішча называлася *пасадам*.

*Паразважайце, ці вялікія былі ў той час гарады. Колькі ў іх было жыхароў?*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Будаўніцтва старажытнарускага горада.
Мастак *Гурый Барысевіч*

*Як вы думаеце, у чым вартасці і недахопы драўляных абарончых збудаванняў?*

***дзядзінец***. З цягам часу гарады занялі важнае месца ў грамадскім жыцці і гаспадарцы.

У гарадах жылі найлепшыя майстры-рамеснікі. Тут яны маглі атрымаць заказ ад багатых людзей і прадаць сваю прадукцыю на таргу. У сваёй працы рамеснікі дасягалі вялікага майстэрства. З'явілася шмат спецыяльнасцей. Найбольшае развіццё атрымалі кавальскае, ювелірнае, ганчарнае, гарбарнае (апрацоўка шкур), шавецкае, бандарнае (выраб бочак) рамёствы.




*З дапамогай схемы раскажыце пра шляхі ўзнікнення гарадоў.*

Правообладатель Издательский центр БГУ




*З дапамогай схемы раскажыце пра паходжанне назваў беларускіх гарадоў.*

*Ці ведаеце вы, ад чаго паходзіць назва населенага пункта, у якім вы жывяце?*

Прадукцыя гарадскіх рамеснікаў прадавалася ў іншых краінах ці гарадах. Вырабы з жалеза (напрыклад, замкí), са срэбра і косці карысталіся попытам і ў Заходняй Еўропе. Гандлем займаліся купцы. Тых, хто гандляваў з замежжам, называлі *гасцямі*. Акрамя рамеснай прадукцыі яны вывозілі таксама футра, мёд, воск, смалу, лён. Гэтыя прадукты маглі быць атрыманы ў якасці даніны з падуладнага князю насельніцтва. Таварам былі і рабы.

*З дапамогай гістарычных карт высветліце, якія гандлёвыя шляхі праходзілі праз вашу мясцовасць. Выкажыце свае меркаванні наконт таго, якія тавары правозіліся па гэтых шляхах.*

У сваю чаргу, купцы-госці з заходнееўрапейскіх гарадоў, Візантыі, краін Усходу прывозілі дарагія тканіны (павалокі), шкляны і фаянсавы посуд, валошскі (грэцкі) арэх. А ў вялікіх гліняных пасудзінах — амфарах — дастаўляліся віно і аліўкавы алей. Іх спажыўцамі былі найбольш багатыя і знатныя людзі.

с. 15



Правообладатель Издательский центр БГУ

**ГАРАДЫ**

- Цэнтры рамяства і гандлю
- Абарончыя пункты
- Адміністрацыйныя цэнтры
- Рэлігійныя і культурныя цэнтры

? *З дапамогай схемы раскажыце пра ролю гарадоў у жыцці ўсходнеславянскага грамадства.*

Такім чынам, на беларускіх землях толькі з другой паловы XII ст. адбывалася станаўленне феадальнага ладу. Аднак развіццё феадальных адносін яшчэ доўгі час спалучалася з існаваннем рабскай залежнасці. Вельмі важнае месца ў развіцці тагачаснага грамадства займалі гарады. Менавіта ў іх жылі князі і найлепшыя рамеснікі.

**Пытанні і заданні**

1. Якія гаспадарчыя заняткі былі распаўсюджаны сярод насельніцтва беларускіх зямель?
2. Па якой прычыне ўзнікла даніна? Як змяняліся спосабы збору даніны?
3. У чым выяўляліся феадальныя адносіны на беларускіх землях у Высокім сярэднявеччы?
4. Якімі шляхамі ўзнікалі гарады ўсходніх славян? Чаму аб заснаванні старажытных гарадоў пісалі «зрубілі горад»?
5. Складзіце ў сшытку табліцу «Знешні гандаль беларускіх гарадоў у Высокім сярэднявеччы», у якой пазначце тавары ўвозу і тавары вывазу.
6. Паразважайце, чым сучасныя беларускія гарады адрозніваюцца ад сярэднявечных.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 14. Хрысціянства на беларускіх землях

**Успомніце.** *1. Калі ўзнікла хрысціянства? Чаму гэтая рэлігія атрымала такую назву? 2. Якую ролю адыгрывала хрысціянская царква ў Заходняй Еўропе?*

**Вы даведаецеся.** Як вы ведаеце, усходнія славяне ў пачатку сваёй гісторыі былі язычнікамі. Аднак з канца X ст. адбыліся важныя змены: Русь прыняла хрысціянства. Яно хутка пашырылася і на сучасных беларускіх землях. Што спрыяла прыняццю хрысціянства? Якія наступствы мела гэтая падзея?

**1. Прычыны прыняцця хрысціянства.** Язычніцтва мела глыбокія карані на славянскіх землях. Яно давала свае адказы на пытанні аб паходжанні свету, людзей, розных прыродных з'яў і г. д. Але язычніцкі светапогляд зусім не адпавядаў патрабаванням грамадства і асобнага чалавека ў Высокім сярэднявеччы. Язычніцтва не было адзінай рэлігіяй: у кожнага саюзу плямёнаў былі свае галоўныя багі. У агульнай дзяржаве такое становішча не магло доўга захоўвацца. Таму князь Уладзімір, як толькі заняў прастол у Кіеве, стварыў адзіны пантэон язычніцкіх багоў на чале з Перуном.



Іконка з выявай святых Канстанціна і Алены. XII ст. Знойдзена ў Полацку

Ужо з часоў рассялення ва Усходняй Еўропе славяне былі знаёмыя з хрысціянствам. І пазней Русь падтрымлівала цесныя сувязі з найбуйнейшай хрысціян-



Правообладатель Издательский центр БГУ

скай краінай — Візантыяй. Дзякуючы дзейнасці вялікіх асветнікаў Кірылы і Мяфодзія і іх вучняў з'явілася славянская азбука. На старaславянскую мову былі перакладзены свяшчэнныя кнігі.

Хрысціянства прапаноўвала больш ясныя адказы на пытанні аб узаемаадносінах грамадства і ўлады. Афармленне дзяржаўнасці, станаўленне княжацкага адзінаўладдзя і іншыя змены мелі патрэбу ў тлумачэнні і абгрунтаванні. Язычніцкае мнагабожжа для гэтага было непрыдатнае. Кіраўніцтва складаным грамадствам з дапамогай спецыяльных службовых асоб выклікала патрэбу ў ведах, пісьменнасці. Патрабаваліся і новыя пісьмовыя законы, якія б замацоўвалі каштоўнасць чалавечага жыцця. Хрысціянства праз зацвярджэнне запаведзяў Хрыстовых садзейнічала паляпшэнню адносін паміж людзьмі. Боязь кары Божай стрымлівала людзей ад дрэнных учынкаў.

Хрысціянская вера замацоўвала аўтарытэт дзяржаўнай (княжацкай) улады, давала разуменне таго, што да яе трэба адносіцца з павагай, бо ўлада дадзена ад Бога. Той, хто ёю валодае, нясе большую адказнасць перад Усявышнім.

Важным таксама было далучыць усходніх славян да агульнага лёсу хрысціянскіх народаў. Людзі верылі, што толькі прыняцце Бога і праведны лад жыцця дазволяць выратавацца падчас непазбежнага канца свету.

Пашырэнне хрысціянства сярод усходніх славян пачалося яшчэ да стварэння дзяржавы. Найбольш важнай падзеяй стала хрышчэнне Русі ў *988 г.* Аднак патрабаваліся яшчэ значныя намаганні для стварэння царкоўнай арганізацыі, падрыхтоўкі святароў, пабудовы храмаў на ўсёй тэрыторыі, падуладнай кіеўскаму князю.

**2. Першыя хрысціяне на беларускіх землях.** Пра імёны першых хрысціян беларускіх зямель мы ніколі не даведаемся. Гэта маглі быць скандынаўскія воіны, якія служылі ў Візантыі і пасля прыйшлі на землі ўсходніх славян, або славяне з Вялікай Маравіі, што была разгромлена венграмі. Таксама гэта маглі быць хрысціяне з акружэння іншаземных нявест мясцовых князёў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Між тым у гісторыі захаваліся імёны першых хрысціян — прадстаўнікоў княжацкай сям'і, якія найбольш садзейнічалі пашырэнню хрысціянства. У Полацкім княстве гэта былі Рагнеда і яе сын Ізяслаў. Летапіс сведчыць, што Рагнеда перад смерцю ў 1000 г. была пастрыжана ў манахіні пад імем Анастасія. З летапісу вядома таксама, што і князь Ізяслаў быў вельмі набожным і старанна чытаў царкоўныя кнігі.

Прыняцце хрысціянства запатрабавала стварэння царкоўнай арганізацыі. Была ўтворана мітраполія з цэнтрам у Кіеве. Яна з'яўлялася часткай Грэчаскай царквы. На чале мітраполіі стаяў *мітрапаліт*, які знаходзіўся ў Кіеве. Ён прызначаўся канстанцінопальскім патрыярхам. Мітраполія падзялялася на *епархіі*, якімі кіравалі *епіскапы*. Да пачатку XIII ст. на Русі было створана 16 епархій, і сярод іх — Полацкая і Тураўская. У Полацку епархія ўзнікла ***каля 992 г.*** Імёны першых полацкіх епіскапаў засталіся невядомымі. Толькі ў пачатку XII ст. узгадваецца полацкі епіскап Міна. Епархія ў Тураўскім княстве была заснавана ў ***1005 г.*** Першым яе епіскапам называецца Фама.




? *Растлумачце, што ўяўляла сабой царкоўная арганізацыя.*

с. 16

**3. Язычніцтва і хрысціянства.** З канца X ст. хрысціянства хутка пашырылася сярод усходніх славян. Пра поспехі хрысціянізацыі сведчыць шырокае будаўніцтва цэркваў і манастыроў. Толькі мураваных цэркваў у Полацку ў XII ст. налічвалася не менш за дзесяць. Намнога больш было драўляных цэркваў.

? *Чаму нельга дакладна сказаць, колькі было драўляных цэркваў?*

Аднак пераканаць нядаўніх язычнікаў свядома адмовіцца ад веры сваіх продкаў было няпроста. Не да кожнага чалавека, асабліва ў сельскай мясцовасці, глухіх ляс-



Правообладатель Издательский центр БГУ



Хрысціянства і язычніцтва. Мастак *Сяргей Іваноў*

? *Як вы думаеце, хто перамог у гэтым супрацьстаянні?*

ных краях, мог дайсці добра адукаваны прапаведнік. Патрэбны быў час, каб стварыць школы для падрыхтоўкі ўласных святароў.

Нават пасля хрышчэння ўсходнія славяне доўгі час адзначалі язычніцкія святы і таемна маліліся старым багам. Летапісы расказваюць аб з'яўленні і праз сто год пасля хрышчэння Русі валхвоў (вешчуноў). Усіх незадаволеных яны заклікалі вярнуцца да ранейшай веры. Таму лічыцца, што некаторы час пасля прыняцця хрысціянства на беларускіх землях існавала *дваяверства*.

**4. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы.** Пашырэнне хрысціянства на беларускіх землях з цягам часу прынесла свой плён. З'явіліся свае асветнікі, святыя людзі, жыццё якіх было сапраўдным узорам хрысціянскага жыцця. Сярод іх найбольш вядомымі сталі Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі.

***Ефрасіння Полацкая*** (пры нараджэнні — Прадслава) паходзіла з княжацкай сям'і. Яна была ўнучкай знакамітага Усяслава Полацкага. Князёўна павінна была выйсці замуж, каб замацаваць

Правообладатель Издательский центр БГУ



Фрэска XII ст. са Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку

які-небудзь палітычны саюз. Але яна абрала іншы шлях: прыняла пострыг у жаночым манастыры.

Княжацкае паходжанне дазволіла Ефрасінні шырока займацца асветніцкай дзейнасцю. Яна заснавала два манастыры (або адзін двайны) і садзейнічала пабудове дзвюх мураваных цэркваў — у імя Святога Спаса і ў гонар Багародзіцы.

«Спас» (ад рускага слова «Спаситель») абазначае самога Ісуса Хрыста. Менавіта Спаса-Праабражэнскай царкве Ефрасіння падаравала вельмі каштоўны, вядомы ва ўсім свеце Крыж. Сама царква знаходзілася ў жаночым Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры. Сюды па просьбе вернікаў Полацкага павета ў 1910 г. былі перанесены з Кіева мошчы найпадобнейшай. Царкве Багародзіцы Ефрасіння падаравала выдатны твор мастацтва — ікону Багародзіцы, якая была прывезена з далёкай Візантыі.

*Ці захаваліся згаданыя цэрквы да нашых дзён?*

У келлі пры Полацкім Сафійскім саборы асветніца перапісвала кнігі. Магчыма таксама, што яна стварыла школу для навучання грамаце.

Сваё жыццё Ефрасіння скончыла падчас падарожжа ў Іерусалім у 1173 г. Святую найпадобную Ефрасінню вернікі лічаць заступніцай беларускай зямлі.

***Кірыла Тураўскі*** яшчэ пры жыцці набыў вядомасць як выдатны для свайго часу пісьменнік і прамоўца. Яго называлі другім Златавустам (першым быў вялікі хрысціянскі багаслоў IV ст. Іаан). Кірыла пакінуў вялікую літаратурную спадчыну: ім напісаны «Словы» (казанні) на некаторыя вялікія царкоўныя святы, павучанні, малітвы, каноны, ***прытчы***. Яны шмат разоў перапісваліся нароўні з творамі візантыйскіх багасловаў.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Пра жыццё Кірылы, які нарадзіўся каля 1113 г. або ў 1130-я гг. у Тураве, вядома няшмат. У «Жыціі» Кірылы распавядаецца: «Сын заможных бацькоў, ён не любіў, аднак, багацця і тленнай славы гэтага свету, але найперш стараўся спасцігнуць вучэнне боскіх кніг і добра напрактыкаваўся ў святых пісаннях». Ён прыняў манаскі пострыг, а пасля «ушел в затвор на столп» — стаў першым вядомым на Русі «стоўпнікам» (зачыніўся ў манастырскай вежы, каб цалкам аддацца роздуму і малітвам). Вядома, што ў 1169 г. Кірыла па просьбе князя і гараджан быў вылучаны на пасаду тураўскага епіскапа.

*Як вы думаеце, ці жадаў сам Кірыла заняць месца епіскапа?*

Як і Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі стаў адным з найбольш шанаваных святых Беларусі.

**5. Вынікі і значэнне пашырэння хрысціянства.** Хрысціянства значна змяніла ўсходнеславянскае грамадства. Людзі пачалі імкнуцца да выратавання сваёй бессмяротнай душы, для чаго трэба было выконваць шэраг запаведзяў: шануй бацьку твайго і маці тваю, не забі, не ўкрадзі, не падмані. Хрысціянства заклікала чалавека жыць па прынцыпе «не рабі бліжняму таго, чаго не жадаеш сабе». Гэта садзейнічала ўсталяванню добрых адносін паміж людзьмі.

*Даведайцеся, калі ў вашай мясцовасці былі пабудаваны першыя цэрквы і заснаваны першыя манастыры, да якой епархіі належыць ваш населены пункт.*

**Значэнне і наступствы прыняцця хрысціянства**

- ˜ мацаванне дзяржаўнай улады
- Змена міжнароднага становішча
- Развіццё культуры
- Змены ў побыце і ў адносінах паміж людзьмі

*З дапамогай схемы распавядзіце пра наступствы прыняцця хрысціянства ўсходнімі славянамі.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Хрысціянскае веравучэнне патрабавала цярпліва зносіць пакуты зямнога жыцця, бо гэтыя выпрабаванні дадзены суразмерна чалавечым магчымасцям. Хрысціянін павінен заўсёды памятаць пра ахвяру Ісуса Хрыста і рабіць так, каб гэтая ахвяра не была марнай.

Хрысціянская царква забараніла ахвярапрынашэнні, што былі ў язычнікаў. Паступова адыходзілі ў мінулае кроўная помста, мнагажонства.

Прыняцце хрысціянства аказала значны ўплыў на развіццё культуры. Дзякуючы хрысціянству на беларускай зямлі з'явіліся *мураванае дойлідства*, іканапіс, фрэскавы жывапіс. Пасля хрышчэння распаўсюдзілася пісьменнасць на славянскай мове. Гэта стала магчымым таму, што ў свой час асветнікі Кірыла і Мяфодзій і іх вучні склалі славянскую азбуку і пераклалі кнігі для набажэнства. Праз пасрэдніцтва Візантыі ўсходнія славяне змаглі дакрануцца да здабыткаў антычнай культуры.

Пад уздзеяннем шэрагу вельмі грунтоўных прычын нашы продкі прынялі хрысціянства. Хрысціянскае веравызнанне значна змяніла аблічча тагачаснага грамадства і стала неад'емнай рысай беларускага этнасу (народа).

**Пытанні і заданні**

**1.** Назавіце асноўныя прычыны пашырэння хрысціянства на беларускіх землях.
**2.** Як і калі хрысціянская вера пранікла на беларускія землі? Хто былі першыя хрысціяне ў Полацкім княстве?
**3.** Якія адносіны склаліся паміж язычніцтвам і хрысціянствам?
**4.** Чым вядомыя Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі?
**5.** Складзіце паведамленні пра беларускую святую, асветніцу Ефрасінню Полацкую і пра дзейнасць Кірылы Тураўскага.
**6.** Якія вынікі і значэнне мела пашырэнне хрысціянства на беларускіх землях?
**7.** Паразважайце, ці маглі ўсходнія славяне і надалей заставацца язычнікамі.


Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 15. Культура беларускіх зямель у Высокім сярэднявеччы

**Успомніце.** *1. З якіх частак складаліся гарады ўсходніх славян Высокага сярэднявечча? 2. Што такое фрэска і мазаіка? 3. Хто стварыў славянскую азбуку і паклаў пачатак славянскай пісьменнасці?*

**Вы даведаецеся.** Да нашага часу дайшло няшмат прыкладаў старажытнарускага мастацтва. Шматлікія войны, якія смяротнымі хвалямі праходзілі па беларускіх землях, знішчылі здабыткі культуры нашых продкаў. Аднак і тое, што засталося, уражвае сваім высокім узроўнем. Археолагі знайшлі і сведчанні шырокага распаўсюджання сярод насельніцтва пісьменнасці. Што гэта за сведчанні? Якія асаблівасці мелі дойлідства і мастацтва ў той час?

**1. Забудова гарадоў.** Драўляная архітэктура надавала непаўторнае аблічча гарадам усходніх славян. Галоўнай асаблівасцю сярэднявечных гарадоў былі ўмацаванні, якія абкружалі іх з усіх бакоў. Найбольш трывала ўмацоўваўся дзядзінец. Ён выглядаў як маленькі горад у вялікім. Умацаваннямі служылі сцены, вежы і равы. Гарадскія сцены складаліся з драўляных зрубаў, прыстаўленых адзін да аднаго. Яны ўтваралі кальцо ўмацаванняў. Унутры зрубы запаўняліся зямлёй.

Галоўнымі вузламі абароны былі вежы. Вежы сярэднявечных гарадоў падзяляліся на брамныя і вартаўнічыя (дазорныя). Таксама вежы маглі стаяць асобна ад сцен і будавацца з камянёў ці цэглы. Такая вежа была ўзведзена ў Берасці і пазней у Камянцы.

У горад вялі ўмацаваныя брамы. Іх колькасць залежала ад даўжыні сцен. Звычайна да брамаў праз вал перакідваліся масты. У летапісах згадваецца, што масты перад брамамі былі «перамётнымі», гэта значыць пад'ёмнымі. Галоўная брама горада называлася залатой, а другая па важнасці — срэбнай. Праз залатую браму заязджалі самыя ганаровыя госці, праз яе ж імкнуліся ўварвацца ў горад і ворагі.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Асноўная частка горада падзялялася на двары. Двор, які складаўся са шматлікіх пабудоў, мог нагадваць цэлы сучасны гарадскі квартал, што належаў аднаму гаспадару. Так, існавалі «княж двор», «уладычан двор», «гасцінны двор». У буйны́х гарадах будаваліся і гандлёвыя падвор'і аб'яднанняў купцоў.

> ? *Як вы думаеце, каму яны належалі?*

У перыяд раздробленасці ў цэнтры большасці гарадоў з'явіліся княжацкія палацы. У старэйшым горадзе княства можна было таксама знайсці мытню, стражышча (дом для варты), «поруб» (турму). На рынкавай плошчы стаялі гандлёвыя крамы і корчмы. Неўмацаваная частка горада па-за межамі абарончых сцен называлася *пасадам*. Падчас небяспекі людзі з пасаду ратаваліся ў крэпасці.

Умацаванні ўсіх сярэднявечных гарадоў Русі былі падобныя. Своеасаблівае ж аблічча асобным гарадам надавалі рэлігійныя пабудовы — цэрквы.

**2. Мураванае дойлідства і мастацтва.** Першыя хрысціянскія цэрквы на беларускай зямлі будаваліся з дрэва. Часта іх ставілі на месцы былых язычніцкіх свяцілішчаў. З цягам часу ва ўсходнеславянскіх гарадах з'явіліся і мураваныя цэрквы. Мураванае дойлідства — гэта ўзвядзенне будынкаў з каменю і цэглы, змацаваных вапнавым растворам.

> Першапачаткова сабор меў пяць або сем купалоў. Ён адрозніваўся ад Сафійскага сабора ў Ноўгарадзе, хаця, магчыма, яго будавалі тыя ж майстры. Іх імёны вядомыя. У самой Полацкай Сафіі падчас раскопак археолагі знайшлі ў падмурку вялікі камень. На ім былі надрапаны імёны: Давыд, Тума, Мікула, Пётр і інш.

Самым старажытным прыкладам мураванага дойлідства на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца Полацкі Сафійскі сабор. Ён быў узведзены ў 50-х гг. XI ст. — у час росквіту Полацкай зямлі. Гэта быў трэці, пасля кіеўскага і наўгародскага, храм у землях усходніх славян, прысвечаны Сафіі. «Сафія» азначае мудрасць Бога — творцы ўсяго існага. Сабор меў і грамадска-палітычнае значэнне: тут

с. 17



Правообладатель Издательский центр БГУ

захоўваліся архіў, бібліятэка, дзяржаўная казна.

> ? *Як вы думаеце, чаму казну захоўвалі менавіта ў саборы?*

У час палітычнай раздробленасці ўтварыліся архітэктурныя школы. У іх выяўляліся мясцовыя традыцыі будаўніцтва, уплывы суседніх краін, густы замоўцы або творчая манера галоўнага майстра-дойліда. Так узніклі полацкая і гродзенская архітэктурныя школы.

Аднакупальнай Спаса-Праабражэнскай царкве дойлід Іаан надаў ярусны вежападобны выгляд. Іншай яе асаблівасцю былі так званыя какошнікі, якія аздаблялі вежу купала. Какошнікі ўпершыню ва ўсім усходнеславянскім свеце з'явіліся на Спаса-Ефрасіннеўскай царкве. Гэты новы тып будынкаў з'яўляецца адметнай рысай полацкай архітэктурнай школы дойлідства.

*Як вы разумееце выраз «архітэктурная школа»?*

Вы ўжо ведаеце, што па замове Ефрасінні Полацкай для заснавання ёй жаночага манастыра была пабудавана Спаская царква. Вядома, што работа вялася пад кіраўніцтвам дойліда Іаана (Івана). Унутры царква была ўпрыгожана ўнікальнымі фрэскамі, якія амаль цалкам захаваліся з тых часоў.

Іншы выдатны помнік дойлідства XII ст. — Барысаглебская (у гонар святых Барыса і Глеба) царква ў Гродне. Часцей яе называюць Каложскай царквой, таму што яна была пабудавана ў прадмесці Каложа.

Звонку сцены Барысаглебскай царквы аздоблены камянямі розных колераў: чырвонымі, карычневымі, шэра-зялёнымі і інш. Часцей за ўсё яны выкладзены ў форме крыжа. Добра адшліфаваныя камяні блішчаць на сонцы. Унутры ў сцены былі ўмураваны гліняныя збаны-галаснікі. Дзякуючы ім у царкве лепш гучаў голас святароў. Таксама на сцены былі нанесены фрэскі. Падлога царквы была ўпрыгожана складаным узорам з маёлікавай пліткі.

*Як вы думаеце, чаму ў тыя часы вялікая ўвага надавалася ўпрыгожванню цэркваў?*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне. Сучасны выгляд



Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку. Сучасны выгляд



Крыж Ефрасінні Полацкай

Каложская царква — найбольш яркі прыклад гродзенскай архітэктурнай школы дойлідства. Падобных цэркваў у іншых мясцінах не знойдзена.

Высокага ўзроўню дасягнула на беларускіх землях выяўленчае мастацтва. Яно было прадстаўлена не толькі фрэскамі, але і кніжнымі мініяцюрамі. Найвышэйшым узорам *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва* на беларускіх землях з'яўляецца крыж, выкананы майстрам Лазарам Богшам па замове Ефрасінні Полацкай у ***1161 г.***

**3. Пісьменнасць.** Пасля прыняцця хрысціянства шырокае распаўсюджанне ва ўсходніх славян атрымала кірылічнае пісьмо. Да гэтага часу на славянскую мову былі



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Прыклады мастацтва** — **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

**Фрэскі**
- у полацкай Спаскай царкве;
- у Каложскай царкве

**Абразы (іконы)**
- з Візантыі, візантыйскія традыцыі

**Кніжныя мініяцюры**
- у Тураўскім евангеллі XI ст.;
- у Аршанскім евангеллі XIII ст.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**
- аздабленне прадметаў побыту, зброі, посуду;
- шахматныя фігуры;
- абразкі з выявамі святых;
- крыж Ефрасінні Полацкай

? *З дапамогай схемы высветліце, якія прыклады сведчаць аб высокім узроўні развіцця мастацтва ў Высокім сярэднявеччы.*

перакладзены свяшчэнныя кнігі. Па адной з кніг Біблii — Псалтыру — звычайна вучыліся грамаце.

Але не толькі для рэлігійных спраў патрэбна было ўмець пісаць і чытаць. Пісьмом у сваёй дзейнасці карысталіся гандляры і рамеснікі, зборшчыкі даніны і суддзі, а таксама простыя людзі ў сваіх паўсядзённых справах.

Пісьменнасць была добра вядомая ў Полацкай зямлі ў XI ст. Сведчаннем таму з'яўляюцца знойдзеныя надпісы. Яны рабіліся на княжацкіх пячатках, буйны́х камянях — валунах, сценах цэркваў, прасліцах, амфарах. Падчас раскопак у Брэсце быў знойдзены грэбень з самшыту (трывалае дрэва), на якім былі выдрапаны літары ад «А» да «Л». Пэўна, грэбень выконваў ролю «азбукі».



Грэбень з алфавітам. Берасце

? *Як вы думаеце, чаму людзі таго часу часта змяшчалі алфавіт на паўсядзённых рэчах?*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Барысаў камень з ваколіц Друі. Малюнак *Аляксея Сапунова.* 1896 г.



Старонка «Тураўскага евангелля»

? *Чаму на старонках старажытных кніг немагчыма знайсці зусім аднолькавыя літары?*

**4. Помнікі пісьменства.** Да нашага часу дайшло няшмат сведчанняў ведання нашымі продкамі граматы. Найлепш захоўваліся надпісы, зробленыя на трывалым прыродным матэрыяле — камянях. На поўначы Беларусі ў рэчышчы Заходняй Дзвіны яшчэ з часоў адыходу ледавіка знаходзіліся вялікія валуны. На іх у XII ст. былі высечаны крыжы і аднолькавы надпіс: «Господи, помози рабу своему Борису». Адсюль назва: *Барысавы камяні*. Напэўна, надпісы былі зроблены па загадзе полацкага князя Барыса Усяславіча. Выказана меркаванне, што князь звяртаўся да Бога, каб той даў добры ўраджай пасля галоднай зімы. Яшчэ адзін надпіс на камені быў зроблены сынам Барыса Усяславіча Рагвалодам у 1171 г. Рагвалодаў камень быў знойдзены ў XIX ст. каля Оршы, але да нашых дзён не збярогся.

Найбольш каштоўнымі помнікамі сярэднявечнай пісьменнасці з'яўляюцца кнігі. Самая старажытная кніга з беларускіх зямель, якая захавалася да нашых дзён, — Тураўскае *евангелле* XI ст.

Безумоўным сведчаннем высокага ўзроўню адукаванасці насельніцтва з'яўляюцца ***берасцяныя граматы***. Гэтыя лісты на бяросце (кары бярозы) паказвалі штодзённае жыццё людзей Сярэднявечча. У іх людзі пісалі пра свае гаспадарчыя, гандлёвыя, сямейныя справы, пра збор падаткаў, занатоўвалі пазыкі, звярталіся да ўладаў,



Правообладатель Издательский центр БГУ



Берасцяная грамата з Віцебска. Канец XIII ст.

? *Падумайце, чаму ўсходнія славяне ў Сярэднявеччы выкарыстоўвалі для пісання бяросту, а не больш звыклыя для нас зараз матэрыялы.*

практыкаваліся ў пісанні і нават рабілі малюнкі. На тэрыторыі Беларусі знойдзена тры берасцяныя граматы: адна ў Віцебску і дзве ў Мсціславе. Найбольш старажытная грамата з Мсціслава адносіцца да першай паловы XII ст.

Акрамя бяросты насельніцтва беларускіх зямель пісала на пакрытых воскам таблічках. Для гэтага выкарыстоўваліся спецыяльныя завостраныя палачкі — стыласы.

Такім чынам, насельніцтва беларускіх зямель у Высокім сярэднявеччы стварыла своеасаблівую культуру высокага ўзроўню. Нешматлікія прыклады дойлідства і мастацтва захаваліся да нашага часу. Гэтая спадчына сведчыць аб таленце і майстэрстве нашых продкаў.

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце галоўныя асаблівасці гарадоў Высокага сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі.
2. Што такое мураванае дойлідства? Назавіце прыклады перыяду Высокага сярэднявечча.
3. Прывядзіце прыклады пабудоў полацкай і гродзенскай архітэктурных школ дойлідства. У чым іх асаблівасці?
4. Чым было прадстаўлена мастацтва беларускіх зямель Высокага сярэднявечча?

Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Якімі ўзорамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ганарыцца Беларусь?
6. У чым асаблівасці пашырэння пісьменнасці на тэрыторыі Беларусі? Дакажыце на канкрэтных прыкладах, што на беларускіх землях ужо з XI ст. была распаўсюджана пісьменнасць.
7. Як вы думаеце, чаму на тэрыторыі Беларусі ад часу Высокага сярэднявечча захавалася няшмат помнікаў культуры ў параўнанні з Заходняй Еўропай?

## § 16. Паўсядзённае жыццё нашых продкаў у IX — першай палове XIII ст.

**Успомніце.** *1. Хто належаў да заможнага пласта насельніцтва Старажытнай Русі? 2. Што ўяўляла сабой дружына і апалчэнне ўсходніх славян?*

**Вы даведаецеся.** Жыццё насельніцтва беларускіх зямель у Высокім сярэднявеччы, вядома, адрознівалася ад сучаснага. Тым не менш і тады людзей непакоілі зразумелыя для нас праблемы: як знайсці ежу і стварыць добрыя, камфортныя ўмовы жыцця, у што апрануцца і як бавіць вольны час. Як жа вырашаліся гэтыя справы ў далёкім мінулым?

**1. Што ўяўлялі сабой паселішчы і жытлы нашых продкаў.** Найбольш уплывовым, пануючым слоем тагачаснага грамадства з'яўляліся князі і блізкія да іх людзі — дружыннікі і «княжыя мужы». Аднак асноўную частку насельніцтва складалі простыя абшчыннікі — «людзі». Іх паўсядзённае жыццё моцна адрознівалася ад княжацкага і баярскага.

Паселішчы сялян былі пераважна невялікімі. Яны называліся сёламі (вёскамі). Сяляне жылі ў малых драўляных хатах з аднаго памяшкання. Яны былі курныя, гэта значыць ацяпляліся глінабітнай печчу без коміна. Хаты мелі прамавугольную форму, чатырохсхільную страху (дах), пакрытую саломай або абчасанымі дошкамі. Сцены складваліся з бярвёнаў, паміж якімі для ўцяплення закладваўся мох. Акенцы ў сценах былі вузенькімі. Яны закрываліся


Правообладатель Издательский центр БГУ

драўлянай заслонкай або зацягваліся бычыным пузыром. Спалі сяляне на лавах ці палацях з дошак.

Жыллё простых людзей IX–XIII стст. мала чым адрознівалася ад пабудоў усходніх славян больш ранняга часу. Аднак жытлы гараджан у гэты час былі больш прасторнымі і камфортнымі. Сваімі памерамі, раскошай унутранай аздобы вылучаліся харомы знаці. Разам з хатамі халопаў і рамеснікаў, якія працавалі на баярына, баярскія двары займалі значную тэрыторыю.

**2. У што апраналіся і што елі нашы продкі.** Сялянскае адзенне было простым і практычным. Шылі яго з саматканага палатна. Мужчыны насілі доўгія кашулі і порты (штаны). Абуткам служылі лапці з ліпавага лыка (кары), радзей скураныя поршні. У халодны час выкарыстоўваліся суконныя світкі, кажухі, валеныя з воўны або пашытыя з аўчыны шапкі, рукавіцы. Жаночае адзенне было больш разнастайным і прыгожым.



Поршань. XII–XIII стст. Гродна



Чаравік. XII–XIII стст. Гродна

Сяляне харчаваліся пераважна ежай раслiннага паходжання. Мясныя стравы спажываліся часцей за ўсё на рэлігійныя і сямейныя святы. Промыслы, якімі займаліся ўсходнія славяне, давалі мёд, рыбу, мяса дзічыны, грыбы, арэхі, ягады. Галоўным прадуктам харчавання быў хлеб. Шырока ўжывалася ў ежу гародніна.

Харчаванне багатых людзей было больш разнастайным. У ім пераважалі мясныя стравы. Да стала знаці падавалі розныя пачастункі і заморскія віны.

**3. На чым перасоўваліся нашы продкі.** У часы Старажытнай Русі вялікую ролю адыгрываў водны транспарт — чаўны, ладдзі. Па рэках перавозілі даніну і розныя тавары для гандлю, перамяшчаліся войскі і перасяляліся людзі. На шчасце, праз Беларусь працякае

Правообладатель Издательский центр БГУ





Старажытнарускія воіны. X ст. Малюнкі *Алега Фёдарава*

? *Пералічыце засцерагальную і баявую зброю, якую вы бачыце на малюнках.*

мноства буйны́х рэк са шматлікімі прытокамі. Па беларускіх землях праходзіла частка гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі» і адно з яго адгалінаванняў па Заходняй Дзвіне.

Звычайным сухапутным транспартам былі розныя павозкі (вазы), а ў зімовы час — сані. У вазы запрагалі коней або валоў. Коні выкарыстоўваліся і для верхавой язды.

Вандраванне па дарогах у той далёкі час было складанай справай. Дарогі часта размываліся і ператвараліся ў непралазную гразь. Значныя тэрыторыі займалі лясы і балоты. Цяжка было перайсці праз рэкі. Аднак людзі пракладвалі гаці з бярвёнаў на балотах, рабілі масты праз рэкі. Добраўпарадкаванне дарог з часам зрабілася адной з павіннасцей насельніцтва.

**4. Ваенная справа і зброя.** Надзвычай вялікая ўвага ў Сярэднявеччы надавалася вайсковай справе. Аснову войска таго часу складалі княжацкія дружыны. Па меры неабходнасці склікалася апалчэнне.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Старажытнарускі меч, які быў выпадкова знойдзены ў 2020 г. каля Бабруйска

Найбольш каштоўнай зброяй у той час быў меч. Выкарыстоўваліся таксама коп'і, баявыя сякеры, больш рэдка — булавы. Як сведчаць крыніцы, вялікага майстэрства дасягнулі воіны Полацкай зямлі ў стральбе з лука.

На працягу X–XIII стст. удасканальвалася засцерагальная зброя: яна станавілася ўсё больш цяжкай і моцнай. Металічныя кальчугі ахоўвалі амаль усё цела. Ваяры карысталіся пласцінкавымі панцырамі, а таксама разнастайнымі шлемамі і шчытамі.

Княжацкія дружыннікі звычайна мелі вельмі дарагую і якасную зброю і выступалі ў паход на конях. Сярод вояў апалчэння прысутнічалі і бедныя. Яны былі пешымі, і іх узбраенне абмяжоўвалася шчытом, сякерай і кап'ём. Некаторыя маглі мець толькі кароткае кідальнае кап'ё — суліцу.

У час бітваў шырока выкарыстоўваліся ваенныя хітрасці: завалы дарог, засады, пасткі, падманныя манеўры войска, высочванні праціўніка і шмат іншага. Пісьмовыя крыніцы сведчаць аб тым, што ўсходнія славяне былі выключна мужнымі воінамі. У бітвах яны вызначаліся стойкасцю, вытрымкай, воінскім братэрствам.

**5. Забавы.** Усе важныя падзеі ў жыцці людзей у тыя часы суправаджаліся спевамі, танцамі, музыкай. Музычныя інструменты былі самыя разнастайныя: духавыя (дудкі, рогі), струнныя (гуслі, смыкі) і ўдарныя (бубны).

Добра ўмелі граць на розных інструментах старажытнарускія скамарохі. Сваёй музыкай, спевамі і танцамі яны пацяшалі насельніцтва гарадоў і вёсак. Скамарохі таксама былі фокуснікамі, акцёрамі. Яны вадзілі за сабой прыручаных мядзведзяў, пастаянна вандравалі і выступалі на розных святах і таргах.

*Як вы думаеце, чаму царква забараняла выступленні скамарохаў?*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Каменная шахматная ладдзя. Гродна. XII ст.



Ігрышча. Мініяцюра з летапісу

? *Чыё выступленне паказана на мініяцюры?*

Улюбёнай забавай багатых людзей было паляванне. Палявалі з дапамогай сабак і драпежных птушак — ястрабаў і сокалаў, а князі — нават з гепардамі. Пасля палявання яго ўдзельнікі бялявалі, частаваліся стравамі з забітай дзічыны.

У час раскопак у Полацку былі выяўлены касцяныя канькі. Знаходка датуецца XII ст. Памеры канькоў сведчаць аб тым, што імі карысталіся дзеці.

Дарослыя бавілі час за гульнёй у шашкі і шахматы. Паўсюдна на тэрыторыі Старажытнай Русі археолагі знаходзяць шахматныя фігуркі, зробленыя з рогу, дрэва, каменю. Шмат іх знойдзена і на тэрыторыі Беларусі.

Такім чынам, у IX–XIII стст. нашы продкі шмат працавалі, але знаходзілі час і для розных забаў. Паўсядзённае жыццё і побыт людзей у той час залежалі ад іх становішча ў грамадстве.

**Пытанні і заданні**

1. Што ўяўлялі сабой паселішчы сялян? Як выглядалі жытлы сялян і баяр?
2. Якое было адзенне ў людзей IX–XIII стст.?
3. Чым адрознівалася сялянская ежа ад страў багатых людзей?
4. Якімі відамі транспарту карысталіся нашы продкі?



Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Пералічыце ўзбраенне і ваенныя прыёмы ўсходнеславянскіх воінаў.
6. Як бавілі час нашы продкі ў перыяд Высокага сярэднявечча?
7. Падумайце, чым адрозніваецца жыццё нашых продкаў у Сярэднявеччы ад жыцця сучасных людзей. У чым можна знайсці падабенства?

## Абагульненне

У другім раздзеле вы пазнаёміліся з гісторыяй перыяду, калі на тэрыторыі Беларусі ўзніклі першыя дзяржавы. З'яўленне дзяржавы — важны этап у развіцці грамадства. Аб'яднаўшыся вакол аднаго ўладара, лягчэй было абараняцца ад ворагаў. Акрамя таго, кіраўнік вырашаў канфлікты паміж сваімі падданымі, караў злачынцаў.

Важным крокам да стварэння дзяржавы сталі племянныя княжанні. У іх ужо была даволі трывалая княжацкая ўлада. Такія княжанні ўзніклі ў палачан і дрыгавічоў. Пазней славяне, якія пасяліліся на тэрыторыі Беларусі, апынуліся ў складзе Старажытнарускай дзяржавы. Яе сталіца знаходзілася ў Кіеве, менавіта там размяшчаўся вялікі князь, якому плацілі даніну ўсе «плямёны» ўсходніх славян. Некаторы час падпарадкоўваліся Кіеву і палачане, і дрыгавічы. Яшчэ ў другой палове X ст. у галоўным горадзе крывічоў-палачан Полацку з'явіўся ўласны князь — Рагвалод. Сваю незалежнасць Полацкае княства аднавіла пад уладай сына кіеўскага князя Уладзіміра — Ізяслава. У той жа час па маці ён быў і ўнукам Рагвалода.

Найвышэйшай магутнасці Полацк дасягнуў у княжанне Усяслава Брачыславіча. Полацкае княства на роўных выступала супраць кіеўскіх князёў, былі пашыраны яго межы. Але пасля смерці князя Усяслава Полацкая зямля была падзелена паміж яго сынамі на асобныя княствы-воласці. Гэта прывяло да аслаблення некалі магутнага Полацкага княства.

Значна пазней незалежным стала і Тураўскае княства, якое ўзнікла на землях дрыгавічоў.


Правообладатель Издательский центр БГУ

У перыяд раздробленасці ў Полацкім і Тураўскім княствах існавалі свае асаблівасці ўнутранага кіравання. У Полацку меў уплыў народны сход — веча, а ў Тураве значная ўлада належала пасадніку.

Раздробленасць з яе міжусобіцамі і пастаянным драбленнем княжацкіх уладанняў аслабляла старажытнарускія землі. Усё цяжэй рабілася адбіваць напады знешніх ворагаў. Нямецкія рыцары-крыжакі ў пачатку XIII ст. заваявалі Усходнюю Прыбалтыку. Неўзабаве паўстала яшчэ больш страшная пагроза — манголы.

У перыяд Высокага сярэднявечча на беларускіх землях з’явілася прыватнае землеўладанне. Так пачалося развіццё феадальных адносін. У той жа час былі пабудаваныя гарады, якія існуюць і сёння.

Найбольш важнай падзеяй у гісторыі беларускіх зямель было распаўсюджванне хрысціянства. Гэта аказала глыбокае ўздзеянне на жыццё людзей. У Высокім сярэднявеччы насельніцтва беларускіх зямель стварыла самабытную культуру, якая захоўваецца стагоддзямі.

**Заданне 1.** Раскажыце аб падзеях, якія звязаны з наступнымі датамі: 862, 980, 988, 1019, 1067, 1129.

**Заданне 2.** Знайдзіце на картасхемах вучэбнага дапаможніка або атласа:

а) межы Старажытнарускай дзяржавы (Кіеўскай Русі);
б) межы Полацкага і Тураўскага княстваў;
в) суседзяў Полацкага і Тураўскага княстваў;
г) найбольш старажытныя гарады на тэрыторыі Беларусі (якія згадваюцца ў IX–XI стст.);
д) водны гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі» і яго адгалінаванні.

**Заданне 3.** Складзіце ў вуснай форме кароткія паведамленні з выкарыстаннем паняццяў, якія даюцца ў дужках:

а) «Збор даніны ў славян» (князь, дружына, палюддзе, даніна);
б) «Сярэднявечны горад» (дзядзінец, пасад, рамяство, гандаль, сабор, торг);


Правообладатель Издательский центр БГУ

в) «Прыняцце хрысціянства» (язычніцтва, хрысціянства, сабор, царква, евангелле).

**Заданне 4.** Растлумачце лагічныя ланцужкі:

знешняя небяспека → узмацненне княжацкай улады → узнікненне дзяржавы;

размеркаванне князямі сваіх уладанняў паміж сынамі → палітычная раздробленасць;

аслабленне княжацкай улады → узрастанне ролі веча ў Полацкім княстве;

развіццё рамяства і гандлю → узнікненне гарадоў.

**Заданне 5.** Раскажыце аб наступных гістарычных падзеях і з'явах:

а) бітва на рацэ Нямізе;
б) узнікненне гарадоў;
в) барацьба з крыжакамі;
г) барацьба з манголамі;
д) прыняцце хрысціянства;
е) з'яўленне рукапісных кніг.

**Заданне 6.** Вызначце прычыны:

а) палітычнай раздробленасці;
б) аслаблення ўлады полацкіх князёў у XII ст.;
в) перамог манголаў падчас нашэсця 1237–1241 гг.

**Заданне 7.** Зрабіце параўнанне.

| План параўнання | Полацкае княства | Тураўскае княства |
|---|---|---|
| **Калі ўзнікла?**<br>**Якую тэрыторыю займала?**<br>**Калі ўпершыню згадваецца сталіца?**<br>**Першыя летапісныя князі**<br>**Асаблівасці кіравання** | | |
| | **Агульны вывад** | |

Правообладатель Издательский центр БГУ



РАЗДЗЕЛ III

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРЫЯД УЗНІКНЕННЯ І ЎМАЦАВАННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (СЯРЭДЗІНА XIII — КАНЕЦ XIV ст.)

## § 17. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ)

**Успомніце.** *1. Хто такія балты? На якія групы і плямёны падзяляліся балты ў пачатку Сярэднявечча? 2. Якія адносіны складваліся паміж балтамі і ўсходнімі славянамі ў Раннім сярэднявеччы?*

**Вы даведаецеся.** У XIII ст. у выніку аб'яднання балтаў і ўсходніх славян, якія жылі ў Панямонні, узнікла моцная дзяржава. Хутка яе заўважылі ў Еўропе. Уладар новай дзяржавы нават атрымаў тытул караля. Як жа гэта адбылося? Якую ролю ў стварэнні гэтай дзяржавы адыграла насельніцтва беларускіх зямель?

**1. Перадумовы ўтварэння Вялікага Княства.** У сярэдзіне XIII ст. ва Усходняй Еўропе ўтварылася новая дзяржава. У яе ўвайшлі літоўскія і частка беларускіх («рускіх») зямель. Таму пазней дзяржава атрымала назву «Вялікае Княства Літоўскае і Рускае». Часцей яе называлі проста ***«Вялікае Княства Літоўскае»***.

Якія ж былі перадумовы ўтварэння Вялікага Княства? Перш за ўсё гэта суседства ў басейне ракі Нёман усходнеславянскіх і балцкіх плямёнаў. Славяне і балты знаходзіліся на розных узроўнях развіцця. На славянскіх землях існавалі багатыя гарады з развітымі рамёствамі. Тут былі даўнія традыцыі дзяржаўнай арганізацыі. Усім гэтым не маглі пахваліцца балты. Але затое яны славіліся як грозныя воіны, якіх баяліся ворагі.



Правообладатель Издательский центр БГУ




Літоўскія землі ў першай трэці XIII ст.

? *Знайдзіце на картасхеме тэрыторыі Аўкштайціі, Жамойці і Літвы. Падумайце, якія выгоды і небяспеку мела іх геаграфічнае становішча.*

На землях балтаў вылучаліся дзве вобласці — *Аўкштайція* і *Жамойць*. Адзін з раёнаў Аўкштайціі называўся *Літва*. Ён стаў цэнтрам аб'яднання балцкіх плямёнаў.

? *Калі Літва ўпершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Літоўцы паспяхова ваявалі з крыжакамі. У *1236 г.* яны разбілі Ордэн мечаносцаў пры Саўле (Шаўляі). Пасля гэтага Ордэн ужо не мог існаваць як самастойная дзяржава. У наступным годзе яго рэшткі былі далучаны да больш моцнага Тэўтонскага ордэна. Ён знаходзіўся на захад ад Літвы — у Прусіі.

> ? *Калі і з якой мэтай быў створаны Ордэн мечаносцаў?*

> ? *Калі адбылося мангольскае нашэсце на землі Русі?*

Поспехі Літвы прыцягвалі да яе беларускія землі, якія таксама змагаліся з крыжакамі. У сярэдзіне XIII ст. над Усходняй Еўропай навісла новая пагроза. У выніку мангольскага нашэсця большасць зямель Русі была захоплена. Для беларускіх зямель пошук моцных саюзнікаў стаў жыццёва неабходным.

Наступнай перадумовай з'яўлення дзяржавы стала гаспадарчае ўзвышэнне Беларускага Панямоння. Гэта быў край развітой сельскай гаспадаркі, рамёстваў і гандлю. Тут знаходзіліся гарады Новагародак (цяпер Навагрудак), Слонім, Ваўкавыск і інш. Панямонне было адным з найбольш спакойных рэгіёнаў на землях Русі. Крыжакі і татары з Арды доўгі час нават не дасягалі яго тэрыторыі.



Літоўскія воіны XIII ст. у паходзе

Кантакты славян і балтаў былі ў Панямонні асабліва цеснымі. Мясцовыя купцы і рамеснікі бачылі ў Літве не канкурэнта, а саюзніка ў барацьбе з ворагамі. Яны спакойна ўспрымалі ўмацаванне ў беларускіх гарадах улады літоўскіх князёў. Часам гараджане самі запрашалі іх на княжанне.



Правообладатель Издательский центр БГУ

| ˜аспадарчае ўзвышэнне ўсходнеславянскіх гарадоў у Панямонні | Рост ваеннай актыўнасці Літвы | Сталыя кантакты балтаў і славян у Панямонні | Рост знешняй пагрозы з боку крыжакоў і ардынцаў |
|---|---|---|---|

↓

**˜ тварэнне Вялікага Княства Літоўскага**

*З дапамогай схемы растлумачце перадумовы стварэння Вялікага Княства Літоўскага.*

**2. Міндоўг — першы ўладар новай дзяржавы.** Адным з самых магутных літоўскіх князёў быў ***Міндоўг***. Ён змог падпарадкаваць сабе іншых літоўскіх валадароў. У сярэдзіне XIII ст. князь Міндоўг распаўсюдзіў сваю ўладу на Беларускае Панямонне.



Каранацыя Міндоўга. Мастак *Адомас Варнас*

*Уважліва разгледзьце малюнак і адкажыце, хто прысутнічае на каранацыі.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Узвышэнне Міндоўга выклікала незадавальненне іншых літоўскіх князёў. Яны паднялі супраць яго мяцеж. Мяцежнікаў падтрымалі крыжакі і галіцка-валынскія князі. Аднак Міндоўг разбурыў небяспечны саюз. Ён прыняў каталіцтва і ў ***1253 г.*** каранаваўся ў Новагародку. Каралеўскую карону прыслаў Міндоўгу сам Папа Рымскі. Каранацыя Міндоўга можа лічыцца афіцыйнай датай утварэння ***Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ)***.

Каб заключыць мір з крыжакамі, Міндоўг часова аддаў ім частку Жамойці. Давялося таксама адмовіцца ад Новагародка, Ваўкавыска і Слоніма. Яны былі перададзены Раману, сыну галіцка-валынскага князя Данілы. За яго другога сына, Шварна, Міндоўг аддаў сваю дачку.

Пасля гэтага ён расправіўся з мяцежнымі літоўскімі князямі і вярнуў сабе Новагародак. Галіцка-валынскія князі спрабавалі аслабіць уладу Міндоўга пры дапамозе татараў Залатой Арды. Аднак іх паход на Літву і Беларускае Панямонне значных поспехаў не прынёс.

с. 20

**3. Барацьба за ўмацаванне дзяржавы.** Насельніцтва перададзенай крыжакам Жамойці не жадала скарыцца ворагу. У 1260 г. жамойты разбілі крыжакоў у бітве каля возера Дурбе. На землях Тэўтонскага ордэна выбухнула паўстанне.

Пасля гэтага Міндоўг разарваў пагадненне з крыжакамі. Ён уступіў у саюз з Аляксандрам Неўскім, князямі Полацка і Віцебска. Аднак супраць яго арганізавалі новую змову. У ***1263 г.*** Міндоўг быў забіты. На чале дзяржавы стаў адзін са змоўшчыкаў — жамойцкі князь Транята.

Паводле летапісаў, адной з прычын забойства Міндоўга стала тое, што ён хацеў забраць жонку аднаго з літоўскіх уладароў — Даўмонта. Калі Міндоўг быў забіты, Даўмонт уцёк у Пскоў. Там яго прыязна прынялі пскавічы, і ён стаў іх князем. Даўмонт хрысціўся па праваслаўным абрадзе пад імем Цімафей і нават быў прызнаны святым.

*Выкажыце сваё стаўленне да ўчынку Даўмонта. Як вы думаеце, чаму ён быў гасцінна прыняты пскавічамі?*



Правообладатель Издательский центр БГУ




Генеалагічная схема «Літоўскія і галіцка-валынскія князі»

? *На дадзеным прыкладзе паразважайце, якую ролю адыгрывалі дынастычныя шлюбы.*

Становішча маладой дзяржавы было нялёгкім. Знешняя небяспека ўскладнялася ўнутранай барацьбой. ВКЛ амаль страціла беларускія землі. Дзяржава магла ператварыцца ў дробнае княства з выключна балцкім насельніцтвам. У гэтых абставінах рашучасць праявіў сын Міндоўга Войшалк. З дапамогай пінскіх князёў ён падпарадкаваў сабе Новагародак. Затым пры падтрымцы новагародцаў ён падначаліў Літву. Такім чынам, жыхары беларускіх зямель адыгралі ключавую ролю ў вяртанні дзяржаве адзінства.

Аднаўленне ВКЛ мела не меншае значэнне, чым яе ўтварэнне. Калі б пінчукі і новагародцы не падтрымалі Войшалка, сумесная балта-славянская дзяржава магла б знікнуць. Такім чынам, продкі беларусаў адыгралі галоўную ролю ў яе захаванні.

Хутка Войшалк сышоў у манастыр. Князі, якія кіравалі пасля яго, здолелі пашырыць сваю ўладу на ўсё Верхняе Панямонне. У канцы XIII ст. вялікім князем стаў Віцень, які кіраваў да 1316 г. Яго ўлада была досыць трывалай. Значная частка беларускіх зямель знаходзілася ўжо ў складзе Вялікага Княства Літоўскага.

Такім чынам, важныя прычыны і шэраг перадумоў прывялі да стварэння новай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага і Рускага. Стварэнне і далейшае падтрыманне гэтай дзяржавы былі б немагчымыя без актыўнага ўдзелу продкаў беларусаў.

с. 20

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Пытанні і заданні**

1. Якія перадумовы садзейнічалі ўтварэнню новай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага?
2. Чым адрозніваліся ў сваім развіцці славяне і балты?
3. Якія асаблівасці ў сваім становішчы і развіцці мела тэрыторыя Панямоння?
4. З якімі знешнімі і ўнутранымі цяжкасцямі сутыкнуўся Міндоўг на шляху ўзмацнення сваёй улады?
5. Якая падзея можа лічыцца датай утварэння Вялікага Княства Літоўскага?
6. У якіх умовах адбывалася развіццё новай дзяржавы ў канцы XIII – пачатку XIV ст.?
7. Падумайце, чаму насельніцтва беларускіх зямель было зацікаўлена ва ўмацаванні ўлады літоўскіх князёў.

## § 18. Умацаванне велікакняжацкай улады. Барацьба з крыжакамі

**Успомніце.** *1. У склад якіх княстваў уваходзілі беларускія землі ў першай палове XIII ст.? 2. Хто такія крыжакі? Якія мэты яны праследавалі?*

**Вы даведаецеся.** На працягу XIV ст. уся тэрыторыя сучаснай Беларусі ўвайшла ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Да яе далучыліся і іншыя ўсходнеславянскія землі. Як адбываўся працэс фарміравання тэрыторыі новай дзяржавы? Якія знешнія прычыны спрыялі гэтаму? Як нашы продкі змагаліся з небяспекай з боку крыжакоў?

**1. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ.** Да канца XIV ст. у склад Вялікага Княства Літоўскага ўвайшлі ўсе беларускія землі. Гэта адбывалася рознымі шляхамі. Часам мясцовыя жыхары бачылі ў літоўскіх уладарах надзейную абарону ад ворагаў. Таму яны самі запрашалі іх да сябе на княжанне. З запрошанымі князямі заключаліся спецыяльныя дагаворы. Яны гарантавалі ўсходнеславянскім землям захаванне даўніх парадкаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ




ВКЛ падчас кіравання першых літоўскіх князёў

**?** *Знайдзіце на картасхеме тэрыторыі, якія ўвайшлі ў склад ВКЛ: 1) праз дамову; 2) праз шлюб; 3) ваенным шляхам.*

Так, у 1307 г. Полацкая зямля часова трапіла ў рукі крыжакоў. Па просьбе палачан войскі князя Віценя прагналі немцаў. Са згоды мясцовых жыхароў Полацк апынуўся пад уладай ВКЛ.

Добраахвотна ўвайшла ў склад ВКЛ і Віцебская зямля. Віцебскі князь аддаў сваю дачку за Альгерда, сына вялікага князя літоўскага Гедзіміна. Пасля смерці цесця Альгерд стаў княжыць у Віцебску.

Некаторыя землі былі далучаны ваенным шляхам. У *1362 г.* войскі ВКЛ у *бітве на рацэ Сіняя Вада* (Сінія Воды) разбілі татарскія войскі. Гэта было першае буйное паражэнне татараў ва Усходняй Еўропе. Яно паклала пачатак вызваленню ўсходнеславянскіх зямель ад ардынскага ярма. Улада ВКЛ замацавалася на большай частцы ўкраінскіх зямель.

**?** *Якія старажытнарускія княствы размяшчаліся на ўкраінскіх землях да мангольскага нашэсця?*

с. 21

Правообладатель Издательский центр БГУ



Бітва на Сіняй Вадзе. 1362 г. Мастак *Артур Арлёнаў*

? *Як вы думаеце, на чыім баку змагаліся воіны з украінскіх зямель? Чаму?*

*З дапамогай дадатковых матэрыялаў высветліце час уваходжання вашай мясцовасці ў склад ВКЛ.*

Уваходжанне беларускіх зямель у ВКЛ было станоўчай з'явай. Мясцовыя жыхары атрымлівалі надзейную абарону ад знешняга ворага. Пры гэтым яны захоўвалі

**Шляхі ўваходжання беларускіх зямель у ВКЛ**

| са згоды мясцовых жыхароў, праз дагавор | праз шлюб | ваенным шляхам |
|---|---|---|
| ˆлацкае кня˜тва, Менскае кня˜тва | Віцебскае кня˜тва | Берасцейшчына, Мсцісл°ўскае кня˜тва |



Правообладатель Издательский центр БГУ

свой лад, традыцыі і веру бацькоў. Ва ўнутраныя справы славянскіх княстваў вярхоўная ўлада амаль не ўмешвалася. Гэтым тлумачыцца хуткае далучэнне да ВКЛ новых тэрыторый Русі.

**2. Княжанне Гедзіміна і Альгерда.** Пасля смерці Віценя ў ***1316 г.*** велікакняжацкі трон заняў яго брат ***Гедзімін***. Пры ім ВКЛ ператварылася ў адзін з галоўных цэнтраў аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель. Гедзімін праводзіў мудрую ўнутраную і знешнюю палітыку. Ён супрацьстаяў крыжацкай і татарскай агрэсіі. Пры ім актывізаваліся кантакты з Заходняй Еўропай. Адтуль ён запрашаў рамеснікаў і гандляроў. У часы Гедзіміна ВКЛ упершыню ўступіла ў антыгерманскі саюз з Польшчай.




*Як вы думаеце, чым вызначалася паслядоўнасць змены вялікіх князёў літоўскіх?*

У 1338 г. Гедзімін заключыў гандлёвы дагавор з Лівонскім ордэнам. У канцы тэксту дагавора сказана, што дагавор заключаны «са згоды караля Літвы і яго дзяцей і ўсіх баяр, якія таксама свае абрады пры гэтым здзейснілі, і са згоды епіскапа Полацка, караля і горада Полацка і караля (князя) Віцебска, якія ўсе на гэтым вышэй названым зборы цалавалі крыж».

*Пра што сведчыць удзел прадстаўнікоў мясцовых улад у заключэнні Гедзімінам гандлёвага дагавора?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У *1323 г.* Гедзімін перанёс сталіцу дзяржавы ў *Вільню* (цяперашні Вільнюс — сталіца Літоўскай Рэспублікі). Гедзімін называў сябе «кароль ліцвінаў і русінаў». Вядучае месца ў Вялікім Княстве заняла славянская культура. Старабеларуская мова стала тут афіцыйнай. Пры Гедзіміне большая частка Беларусі апынулася ў складзе ВКЛ. Тры чвэрці насельніцтва дзяржавы складалі продкі сучасных беларусаў.

Гедзімін быў язычнікам. Але ён цярпіма ставіўся да розных рэлігій. Гедзімін дазволіў дзейнасць каталіцкіх манахаў. Не чынілася перашкод будаўніцтву праваслаўных храмаў. Такія адносіны да рэлігіі садзейнічалі ўмацаванню краіны, рэлігійнаму міру.

Пасля смерці Гедзіміна ў ***1341 г.*** трон заняў ягоны сын Яўнут. Але браты Яўнута ***Альгерд*** і *Кейстут* пазбавілі яго ўлады. У ***1345 г.*** вялікім князем стаў Альгерд. Ён валадарыў у згодзе з Кейстутам. Кейстуту была перададзена ў кіраванне заходняя частка дзяржавы. Дзейнасць Кейстута была скіравана найперш на барацьбу з крыжакамі.

Усходняй часткай дзяржавы кіраваў Альгерд. Ён стараўся пашырыць межы ВКЛ на ўсходзе. У барацьбе за «рускія землі» Альгерду давялося сутыкнуцца з Залатой Ардой. Яна лічыла гэтыя тэрыторыі сваім уладаннем. Няпроста складваліся адносіны і з Маскоўскім княствам. Яно таксама стала прэтэндаваць на ролю аб'яднальніка Русі. Таму з цягам часу паміж літоўскімі і маскоўскімі князямі пачаліся войны.

> ? *Якую тэрыторыю займала Залатая Арда?*

За час княжання Альгерда ***(1345–1377)*** тэрыторыя ВКЛ павялічылася ў два разы. Аб'яднанне ўсходнеславянскіх княстваў стала галоўнай задачай дзяржавы. Гэта было карысна для беларускіх зямель. Яны занялі цэнтральнае месца ў краіне. Выгаднае размяшчэнне спрыяла развіццю эканомікі і культуры. Тым самым забяспечвалася вядучая роля беларускіх зямель у Вялікім Княстве.

с. 21

**3. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй.** У канцы XII ст. у Палесціне для барацьбы з «нявернымі» быў утвораны *Тэўтонскі ордэн*.



Правообладатель Издательский центр БГУ

У 1227 г. тэўтоны з’явіліся на поўначы Польшчы. Там яны хутка падпарадкавалі балцкія плямёны прусаў, роднасных літоўцам.

> **?** *Што дазваляла крыжакам, нягледзячы на шматлікія паражэнні, аднаўляць свае сілы?*

Пасля паражэння Ордэна мечаносцаў пры Саўле Папа Рымскі загадаў яму далучыцца да Тэўтонскага ордэна. У Прыбалтыцы ўтварылася дзве правінцыі Ордэна — пруская і лівонская. Паміж імі ляжала Жамойць. Крыжакі прагнулі захапіць яе, каб злучыць свае землі.

> **?** *Узгадайце, калі адбылася бітва пры Саўле.*



Асноўныя напрамкі крыжацкай агрэсіі

Да XIV ст. крыжовыя паходы ў Палесціну спыніліся. Таму барацьба з язычнікамі-літоўцамі стала асноўнай задачай тэўтонаў. Крыжакі рабілі свае паходы ў некалькіх напрамках. Важнымі тэрыторыямі для нападу былі землі Літвы і Жамойці. Але нападалі крыжакі і на хрысціянскія беларускія землі. З канца XIII ст. арэнай няспынных паходаў прускіх рыцараў стала Панямонне.


Выправа крыжакоў на беларускія землі ў сярэдзіне XIV ст.


Правообладатель Издательский центр БГУ

На захопленых землях крыжакі будавалі замкі, якія служылі апорай для далейшых паходаў. У адказ вялікія князі літоўскія стараліся ўзвесці магутны абарончы пояс. Непрыступнымі цвярдынямі сталі замкі ў Гародні (зараз Гродна), Навагародку, Лідзе, Крэве і іншых гарадах.

> Знайдзіце гэтыя гарады на карце.

**4. Стараста Давыд Гарадзенскі, князь Андрэй Полацкі.** Славу абаронцы ад крыжакоў Беларускага Панямоння набыў стараста




Замкі, пабудаваныя літоўскімі князямі
Крэпасці і замкі, пабудаваныя крыжакамі
Напрамкі нападаў нямецкіх рыцараў у XIV ст.
Напрамкі паходаў літоўскіх войскаў у XIV ст.

Супрацьстаянне Ордэна і ВКЛ у XIV ст.

> *На падставе картасхемы растлумачце неабходнасць захопу крыжакамі тэрыторыі Жамойці.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

***Давыд Гарадзенскі***. Ужо ў 1305 г. ён разбіў нямецкіх рыцараў каля Гародні. У наступным годзе Давыд узначаліў паспяховую абарону гэтага горада ад тэўтонаў.

У 1314 г. крыжакі напалі на Навагародак. Давыд знішчыў увесь крыжацкі абоз, забраў іх коней і прымусіў рыцараў уцякаць. Мала хто з крыжакоў вярнуўся дамоў.

Неўзабаве Давыд сам узначаліў паход на Прусію. Потым ён ваяваў у Мазовіі на ўсходзе Польшчы. Слава Давыда грымела далёка за межамі ВКЛ. Ён бараніў ад нямецкіх і дацкіх рыцараў Пскоў. Яго воіны даходзілі ажно да Рэвеля (сучасны Талін).

У 1326 г. Давыд удзельнічаў у сумесным з палякамі паходзе на Брандэнбург. Аднак па дарозе назад Давыд быў забіты.

**З хронікі Мацея Стрыйкоўскага**

На другі ж год 1326 Уладзіслаў Лакетак, узяўшы ў Гедзіміна на дапамогу тысячу дзвесце чалавек літоўскага рыцарства, якімі камандаваў гетман Давыд, слаўны стараста гарадзенскі…, сам сваёй асобай выправіўся… супраць Вальдэмара, маркграфа Брандэнбургскага, … а так як ніякага адпору супраць сябе не меў, ад ракі Одэр і ад Брандэнбурга аж да Франкфурта ўсе землі маркграфства Брандэнбургскага паваяваў, пабраў і ўшчэнт агнём, жалезам, гвалтам знішчыў…

Не змог сцярпець гэтага спусташэння і лютасці літоўскай нейкі шляхціц мазавецкі імем Андрэй, але, гневам вялікім запалены, наважыўся ўчыніць варты памяці ўчынак; змяшаўшыся з палкамі літоўскімі, старасту гарадзенскага, мужа ў Літве вельмі слаўнага і пана на той час пасля вялікага князя Гедзіміна першага (якога дачку сваёй жонкай меў), гетмана гэтага забіў пасярод лагера і, прышпорыўшы хуткага каня, … уцёк. А Давыд, гетман слаўны, які землі прускія і лівонскія да Рэвеля і Дэрпта ваяваў, …вечным сном заснуў.

*Чаму польскі храніст піша пра Давыда Гарадзенскага з вялікай павагай?*

У другой палове XIV ст. пачасціліся паходы лівонскіх рыцараў на землі Беларускага Падзвіння. Цэнтрам абароны Падзвіння стаў Полацк. Тут княжыў ***Андрэй Альгердавіч***. Ён вёў асноўныя ваенныя дзеянні з крыжацкім горадам Дынабургам (цяпер Даўгаўпілс у Латвіі). Гэты горад знаходзіўся паблізу ад Полацка і ўвесь час пагражаў яму. Не раз палачане спусташалі ваколіцы Дынабурга і іншых крыжацкіх замкаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Князь Андрэй змагаўся не толькі з крыжакамі, але і з іншымі ворагамі. Ён ваяваў з татарамі, вылучыўся як адзін з галоўных герояў Кулікоўскай бітвы. Скончыў жыццё славуты князь на полі бою падчас бітвы з татарамі на рацэ Ворскла.

Такім чынам, за даволі кароткі час у складзе ВКЛ былі аб'яднаны велізарныя тэрыторыі. Асноўным іх насельніцтвам з'яўляліся ўсходнія славяне. Вялікія князі літоўскія — Гедзімін, Альгерд — удала выкарысталі сітуацыю, якая склалася ва Усходняй Еўропе. Шмат сіл патрабавала барацьба з крыжакамі. Крок за крокам тэўтоны спрабавалі прасунуцца на ўсход. Аднак гераічная барацьба беларускага і іншых народаў ВКЛ дапамагла ім адстаяць сваю незалежнасць.

**Пытанні і заданні**

**1.** Якімі шляхамі ўваходзілі беларускія землі ў склад ВКЛ? Прывядзіце прыклады.
**2.** Якое значэнне мела ўключэнне беларускіх зямель у склад ВКЛ?
**3.** Якую палітыку праводзілі вялікія князі літоўскія Гедзімін і Альгерд? Адказ прадстаўце ў выглядзе табліцы:

| | **Унутраная палітыка** | **Знешняя палітыка** | **Вынікі ўладарання** |
|---|---|---|---|
| **Гедзімін (1316–1341)** | | | |
| **Альгерд (1345–1377)** | | | |

**4.** Якія змены адбыліся ў дзейнасці крыжакоў пасля спынення крыжовых паходаў у Святую зямлю?
**5.** Якімі спосабамі змагаліся літоўскія князі з крыжакамі?
**6.** Які ўклад у абарону беларускіх зямель ад знешніх ворагаў унеслі Давыд Гарадзенскі і Андрэй Полацкі?
**7.** Паразважайце, чым адрозніваліся дзеянні крыжакоў ва Усходняй Еўропе і ў Палесціне.


Правообладатель Издательский центр БГУ

## § 19. Княжанне Ягайлы. Крэўская унія і яе значэнне

**Успомніце.** *1. Дзякуючы якім уладарам была сфарміравана тэрыторыя ВКЛ? 2. Хто ўяўляў значную небяспеку для Польшчы ў XIII–XIV стст.?*

**Вы даведаецеся.** У канцы XIV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім пачалася барацьба за ўладу. Літоўцы ўсё яшчэ заставаліся язычнікамі. Гэта імкнуліся выкарыстаць крыжакі. Яны заклікалі еўрапейскія краіны знішчыць «апошнюю апору язычніцтва ў Еўропе». Як кіраўніцтва ВКЛ паспрабавала вырашыць дадзеную праблему? Якія наступствы мела гэта для беларускіх зямель?

**1. Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне.** У 1377 г. памёр вялікі князь літоўскі Альгерд. Сваім пераемнікам ён прызначыў ***Ягайлу***. Гэта быў яго любімы, але не старэйшы сын. Спачатку Ягайла працягваў палітыку свайго бацькі. Заходняй часткай дзяржавы па-ранейшаму кіраваў стары Кейстут. А сам Ягайла павінен быў ажыццяўляць «збіранне рускіх зямель». У гэтай справе Ягайла знайшоў саюзніка. Ім стаў уладар Залатой Арды Мамай. Ён, як і Ягайла, быў заклапочаны ўмацаваннем Масквы.

Аднак прыход да ўлады Ягайлы прывёў да ўнутранага канфлікту. Старэйшыя сыны Альгерда палічылі сябе пакрыўджанымі. Яны гуртаваліся вакол полацкага князя Андрэя Альгердавіча. Каб аслабіць



Забойства Кейстута. Малюнак XIX ст.

? *Якія мэты пераследаваў Ягайла забойствам Кейстута?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

сваіх праціўнікаў, Ягайла выгнаў Андрэя з Полацка. Той разам са сваімі паплечнікамі скіраваўся да маскоўскага князя Дзмітрыя. У далейшым яны адыгралі важную ролю ў Кулікоўскай бітве 1380 г. Перамога ў гэтай бітве ўмацавала пазіцыі Дзмітрыя Данскога. Пазіцыі ж Ягайлы былі аслаблены.

Няпростыя адносіны склаліся ў Ягайлы і з Кейстутам. Ягайла не давяраў свайму дзядзьку і таму заключыў сакрэтныя пагадненні з крыжакамі. Даведаўшыся пра гэта, Кейстут у 1381 г. пазбавіў пляменніка ўлады і стаў на чале дзяржавы.

Аднак кіраванне Кейстута таксама задавальняла не ўсіх. Супраць яго ўзняўся мяцеж. У чэрвені 1382 г. сталіца дзяржавы зноў апынулася ў руках Ягайлы. Кейстута падманам захапілі і зняволілі ў Крэўскім замку. Разам з ім быў захоплены і яго сын Вітаўт — князь гарадзенскі, берасцейскі і камянецкі. Па загадзе Ягайлы Кейстут быў задушаны. Вітаўту ж удалося ўцячы. Пасля гэтага ён скіраваўся да крыжакоў. Пры іх дапамозе Вітаўт хацеў вярнуць уладанні свайго бацькі.

**2. Прычыны збліжэння ВКЛ і Польшчы.** Становішча Ягайлы было няпростым. Вітаўт з крыжакамі пагражалі пазбавіць яго ўлады. Ягайлу ўдалося памірыцца з Вітаўтам. Аднак вялікаму князю трэба было шукаць новых саюзнікаў.

Свае спадзяванні Ягайла стаў звязваць з Польшчай. Там памёр кароль, не пакінуўшы пасля сябе сыноў. Дзве яго дачкі былі заручаны з нямецкімі прынцамі. Адзін з іх павінен быў стаць польскім каралём. Для Польшчы гэта азначала б катастрофу. Немцы і без таго валодалі значнай часткай польскіх зямель. Пагоршыліся і адносіны Польшчы з Тэўтонскім ордэнам.

Таму палякі сталі шукаць іншага мужа для будучай каралевы. Ён павінен быў захаваць Польшчу і дапамагчы ёй у барацьбе са знешнімі ворагамі. Выбар спыніўся на Ягайлу. Для гэтага мелася некалькі прычын. Па-першае, вялікі князь літоўскі таксама быў зацікаўлены ў саюзніках, якія б дапамаглі яму захаваць уладу. Па-другое, ВКЛ было спрадвечным ворагам нямецкіх крыжакоў, а значыць — магчымым саюзнікам Польшчы. Па-трэцяе, калі б


Правообладатель Издательский центр БГУ



Крэўскі замак. Рэканструкцыя

Ягайла хрысціў Літву ў каталіцтва, гэта падняло б аўтарытэт палякаў, бо ім удалося б зрабіць тое, што стагоддзямі не ўдавалася немцам.

> ? *Зрабіце схему «Прычыны уніі ВКЛ і Польшчы», у якой асобна ўкажыце, што атрымлівала ад саюзу кожная з дзяржаў.*

**3. Крэўская унія і яе ўмовы.** ***14 жніўня 1385 г.*** у замку ***Крэва*** (цяпер вёска Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці) была

> Ядвіга яшчэ да Крэўскай уніі была заручана з маладым нямецкім прынцам Вільгельмам Габсбургам, якога паспела пакахаць. Калі надышоў час вяселля, Вільгельм прыехаў да яе, але быў выгнаны польскімі панамі. Няшчасная Ядвіга спрабавала дагнаць свайго каханага, аднак яе замкнулі ў пакоі. Спачатку яна нават намагалася выбіць дзверы сякерай, але гэта ёй не ўдалося. І вось праз нейкі час юная дзяўчына мусіла згадзіцца на шлюб з немаладым і не вельмі жаданым Ягайлам.
>
> *Ці пацвярджае гэтая гісторыя тое, што шлюб каралевы — справа дзяржаўная? Ці магла Ядвіга настаяць на сваім жаданні?*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Каранацыя Ягайлы. Фрагмент карціны кафедральнага касцёла ў Кракаве. Канец XV ст.

заключана ***унія*** (саюз, аб'яднанне дзяржаў) Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства. У 1386 г. Ягайла ажаніўся з польскай каралевай Ядвігай і стаў польскім каралём. Узамен ён абяцаў далучыць ВКЛ да Польшчы і хрысціць язычніцкую Літву ў каталіцтва. Былі і іншыя ўмовы уніі. Ягайла павінен быў перавезці скарб ВКЛ з Вільні ў Кракаў, дапамагчы Польшчы вярнуць страчаныя землі, выпусціць усіх польскіх палонных, захопленых у папярэдніх войнах. Новы польскі кароль абавязваўся выплаціць значную суму грошай нямецкаму прынцу Вільгельму Габсбургу. Гэта павінна было стаць кампенсацыяй за сарваны шлюб.

Неўзабаве Ягайла прыступіў да выканання ўмоў уніі. У *1387 г.* адбылося хрышчэнне літоўскага насельніцтва па каталіцкім абрадзе. Ягайла выдаў ***прывілей*** *феадалам* (землеўласнікам), што прынялі каталіцтва. Цяпер яны станавіліся поўнымі гаспадарамі ў сваіх маёнтках. Буйны́я землеўласнікі маглі нават без дазволу вялікага князя завяшчаць, прадаваць маёнткі, будаваць замкі і г. д. Гэты прывілей не распаўсюджваўся на праваслаўных.

Далучэнне ВКЛ да Польшчы выклікала незадавальненне літоўскіх і «рускіх» феадалаў. Яны жадалі захаваць самастойнасць дзяржавы. На беларускіх землях успыхнула паўстанне. Яго ўзначаліў Андрэй Полацкі. Хутка на чале барацьбы супраць Ягайлы стаў Вітаўт. Ён зноў уцёк да крыжакоў і заключыў з імі саюз. Барацьба з Вітаўтам была для Ягайлы вельмі цяжкай. Таму кароль вырашыў

? *Што вы ўжо ведаеце пра Андрэя Полацкага?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**˜ мовы Крэўскай уніі, выгадныя Ягайлу**

- Ягайла рабіўся каралём Польшчы

**˜ мовы Крэўскай уніі, выгадныя Польшчы**

- ВКЛ далучылася да Польшчы
- Язычнікі Літвы прымалі каталіцтва
- Скарб (казна) ВКЛ пераводзіўся ў Польшчу
- ВКЛ адпускала палонных палякаў, зašопленых у ранейшых войнах
- Ягайла дапамагаў Польшчы вярнуць землі, зašопленыя немцамі
- Ягайла выплачваў кампенсацыю нямецкаму прынцу Вільгельму ‡абсбур°у за сарваны шлюб з Ядвігай

❓ *Уважліва разгледзьце схему і адкажыце, якія з умоў былі выкананы, а якія — не.*

пайсці на саступкі. У *1392 г.* было заключана *Востраўскае пагадненне*. Вітаўт абвяшчаўся вялікім князем літоўскім, але ён прызнаваў залежнасць ад Ягайлы.

Аднак унія спарадзіла новыя супярэчнасці ў дзяржаве. Палякі патрабавалі поўнага далучэння ВКЛ да Польшчы. У той жа час беларускія і літоўскія феадалы жадалі захаваць самастойнасць сваёй дзяржавы. Акрамя таго, праваслаўныя феадалы хацелі атрымаць такія ж правы, як і каталікі. За гэтыя правы ім давялося змагацца.

Між тым станоўчыя вынікі уніі былі для ВКЛ большыя. Палепшыліся адносіны не толькі з Польшчай, але і з іншымі краінамі Еўропы. На карысць пайшло і хрышчэнне язычнікаў Літвы. Вялікае Княства ўжо не ўспрымалася як апошняя апора язычніцтва. Без гэтага спыніць агрэсію з боку еўрапейскага рыцарства было б немагчыма.

Правообладатель Издательский центр БГУ




? *З дапамогай схемы і тэксту параграфа растлумачце вынікі заключэння уніі.*

Заключэнне Крэўскай уніі стала найбольш важнай падзеяй у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага Позняга сярэднявечча. З гэтага часу дзяржава нашых продкаў аказалася цесна звязанай са сваёй заходняй суседкай.

**Пытанні і заданні**

**1.** Якую палітыку праводзіў вялікі князь Ягайла? На чыю падтрымку разлічваў?
**2.** Якую ролю ў падзеях пачатку 1380-х гг. адыгралі Кейстут і Вітаўт?
**3.** Якія прычыны прывялі да зближэння ВКЛ і Польшчы?
**4.** Пералічыце ўмовы заключэння Крэўскай уніі. Якія яна мела наступствы?
**5.** Знайдзіце на картасхеме на с. 132 тэрыторыю, падпарадкаваную Тэўтонскаму ордэну. Для якіх суседзяў ён мог уяўляць пагрозу?
**6.** Як вы думаеце, чаму некаторыя ўмовы Крэўскай уніі шмат у чым засталіся толькі на паперы?
**7.** Паразважайце, да якіх наступстваў магло прывесці поўнае ўключэнне ВКЛ у склад Каралеўства Польскага.


Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 20. Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага

**Успомніце.** *1. Калі ў Старажытнай Русі пачаўся перыяд палітычнай раздробленасці? 2. Што азначала васальная залежнасць? 3. Якія пытанні вырашаліся на вечы ў Полацкім княстве XII — першай паловы XIII ст.?*

**Вы даведаецеся.** У Вялікім Княстве Літоўскім аб'ядналіся розныя землі з насельніцтвам, якое адрознівалася па паходжанні і рэлігіі. Як жа тут было вырашана пытанне кіравання? Якое месца ў новай дзяржаве займалі беларускія землі? Ці моцна змянілася кіраванне на беларускіх землях у параўнанні з папярэднімі часамі?

**1. Тэрытарыяльны падзел ВКЛ.** На момант стварэння ВКЛ на беларускіх землях існаваў тэрытарыяльны падзел, які ўзнік яшчэ ў старажытнарускія часы. Буйны́я адзінкі, якія называліся ***землямі***, у XII–XIII стст. вылучыліся ў самастойныя дзяржавы. Гэта адбылося ў выніку канчатковага падзелу зямель Старажытнай Русі. Улада ў княствах-землях перадавалася ў спадчыну.

> ? *Якія княствы існавалі на беларускіх землях у старажытнарускі перыяд?*

З утварэннем ВКЛ князі ўсходнеславянскіх княстваў-зямель трапілі ў залежнасць ад вялікага князя літоўскага. Але гэта не было для іх вельмі цяжка: ва ўнутраных справах яны захоўвалі самастойнасць. Усходнеславянскія князі заставаліся буйнейшымі землеўласнікамі ў Вялікім Княстве Літоўскім, хаця і мусілі выпраўляцца ва ўсе ваенныя паходы вялікага князя.

Больш дробныя княствы, на якія падзяляліся землі, мелі назву ***воласці***. Воласці складаліся з сельскіх паселішчаў. Іх жыхары гуртаваліся ў абшчыны. Сельскія абшчыны называліся словам «*верв*» ці весь (адсюль беларуская назва «вёска»). Аднак часцей выкарыстоўвалася назва сяло.

Да канца XIV ст. фарміраванне тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага было ў асноўным завершана. Яна падзялялася на дзве

Правообладатель Издательский центр БГУ

> ? *З дапамогай картасхемы «Пашырэнне межаў ВКЛ у XIV ст.» на 2-м форзацы вызначце, да Літвы ці да Русі належала мясцовасць, дзе вы жывяце.*

часткі — Літву і Русь. Пад Літвой разумелася не толькі тэрыторыя сучаснай Літвы. Так называлі таксама землі на захадзе і ў цэнтры Беларусі. Яны ўваходзілі ў гістарычнае ядро дзяржавы. Тэрмін «Русь» абазначаў беларускія, украінскія і рускія землі, далучаныя ў XIV ст.

Літоўскай зямлёй лічылася таксама Жамойць. Аднак гэтая зямля мела асобы статус. Нярэдка ў палітычных мэтах кіраўніцтва дзяржавы перадавала яе крыжакам.

**2. Дзяржаўны лад і кіраванне.** Вялікае Княства Літоўскае з'яўлялася *манархіяй*. Першы яе кіраўнік — Міндоўг — нават атрымаў каралеўскі тытул. Яго пераемнікі называліся ***вялікімі князямі***, або ***гаспадарамі***. Аднак у міжнароднай перапісцы яны таксама часам згадваліся як *каралі*. Гаспадар узначальваў узброеныя сілы. Ён мог уступаць у саюзы з іншымі дзяржавамі, абвяшчаць вайну, заключаць мір. У яго руках было заканадаўства.

> ? *Якія яшчэ ўладары Усходняй Еўропы насілі тытул караля?*

У канцы XIII — XIV ст. пры вялікім князю дзейнічала ***гаспадарская рада (Рада ВКЛ)***. Гэта быў дарадчы орган. У раду гаспадар уключаў уплывовых, карысных і патрэбных яму людзей. Спачатку ў ёй вялікую ролю адыгрывалі князі асобных зямель.




Арганізацыя кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім

? *На падставе схемы дакажыце, што Вялікае Княства Літоўскае з'яўлялася манархіяй.*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Воін Вялікага Княства Літоўскага XIV ст.
Рэканструкцыя *Марэка Шышко*.
На шчыце намаляваны калюмны –
герб Гедзімінавічаў

У непасрэдным кіраванні вялікіх князёў знаходзілася толькі невялікая частка зямель. 70–75 % тэрыторыі дзяржавы складалі зямельныя ўладанні іншых князёў. Некаторыя з іх былі нашчадкамі роду Рурыкавічаў. Яны спрадвеку валодалі сваімі княствамі. Гэтыя князі працягвалі кіраваць ва ўласных землях разам з баярамі.

Князі мелі свае ўмацаванні і дружыны. Спачатку дружыннікі знаходзіліся ў гарадах пры князях, а ў XIV ст. усё часцей сталі атрымліваць уласныя маёнткі з сялянамі. Узамен яны неслі ваенную службу. Такім чынам, дружыннікі ператвараліся ў землеўласнікаў-феадалаў.

Паступова становішча пачало змяняцца. Вялікі князь Гедзімін раздаваў некаторыя далучаныя тэрыторыі сваім сынам. Пасля




Правообладатель Издательский центр БГУ

смерці Гедзіміна ўсё Вялікае Княства Літоўскае было падзелена на восем асобных княстваў. Гэтыя ўладанні, якія вылучаліся ў складзе дзяржавы прадстаўнікам кіруючай дынастыі, называліся *ўдзеламі*. Сем такіх удзелаў, або ўдзельных княстваў, атрымалі сыны Гедзіміна. Восьмы, полацкі, удзел дастаўся яго пляменніку. Унукі і праўнукі Гедзіміна таксама валодалі ўдзельнымі княствамі.

> ? *Падумайце, чаму, нягледзячы на падзел дзяржавы паміж сынамі Гедзіміна, у ВКЛ не ўзнікла палітычная раздробленасць.*

Некаторыя тэрыторыі дзяржавы кіраваліся велікакняжацкімі *намеснікамі*, якіх прызначаў асабіста вялікі князь. Ім падпарадкоўвалася мясцовае кіраўніцтва. Яны сачылі за гаспадаркай, збіралі падаткі, вяршылі суд. З сярэдзіны XIV ст. велікакняжацкія намеснікі былі ў Менску (цяпер Мінск), Ваўкавыску, Слоніме і іншых гарадах з валасцямі.

> ? *Знайдзіце гэтыя гарады на картасхеме «Пашырэнне межаў ВКЛ у XIV ст.» на 2-м форзацы.*

> *З дапамогай дадатковых матэрыялаў высветліце, ва ўладанні якога ўдзельнага князя ўваходзіла ваша мясцовасць у XIV ст., уладзе якога вялікага князя літоўскага — Альгерда ці Кейстута — яна падпарадкоўвалася.*

Ядром дзяржавы лічыліся цэнтральныя землі. Як ужо гаварылася, яны мелі агульную назву — Літва. Сюды ўваходзілі Віленская і Трокская землі, Беларускае Панямонне, Міншчына, Берасцейшчына і іншыя. У іх знаходзілася асноўная колькасць велікакняжацкіх і дзяржаўных маёнткаў. Адсюль набіралася асноўная частка войска ВКЛ. Тэрыторыі на ўскрайках дзяржавы называлі «прыслухаючымі» (сумежнымі) землямі. Да іх належалі Кіеўская, Чарнігаўская, Смаленская, Полацкая, Віцебская землі, Жамойць і інш.

> ? *Знайдзіце гэтыя землі на картасхеме «Пашырэнне межаў ВКЛ XIV ст.» на 2-м форзацы.*

Сістэма кіравання ВКЛ прадугледжвала значную самастойнасць «прыслухаючых» княстваў. Яны не толькі самі вырашалі


Правообладатель Издательский центр БГУ

**З Густынскага летапісу**

У год 1276. Пачаў княжыць у Літве Віцень, учыніў сабе герб і ўсяму княству Літоўскаму пячатку — узброены рыцар на кані з мячом, што цяпер называюць «Пагоня».

*Якое значэнне мела ўвядзенне агульнадзяржаўных герба і пячаткі?*

ўнутраныя справы, але і ўплывалі на знешнюю палітыку. У рэальнасці значэнне Літвы і Русі было аднолькавае. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў поўнай назве дзяржавы — Вялікае Княства Літоўскае і Рускае.

**3. Мясцовыя органы ўлады.** Мясцовае кіраванне ажыццяўлялася на ўзроўні зямель, валасцей і абшчын. Асноўную частку тагачаснага насельніцтва складалі сяляне, якія жылі сельскімі абшчынамі. У межах абшчыны рэгуляваліся адносіны яе членаў, размяркоўваліся павіннасці.

Зямля, якая апрацоўвалася сялянамі, была замацавана ў іх карыстанні як *надзел*. Некалькі абшчын складалі воласць, якая разам з дзяржавай і феадалам выконвала адміністрацыйна-паліцэйскія функцыі. У воласці былі пасады цівуноў, сотнікаў, старцаў. Гэтыя пасады найчасцей займалі заможныя сяляне. Яны сачылі за зборам даніны, рэгулявалі адносіны сялян паміж сабой і з феадалам.



Герб ВКЛ. Выява 1435 г.

На беларускіх землях па-ранейшаму існавала веча. Яно ўяўляла сабой сход гараджан, на які збіраліся таксама свабодныя жыхары суседніх сёлаў. У вечы прымалі ўдзел і мясцовыя князі. Яно выконвала ролю судовай і адміністрацыйнай улады. Распаўсюджвалася яна не толькі на горад, але і на яго прадмесці. Веча выдавала



Правообладатель Издательский центр БГУ




*З дапамогай схемы растлумачце, як ажыццяўлялася кіраванне воласцю.*

пастановы, абавязковыя для ўсяго насельніцтва. Асабліва актыўна дзейнічалі вечы ў Полацку, Смаленску і іншых буйны́х гарадах усходніх славян.

Уваходжанне беларускіх зямель у склад ВКЛ не парушала іх традыцыйны лад. Яны захоўвалі свае звычаі, веру, культуру, сістэму кіравання. Значная самастойнасць славянскіх зямель Вялікага Княства спрыяла добраахвотнаму далучэнню да яго новых тэрыторый былой Русі.

**Пытанні і заданні**

1. На якія тэрытарыяльныя адзінкі падзяляліся беларускія землі ў складзе ВКЛ да канца XIV ст.?
2. Якія правы і абавязкі мелі князі асобных усходнеславянскіх зямель?
3. Хто ажыццяўляў вышэйшае кіраўніцтва ў ВКЛ? Якія паўнамоцтвы мелі гаспадар і ягоная рада?
4. Як змянілася кіраванне асобнымі тэрыторыямі ВКЛ падчас уладарання Гедзіміна і Альгерда?
5. Якую асаблівасць мелі цэнтральныя і «прыслухаючыя» (сумежныя) землі ВКЛ?
6. Як у ВКЛ ажыццяўлялася мясцовае кіраванне?
7. Як вы думаеце, чым можна растлумачыць пэўную самастойнасць «прыслухаючых» зямель?



Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 21. Гаспадарчае развіццё і культура

**Успомніце.** *1. Якая сістэма земляробства была распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі ў Раннім і Высокім сярэднявеччы? 2. Якія гарады на тэрыторыі Беларусі маюць найбольш працяглую гісторыю? 3. Якія найбольш старажытныя рукапісныя кнігі з беларускіх зямель захаваліся да нашага часу?*

**Вы даведаецеся.** Нягледзячы на шматлікія войны, галоўным клопатам людзей заставалася гаспадарчая дзейнасць. Кожны дзень яны працавалі ў полі, пасвілі жывёлу, выраблялі неабходныя ў штодзённым побыце рэчы. Не забываліся нашы продкі і на духоўныя патрэбы.

**1. Сельская гаспадарка і промыслы.** У XIII–XIV стст. галоўным заняткам насельніцтва Беларусі заставалася сельская гаспадарка. Змены тут у параўнанні з папярэднім часам адбываліся марудна. Далейшае пашырэнне атрымала трохполле. Аднак яно не здолела да канца выцесніць больш старажытныя формы земляробства.

> ? *Намалюйце схему трохполля. Чаму гэтая сістэма земляробства была лепшая за лядную?*

Першае месца сярод збожжавых культур належала азімаму жыту. Акрамя яго сяляне сеялі проса, пшаніцу, ячмень, авёс, грэчку, лён. Яны таксама вырошчвалі боб, гарох і розную гародніну.

Важнай галіной сельскай гаспадаркі з'яўлялася жывёлагадоўля. На землях Беларусі разводзілі буйну́ю і дробную рагатую жывёлу, свіней, коней. Дапаможнымі заняткамі сельскага насельніцтва заставаліся паляванне, рыбалоўства. Паўсюдна існавала бортніцтва.

Па-ранейшаму сельская гаспадарка была звязана з хатнімі промысламі. Сялянская сям'я звычайна выраблялa прылады працы, посуд, палатно, грубае сукно, адзенне, абутак і інш. Паступова з сялян вылучаліся майстры, для якіх рамяство станавілася асноўным заняткам.

> ? *Падумайце, якія з заняткаў сялян на працягу года мелі большае ці меншае значэнне.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Жыццё сялян у часы Сярэднявечча было няпростым. Падчас вайны вораг мог знішчыць пасевы і запасы харчавання. Ураджай залежаў ад капрызаў надвор'я. Нярэдкімі былі выпадкі недаядання. У пачатку XIV ст. у Еўропе надышло пахаладанне. Неўраджаі выклікалі ў еўрапейскіх краінах жудасны голад. Закрануў ён і беларускія землі. Змены надвор'я, голад і хваробы прывялі да рэзкага змяншэння насельніцтва. Замарудзілася гаспадарчае развіццё беларускіх зямель.

**2. Гарады і заняткі іх жыхароў.** Замаруджванне гаспадарчага развіцця ў XIV ст. закранула і гарады. Старыя вялікія гарады перажывалі крызіс. Колькасць насельніцтва ў Полацку, Менску, Віцебску скарацілася. Паменшылася іх тэрыторыя. Прадукцыя рамеснікаў зрабілася менш разнастайнай. Крызіс гарадоў стаў пераадольвацца толькі ў XV ст.



Сякера XIII ст.

Аднак заняпад старых гарадоў суправаджаўся ўзнікненнем новых паселішчаў. Узніклі Абольцы, Быхаў, Гальшаны, Капыль, Крэва, Лебедзева, Ліда, Лоск і інш. Гэта былі пераважна дробныя гарады. Некаторыя з іх засноўваліся як умацаваныя цэнтры новых феадальных уладанняў. Сюды маглі перасяляцца рамеснікі са старых гарадскіх цэнтраў. Узрастала колькасць гарадскога насельніцтва і за кошт сялян. Яны шукалі ў гарадах лепшай долі. Асабліва вабілі гарады людзей, якія валодалі рамесніцкімі навыкамі.

? *Знайдзіце гэтыя гарады на картасхеме 1-га форзаца.*



Ключ XIV–XV стст. з Віцебска

Развіццё гандлю стрымлівалася натуральнай гаспадаркай. Набыць рамесніцкія вырабы магла толькі абмежаваная колькасць пакупнікоў. Таму большасць рамеснікаў працавалі не на продаж, а на заказ. Многія з іх абслугоўвалі патрэбы феадалаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**˜арадскія рамёствы**

- Апрацоўка металаў
- Ювелірная справа
- Гарбарнае рамя тво
- Выраб цэглы
- Рымар тва
- Шавецкае рамяство
- Ганчарнае рамя тво

? *Растлумачце, што ўяўляе сабой кожнае з рамёстваў, пазначаных у схеме.*

Найважнейшай галіной рамяства заставалася апрацоўка металаў. Паўсюдным попытам карысталіся вырабы кавалёў. Слесары стваралі складаныя прадметы ўжытку, напрыклад, замкі́ для замыкання дзвярэй, скрыняў, куфраў.

Высокага ўзроўню дасягнула ювелірная справа. Са срэбра і золата ювеліры выраблялі каштоўныя ўпрыгажэнні. Гэтыя металы выкарыстоўваліся таксама для аздаблення вокладак царкоўных кніг.

У XIV ст. адбываліся перамены ў гарбарным (апрацоўка скур) і шавецкім (шыццё скуранога абутку) рамёствах. Гэтыя дзве галіны рамяства канчаткова раздзяліліся. З'явілася яшчэ адна галіна рамяства — рымарства. Рымары шылі хамуты і іншую конскую вупраж.

Для пабудовы замкаў патрабавалася шмат будаўнічых матэрыялаў.



Вокладка Лаўрышаўскага евангелля



Правообладатель Издательский центр БГУ



Печ з Лідскага замка. Рэканструкцыя

З канца XIII ст. ва ўжытак увайшла буйнапамерная цэгла. Выкарыстанне цэглы вялікага фармату паскарала будаўніцтва. Для пакрыцця дахаў пачалі вырабляць чарапіцу. З XIV ст. у Беларусі пры пабудове печаў выкарыстоўвалася кафля. Умураваная ў сценкі печы, яна добра захоўвала цяпло.

**3. Архітэктура.** Узрастанне знешняй пагрозы прывяло на беларускіх землях да маштабнага будаўніцтва ўмацаванняў. З канца XIII ст. пачалі ўзводзіць магутныя мураваныя вежы. Яны выконвалі вартавыя функцыі, служылі наймацнейшым вузлом абароны або жыллём. Найбольш вядомай з'яўляецца Камянецкая вежа (г. Камянец Брэсцкай вобласці).

**Іпацьеўскі летапіс** паведамляе: «У год 1289. Князь жа Уладзімір за гады свайго княжання многія гарады пабудаваў пасля бацькі свайго... Заклаў горад і даў яму імя Камянец, таму што зямля была каменістай. У ім ён узвёў каменную вежу вышынёй у 17 сажняў, вартую здзіўлення ўсіх, хто яе бачыць».

*Як вы думаеце, для чаго пабудаваў моцную вежу ў Камянцы валынскі князь Уладзімір Васількавіч?*



Камянецкая вежа. Сучасны выгляд

? *Як вы думаеце, пад чыім уплывам пачалі будаваць падобныя вежы?*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Лідскі замак. Сучасны выгляд

? *Якія абавязковыя абарончыя элементы замка не захаваліся да нашых дзён?*

У XIV ст. разгарнулася актыўнае будаўніцтва замкаў. Яны ўяўлялі сабой умацаваныя рэзідэнцыі князёў. Галоўныя замкі ўзводзіліся з каменю і цэглы. У першай палове XIV ст. былі пабудаваны Верхні і Ніжні замкі ў Віцебску. Гэта былі адны з самых моцных замкаў дзяржавы. На мяжы XIV–XV стст. з'явіўся магутны замак у Троках.

У гэты ж час узнік новы тып замка — *кастэль*. Яго аснову складаў чатырохвугольны ў плане будынак з мураванымі сценамі. Па вуглах такіх замкаў маглі размяшчацца вежы. Яны служылі галоўнымі вузламі абароны. Часам тут жылі ўладальнікі замка. Замкі-кастэлі былі збудаваны ў Крэве і Лідзе. Побач з мураванымі па-ранейшаму ўзводзіліся і драўляныя замкі.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Пярсцёнак XIII–XIV стст. з Навагрудчыны

У абарончым дойлідстве гэтага часу найбольш выявіўся ўплыў заходняга мастацтва. Тут выразна прасочваюцца элементы раманскага і гатычнага стыляў.

**4. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** У канцы XIII — XIV ст. працягваліся традыцыі старажытнарускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Па-ранейшаму выкарыстоўваліся літыя абразкі, нацельныя, а таксама складныя крыжы. Усярэдзіне апошніх змяшчаліся мошчы святых. Некаторыя з крыжоў нават адліваліся ў формах, зробленых з больш ранніх вырабаў.

> ? *Успомніце, якія ўпрыгажэнні насілі крывічанкі, дрыгавічанкі і радзімічанкі.*

Працягвалі бытаваць ранейшыя тыпы ўпрыгажэнняў. Сярод іх — жаночыя скроневыя кольцы, бранзалеты і пярсцёнкі традыцыйных формаў.



Мініяцюра з Мсціжскага евангелля

Трывалымі аказаліся візантыйскія і старажытнарускія рысы ў *іканапісе*. Тут яны панавалі да пачатку XVI ст. Даўнія традыцыі ў выяўленчым мастацтве перапляталіся з заходнееўрапейскімі стылямі. Гэта выразна выявілася ў аздабленні рукапісных кніг XIV ст. Для яго характэрныя прыгожа выкананыя вялікія літары — ініцыялы. У іх спалучаліся элементы арнаменту і дзівосныя фантастычныя істоты.

Багаццем афармлення вылучаецца Мсціжскае евангелле. Яно было створана, верагодна, у Менску ў XIV ст. Сярод ілюстрацый выдання можна сустрэць сілуэт храма, выявы фантастычных грыфонаў і хімер. Ва ўзоры



Правообладатель Издательский центр БГУ

ініцыялаў уплецены і чалавечыя фігуры. У XIV ст. у мініяцюрах асобных кніг назіраецца парушэнне візантыйскіх канонаў, узбагачэнне тэм, ажыўленне вобразаў. Выявы набліжаюцца да жанравых сцэнак з рэальнага жыцця. Найбольш выразнымі з'яўляюцца мініяцюры Лаўрышаўскага евангелля пачатку XIV ст.



Мініяцюра з Лаўрышаўскага евангелля

Замаруджванне гаспадарчага жыцця не спыніла эканамічнага і культурнага развіцця беларускіх зямель. Яны захоўвалі і развівалі традыцыі перыяду IX–XIII стст. У XIV ст. у культуры ВКЛ стаў адчувацца і заходнееўрапейскі ўплыў. Спалучэнне візантыйска-рускіх і заходнееўрапейскіх традыцый надавала культуры беларускіх зямель своеасаблівыя рысы.

**Пытанні і заданні**

1. Пералічыце асноўныя і дапаможныя заняткі сялян беларускіх зямель у другой палове XIII – XIV ст.
2. Якія змены адбыліся ў развіцці гарадоў у XIV ст.?
3. У чым заключаліся асаблівасці гарадскіх рамёстваў? Якія рамесныя спецыяльнасці існавалі ў беларускіх гарадах?
4. Якія змены ў развіцці архітэктуры адбыліся на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIII – XIV ст.?
5. Раскажыце пра будаўніцтва замкаў у ВКЛ у XIV ст.
6. Згодна з якімі традыцыямі працягвалася развіццё выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на беларускіх землях? Прывядзіце прыклады.
7. Паразважайце, ці істотна змяніліся заняткі насельніцтва беларускіх зямель у параўнанні са старажытнарускім перыядам.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 22. Насельніцтва і рэлігіі ў ВКЛ

**Успомніце.** *1. Калі ў Старажытнай Русі было прынята хрысціянства і з'явіліся Полацкае і Тураўскае епіскапствы? 2. Калі адбылося хрышчэнне па каталіцкім абрадзе літоўскіх зямель?*

**Вы даведаецеся.** Вялікае Княства Літоўскае аб'яднала ў адной дзяржаве розныя народы. Галоўным чынам гэта былі ўсходнія славяне і літоўцы. Праваслаўныя славяне складалі большасць насельніцтва ВКЛ. Таму ўсходняя хрысціянская царква мела вялікі ўплыў у дзяржаве. Літоўцы доўгі час заставаліся язычнікамі. Яны прынялі хрысціянства толькі ў канцы XIV ст. Аднак гэта было хрысціянства заходняга ўзору – каталіцтва. Як жа ў адной дзяржаве суіснавалі розныя народы? У якім становішчы знаходзіліся праваслаўе і каталіцызм?

**1. ВКЛ як шматэтнічная дзяржава.** Напярэдадні ўтварэння ВКЛ большую частку беларускіх зямель засялялі славяне. Побач са славянамі на тэрыторыі Усходняй Прыбалтыкі пражывалі балты. Паступова адбываўся працэс зліцця плямёнаў у саюзы. У XIII–XIV стст. на аснове аўкштайтаў і жамойтаў фарміравалася літоўская народнасць. У яе ўліліся і некаторыя іншыя балцкія плямёны.

? *Якія балцкія плямёны вы ведаеце?*

Калісьці балты жылі і ў Верхнім Панямонні. Аднак у X–XI стст. сюды сталі пранікаць славянскія плямёны крывічоў, дрыгавічоў і валынян. Яны заснавалі свае гарады: Гародню, Навагародак, Ваўкавыск, Слонім і інш.

У другой палове XIII ст. гэтыя гарады разам з балцкім і славянскім насельніцтвам Панямоння ўвайшлі ў склад новай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага. У XIV ст. у гэтай дзяржаве апынуліся ўсе беларускія землі. Да пачатку XV ст. да яе былі далучаны большасць украінскіх і частка рускіх зямель.

Вялікія князі літоўскія клапаціліся пра развіццё рамяства і гандлю. Таму яны запрашалі дасведчаных майстроў і купцоў


Правообладатель Издательский центр БГУ

з-за мяжы. У выніку ў ВКЛ сталі сяліцца немцы, палякі, яўрэі і прадстаўнікі іншых народнасцей. У XIV ст. на беларускіх і літоўскіх землях з'явіліся татары. Частка іх перасялілася сюды добраахвотна. Многія ж былі захоплены ў палон. Такім чынам, Вялікае Княства Літоўскае ператварылася ў *шматэтнічную дзяржаву*. Аднак большасць насельніцтва складалі ўсходнія славяне — жыхары ўсходнеславянскіх зямель.



Татарын.
Сярэднявечная гравюра

**2. Язычніцтва.** Балты і славяне Вялікага Княства Літоўскага адрозніваліся не толькі мовай і звычаямі. Першапачаткова розная была ў іх і рэлігія. Балты, у тым ліку і літоўцы, традыцыйна прытрымліваліся *язычніцтва*, або паганства. Яны верылі, што існуе не адзін, а шмат багоў. Багі звязваліся з сіламі прыроды — сонцам, месяцам і інш. Адзін з галоўных багоў кіраваў



Язычніцкі абрад літоўцаў. Сярэднявечная гравюра

? *З чаго вынікае, што на гравюры адлюстраваны менавіта язычніцкі абрад?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

громам і маланкай. Гэта быў Пяркунас, які адпавядаў старажытнаславянскаму Перуну.

Існавалі ў балтаў таксама дробныя багі і духі. Яны былі звязаны з палямі, лясамі, рэкамі, гарамі. Пэўныя духі апекаваліся жывёлай, ураджаем, хатнім вогнішчам. Багам прыносілі ахвяры. Набажэнствы адбываліся ў свяшчэнных гаях, на адмысловых капішчах.

З прадстаўнікоў жывёльнага свету балты асабліва шанавалі змей. Балтыйскія плямёны верылі ў святасць агню. Свяшчэнны агонь гарэў на паганскіх капішчах. Вера ў яго ачышчальную сілу ўплывала і на пахавальны абрад балтаў. Яны не закопвалі нябожчыкаў у зямлю, а спальвалі іх.

**З Хронікі Яна Длугаша**

У літоўцаў, пакуль яны знаходзіліся ў цемры паганства, існавала захаванае ад продкаў святое свята і звычай: у пачатку кастрычніка, пасля збору ўраджаю, адпраўляцца з жонкамі, дзецьмі і хатнімі ў лясы, якія яны лічылі святымі, і прыносіць на працягу трох дзён багам бацькоў быкоў, бараноў і іншых жывёл у ахвяру і поўнае спаленне; а пасля ахвярапрынашэнняў і святадзействаў праводзіць гэтыя тры дні ў святах, гульнях і скоках...

Акрамя таго, яны спальвалі сваіх нябожчыкаў... Аднак літоўцы дзякуючы мноству лясоў і гаёў мелі адмысловыя лясы, у якіх кожнае паселішча і кожны дом і сям’я размяшчалі спецыяльныя вогнішчы для спалення паводле звычаю целаў нябожчыкаў. Пры гэтым да чалавечага цела, якое спальвалі, далучалі найбольш каштоўных жывёл і рэчы: каня, быка, карову, сядло, зброю, пояс, каралі, пярсцёнак, і ўсё гэта спальвалі разам з трупам, не лічачыся з тым, што рэчы маглі быць залатыя або срэбныя.

*З прыведзенага тэксту вылучыце асноўныя рысы язычніцтва.*

**3. Роля праваслаўнай царквы ў ВКЛ.** Славянскае насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага прытрымлівалася *праваслаўя*. Руская праваслаўная царква ўваходзіла ў склад Канстанцінопальскага патрыярхату і ўяўляла сабой *мітраполію*. Улада кіеўскага мітрапаліта распаўсюджвалася на ўсе землі былой Старажытнай Русі. У канцы XIII ст. ён пераехаў з Кіева

? *Калі адбыўся раскол хрысціянскай царквы на дзве галіны – праваслаўную і каталіцкую?*


Правообладатель Издательский центр БГУ

ва Уладзімір-на-Клязьме. Тады ў 1316 г. у Вялікім Княстве была створана самастойная мітраполія. Цэнтрам яе стаў Навагародак. Канчаткова асобная праваслаўная мітраполія ў ВКЛ аформілася ў другой палове XV ст. Мітрапаліту падначальваліся епіскапы. Яны ўзначальвалі епархіі. На беларускіх землях самымі значнымі былі Полацкая і Тураўская епархіі.



Барысаглебская царква ў Новагародку — рэзідэнцыя праваслаўнага мітрапаліта ВКЛ

Шматбожжа літоўцаў не перашкаджала ім шанаваць веру славян. Часта палітычныя інтарэсы патрабавалі ад літоўскай знаці прымаць праваслаўную веру. Звычайна гэта рабілася тады, калі літоўскія князі пачыналі правіць у «рускіх» гарадах. Прыняцце імі праваслаўя павышала да іх давер з боку мясцовага насельніцтва. Часта літоўская знаць раднілася з прадстаўнікамі «рускіх» родаў. Гедзімін і яго сыны былі жанатыя са славянскімі князёўнамі. Пры Гедзіміне *рэлігійная цярпімасць* стала адным з асноўных прынцыпаў у адносінах да «рускіх» зямель.

? *Успомніце, якімі спосабамі распаўсюджвалі хрысціянства крыжакі. Ці рабілі так рускія князі?*

Праваслаўе ўмацоўвала свае пазіцыі не толькі на славянскіх землях. У самой Літве знаць і некаторыя мяшчане прымалі новую веру. Царква ў якасці дарункаў ад вялікіх князёў, прадстаўнікоў знаці і простых вернікаў атрымлівала землі і іншую маёмасць. Будаваліся новыя цэрквы і манастыры.

**4. Пачатак распаўсюджання каталіцтва.** Даволі рана на землі Вялікага Княства Літоўскага прыйшло і каталіцтва. Першы кіраўнік



Правообладатель Издательский центр БГУ




? *З дапамогай картасхемы высветліце, на якой частцы тэрыторыі ВКЛ у большай ступені распаўсюдзілася каталіцтва. Падумайце, якім было па веравызнанні насельніцтва, чыя тэрыторыя пазначана жоўтым колерам.*

дзяржавы Міндоўг прыняў хрысціянства паводле лацінскай традыцыі. Аднак для насельніцтва ВКЛ каталіцкая вера доўгі час была чужой. Для літоўцаў яна да таго ж звязвалася з агрэсіяй крыжакоў. Хрышчэнне Міндоўга было выклікана палітычнымі прычынамі. Яго пераемнікі доўга не ўспрымалі ідэю прыняцця каталіцтва ўсур’ёз.

Аднак ужо ў часы Віценя і Гедзіміна разгарнулася прапаведніцкая дзейнасць каталіцкіх манахаў. Яны знаходзіліся нават пры дварах вялікіх князёў. *Кляштары (манастыры)* манаскіх ордэнаў дамініканцаў і францысканцаў дзейнічалі ў Вільні і Навагародку.

Значэнне каталіцкай царквы ўзрасло пасля заключэння Крэўскай уніі 1385 г. Яна прадугледжвала хрышчэнне язычнікаў-літоўцаў



Правообладатель Издательский центр БГУ



Хрышчэнне Літвы. *Аўтар невядомы*

*Якіх асоб, намаляваных на карціне, вы можаце пазнаць? Як вы думаеце, навошта мастак намаляваў сякеру?*

у каталіцтва. У 1387 г. Ягайла з вялікай пышнасцю правёў абрад хросту. Акрамя таго, ён дараваў каталіцкай царкве прывілеі. Гэтыя прывілеі давалі ёй надзвычайныя правы.

*Якія яшчэ ўмовы прадугледжвала Крэўская унія?*

На беларускіх землях сталі хутка ўзводзіцца каталіцкія касцёлы. Касцёлы і кляштары шчодра надзяляліся зямлёю. Каталіцкія біскупы (епіскапы) увайшлі ў лік найбольш уплывовых людзей дзяржавы.

Такім чынам, да канца XIV ст. праваслаўная царква панавала ў духоўным жыцці насельніцтва. Яна паспяхова пашырала свой уплыў у ВКЛ. Аднак пасля заключэння Крэўскай уніі дзяржаўнай канфесіяй (рэлігіяй) у Вялікім Княстве стала каталіцтва.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Пытанні і заданні**

1. Якія народы складалі аснову насельніцтва ВКЛ і якія з'явіліся на яго тэрыторыі з цягам часу?
2. Якія рэлігійныя вераванні былі распаўсюджаны ў літоўцаў да прыняцця хрысціянства?
3. Па якіх прычынах літоўская знаць часта прымала праваслаўе?
4. Якім было становішча праваслаўнай царквы ў ВКЛ да канца XIV ст.?
5. Як пашыралася каталіцтва на тэрыторыі ВКЛ?
6. Падумайце, чаму менавіта для ВКЛ была характэрная рэлігійная цярпімасць.
7. Як вы думаеце, чаму ўладары ВКЛ намагаліся стварыць асобную літоўскую праваслаўную мітраполію?

## Абагульненне

У трэцім раздзеле вы разгледзелі вельмі важны перыяд у гісторыі нашай зямлі. Ён быў звязаны з уваходжаннем беларускіх зямель у склад новай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага. Гэты працэс расцягнуўся на паўтара стагоддзя — з сярэдзіны XIII па канец XIV ст.

Перадумовай аб'яднання славян і балтаў, якія пражывалі на беларускіх землях і побач з імі, сталі трывалыя сувязі паміж гэтымі плямёнамі. Іх узаемадзеянні былі як мірнымі, так і варожымі. Магчыма, балты і славяне так і засталіся б проста суседзямі. Аднак у першай палове XIII ст. адбыліся важныя падзеі, якія зрабілі іх адносіны больш цеснымі. Ва Усходняй Еўропе з'явіліся небяспечныя ворагі — крыжакі і манголы. Для таго каб пазбегнуць іх ярма, неабходна было аб'яднацца. Сам ход гісторыі падказаў напрамак гэтага аб'яднання. Практычна ўсе балцкія землі, акрамя Літвы, былі захоплены крыжакамі. Манголы ж падпарадкавалі амаль усе ўсходнеславянскія землі, акрамя беларускіх. Такім чынам, балта-славянскі саюз быў зусім не выпадковым.

Вялікае Княства Літоўскае стала сапраўды балта-славянскай дзяржавай. Часам яшчэ яе называюць літоўска-беларускай ці



Правообладатель Издательский центр БГУ

беларуска-літоўскай. Яе кіраўнікі мелі літоўскае паходжанне. Ядро дзяржавы таксама было пераважна балцкім. Аднак дзякуючы больш высокаму ўзроўню гаспадарчага і культурнага развіцця славяне вызначалі эканоміку і духоўнае жыццё краіны. Беларускія землі захоўвалі ў ВКЛ свой палітычны лад, звычаі, веру. Больш за тое, яны паспяхова распаўсюджвалі славянскія традыцыі на балцкіх землях. Іх уплыў на вызначэнне знешняй палітыкі ВКЛ быў велізарны. Далучэнне ўсходнеславянскіх зямель стала галоўнай палітычнай задачай дзяржавы. На захадзе ж ВКЛ толькі бараніла свае межы ад крыжацкай агрэсіі.

Знаходжанне ў складзе Вялікага Княства не перашкаджала, а нават спрыяла фарміраванню беларускай народнасці. Таму насельніцтва Беларусі магло лічыць і лічыла гэтую дзяржаву сваёй. У складзе ВКЛ беларусы пачалі вылучацца як самастойны этнас. Яны захавалі цывілізацыйную (культурную) аснову старажытнарускага часу і дапоўнілі яе культурнымі дасягненнямі еўрапейскіх народаў.

**Заданне 1.** Раскажыце пра падзеі ў палітычным развіцці Вялікага Княства Літоўскага, якія звязаны з наступнымі датамі: 1253, 1323, 1345, 1362, 1385, 1392.

**Заданне 2.** Знайдзіце на картасхемах на форзацах, с. 121, 127, 132 вучэбнага дапаможніка або на с. 19–22 атласа:

а) тэрыторыі Аўкштайціі, Жамойці і Літвы;

б) тэрыторыю Панямоння і яе найбольш значныя гарады;

в) тэрыторыі, падуладныя літоўскаму князю Міндоўгу ў сярэдзіне XIII ст. і ў пачатку 1260-х гг.;

г) суседзяў Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIII ст. і ў канцы XIV ст.;

д) месцы бітваў каля возера Дурбе і на Сіняй Вадзе.

**Заданне 3.** Вусна складзіце кароткія паведамленні з выкарыстаннем паняццяў, якія даюцца ў дужках:

Правообладатель Издательский центр БГУ

а) «Каранацыя Міндоўга» (каралеўская карона, каталіцтва, Папа Рымскі, Навагародак, урачыстасць);

б) «Подзвігі Давыда Гарадзенскага» (гарадзенскі староста, крыжакі, аблога, паходы, нямецкія і дацкія рыцары, слава);

в) «Суд на вечы ў Полацку» (гараджане, сяляне, князь, 30 мужоў, вялікі звон, судовае рашэнне);

г) «Будаўніцтва замка» (камяні, цэгла, кастэль, чатырохвугольнік, мураваныя сцены, вежы, іншаземныя майстры).

**Заданне 4.** Растлумачце лагічныя ланцужкі:

небяспека з боку крыжакоў → утварэнне Вялікага Княства Літоўскага;

мангольскія заваяванні → далучэнне ўсходнеславянскіх зямель да ВКЛ;

заключэнне Крэўскай уніі → хрышчэнне Літвы;

ваеннае супрацьстаянне ВКЛ з Залатой Ардой → з'яўленне на тэрыторыі Беларусі татараў.

**Заданне 5.** Раскажыце пра наступныя гістарычныя падзеі і з'явы:

а) утварэнне Вялікага Княства Літоўскага;
б) княжанне Альгерда;
в) барацьба ВКЛ з крыжакамі;
г) заключэнне Крэўскай уніі;
д) барацьба за ўладу Вітаўта;
е) распаўсюджанне каталіцтва ў ВКЛ.

**Заданне 6.** Размясціце гістарычныя падзеі ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці (ад больш ранніх да больш позніх):

а) перамога войска ВКЛ над татарамі ў бітве на Сіняй Вадзе;
б) хрышчэнне літоўскага насельніцтва па каталіцкім абрадзе;
в) паражэнне крыжакоў у бітве каля возера Дурбе;
г) заключэнне Востраўскага пагаднення;
д) паражэнне рыцараў Ордэна мечаносцаў пад Саўле;
е) перанос сталіцы ВКЛ у Вільню.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 7.** Вызначце прычыны:

а) уваходжання ўсходнеславянскіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага;

б) заключэння Крэўскай уніі;

в) барацьбы паміж Ягайлам і Вітаўтам;

г) шматэтнічнага характару Вялікага Княства Літоўскага.

**Заданне 8.** Запоўніце ў сшытку параўнальную табліцу «ВКЛ падчас уладарання Гедзіміна і Альгерда».

| Вялікі князь літоўскі | Адносіны з суседзямі | Далучаныя тэрыторыі | Месца беларускіх зямель у складзе ВКЛ | Вынікі праўлення |
|---|---|---|---|---|
| Гедзімін (1316–1341) | | | | |
| Альгерд (1345–1377) | | | | |
| | | | Агульны вывад | |

**Заданне 9.** Адкажыце, чым найбольш вядомыя наступныя асобы:

Міндоўг, Войшалк, Віцень, Гедзімін, Альгерд, Давыд Гарадзенскі, Андрэй Полацкі, Ягайла, Вітаўт.

**Заданне 10.** Успомніце, што азначаюць прыведзеныя ніжэй паняцці, і размяркуйце іх па трох слупках.

Гаспадарская рада, епархія, іканапіс, ініцыялы, кастэль, каталіцтва, кляштар, манархія, мітраполія, намеснікі, праваслаўе, сотнікі, старцы, цівуны.

| Улада, кіраванне | Культура | Рэлігія |
|---|---|---|
| | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ



РАЗДЗЕЛ IV

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV — XV ст.

## § 23. Княжанне Вітаўта

**Успомніце.** *1. Якія былі асноўныя ўмовы Востраўскага пагаднення? 2. Хто з літоўскіх уладароў атрымліваў каралеўскую карону?*

**Вы даведаецеся.** Пасля заключэння Крэўскай уніі ў ВКЛ разгарнулася барацьба за захаванне незалежнасці. У выніку да ўлады ў краіне прыйшоў князь Вітаўт. Яму ўдалося ператварыць Вялікае Княства Літоўскае ў адну з наймацнейшых дзяржаў Еўропы. Даведайцеся, як гэта адбывалася.



Вітаўт.
Гравюра з «Апісання Еўрапейскай Сарматыі». 1578 г.

**1. Намаганні Вітаўта па аднаўленні самастойнасці ВКЛ.** Пачатак кіравання Вітаўта быў няпросты. Паводле Востраўскага пагаднення ён лічыўся толькі намеснікам Ягайлы. Аднак князь Вітаўт не жадаў мірыцца з залежнасцю ад Польшчы. Ён заняўся ўмацаваннем сваёй улады. Вітаўт абапіраўся на дробных і сярэдніх землеўласнікаў-феадалаў. Яны падпарадкоўваліся волі вялікага князя і старанна выконвалі яго даручэнні. За верную службу ён шчодра надзяляў іх зямлёй.

Галоўную пагрозу для сябе Вітаўт бачыў ва ўдзельных князях. Яны ўвесь час


Правообладатель Издательский центр БГУ

былі гатовыя пачаць барацьбу за ўладу. Вітаўт пазбаўляў іх буйны́х удзелаў, якія ператвараў у намесніцтвы. Гэта выклікала незадавальненне знаці. Справа даходзіла да мяцяжоў. Аднак усе яны бязлітасна задушаліся Вітаўтам. Некаторыя князі замест забраных уладанняў атрымоўвалі ад гаспадара іншыя, драбнейшыя. Гэта ўзмацняла іх васальную залежнасць ад Вітаўта.

> ? *Якое паходжанне мелі ўдзельныя князі?*

с. 22

> ? *Што азначала васальная залежнасць?*

**2. Знешняя палітыка Вітаўта.** Вітаўт праводзіў актыўную знешнюю палітыку. Ён канчаткова падпарадкаваў Смаленск, яго ўладу прызнавалі ў Вялікім Ноўгарадзе. Войска ВКЛ зрабіла паспяховы паход супраць татараў да ракі Дон. Былі далучаны землі ў нізоўях Дняпра. У выніку межы Вялікага Княства Літоўскага дасягнулі Чорнага мора.

> ? *Пакажыце межы ВКЛ гэтага часу на карце.*

> ? *У якія сучасныя дзяржавы ўваходзіць тэрыторыя ВКЛ часоў Вітаўта?*

Вітаўт марыў пра грандыёзныя заваёвы на Усходзе. Для гэтага ён планаваў паставіць на чале Залатой Арды свайго саюзніка Тахтамыша. Узамен Вітаўт спадзяваўся атрымаць ад яго землі ўсёй Русі. Вітаўт заручыўся падтрымкай заходніх краін. Папа Рымскі абвясціў заваёўніцкія планы Вітаўта крыжовым паходам. Для вялікай вайны на ўсходзе княства быў патрэбны мір на захадзе. У 1398 г. Вітаўт заключыў *Салінскае пагадненне* з Тэўтонскім ордэнам. Яно прадугледжвала перадачу Ордэну часткі Жамойці. У гонар пагаднення быў наладжаны пір. На ім літоўская і беларуская знаць назвала Вітаўта «каралём Літвы і Русі». Тым самым абвяшчалася незалежнасць ад польскага караля.



Шлем канца XIV ст., знойдзены каля Кіева

> ? *Падумайце, пры якіх абставінах ён мог быць згублены.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Аднак паход супраць Залатой Арды скончыўся для Вітаўта трагічна. Войскі сустрэліся ў *1399 г.* у бітве на *рацэ Ворскла*. Напачатку ў Вітаўта былі ўсе шанцы перамагчы. Гэта разумелі і татары. Нягледзячы на колькасную перавагу, яны згаджаліся на вялікія саступкі. Хан Цімур Кутлуг нават абяцаў плаціць Вітаўту даніну. Паддаўшыся на перамовы, Вітаўт упусціў зручны момант. Да залатаардынскага хана падышлі свежыя сілы. На чале татарскага войска стаў больш вопытны палкаводзец Едыгей.

**Цвярскі летапіс** так апісвае бітву на Ворскле:
«Выхваляўся Вітаўт Тахтамыша на Ардзе пасадзіць, а ... Тахтамыш паабяцаў яму Маскву і ўсю зямлю Рускую... У той час прыйшоў Цімур Кутлуг з многімі баявымі палкамі, і сустрэліся з Вітаўтам у полі на рацэ Ворскле, і было страшна бачыць у тую гадзіну, як сыходзяцца дзве вялікія сілы. Наперад прыйшоў Едыгей, і сутыкнуліся палкі, стрэлы з абодвух бакоў ляцелі, як дажджавыя хмары, ад ляхаў жа самастрэлы, і пачалі літвіны перамагаць арбалетамі Едыгея, але потым цар прыйшоў з велізарным войскам і абышоў кругом Вітаўта, пастраляў пад ім коней; і была моцная бітва, і адолеў цар Цімур Кутлуг».
*Якія прычыны перамогі татараў згадваюцца ў летапісным тэксце?*

Войска Вітаўта было разбіта. Гэта сарвала яго планы поўнага падпарадкавання Усходняй Еўропы. У 1401 г. Вітаўт вымушаны быў пайсці на пацвярджэнне уніі ВКЛ з Польшчай. Была заключана Віленска-Радамская унія. Згодна з яе ўмовамі пасля смерці Вітаўта ўладаром ВКЛ мусіў стаць Ягайла.

**3. Вялікае Княства Літоўскае на вяршыні магутнасці.** Паражэнне на Ворскле не змусіла Вітаўта адмовіцца ад прасоўвання на ўсход. Аднак цяпер ён скіраваў позірк і ў бок Тэўтонскага ордэна. Вітаўт больш не меў патрэбы ў саюзе з крыжакамі. Ён зноў хацеў вярнуць сабе Жамойць. Гэта прывяло да так званай *Вялікай вайны* з крыжакамі *(1409–1411)*. Аб'яднаныя сілы ВКЛ і Польшчы нанеслі тэўтонам нечуванае паражэнне. У выніку ВКЛ вярнула сабе жамойцкія землі.

? *Знайдзіце тэрыторыю Жамойці на карце. У чым асаблівасці геаграфічнага становішча гэтай тэрыторыі?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Узмацненне пазіцый Вітаўта зноў паставіла пытанне аб яго адносінах з Польшчай. У *1413 г.* была заключана новая унія — Гарадзельская. Яна гарантавала захаванне адасобленасці ВКЛ. Але найвышэйшыя пасады ў дзяржаве маглі займаць толькі католікі. Феадалы ВКЛ абяцалі быць з палякамі ў вечнай «дружбе і саюзе».

Умацаванне ўлады Вітаўта абумовіла яго міжнароднае прызнанне. У 1414–1418 гг. у Канстанцы (горад у Германіі) праходзіў царкоўны сабор. Гэта быў найбуйнейшы сход знаці сярэднявечнай Еўропы. Сабор разгледзеў прэтэнзіі Тэўтонскага ордэна да ВКЛ і Польшчы. Яны былі прызнаны беспадстаўнымі. На бок Вітаўта і Ягайлы схіліўся Папа Рымскі. Еўрапейскае рыцарства страціла цікавасць да крыжовых паходаў у Літву. Гэта стала пачаткам заняпаду Ордэна.

? *Як вы думаеце, чаму так адбылося?*

Пад канец жыцця Вітаўт дабіўся новых поспехаў на Усходзе. Ён умешваўся ў дынастычную барацьбу ў Залатой Ардзе. Некаторых ханаў вялікі князь літоўскі сам пасадзіў на прастол у Сараі (сталіца Арды). Вітаўта слухаліся ўладары Цверы і Пскова, пашырыўся яго ўплыў і на Маскву. На прастоле апошняй апынуўся ўнук уладара ВКЛ — Васілій II. Яго маці была дачка Вітаўта Соф'я. Такім чынам, Вялікае Княства Літоўскае дасягнула сваёй найбольшай магутнасці. Яно ператварылася ў найбуйнейшую дзяржаву ў Еўропе.

с. 22



Імператар Жыгімонт I Люксембург. Мастак *Альбрэхт Дзюрэр*

Умацаваўшы сваю ўладу, Вітаўт зрабіў спробу атрымаць каралеўскую карону. Гэта ўраўнавала б тытулы яго і Ягайлы. Апошнія праявы залежнасці ВКЛ ад Польшчы былі б скасаваныя.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Зручны момант надарыўся хутка. Чэшскія гусіты вялі барацьбу з германскім імператарам Жыгімонтам І Люксембургам. Каб дамагчыся падтрымкі магутнага Вітаўта, яны прапанавалі яму стаць каралём Чэхіі.

Замест сябе Вітаўт паслаў у Чэхію з войскам свайго намесніка Жыгімонта Карыбутавіча, які стаў адным з гусіцкіх лідараў. Яго ўладу прызнаў нават Ян Жыжка. У далейшым Жыгімонт быў абраны гусіцкім каралём.

*Ці сведчыць гэты факт аб высокім аўтарытэце Вялікага Княства Літоўскага?*

? *Як вы думаеце, чаму палякі былі супраць каранацыі Вітаўта?*

Імператар усімі сіламі стараўся не дапусціць згоды Вітаўта, таму прапанаваў вялікаму князю карону Літвы і Русі. Аднак палякі сустрэлі ідэю каранацыі Вітаўта са страхам і абурэннем. Яны пастараліся настроіць супраць каранацыі Вітаўта еўрапейскіх манархаў і Папу Рымскага. Калі ж германскі імператар выслаў карону, палякі перахапілі яе па дарозе. Між тым быў прызначаны



Жыгімонт Карыбутавіч на чале гусітаў. Мініяцюра з сярэднявечнай хронікі



Пахаванне Вітаўта. Мініяцюра XVI ст.



Правообладатель Издательский центр БГУ

час каранацыі. На яе сабраліся тытулаваныя госці. Імператар прасіў Вітаўта пачакаць, абяцаў выслаць яму новую карону. Але ***27 кастрычніка 1430 г.*** Вітаўт памёр.

Падчас праўлення Вітаўта Вялікае Княства Літоўскае дасягнула вяршыні сваёй магутнасці. Вітаўт змог вырашыць большасць знешнепалітычных праблем дзяржавы. Залежнасць ад Польшчы была ліквідавана. Тэўтонскі ордэн быў разгромлены. Амаль усе рускія княствы знаходзіліся пад уплывам ВКЛ. Аднак пасля смерці Вітаўта зноў пачалася барацьба за ўладу. Гэта прывяло да аслаблення Вялікага Княства.

**Пытанні і заданні**

**1.** Якімі спосабамі Вітаўт умацоўваў сваю ўладу?

**2.** Якія планы ў знешняй палітыцы Вітаўту ўдалося рэалізаваць, а якія – не?

**3.** Якія наступствы мела паражэнне на Ворскле? Як змяніўся характар адносін ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам і Польшчай?

**4.** Як умацаванне ўлады Вітаўта адбілася на міжнародным становішчы ВКЛ?

**5.** Навошта Вітаўт жадаў атрымаць каралеўскую карону? Якія знешнепалітычныя абставіны гэтаму садзейнічалі, а якія перашкаджалі?

**6.** Паразважайце, чаму, нягледзячы на няўдачы, Вітаўт здолеў аднавіць незалежнасць сваёй дзяржавы і ўзвысіць яе.

**7.** Запоўніце табліцу «Знешняя палітыка Вітаўта».

| Перыяд | Заходні кірунак | Усходні кірунак | Вынікі |
|---|---|---|---|
| Канец XIV ст. | | | |
| Першая чвэрць XV ст. | | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ

## § 24. «Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва

**Успомніце.** *1. Калі ва Усходняй Прыбалтыцы ўсталяваўся Тэўтонскі ордэн? 2. Чым скончылася сутыкненне Полацкай і Наўгародскай зямель з крыжакамі ў першай палове XIII ст.?*

**Вы даведаецеся.** Больш за 200 гадоў народы Усходняй Еўропы змагаліся з крыжацкай агрэсіяй. Для беларускіх зямель яна апынулася яшчэ больш страшнай і небяспечнай, чым пагроза манголаў. У пачатку XV ст. Вялікае Княства Літоўскае ў саюзе з Польшчай нанесла крыжакам знішчальнае паражэнне. Якія наступствы гэта мела для беларускіх зямель?

**1. Узмацненне крыжацкай небяспекі.** У пачатку XV ст. адносіны ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам рэзка пагоршыліся. Паводле Салінскага пагаднення 1398 г. крыжакі атрымалі Жамойць. Вялікае Княства страціла выхад да Балтыйскага мора. Крыжакі захапілі і некаторыя польскія землі. У выніку яны злучылі свае лівонскія і прускія ўладанні з Германіяй.

? *Знайдзіце гэтую тэрыторыю на картасхеме на с. 132.*

Вітаўт разумеў непазбежнасць канфлікту з Ордэнам з-за Жамойці. Хаця крыжакі атрымалі правы на гэтую літоўскую вобласць, але нічога не маглі зрабіць з пастаяннымі паўстаннямі жамойтаў. Гэтыя мяцяжы падтрымліваліся Вітаўтам. Ён аказваў жамойтам дапамогу зброяй і войскамі.

**2. Ваеннае супрацьстаянне з крыжакамі.** Ужо ў снежні 1408 г. адбылася нарада Вітаўта і Ягайлы ў Новагародку. Там было прынята рашэнне аб пачатку вайны з Тэўтонскім ордэнам. Аднак падзеі разгортваліся так, што першымі абвясцілі вайну крыжакі.

У 1408 г. у Літве ўспыхнуў голад. Вялікі князь літоўскі папрасіў польскага караля, каб той выслаў караблі са збожжам. Караблі былі высланы, але іх затрымалі крыжакі. Яны нібыта знайшлі разам са збожжам зброю. Хутка выбухнула паўстанне ў Жамойці. Крыжакі былі ўпэўнены, што да мяцяжу жамойтаў падштурхнулі агенты Вітаўта. Усё гэта стала падставай для пачатку вайны.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Крыжакі паспрабавалі заручыцца нейтралітэтам палякаў. Але палякі паабяцалі ў выпадку вайны падтрымаць Вітаўта. У адказ Ордэн 6 жніўня *1409 г.* абвясціў Ягайлу вайну.

Першы этап вайны скончыўся для палякаў няўдала. Яны страцілі частку сваіх зямель. Ягайла мусіў падпісаць з Ордэнам часовае перамір'е. Вітаўт, які ваяваў асобна, дабіўся большых поспехаў. Ён здолеў заняць Жамойць.

Абодва бакі рыхтаваліся да новага сутыкнення. Яны збіралі войскі, вербавалі наёмнікаў, вялі дыпламатычную барацьбу. Ваенныя дзеянні былі аднаўлены ў чэрвені 1410 г. Ягайла і Вітаўт планавалі рухацца на сталіцу Тэўтонскага ордэна — Мальбарк. Вялікі магістр Ордэна Ульрых фон Юнгінген даведаўся пра планы праціўнікаў позна. Ён спрабаваў перакрыць шлях на сталіцу. Раніцай ***15 ліпеня 1410 г.*** сапернікі сышліся каля вёскі Грунвальд (цяпер тэрыторыя Польшчы).

? *Знайдзіце Мальбарк і Грунвальд на карце атласа.*

с. 23

**3. Грунвальдская бітва.** Войска крыжакоў налічвала каля 15–20 тыс. чалавек. Яно дзялілася на 50 *харугваў* (палкоў). У крыжацкім войску было шмат рыцараў з Германіі, Англіі, Францыі, Швейцарыі, Чэхіі і інш.

Войска Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы было большым. Яно налічвала каля 30–40 тыс. чалавек. Вітаўт прывёў з сабой 40 харугваў з Полацка, Навагародка, Вільні, Трокаў, Смаленска, Віцебска, Гародні, Ліды, Берасця (зараз Брэст), Пінска, Мсціслава, Дарагічына (цяпер Драгічын) і іншых зямель. З Ягайлам прыйшло 50 харугваў. У аб'яднаным войску былі харугвы з Украіны, атрад з Чэхіі пад кіраўніцтвам Яна Жыжкі (у будучым героя гусіцкага руху) і татарская конніца.

Усходнеславянскія і літоўскія харугвы ўзначаліў Вітаўт. Агульнае кіраванне аб'яднаным войскам ажыццяўляў Ягайла. Саюзныя сілы пастроіліся трыма лініямі. Войскі ВКЛ размясціліся на правым флангу, палякі — на левым.

? *Чаму Ягайла, а не Вітаўт, узначаліў аб'яднанае войска?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Хроніка Яна Длугаша** паведамляе, што напярэдадні Грунвальдскай бітвы абодва бакі працяглы час стаялі ў нерашучасці, не жадаючы пачынаць бітву. Каб раззлаваць Ягайлу і Вітаўта і справакаваць іх наступленне ў нязручнай мясцовасці, магістр крыжакоў прыслаў ім два мячы, заяўляючы, што калі ў іх не хапае зброі, то крыжакі пасылаюць яе ім, каб тыя маглі нарэшце адважыцца на бой. Ягайла і Вітаўт прынялі «падарунак» і, хаця намагаліся ніяк не паказваць свайго абурэння, неўзабаве пачалі атаку.

*Як вы думаеце, ці залежаў зыход бітвы ад таго, хто першы яе пачне?*

с. 28



Крыжакі перадаюць Ягайлу мячы. Малюнак *Войцэха Косака*

Бітва пачалася атакай першай лініі Вітаўта. Крыжакі спрабавалі адбіць яе гарматным агнём. Пасля гэтага яны кінулі супраць конніцы ВКЛ асноўныя сілы.

Бітва цягнулася доўга і зацята. Праз нейкі час воіны ВКЛ пачалі адступаць. Частка іх кінулася наўцёкі. Гэта было справакавана татарскімі атрадамі. Для іх прытворныя ўцёкі з далейшым вяртаннем у бітву былі ўлюбёным прыёмам.

Для правага крыла саюзнікаў склалася пагрозлівая сітуацыя. Яе ўратавалі тры смаленскія палкі пад кіраўніцтвам мсціслаўскага князя Сымона Лугвена. Але яны былі амаль усе пасечаны. Хто вы-

**З «Хронікі канфлікту Уладзіслава, караля Польшчы, з крыжакамі ў год Хрыстовы 1410»**

На правым крыле ўступіў у бой князь Вітаўт са сваімі людзьмі, з харугвай Святога Юрыя і харугвай пярэдняй стражы. Незадоўга перад самым пачаткам бітвы прайшоў невялікі і цёплы дождж, які змыў пыл з конскіх капытоў. А на самым пачатку таго дажджу гарматы ворагаў, бо ворагі мелі шматлікія гарматы, двойчы далі залпы каменнымі ядрамі, але не маглі нашым зрабіць тым стрэлам ніякай шкоды; і ворагі пры першай сутычцы з людзьмі караля былі адкінуты ад тых гармат на без малога стадыю [каля 200 м]. У той жа час разгарэўся жорсткі бой.

*З прыведзенага тэксту зрабіце выснову, ці мелі ў той час вялікае значэнне гарматы.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

стаяў, дачакаліся дапамогі — другой і трэцяй ліній Вітаўта. Адначасова палякі кінулі ў бой сваю першую лінію.



Бітва пры Грунвальдзе. Мініяцюра з «Бернскай хронікі» *Дыбалда Шылінга Старэйшага*. 1483 г.

Бітва закіпела на абодвух флангах. У гушчы бітвы быў звалены польскі каралеўскі сцяг. Крыжакі ўжо заспявалі пераможны гімн. Ад паражэння палякаў уратавала ўвядзенне ў бой другой лініі.

У тэўтонскага магістра Ульрыха фон Юнгінгена таксама заставаліся рэзервы. Іх ён павёў у бой асабіста. Страшны ўдар крыжакоў зламаў строй саюзнікаў. Тэўтоны зноў заспявалі гімн перамогі. Аднак тут па іх ударылі з розных бакоў уцалелыя флангі Ягайлы і Вітаўта. У бой уступіла апошняя польская лінія. Да яе далучыліся і тыя воіны ВКЛ, якія вярнуліся пасля ўцёкаў. Бітва ператварылася ў знішчэнне акружаных рыцараў. Загінуў сам магістр. Быў захоплены абоз і ўсе баявыя сцягі Ордэна.

**4. Вынікі і гістарычнае значэнне бітвы.** Пасля перамогі саюзнікі маглі без перашкод рухацца да Мальбарка. Па дарозе ім без бою здаваліся прускія гарады і замкі. Аднак аблога сталіцы Тэўтонскага ордэна зацягнулася. Хутка лагер саюзнікаў пакінулі войскі Вітаўта. Мудры князь не хацеў поўнага знішчэння Ордэна. Ён разлічваў выкарыстоўваць крыжакоў для стрымлівання палякаў. Вітаўт разумеў, што без гэтага Польшча зноў захоча заявіць прэтэнзіі на яго ўладанні. Далейшая аблога Мальбарка стала марнай. Хутка палякі таксама рушылі назад.

*Даведайцеся, ці ўдзельнічалі ў Грунвальдскай бітве тагачасныя жыхары вашай мясцовасці. Якую ролю адыгралі харугвы з вашага краю ў гэтай бітве?*

У *1411 г.* у г. Торунь быў заключаны мір. Найбольш выгадны ён быў для ВКЛ. Крыжакі вярталі яму Жамойць. Польшча таксама вяртала частку зямель. Акрамя таго, пераможцам павінна была быць выплачана вялікая сума грошай.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Грунвальдская бітва вызначыла новую сітуацыю ў Прыбалтыцы. Тэўтонскі ордэн страціў сваё вядучае становішча ў рэгіёне. Канчаткова спыніліся крыжовыя паходы ў Прыбалтыку і Усходнюю Еўропу. Значна ўзрос міжнародны аўтарытэт Вялікага Княства Літоўскага. Ажывіўся гандаль, больш паспяхова сталі развівацца гаспадарка і культура.

**Пытанні і заданні**

**1.** У чым прычыны вайны ВКЛ у саюзе з Польшчай супраць Тэўтонскага ордэна?
**2.** Растлумачце, чаму так атрымалася, што першымі вайну абвясцілі крыжакі.
**3.** Дзе і калі адбылася вырашальная бітва «Вялікай вайны»?
**4.** Складзіце расказ пра Грунвальдскую бітву паводле наступнага плана: сілы бакоў, кіраўнікі, размяшчэнне на полі бою, ход бітвы, вынікі.
**5.** Якімі падзеямі завяршылася «Вялікая вайна»?
**6.** Якое значэнне мелі перамогі пад Грунвальдам і ў «Вялікай вайне»?
**7.** Як вы думаеце, чаму, нягледзячы на падтрымку каталіцкай царквы, Тэўтонскі ордэн пацярпеў паражэнне?

## § 25. Дынастычная вайна 1432–1439 гг. Змены ў дзяржаўным ладзе

**Успомніце.** *1. Хто звычайна атрымліваў у спадчыну галоўны прастол княства-зямлі ў Старажытнай Русі? 2. Ці заўсёды перадача ўлады ў ВКЛ адбывалася мірна?*

**Вы даведаецеся.** Вялікі князь Вітаўт не пакінуў пасля сябе нашчадкаў. Пасля яго смерці зноў пачалася барацьба за ўладу. Змаганне паміж Альгердавічамі і Кейстутавічамі прывяло да расколу дзяржавы на ўсходнюю і заходнюю часткі. З вялікай цяжкасцю ўдалося захаваць адзінства краіны. Аднак з сярэдзіны XV ст. улада Вялікага Княства пачала слабнуць. Усё больш узрастала значэнне феадалаў. Чым гэта было выклікана? Якія наступствы, добрыя ці кепскія, мела такое становішча для развіцця беларускіх зямель?

**1. Супярэчнасці паміж групоўкамі феадалаў у ВКЛ.** Пасля смерці Вітаўта вялікім князем літоўскім стаў *Свідрыгайла*,



Правообладатель Издательский центр БГУ

малодшы сын Альгерда. Свідрыгайла з'яўляўся праціўнікам уніі з Польшчай. Пачатак яго кіравання быў адзначаны канфліктам з польскімі феадаламі. Яны раптоўна захапілі частку зямель ВКЛ на захадзе Украіны. Свідрыгайла даў адпор былым саюзнікам. У 1431 г. Польшча аб'явіла Свідрыгайлу вайну.

> **?** *Хто ў адпаведнасці з літоўска-польскімі уніямі павінен быў заняць прастол ВКЛ пасля смерці Вітаўта?*

Адначасова нарастала варожасць да вялікага князя з боку літоўскіх феадалаў. Іх не задавальняла ўнутраная палітыка Свідрыгайлы. У той жа час Свідрыгайлу падтрымлівалі праваслаўныя «русіны» (будучыя беларусы і ўкраінцы). Сам вялікі князь быў каталікам. Аднак усё жыццё ён правёў сярод праваслаўных феадалаў. Свідрыгайла ведаў іх, давяраў ім, карыстаўся іх падтрымкай. Таму з цягам часу ён стаў набліжаць да сябе праваслаўную знаць. Гэта таксама не падабалася літоўскім феадалам. Паміж імі і Польшчай утварыўся саюз, хоць кожны меў на мэце свае інтарэсы.



Свідрыгайла. Гравюра з «Апісання Еўрапейскай Сарматыі». 1581 г.

**2. Змаганне паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам.** У ***1432 г.*** мяцежнікі зрабілі спробу забіць Свідрыгайлу ў Ашмянах. На чале змовы стаяў брат Вітаўта Жыгімонт Кейстутавіч. Свідрыгайла быў папярэджаны і ўцёк у Полацк. Там яго падтрымала мясцовая знаць. Да яе далучыліся феадалы Віцебскай, Смаленскай і ўкраінскіх зямель.

с. 24

> **?** *Як вы думаеце, чаму менавіта гэтыя тэрыторыі падтрымалі Жыгімонта?*

У Вільні вялікім князем літоўскім быў абвешчаны Жыгімонт. Яго прызнала насельніцтва Літвы, Жамойці, Падляшша, Панямоння, Берасцейскай і Менскай зямель. У выніку дзяржава была расколата на дзве часткі — Вялікае Княства Літоўскае і Вялікае Княства Рускае.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Жыгімонт Кейстутавіч.
Партрэт XIX ст.

Пачалася вайна за велікакняжацкі трон. Вайна вялася за вярхоўную ўладу паміж прадстаўнікамі кіруючай дынастыі. Такія войны называюць дынастычнымі. У гэтай вайне мела месца і рэлігійнае супрацьстаянне.

Польшча адразу ж аказала Жыгімонту Кейстутавічу ваенную дапамогу. Свідрыгайлу падтрымалі цвярскі князь і лівонскія рыцары. Вайна вялася вельмі жорстка. Праціўнікі спусташалі землі адзін аднаго.

Вялася і дыпламатычная барацьба. У 1434 г. Жыгімонт выдаў прывілей. Ён ураўноўваў праваслаўных феадалаў у асноўных правах з каталікамі. Пачаўся пераход прыхільнікаў Свідрыгайлы да Жыгімонта. У тайныя перамовы з ім уступілі смаленскія баяры і праваслаўны мітрапаліт Герасім. Даведаўшыся пра гэта, Свідрыгайла спаліў Герасіма на вогнішчы.

> ? *Як гэта магло паўплываць на падтрымку Свідрыгайлы насельніцтвам?*

*1 верасня 1435 г.* пад *Вількамірам* (цяпер г. Укмярге ў Літве) адбылася вырашальная бітва. На дапамогу Свідрыгайлу прыйшлі лівонскія, чэшскія і заходнееўрапейскія рыцары, невялікі татарскі атрад. Сілы праціўнікаў былі прыблізна роўныя — не больш чым 10 тыс. чалавек.

с. 28




Помнік на месцы бітвы
пад Вількамірам

Бітва скончылася для Свідрыгайлы катастрофай. У крывавай бітве палягло 13 князёў з беларускіх і ўкраінскіх зямель. Многія трапілі ў палон. Свідрыгайла з невялікай групай рыцараў уцёк у Полацк.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Няўдачы Свідрыгайлы выклікалі незадавальненне яго прыхільнікаў. Усходнеславянскія землі сталі пераходзіць на бок Жыгімонта. Аднак Полацк, Віцебск і іншыя гарады працягвалі ўпарта супраціўляцца. Баявыя дзеянні месцамі працягваліся яшчэ да ***1439 г.***



Соф'я Гальшанская. Сярэднявечная гравюра

**3. Казімір Ягайлавіч і яго палітыка.** Жыгімонт Кейстутавіч аказаўся жорсткім уладаром. Гэта адштурхнула ад яго знаць ВКЛ. У *1440 г.* супраць Жыгімонта была арганізавана змова, і ён быў забіты.

Прэтэндэнты на велікакняжацкі трон былі гатовыя зноў распачаць барацьбу. Аднак вялікім князем быў абраны ***Казімір (1440–1492)***, сын Ягайлы і беларуска-літоўскай княгіні Соф'і Гальшанскай. На доўгі час у Вялікім Княстве Літоўскім усталяваўся мір.




? *З дапамогай генеалагічнай схемы высветліце, кім даводзіўся Свідрыгайла Альгердавіч Жыгімонту Кейстутавічу.*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Паны-Рада ВКЛ.
Сярэднявечны малюнак

Праз сем гадоў Казімір стаў яшчэ і польскім каралём. У выніку гэтага была адноўлена унія Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай. Перад ад’ездам у Польшчу ў 1447 г. Казімір выдаў прывілей. Гэты дакумент не дапускаў пранікнення ў ВКЛ польскіх феадалаў. Зямля і дзяржаўныя пасады даваліся толькі ўраджэнцам княства. Яшчэ Ягайла даў феадалам-католікам ВКЛ шматлікія правы. У выніку яны станавіліся поўнымі гаспадарамі ў сваіх маёнтках. Цяпер такія ж правы атрымалі і праваслаўныя феадалы.

У *1468 г.* убачыў свет першы зборнік законаў ВКЛ. Ён атрымаў назву ***Судзебнік** Казіміра*. У ім былі вызначаны адзіныя тры віды пакаранняў: грашовы штраф, пабоі, смяротная кара.

У часы Казіміра адбывалася ўмацаванне вышэйшага органа дзяржавы — ***Рады ВКЛ (Паноў-Рады)***. У XIV ст. Рада існавала як дарадчы орган пры вялікім князю. У XV ст. яна набыла самастой-




*На падставе схемы раскажыце аб арганізацыі кіравання ў ВКЛ XV ст. Які орган улады быў галоўным і чаму?*


Правообладатель Издательский центр БГУ

нае значэнне. Як польскі кароль Казімір доўгі час праводзіў у Польшчы. У яго адсутнасць Рада вырашала ўсе галоўныя пытанні ў ВКЛ. Рада складалася з буйнейшых феадалаў, каталіцкіх біскупаў і вышэйшых службовых асоб. Галоўнымі з іх былі *ваяводы*, якія змянілі ў XV ст. колішніх намеснікаў. Яны ўзначальвалі буйнейшыя тэрытарыяльныя адзінкі — *ваяводствы*.

У склад Рады ўваходзіў таксама ***канцлер***, які ведаў усім дзяржаўным справаводствам. Менавіта канцлер захоўваў дзяржаўную пячатку, якой зацвярджаліся ўсе вялікакняжацкія ўказы і прывілеі.

У часы Казіміра ўзрасло значэнне *соймаў*. У іх аснове ляжала даўняя вечавая традыцыя. На соймы збіралася не толькі Рада. У іх бралі ўдзел і ўсе феадалы, хто жадаў. Яны не хацелі, каб у дзяржаве важныя пытанні вырашаліся без іх. Прапановы сойма нельга было не ўлічваць: незадаволенае рыцарства магло не ўхваліць падаткі на вядзенне вайны.

? *Падумайце, па якіх яшчэ прычынах феадалы сталі адыгрываць усё большую ролю ў кіраванні дзяржавай.*

Дынастычная вайна ў ВКЛ прывяла да аслаблення дзяржавы, чым пачалі карыстацца суседзі. У часы Казіміра Ягайлавіча ў дзяржаўным ладзе ВКЛ адбыліся важныя змены. Рост значэння Паноў-Рады і сойма прыводзіў да абмежавання ўлады вялікага князя. Ён ужо не мог прымаць важныя для ВКЛ рашэнні толькі па сваёй волі. Феадалы сталі адыгрываць усё большую ролю ў кіраванні дзяржавай.

**Пытанні і заданні**

**1.** З якой прычыны пасля смерці Вітаўта абвастрыўся канфлікт паміж ВКЛ і Польшчай?
**2.** Чаму супраць Свідрыгайлы выступілі літоўскія феадалы?
**3.** Якія сілы супрацьстаялі адна адной падчас дынастычнай вайны 1432–1439 гг.? Хто іх падтрымліваў?
**4.** Чым скончылася дынастычная вайна 1432–1439 гг.?
**5.** Якімі ўнутрыпалітычнымі дзеяннямі вядомы Казімір Ягайлавіч?
**6.** Што змянілася ў кіраванні дзяржавай у XV ст?
**7.** У падзеі дынастычнай вайны ў ВКЛ умешваліся амаль усе суседзі, акрамя Маскоўскага вялікага княства. Чым гэта тлумачыцца?

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 26. Знешняя палітыка ВКЛ у другой палове XV ст.

**Успомніце.** *1. З якіх частак складалася войска Полацкага княства? 2. Якая перамога дазволіла ВКЛ вырашыць праблему супрацьстаяння з Тэўтонскім ордэнам?*

**Вы даведаецеся.** Да сярэдзіны XV ст. ВКЛ пашырыла свае межы ад Балтыйскага да Чорнага мора. Казімір Ягайлавіч стаў адным з самых уплывовых манархаў у Еўропе. Гэта выклікала зайздрасць і варожасць суседніх дзяржаў. Стаўшы польскім каралём, Казімір аддаваў менш увагі справам Вялікага Княства. Чым гэта пагражала беларускім землям?

**1. Асаблівасці знешняй палітыкі.** Асноўным зместам знешняй палітыкі ў Сярэднявеччы былі войны, але яна ўключала таксама дыпламатычныя зносіны, якія маглі завяршацца дагаворамі. Вялікае значэнне надавалася і заключэнню шлюбаў паміж прадстаўнікамі кіруючых дынастый.

У XIV–XV стст. Вялікае Княства Літоўскае вяло шматлікія войны. Таму важнае значэнне надавалася баяздольнаму войску. Першапачаткова вайсковая служба з'яўлялася абавязкам кожнага свабоднага мужчыны. Народнае апалчэнне збіралася для разгрому і праследавання ворага. Гэтая ўсеагульная вайсковая служба распаўсюджвалася на людзей, якія часта не ўмелі добра валодаць зброяй. Такая састарэлая форма арганізацыі войска знікла ўжо ў XV ст.

Акрамя таго, існавалі і прафесійныя воіны — баяры і дружыннікі. З цягам часу яны станавіліся феадаламі — атрымлівалі зямлю і сялян. За гэта яны выязджалі на вайну і прыводзілі з сабой узброеных воінаў. Падобная форма арганізацыі войска атрымала назву ***«паспалітае рушэнне»*** (агульная выправа).

Воіны аб'ядноўваліся ў дробныя атрады — коп'і, а коп'і — у харугвы. Яны выступалі пад уласнымі сцягамі-харугвамі (адсюль паходзіць іх назва). Кожны рэгіён дзяржавы ці буйны́ феадал выстаўляў сваю харугву. Падчас бою харугвы шыхтаваліся звужанымі


Правообладатель Издательский центр БГУ

наперадзе калонамі (клінамі). Спераду размяшчаліся капійнікі, за імі — стральцы.

Паспалітае рушэнне складалася амаль выключна з коннікаў. Пяхота выкарыстоўвалася пры будаўніцтве дарог для войска, у крытычныя моманты бітвы і для аховы абозу. Каб ператварыць абоз у непрыступны лагер, яго абкружалі ваза́мі. Яны маглі акоўвацца жалезам і звязвацца ланцугамі.



Шыхтаванне харугвы клінам

> ? *Падумайце, чаму капійнікі ставіліся перад стральцамі.*

ВКЛ было грозным праціўнікам для ворагаў як з захаду, так і з усходу. Аднак дынастычная вайна 1430-х гг. стала цяжкім выпрабаваннем для гэтай дзяржавы. Прыход да ўлады Казіміра Ягайлавіча (у 1440 г.) паспрыяў прымірэнню варожых бакоў. Але незадаволенасць у грамадстве заставалася. Напружанасць у ВКЛ хацела выкарыстаць Маскоўскае вялікае княства. Яно імкнулася ўмацаваць свае пазіцыі ва Усходняй Еўропе. Справа дайшла да ваеннага канфлікту. Але ў 1449 г. абодва бакі заключылі пагадненне. За ВКЛ замацоўваліся права на Смаленшчыну і княствы ў вярхоўях ракі Ака. Саюзнікамі Вялікага Княства прызнаваліся Цвер і Разань. Аднак вялікі князь літоўскі абяцаў не прэтэндаваць на Ноўгарад, Пскоў і Ржэву (зараз Ржэў).

> ? *Знайдзіце гэтыя тэрыторыі на картасхемах 2-га форзаца.*

Галоўная асаблівасць знешняй палітыкі ВКЛ у другой палове XV ст. была абумоўлена шчыльнымі адносінамі з Польшчай. Вялікі князь літоўскі адначасова з'яўляўся і польскім каралём. Вельмі часта ён грэбаваў інтарэсамі ВКЛ і больш увагі надаваў дзеянням на карысць «Кароны Польскай». Таму ВКЛ паволі саступала ў спаборніцтве з Маскоўскім вялікім княствам у «збіранні рускіх зямель».

Правообладатель Издательский центр БГУ

с. 19

**2. Адносіны з заходнімі суседзямі.** У час уладарання Казіміра Ягайлавіча (у 1440–1492 гг. — вялікі князь літоўскі, з 1447 г. — польскі кароль) ВКЛ дасягнула пэўных поспехаў у заходнім кірунку знешняй палітыкі. Так, да ВКЛ была канчаткова далучана Жамойць. Менавіта з гэтага часу з'явілася поўная назва дзяржавы — ***Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае***. Пасля чарговай вайны з Тэўтонскім ордэнам апошні станавіўся васалам Польшчы і перадаваў ёй шмат гарадоў. У выніку Польшча атрымала выхад у Балтыйскае мора.

Няпростыя адносіны склаліся ў ВКЛ са Свяшчэннай Рымскай імперыяй, якая падтрымлівала Тэўтонскі ордэн. Аднак пазней германскі імператар выступаў пасрэднікам у перамовах ВКЛ з Маскоўскім вялікім княствам.

*Калі Асманская імперыя (Турцыя) захапіла тэрыторыю Балканскага паўвострава?*

Неаднаразова ВКЛ аказвала дапамогу Малдаўскаму княству ў супрацьстаянні пагрозе з боку туркаў-асманаў. Найбольш блізкія саюзніцкія адносіны склаліся ў ВКЛ з Чэхіяй і Венгрыяй. На прастолах гэтых дзяржаў нават апынуліся прадстаўнікі дынастыі Ягелонаў. На некаторы час дынастыя Ягелонаў стала адной з наймацнейшых у Еўропе.

**3. Страта ВКЛ першынства ў «збіранні рускіх зямель».** Пагадненне 1449 г. азначала прызнанне раўнавагі сіл паміж Вільняй і Масквой. У далейшым пазіцыі ВКЛ ва Усходняй Еўропе пачалі слабнуць. Казімір Ягайлавіч большасць часу знаходзіўся ў Польшчы. Для палякаў ён стаў вельмі добрым каралём. Ён шмат зрабіў для ўзмацнення Польшчы і павелічэння яе тэрыторыі, у тым ліку за кошт зямель ВКЛ. Пры гэтым на ўсход-



Срэбны пазалочаны пояс. Верагодна, быў падараваны вялікаму князю Вітаўту Хаджы Гірэем

*Як вы думаеце, чаму татарскі хан падносіў Вітаўту такія каштоўныя падарункі?*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Знішчэнне наўгародскага веча.
Мастак *Клаўдзій Лебедзеў*

*На падставе карціны паразважайце, ці ўсе наўгародцы былі задаволены далучэннем да Маскоўскага вялікага княства. Хто мог быць незадаволены?*

ня справы ў яго не хапала часу. У выніку ВКЛ адмовілася ад далейшага пранікнення ў рускія землі. Яно імкнулася толькі захаваць свае межы. Ініцыятыва ў «збіранні рускіх зямель» перайшла да Маскоўскага вялікага княства.

*Далучэнне да Масквы Ноўгарада Вялікага стварала небяспеку ВКЛ. Дакажыце гэтае сцвярджэнне з дапамогай картасхемы на 2-м форзацы.*

Маскоўскі князь падпарадкаваў сабе Цвер і Разань. Неўзабаве была захоплена багатая Наўгародская рэспубліка. Кіраўніцтва Ноўгарада імкнулася да саюзу з ВКЛ. Гэта было выкарыстана Масквой для захопу найбагацейшага горада Русі. Далучэнне Ноўгарада яшчэ больш умацавала пазіцыі маскоўскага князя Івана III. Ён стаў прэтэндаваць ужо на «рускія» землі ВКЛ. Казімір спрабаваў арганізаваць антымаскоўскі саюз з Вялікай Ардой. Аднак Арда была ўжо занадта слабая. У 1480 г. Маскоўскае вялікае княства канчаткова вызвалілася ад ардынскай залежнасці.

Значную пагрозу паўднёвым землям ВКЛ уяўлялі крымскія татары. Крымскае ханства адасобілася ад Залатой Арды ў сярэдзіне XV ст. Напачатку яно мела прыязныя адносіны з ВКЛ. Першы

*Высветліце, якія знешнія ворагі пранікалі на тэрыторыю вашага краю ў Познім сярэднявеччы. Ці адбываліся ў вашай мясцовасці ў тыя часы бітвы ці аблогі гарадоў?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

крымскі хан Хаджы Гірэй быў узведзены на прастол Казімірам Ягайлавічам. Збліжэнне Вільні з Вялікай Ардой прывяло да пагаршэння адносін з Крымам.

Хаджы Гірэй нарадзіўся ў Вялікім Княстве Літоўскім, верагодна, у Лідзе. У 1428 г. пры падтрымцы Вітаўта ён захапіў Крым. Быў выгнаны, з сабраным у ВКЛ войскам неаднаразова падпарадкоўваў Крым, зноў вяртаўся ў Ліду. У 1440 г. па просьбе татарскай знаці Казімір Ягайлавіч адпусціў Хаджы Гірэя ў Крым. Там ад імя вялікага князя маршалак ВКЛ Радзівіл Осцік зацвердзіў яго на ханскім прастоле.

*Зрабіце выснову з прыведзенай інфармацыі, якую ролю адыграла ВКЛ у стварэнні Крымскага ханства.*

Ужо ў 1474 г. быў заключаны саюз Крымскага ханства з Маскоўскім вялікім княствам. Крымскія татары сталі рэгулярна рабіць набегі на землі ВКЛ.

У канцы XV ст. Вялікае Княства Літоўскае пацярпела паражэнне ў вайне з Маскоўскім вялікім княствам. Так пачаўся шэраг «памежных» войнаў, у якіх ВКЛ вымушана было саступаць свае тэрыторыі на карысць Масквы.

с. 25

Такім чынам, у другой палове XV ст. адносіны ВКЛ і Польшчы з суседнімі дзяржавамі рэзка пагоршыліся. Гэта паставіла Казіміра Ягайлавіча і яго нашчадкаў перад пагрозай вайны на некалькіх напрамках.

**Пытанні і заданні**

1. У чым заключаўся змест і асаблівасці знешняй палітыкі ВКЛ у другой палове XV ст.?
2. Растлумачце асаблівасці арганізацыі войска ВКЛ. Што такое паспалітае рушэнне?
3. Як змянілася знешняя палітыка ВКЛ пасля дынастычнай вайны 1430-х гг.?
4. Якіх поспехаў дасягнуў Казімір Ягайлавіч у заходнім кірунку знешняй палітыкі?
5. Чаму пазіцыя ВКЛ ва Усходняй Еўропе ў другой палове XV ст. пачала слабець? У чым гэта выявілася?


Правообладатель Издательский центр БГУ

**6.** Якія адносіны склаліся ў ВКЛ з Крымскім ханствам у другой палове XV ст.?

**7.** Падвядзіце вынікі знешняй палітыкі ВКЛ да канца XV ст. Як вы думаеце, у чым прычыны яе няўдачы?

## § 27. Развіццё феадальнага грамадства

**Успомніце.** *1. Што характэрна для феадальных адносін? 2. Які дакумент забяспечваў феадалам ВКЛ валоданне зямлёй на правах поўнай уласнасці?*

**Вы даведаецеся.** У XV ст. на беларускіх землях панавалі феадальныя адносіны. Феадалы замацавалі правы на валоданне сваімі маёнткамі. Яны ператварыліся ў пануючую частку грамадства. Сяляне ж усё больш станавіліся паднявольнымі, залежнымі ад феадалаў. Новы парадак у дзяржаве замацоўваўся законамі. Якое значэнне гэта мела для гаспадарчага развіцця беларускіх зямель?

**1. Сельская гаспадарка.** Аснову гаспадарчага жыцця беларускіх зямель у XV ст. складала, як і раней, сельская гаспадарка. Вырошчвалі жыта, пшаніцу, авёс, проса, ячмень, грэчку, лён. Не забываліся і пра боб, гарох, садавіну і гародніну. Зямлю апрацоўвалі драўлянымі сохамі з жалезнымі наканечнікамі (нарогамі), драўлянымі акаванымі рыдлёўкамі, жалезнымі матыкамі, косамі, сярпамі.

Ураджай прыносіў у 3–5 разоў больш збожжа, чым было пасеяна. Гэта не перавышала 4 цэнтнераў з гектара. Важнае месца займала жывёлагадоўля.

Значную ролю працягвалі адыгрываць паляванне і рыбалоўства. Пры лоўлі рыбы выкарыстоўваліся вуды, восці, пешні, нераты.



Узворванне зямлі сахой. Малюнак XV ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Паляванне з сокалам. Малюнак XV ст.

? *Хто мог дазволіць сабе займацца паляваннем з драпежнымі птушкамі?*

? *На аснове прыведзенай інфармацыі складзіце схему «Заняткі беларускіх сялян у Познім сярэднявеччы».*

Збор дароў лесу служыў важным дадаткам да земляробства. Сярод усіх сельскіх промыслаў асабліва месца займала бортніцтва.

У XV ст. па-ранейшаму панавала натуральная гаспадарка. Большая частка насельніцтва, асабліва вясковага, забяспечвала практычна ўсе свае патрэбы за кошт уласнай вытворчасці.

**2. Фарміраванне саслоўяў у Вялікім Княстве Літоўскім.** У XIV–XV стст. на тэрыторыі Беларусі панавалі феадальныя адносіны. Грамадства падзялялася на *саслоўі*. Гэта былі групы людзей, якія валодалі пэўнымі правамі і абавязкамі. Яны былі замацаваныя законам і перадаваліся ў спадчыну.

Пануючым саслоўем з'яўляліся феадалы. У 1387 г. феадалы каталіцкага веравызнання атрымалі важны прывілей. Ён гарантаваў іх маёмасныя і асабістыя правы. Да сярэдзіны XV ст. гэтыя правы былі замацаваныя і за праваслаўнымі феадаламі.

? *Нагадайце, пры якіх умовах быў выдадзены прывілей 1387 г.*

? *З якіх прыступак складалася феадальная лесвіца ў Заходняй Еўропе?*

Феадальнае саслоўе не было аднародным. У ім вылучаліся саслоўныя групы. Як і ў Заходняй Еўропе, яны ўтваралі феадальную лесвіцу. На вяршыні стаялі князі — радавая тытулаваная знаць. Яна вяла сваё паходжанне ад кіруючых дынастый — Рурыкавічаў ці Гедзімінавічаў. У лацінамоўных дакументах князі называліся герцагамі. Яны валодалі зямлёй згодна з так званым вотчынным правам. Гэта значыць, што яны маглі цалкам ёю распараджацца.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Яны маглі прадаваць, дарыць зямлю, перадаваць сваім дзецям ці васалам. Іх уладанні ўяўлялі сабой як быццам дзяржаву ў дзяржаве. Князі мелі ўласнае войска, сваю раду. З асяроддзя князёў паходзіў кіраўнік дзяржавы — вялікі князь.



Шляхта ВКЛ
на карціне пачатку XVI ст.

Трохі ніжэйшую прыступку займалі *паны*. У лацінамоўных дакументах яны называліся баронамі. Паны таксама належалі да тытулаванай знаці, аднак свой тытул паны атрымлівалі не па праве нараджэння. Ён надаваўся за пэўныя заслугі перад вялікім князем. Паны займалі значныя дзяржаўныя пасады і паходзілі з асяроддзя найбольш давераных асоб вялікага князя.




? *Якія саслоўі мелі больш правоў, а якія — больш абавязкаў? Паразважайце, ці было такое грамадства справядлівым. Ці ўсіх задавальняла гэтае становішча?*

Драбнейшыя феадалы спачатку называліся баярамі, а пасля — ***шляхтай*** або рыцарствам. Рыцарствам таксама называлася ўсё феадальнае саслоўе. Яно адзінае лічылася прыдатным для выканання вайсковай службы.

У XV ст. адбывалася фарміраванне мяшчанскага саслоўя. ***Мяшчане*** атрымалі сваю назву ад слова «места» — так у той час называлі на нашых землях горад. Гарадскія жыхары — мяшчане — займаліся

Правообладатель Издательский центр БГУ



Феадалы і сяляне. Малюнак XV ст.

*Якія заняткі сялян і феадалаў паказаны на малюнку?*



Каталіцкае духавенства XV ст. Малюнак *Яна Матэйкі*

рамяством ці гандлем, былі вольныя, але падпарадкоўваліся кіраўніцтву горада. Мяшчане аднаго горада складалі гарадскую абшчыну.

У асобную групу вылучалася духавенства — службоўцы царквы. Аднак каталіцкая і праваслаўная цэрквы мелі розныя правы. Гэта перашкаджала ператварэнню духавенства ў асобнае саслоўе.

Найбольш шматлікім было сялянскае саслоўе. Сяляне былі самай бяспраўнай групай насельніцтва і цалкам залежалі ад феадалаў.

**3. Землеўладанне і землекарыстанне.** Галоўным багаццем у Сярэднія вякі з'яўлялася зямля. У XIV–XV стст. яна амаль поўнасцю перайшла ў рукі феадалаў. Найбуйнейшым землеўласнікам была дзяржава, г. зн. вялікі князь. Значная частка зямлі знаходзілася ў руках князёў, паноў і шляхты.

Землі належалі таксама епіскапствам, манастырам і цэрквам. Але царкоўнае землеўладанне, у адрозненне ад Заходняй Еўропы, не атрымала ў ВКЛ значнага развіцця.

У процілегласць феадалам сяляне паступова страчвалі права валодання зямлёй. Яны ператвараліся ў землекарыстальнікаў. Сяляне вялі сваю гаспадарку *(дым)* сіламі сваёй сям'і і ўласнымі прыладамі працы. Сялянскія сем'і ў той час былі вялікімі. Адных толькі працаздольных асоб налічвалася ў іх 5–7 і нават больш чалавек.

*У якія калектывы аб'ядноўваліся сяляне аднаго ці некалькіх сёлаў?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Сялянскія павіннасці. Пачатак запрыгоньвання сялян.** Сяляне знаходзіліся ў залежнасці ад феадалаў. Землеўласнікі перадавалі свабодным сялянам у карыстанне зямлю. За гэта сяляне выконвалі пэўныя павіннасці. Павіннасці спаганяліся з кожнага сялянскага дыма. Сяляне падзяляліся на даннікаў, цяглых, чыншавых і слуг. Сялян, у якіх асноўнай павіннасцю была даніна, называлі *даннікамі*. Даніна выплочвалася прадуктамі: зернем, мясам, мёдам, птушкай і г. д. У XV ст. з'явіўся грашовы аброк — ***чынш***. Яго плацілі землеўласнікам *чыншавыя сяляне*.

*Цяглыя сяляне* адбывалі ***паншчыну***. Яны працавалі на зямлі феадала са сваёй рабочай жывёлай і прыладамі. Паншчына вядомая на беларускіх землях з XIV ст. Аднак шырока яна стала распаўсюджвацца з сярэдзіны XV ст.

Сярод іншых сялян вылучалася група *сялян-слуг*. Яны былі конюхамі, агароднікамі, садоўнікамі, рамеснікамі і г. д. Частка такіх сялян несла вайсковую службу. Яны называліся служылымі ці *панцырнымі баярамі*.

> ? *Што паслужыла падставай для вылучэння гэтых груп сялян?*

Феадалы імкнуліся «замацаваць» сялян за зямлёй, забараніць ім пераход да іншых землеўладальнікаў. Такое замацаванне атрымала назву *«прыгон»*. Пачаткам юрыдычнага афармлення прыгону стаў прывілей Казіміра Ягелончыка 1447 г. Феадалы атрымалі права на суд над залежным ад іх насельніцтвам. Аднак ім забаранялася прымаць чужых беглых сялян. Судзебнік Казіміра 1468 г. садзейнічаў далейшаму запрыгоньванню сялян. У ім прадугледжвалася пакаранне за дапамогу пры ўцёках залежных ад феадала людзей.

Заканадаўчае афармленне правоў феадалаў замацоўвала ў ВКЛ маёмасную няроўнасць. Адна група грамадства атрымлівала права выкарыстоўваць працу іншай, больш шматлікай часткі. Аднак за кошт эксплуатацыі сялян адбываўся рост сельскагаспадарчай вытворчасці, развіццё эканомікі, пашырэнне гандлю. Ва ўмовах Сярэднявечча гэта было прагрэсіўнай з'явай.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Пытанні і заданні**

1. Што было характэрна для развіцця сельскай гаспадаркі ў XV ст.?
2. Што ўяўляла сабой пануючае саслоўе ВКЛ? Якімі прывілеямі карысталіся феадалы?
3. У чыёй уласнасці знаходзілася зямля ў Познім сярэднявеччы?
4. На якія групы падзяляліся сяляне ВКЛ? Якія яны неслі абавязкі?
5. Па якой прычыне з сярэдзіны XV ст. стала шырока распаўсюджвацца паншчына?
6. Якія дакументы паклалі пачатак юрыдычнаму афармленню прыгону?
7. Якія супярэчнасці існавалі ў грамадстве ВКЛ? Як яны маглі паўплываць на эканамічнае і палітычнае развіццё ВКЛ?

## § 28. Развіццё гарадоў

**Успомніце.** *1. Якія гарады ў Беларусі маюць найбольш працяглую гісторыю? 2. Якімі шляхамі ўзнікалі гарады?*

**Вы даведаецеся.** У XV ст. беларускія землі наладзілі больш цесныя гандлёвыя сувязі з Заходняй Еўропай. Гэта спрыяла развіццю і ўнутранага гандлю. Каб насельніцтва магло прадаваць сваю прадукцыю, была неабходная густая сетка таргоў. Вакол таргоў сталі ўзнікаць новыя гарады. Каб прыцягнуць у іх гандляроў і рамеснікаў, кіраўніцтва ВКЛ давала гарадам новыя прывілеі. Паступова гараджане ператвараліся ў асобнае саслоўе. Чым яно адрознівалася ад іншых саслоўяў дзяржавы?

*З дапамогай гістарычных карт і іншых матэрыялаў даведайцеся, якія гарады былі заснаваныя ці ўжо існавалі ў вашай мясцовасці ў Познім сярэднявеччы. Ці атрымалі гэтыя гарады магдэбургскае права?*

**1. Рост гарадоў і іх насельніцтва.** У XV ст. у Беларусі пачаўся новы этап у развіцці гарадоў. Пасля Грунвальдскай бітвы больш цеснымі сталі сувязі з еўрапейскімі краінамі. На Захадзе павялічыўся попыт на сельскагаспадарчыя прадукты. Беларускія землі здаўна былі багатыя збожжам,



Правообладатель Издательский центр БГУ

ільном, лесам. Таму для беларускіх феадалаў замежны гандаль зрабіўся надзвычай выгадным.

Пашырылася сувязь з рынкам і сялянскіх гаспадарак. Гэта прывяло да росту колькасці рынкаў — *таргоў*. Там сяляне і феадалы маглі прадаць сваю прадукцыю. Вакол таргоў у XV ст. пачалі ўзнікаць новыя гарады.

Пачала мяняцца гарадская планіроўка. Цэнтрам горада стала гандлёвая плошча, а не дзядзінец. Да яе сцякаліся асноўныя вуліцы горада. Гарадскія ўмацаванні з-за выкарыстання артылерыі станавіліся больш моцнымі.

> ? *Як у старажытнарускіх гарадах называлася неўмацаванае наваколле горада?*

Насельніцтва гарадоў фарміравалася пераважна за кошт сялян. З радасцю прымаліся і перасяленцы з іншых гарадоў. Асабліва высока цаніліся кваліфікаваныя замежныя майстры. Аснову насельніцтва горада складалі мяшчане — рамеснікі і гандляры. Але жыхары гарадоў займаліся таксама і сельскай гаспадаркай.

Прывілеяванымі (якія мелі больш правоў і прывілеяў) жыхарамі горада былі феадалы і багатыя купцы. Разам з феадаламі купцы ўдзельнічалі ў кіраванні горадам. Уплывовую групу гарадскога насельніцтва ўтварала духавенства.

Самымі значнымі гарадамі ў XV ст. у Беларусі былі Берасце, Полацк, Слуцк, Гародня, Менск,

> ? *Які з гэтых гарадоў найбольш старажытны?*



План Полацка. XVI ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Навагародак. З канца XV ст. узніклі дробныя гарадскія паселішчы — *мястэчкі*. Яны засноўваліся не толькі дзяржавай, але і феадаламі. У мястэчкі ператвараліся вялікія сёлы і вёскі. Некаторыя мястэчкі ўзнікалі побач з замкамі ці панскімі дварамі. Галоўнай задачай мястэчак было забеспячэнне дзейнасці таргоў.

> ? *Ці былі гэтыя спецыяльнасці ў беларускіх гарадах Высокага сярэднявечча?*

**2. Узрастанне ролі рамяства і гандлю.** У XV ст. у жыцці беларускіх гарадоў узрасло значэнне рамяства. Сярод кавалёў, ювеліраў, ганчароў, шаўцоў, цесляроў з'явіліся больш вузкія спецыялісты. З прафесіі кавалёў вылучыліся слесары, збройнікі, мечнікі і інш. Сярод шаўцоў існавалі майстры па пашыве розных гатункаў абутку. Павялічвалася колькасць прафесій і ў асобных гарадах. Узмацнілася сувязь гарадскіх рамеснікаў з рынкам. Аднак многія спецыялісты працавалі на заказ ці на патрэбы феадальных двароў.



Гарбар.
Сярэднявечны малюнак

У рамесніцкіх майстэрнях вырабам прадукцыі займаліся пераважна гаспадар і члены яго сям'і. З XV ст. у асобных гарадах ВКЛ пачалі з'яўляцца рамесніцкія аб'яднанні — *цэхі*. У іх уваходзілі майстры адной ці некалькіх блізкіх спецыяльнасцей. Аднак пашырэнне ў беларускіх гарадах цэхі атрымалі ўжо ў наступным стагоддзі.



Цясляр.
Сярэднявечная гравюра

Беларускія гарады вялі як унутраны, так і знешні гандаль. Яны гандлявалі з Прыбалтыкай, Польшчай, Чэхіяй, Венгрыяй, украінскімі землямі, Ноўгарадам і Маскоўскім вялікім княствам. На Захадзе беларускія купцы набывалі рамесніцкія вырабы і экзатычныя тавары. Узамен вывозіліся драўніна



Правообладатель Издательский центр БГУ

і вырабы з яе, збожжа, воск, футры, лён, пянька (валокны каноплі).



Гандаль рускімі футрамі. Сярэднявечны барэльеф

с. 26

З Украіны на беларускія землі прыбывалі ўсходнія тавары. У Маскоўскім вялікім княстве і Ноўгарадзе закупляліся футры каштоўных звяроў. Частка набытага тавару перапрадавалася на Захад. У рускія ж гарады беларускія купцы прадавалі свае і заходнееўрапейскія тавары.

На беларускіх землях існавала даволі густая сетка сухапутных дарог. Аднак найбольш актыўны гандаль вёўся па буйны́х рэках: Нёмане, Заходняй Дзвіне, Дняпры, Заходнім Бугу, Прыпяці.

Пашыраўся гандаль паміж горадам і вёскай. Гэтаму спрыяла распаўсюджанне плацяжоў грашыма за карыстанне зямлёй. Сяляне




*З дапамогай схемы высветліце, якія яшчэ тавары прывозіліся на беларускія землі, а якія вывозіліся.*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Беларуская карчма.
Сярэднявечная гравюра

прадавалі сваю прадукцыю, каб выплаціць чынш (грашовы аброк) феадалам.

Вялікае значэнне ў гаспадарчай дзейнасці гарадоў мела ўтрыманне *корчмаў*. Корчмы давалі праезджым гандлярам і проста падарожнікам начлег. Тут можна было паесці і выпіць, паправіць воз ці падкаваць каня. Дзейнасць корчмаў спрыяла развіццю ўнутранага гандлю.

с. 26

**3. Магдэбургскае права.** Каб прыцягнуць у гарады новых жыхароў, дзяржава і феадалы надавалі гарадам прывілеі. Найбольш жаданым для любога горада быў прывілей на самакіраванне. З канца XIV ст. гарады ВКЛ сталі атрымоўваць ***магдэбургскае права***. Гэта было самакіраванне на ўзор нямецкага горада Магдэбурга. Першым з гарадоў Вялікага Княства Літоўскага яго атрымала Вільня ў ***1387 г.*** Першы горад на беларускіх землях, якому было дадзена магдэбургскае права ў 1390 г., — Берасце. Старажытны Полацк атрымаў магдэбургскае права ў 1498 г., Менск — у 1499 г.

***Магістрат*** — орган гарадской улады — складаўся з лавы і рады. *Лава* судзіла мяшчан па крымінальных справах. На чале яе стаяў *войт*. *Рада* займалася збіраннем падаткаў, добраўпарадкаваннем горада. Яна кіравала рамеснікамі і гандлярамі. На чале рады стаялі *бурмістры*. Для магістрата ўзводзіліся асобныя будынкі — ***ратушы***.




*З дапамогай схемы і тэксту параграфа складзіце расказ аб арганізацыі кіравання ў гарадах з магдэбургскім правам.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**~° гдэˆ ургскае права**

- Вызваленне ад феадальнай залежнасці і павіннасцей
- Свабодны занятак рамяством, гандлем, земляробствам
- Самакіраванне: свой орган гарадской улады — магістрат
- Свой суд

*З дапамогай схемы высветліце, што давала гарадам магдэбургскае права.*

**4. Гістарычная роля гарадоў.** Узнікненне і развіццё гарадоў адыграла важную ролю ў гісторыі. Іх з'яўленне — вынік аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі.

*Складзіце схему «Гістарычная роля гарадоў».*

Гарады станавіліся цэнтрамі культуры і мастацтва. Пасля прыняцця хрысціянства ў гарадах разгарнулася будаўніцтва цэркваў, сабораў, манастыроў. Некаторыя гарады сталі рэзідэнцыямі епіскапаў. У іх з'явіліся буйны́я кафедральныя саборы, духоўныя навучальныя ўстановы. Так гарады ператвараліся ў рэлігійныя цэнтры.



Гродзенская ратуша на гравюры XVI ст.

У Сярэднія вякі гарады мелі ўмацаванні, і ў час войнаў яны станавіліся важнымі абарончымі пунктамі. Гарады былі цэнтрамі княстваў, валасцей, ваяводстваў.

Такім чынам, у XV ст. рэзка ўзрасло значэнне гаспадарчых функцый гарадоў. Галоўнымі заняткамі мяшчан сталі рамяство і асабліва гандаль. Спецыфічныя гаспадарчыя заняткі мяшчан абумовілі



Правообладатель Издательский центр БГУ

вылучэнне іх у асобнае саслоўе. Найбольш яскрава праявілася гэта ў атрыманні некаторымі гарадамі самакіравання.

**Пытанні і заданні**

**1.** У чым заключаліся асаблівасці развіцця беларускіх гарадоў у XV ст.?
**2.** Калі і чаму пачалі ўзнікаць мястэчкі? У чым іх асаблівасці?
**3.** Дакажыце сцвярджэнне пра тое, што ў беларускіх гарадах XV ст. узрасло значэнне рамяства.
**4.** Як адбывалася развіццё гандлю беларускіх гарадоў у XV ст.?
**5.** Калі магдэбургскае права з'явілася ў гарадах ВКЛ? Што яно давала гарадам?
**6.** Якую ролю адыгрывалі гарады ў Познім сярэднявеччы?
**7.** Паразважайце, ці ператварыліся гарады ВКЛ у асобную палітычную сілу, як гэта было ў Заходняй Еўропе.

# § 29. Этнічнае развіццё беларускіх зямель. Царква і рэлігія

**Успомніце.** *1. Калі славяне засялілі тэрыторыю Беларусі? 2. Якія хрысціянскія епархіі першымі былі створаны на тэрыторыі Беларусі? Калі гэта адбылося?*

**Вы даведаецеся.** З самага пачатку свайго існавання Вялікае Княства Літоўскае было дзяржавай многіх народаў. Кожны з іх меў адметную культуру і рэлігію. Большасць насельніцтва дзяржавы складалі славяне праваслаўнага веравызнання. З іх паступова вылучалася беларуская народнасць. Яна займала ключавое месца ў культурным развіцці ВКЛ. У цэлым жа ў Вялікім Княстве мірна суіснавалі розныя народы і рэлігіі. Пасля Крэўскай уніі пануючай рэлігіяй у ВКЛ стала каталіцтва. Якое значэнне гэта мела для беларускай народнасці?

**1. Асаблівасці фарміравання беларускай народнасці.** Як гістарычная супольнасць людзей *народнасць* мае свае прыкметы.

Важны этап фарміравання беларускай народнасці быў звязаны з Вялікім Княствам Літоўскім. Тэрыторыя гэтай дзяржавы склад-


Правообладатель Издательский центр БГУ




*Як вы думаеце, ці абавязковая наяўнасць усіх прыкмет для існавання народнасці?*

валася ў XIII–XV стст. У гэты час працягвалася славянская каланізацыя Літвы. Балты пераймалі славянскую мову і культуру. У XIV ст. старабеларуская мова стала ў ВКЛ дзяржаўнай. На ёй складаліся афіцыйныя дакументы, вялася перапіска, ствараліся мастацкія творы. Ёй карысталіся не толькі сяляне і мяшчане, але і арыстакратыя. У выніку старажытнабеларуская культура атрымала спрыяльныя ўмовы для развіцця. Гэта садзейнічала фарміраванню беларускай народнасці.

*Разгледзьце карту атласа на с. 25. Якія народы пражываюць зараз на тэрыторыі былога ВКЛ?*

Старажытнай і багатай была духоўная культура беларусаў. Яшчэ ад язычніцкіх часоў у ёй захавалася пакланенне прыродзе. У беларускай міфалогіі цесна перапляталіся язычніцкія і хрысціянскія традыцыі. Гэта выразна выявілася ў каляндарных абрадах беларусаў.

Традыцыйным заставаўся і побыт беларусаў. У будаўніцтве жылля перавага аддавалася дрэву. Памеры пабудоў былі невялікімі. Часам яны выконвалі як жылыя, так і вытворчыя функцыі. Захоўваліся традыцыйныя прылады працы, упрыгажэнні, побытавыя рэчы. Прастатой вызначалася харчаванне.

У XV ст. на беларускія землі сталі пранікаць заходнія ўплывы. Асабліва хутка пераймалі іх феадалы і заможныя мяшчане. Мянялася мода, больш разнастайным зрабілася харчаванне. Знаць пачала бавіць час на паляваннях, пірах, турнірах. Багатыя феадалы

*Якую ежу часцей за ўсё спажывалі нашы продкі?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

шмат вандравалі, выязджалі за мяжу. Лад іх жыцця ўсё больш набліжаўся да побыту заходняга рыцарства.

**2. Паходжанне назвы «Белая Русь».** У XIV–XV стст. былі вядомыя розныя назвы нашых продкаў. Яны называліся «русь», «русіны», «ліцвіны», «ліцвіны-беларусы». Існавалі мясцовыя назвы, напрыклад, «палешукі». «Ліцвінамі» называлі пераважна насельніцтва сучаснай Літвы і Беларускага Панямоння, але часта — усіх жыхароў Вялікага Княства Літоўскага. Такім чынам, пад ліцвінамі разумелі продкаў не толькі сучасных літоўцаў, але і беларусаў.

«Русінамі» і «беларусамі» часцей называлі праваслаўных жыхароў Падзвіння і Падняпроўя. Назва «Белая Русь» вядомая з XIV ст. Ужо ў 1382 г. Полацк згадваецца ў хроніках як крэпасць Белай Русі. Паступова гэтая назва пашырылася і на іншыя землі сучаснай Беларусі.

Што азначае назва «Белая Русь»? Адзінай думкі па гэтым пытанні ў вучоных няма. У тыя часы той ці іншы колер мог азначаць напрамак свету. Белы колер звязваўся з усходам, чорны — з захадам. Белай Руссю тэрыторыю нашай краіны маглі называць у сувязі з колерам адзення і валасоў. Беларусы насілі белае адзенне, мелі светлыя валасы. Існуе таксама думка, што Белай Руссю называлі тую частку нашай краіны, якая не была захоплена ні крыжакамі, ні манголамі. Слова «белая» азначала стан свабоды, волі, незалежнасці.

**3. Этнічныя меншасці ў ВКЛ.** Акрамя ўсходніх славян і балтаў у ВКЛ пражывалі і іншыя народнасці. Ужо ў часы Гедзіміна тут з'явіліся немцы. Яны запрашаліся сюды як рамеснікі і гандляры. Нямецкія гандлёвыя двары меліся ў Вільні, Троках, Полацку. Нямецкія абшчыны існавалі ў Гародні і Берасці. З канца XIV ст. на беларускіх землях з'явіліся палякі. У беларускія гарады перасяляліся польскія мяшчане. Польскія рыцары за службу ў ВКЛ атрымоўвалі тут маёнткі.

? *У якія гады ўладарыў Гедзімін?*

? *Чаму палякі з'явіліся менавіта ў гэты час?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У XIV ст. у Літве і Беларусі з'явіліся татары. Вялікія князі літоўскія запрашалі татараў з Залатой Арды і Крыма. Іх выкарыстоўвалі ў барацьбе з нямецкімі рыцарамі. У канцы XIV ст. у ВКЛ прыехаў хан Тахтамыш. Ён страціў уладу ў Залатой Ардзе і быў гасцінна прыняты Вітаўтам. Вітаўт і Тахтамыш здзейснілі паспяховы паход пад Азоў. Там яны захапілі ў палон шмат татараў. Палонныя былі паселены каля Вільні, Трокаў, Ліды, Навагародка, Ашмян і ў іншых месцах. Ім дазвалялася вызнаваць іслам і будаваць мячэці.

**З нататак бургундскага падарожніка XV ст. Жыльбера дэ Лануа**

У згаданых Троках і па-за імі ў многіх селішчах знаходзіцца вялікая колькасць татараў, якія жывуць там племёнамі. Яны — сапраўдныя сарацыны, не маюць нічога хрысціянскага і гавораць асаблівай мовай, званай татарскай. Сапраўды, такім жа чынам у згаданым горадзе жывуць немцы, літоўцы, рускія і велізарная колькасць яўрэяў, з якіх кожны гаворыць сваёй асобнай мовай. Горад гэты належыць згаданаму князю Вітаўту.

*Як вы думаеце, каго разумеў пад імем «рускія» бургундскі падарожнік?*

У канцы XIV ст., пры Вітаўце, на беларускіх землях сталі сяліцца яўрэі. Першыя яўрэйскія абшчыны ўзніклі ў Берасці і Гародні. Масавае перасяленне яўрэяў у Беларусь

? *Калі ўладарыў Казімір Ягайлавіч?*



Яўрэі і сяляне-беларусы ў XV ст.
Малюнак *Яна Матэйкі*

? *Якія прыкметы дазваляюць вылучыць сярод намаляваных асоб яўрэяў?*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Фларэнтыйскі сабор.
Фрэска *Пінтурык'я*

пачалося пры Казіміру Ягайлавічу. Яўрэі зарэкамендавалі сябе як выдатныя купцы і гандляры. Яны сяліліся ў гарадах асобнымі кварталамі. Яўрэі аб'ядноўваліся ў абшчыны — *кагалы*. Вярхоўная ўлада ВКЛ прыхільна ставілася да яўрэяў. Яны збіралі падаткі, гандлёвыя пошліны, працавалі ў маёнтках буйны́х феадалаў. Аднак яўрэям не дазвалялася набываць зямельную ўласнасць і служыць у шляхецкім войску.

У XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім з'явіліся цыганы. Яны патрапілі сюды з Польшчы, Германіі і Венгрыі. Цыганы вялі качавы лад жыцця групамі сем'яў — *табарамі*.

с. 27

### 4. Становішча праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла.

Пасля заключэння Крэўскай уніі галоўнай *канфесіяй* у ВКЛ зрабілася каталіцтва. У *1387 г.* было створана *Віленскае біскупства*. У першай палове XV ст. дзейнічалі таксама Жамойцкае і Луцкае біскупствы. Дзяржава шчодра надзяляла касцёл землямі і даходамі з насельніцтва.

> ? *Якое палажэнне Гарадзельскай уніі 1413 г. ставіла праваслаўных феадалаў ВКЛ у нераўнапраўнае становішча ў параўнанні з католікамі?*

Ужо ў часы Вітаўта актыўна засноўваліся каталіцкія храмы. Каля трэці каталіцкіх *парафій* (прыходаў) было закладзена на беларускіх землях. У канцы XV ст. актыўную дзейнасць тут распачалі каталіцкія манахі.

Самай шматлікай канфесіяй заставалася праваслаўе. Крэўская унія мела негатыўныя вынікі для праваслаўнай царквы. Аднак яе прыхільнікаў не змушалі да пераходу ў іншую веру. Таму пазіцыі праваслаўя заставаліся моцнымі нават сярод феадальнай знаці.



Правообладатель Издательский центр БГУ

У XV ст. у Еўропе распаўсюдзіліся ідэі ўз’яднання каталіцкай і праваслаўнай цэркваў. Яны сустрэлі падтрымку ў вялікага князя літоўскага Вітаўта. Ідэю царкоўнай уніі падтрымліваў і Свідрыгайла. У 1439 г. у Фларэнцыі (Італія) была заключана царкоўная унія. Аднак заваяванне Канстанцінопаля туркамі ў 1453 г. зрабіла яе непатрэбнай. Тым не менш у ВКЛ спробы аднавіць адзінства царквы рабіліся і пазней.

Яскравай з’явай у рэлігійным жыцці і культуры ВКЛ XV ст. стала дзейнасць мітрапаліта, таленавітага пісьменніка і прамоўцы Грыгорыя Цамблака (1364 – каля 1420), родам з Балгарыі. Па ініцыятыве вялікага князя літоўскага Вітаўта ў 1415 г. ён быў абраны кіеўскім мітрапалітам. Даследчыкі лічаць Цамблака аўтарам больш чым 40 твораў, з якіх захавалася каля 26. Яго творы, напісаныя вобразнай мовай, карысталіся заслужанай вядомасцю ва ўсім славянскім свеце.

*Знайдзіце дадатковую інфармацыю пра дзейнасць Грыгорыя Цамблака на пасадзе кіеўскага мітрапаліта.*

Такім чынам, у складзе Вялікага Княства Літоўскага пачаўся працэс фарміравання беларускай народнасці. Гэты працэс праходзіў у спрыяльных умовах. Беларуская мова і культура шмат у чым вызначалі культурнае аблічча дзяржавы ў цэлым. Таму тэрыторыя беларускай народнасці пашыралася, у тым ліку ахопліваючы і некаторыя этнічна літоўскія землі. Гэтая сітуацыя не змянілася нават пасля прыняцця каталіцтва ў якасці галоўнага веравызнання дзяржавы.

**Пытанні і заданні**

**1.** З дапамогай схемы на с. 197 дайце азначэнне паняццю «народнасць».
**2.** У чым заключаліся асаблівасці этнічнага развіцця ў ВКЛ Позняга сярэднявечча?
**3.** Якую ролю адыгрывала старабеларуская мова ў ВКЛ?
**4.** Якія існуюць меркаванні наконт паходжання назвы «Белая Русь»? Якое з іх здаецца вам найбольш пераканаўчым?
**5.** Пералічыце народы, акрамя славян і балтаў, якія пражывалі на тэрыторыі ВКЛ. У чым заключаліся асаблівасці іх жыцця?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**6.** Як змянілася становішча каталіцкай і праваслаўнай канфесій у ВКЛ Позняга сярэднявечча?

**7.** Параўнайце становішча праваслаўнай царквы на беларускіх землях у старажытнарускі перыяд і ў Познім сярэднявеччы.

## § 30. Культура беларускіх зямель у канцы XIV — XV ст.

**Успомніце.** *1. Які новы тып замкаў з'явіўся ў ВКЛ у XIV ст.? 2. Якія рукапісныя кнігі XIV ст. з тэрыторыі Беларусі захаваліся да нашага часу?*

**Вы даведаецеся.** Насельніцтва беларускіх зямель Позняга сярэднявечча працягвала ствараць выдатныя ўзоры архітэктуры і мастацтва. Між тым культура ў большай ступені апынулася пад уплывам заходнееўрапейскіх традыцый. У чым гэта выявілася? Якія новыя рысы набыла культура Беларусі канца XIV – XV ст.?

**1. Асноўныя мастацкія стылі.** Канец XIV — XV ст. былі адметнымі ў развіцці беларускай культуры. Страчваліся традыцыі полацкай і гарадзенскай архітэктурных школ. Змяняліся ўзоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Візантыйска-руская культурная спадчына дапаўнялася пранікненнем заходнееўрапейскіх стыляў.

Раманскі стыль да канца XIV ст. паступова знікаў. Усё больш уплыў на развіццё мастацтва стала аказваць готыка. Для яе былі характэрныя спічастыя, выцягнутыя ўгору абрысы. Гатычныя будынкі мелі вялікія вокны са стральчатымі аркамі. Выкарыстоўваліся *вітражы* — вокны з малюнкамі з каляровага шкла. Крыжовыя, зорчатыя ці сотавыя скляпенні ўтваралі непаўторны ўзор на столі. Узнікала ўражанне лёгкасці будынка, яго імкнення ўгору, да Бога. Гэта было асабліва важна пры ўзвядзенні цэркваў і касцёлаў.

> **?** *Якія прыклады заходнееўрапейскіх гатычных пабудоў вы ведаеце?*

Готыка стала пануючым стылем у скульптуры, жывапісе, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Нават напісанне літар мянялася пад уплывам готыкі. Атрымалі папулярнасць ламаныя,



Правообладатель Издательский центр БГУ

вычварныя формы. Яны надавалі чалавечым фігурам і дэкаратыўным узорам надзвычайную выразнасць. «Гатычныя» густы праяўляліся ў вырабе ўзбраення, даспехаў, свецкай модзе. Праявы готыкі пратрымаліся на беларускіх землях вельмі доўга.

**2. Культавае і абарончае дойлідства.** Да канца XV ст. самымі моцнымі ў Вялікім Княстве Літоўскім былі велікакняжацкія замкі. Прывілей Ягайлы 1387 г. дазваляў будаваць замкі таксама феадалам.

> ? *Дзе былі пабудаваны замкі-кастэлі на беларускіх землях у XIV ст.?*

Замкавую архітэктуру адрознівалі прастата і суровасць. Найбольшая ўвага звярталася на моц сцен і вежаў. Яны павінны былі супрацьстаяць любому ворагу. Замкі будаваліся ў месцах, зручных для абароны. Яны ўзводзіліся на пагорках, сярод балот, на астравах азёр. Многія замкі абводзіліся ровам, запоўненым вадой. Некаторыя складаліся з дзвюх частак — Ніжняга і яшчэ больш магутнага Верхняга замка. Старыя замкі таксама перабудоўваліся і ўмацоўваліся.

> ? *Чым была выклікана патрэба ва ўмацаванні замкаў?*



Віленскія замкі ў XV ст. Рэканструкцыя

? *Параўнайце знешні выгляд горада Позняга сярэднявечча і старажытнарускага часу.*



Правообладатель Издательский центр БГУ



Макет замка Вітаўта ў Гродне



Касцёл у в. Ішкальдзь. Сучасны выгляд

Галоўнымі з'яўляліся замкі ў Вільні і Троках (на тэрыторыі сучаснай Літвы). Яны былі ўзведзены на мяжы XIV і XV стст. з каменю і цэглы. Верхні замак у Вільні ўзвышаўся на вяршыні стромкай гары. Трокскі замак размяшчаўся пасярэдзіне возера. Замкі ў Вільні і Троках лічыліся непрыступнымі і былі асноўнымі рэзідэнцыямі вялікіх князёў літоўскіх.

Не менш магутным быў замак у Новагародку. Узвядзенне мураваных вежаў і сцен пачалося тут у часы Вітаўта. Галоўная вежа замка называлася Шчытоўка. Тут размяшчаліся турма, арсенал і жылыя пакоі. Патрапіць у вежу можна было праз пад'ёмны мост. Каля мураванага замка месціўся яшчэ адзін замак — драўляны.

Адзін з улюбёных замкаў Вітаўта размяшчаўся ў Гародні. На мяжы XIV і XV стст. Вітаўт перабудаваў замак. Былі ўзведзены магутныя мураваныя сцены з пяццю вежамі. Непадалёк ад брамы знаходзіўся вялікі палац Вітаўта. Над ім узвышалася высокая галоўная вежа.

У канцы XIV — XV ст. у культавай архітэктуры таксама замацаваўся гатычны стыль. Беларуская готыка належыць да паўночнаеўрапейскага варыянта гэтага стылю. Ёй уласцівая большая стрыманасць і суровасць. Шырэй выкарыстоўвалася цэгла, а не камень.

*З даведачнай літаратуры высветліце, якія культавыя пабудовы існавалі ў вашай мясцовасці ў Познім сярэднявеччы. Да якіх канфесій яны належалі? Якая канфесія пераважала?*


Правообладатель Издательский центр БГУ

Галоўнай асаблівасцю гатычных храмаў Беларусі былі трохвугольныя спічастыя фасады. Часам яны мелі пабеленыя нішы. Сцены ўмацоўваліся спецыяльнымі падпорамі — *контрфорсамі*. Гэта стварала ўражанне велічнасці і манументальнасці. Аркі і нішы часам рабілі не стральчатымі, а скругленымі. Гэта надавала ім падабенства з раманскім стылем. Да нашых дзён захаваліся гатычныя касцёлы ў аграгарадку Уселюб Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, в. Ішкальдзь Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці і інш.



Пілат абмывае рукі. Фрэска з замкавай капліцы ў Любліне

с. 27

**3. Жывапіс і скульптура.** Далейшае развіццё атрымала ў канцы XIV — XV ст. выяўленчае мастацтва. Па-ранейшаму вялікае значэнне меў іканапіс. Ён развіваўся на аснове візантыйска-рускіх традыцый. Вялікае прызнанне атрымалі беларускія майстры фрэсак. Захаваліся іх роспісы ў шэрагу рэлігійных збудаванняў. Самымі вядомымі з'яўляюцца фрэскі замкавай капліцы ў Любліне пачатку XV ст. Сярод іх вылучаецца партрэт Ягайлы.

Візантыйскія традыцыі захоўваліся ў кніжнай *мініяцюры*. Аднак і тут яны адступалі пад націскам новых культурных павеваў.



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

? *Знайдзіце на мініяцюры заходнееўрапейскія і візантыйска-старажытнарускія элементы.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца так званы *Радзівілаўскі летапіс*. Ён утрымоўвае 617 каляровых мініяцюр. На іх адлюстраваны бітвы, народныя паўстанні, праца і адпачынак, святы, побытавыя сцэнкі. Праз руска-візантыйскія каноны праступаюць і мясцовыя рэаліі XV ст.: рыцарскае ўзбраенне, гатычнае адзенне і мэбля, геральдыка.

У XV ст. пашырылася гатычная скульптура. Самым папулярным сюжэтам стала выява Дзевы Марыі з дзіцем на руках. Сустракаліся таксама вобразы святых. Для скульптур гэтага часу характэрная велічнасць. Яна падкрэслівалася манументальнасцю пастаў і ламанымі складкамі адзення.

? *Складзіце ў сшытку табліцу з двух слупкоў «Традыцыі ў мастацтве Беларусі Позняга сярэднявечча». У адным слупку прывядзіце прыклады мастацтва з візантыйскімі традыцыямі, у другім — з заходнееўрапейскімі.*



Маці Божая. Гатычная скульптура з г. п. Рось Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобл.



Распяцце з в. Галубічы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл. XIV ст. Мае раманскія рысы



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Літаратура.** Аснову літаратуры XIV–XV стст. складалі рэлігійныя творы. Да іх належалі Біблія, богаслужбовыя кнігі, жыццяпісы святых, павучанні і інш. Яны перапісваліся пераважна манахамі ў манастырах на царкоўнаславянскай мове. У XV ст. з'явіліся і першыя пераклады рэлігійнай літаратуры на старабеларускую мову.

Некаторыя творы рэлігійнай тэматыкі ўтрымлівалі практычныя звесткі. Да іх належыць *паломніцкая літаратура*. У нечым яна была падобная да падарожных нататак. У XV ст. узнік жанр *панегірычнай літаратуры*. У ёй услаўляліся пэўныя асобы. Найбольш вядомым творам такога характару была «*Пахвала Вітаўту*». У ёй Вітаўт услаўляецца як мудры і магутны ўладар.

? *Растлумачце паняцце «панегірык».*

У гэты ж час ствараюцца выдатныя летапісныя творы. Сярод іх — «*Летапісец вялікіх князёў літоўскіх*» і *Беларуска-літоўскі летапіс*, у якіх паслядоўна адстойвалася палітыка вярхоўнай улады па ўмацаванні дзяржавы.

Перапісванне кніг было доўгай і цяжкай працай. Дазволіць сабе мець бібліятэку мог далёка не кожны. Найчасцей зборы кніг меліся пры цэрквах і манастырах. Аднак з канца XV ст. вядомыя бібліятэкі феадалаў. У іх траплялісь кнігі не толькі духоўнага, але і свецкага характару.

Разам з пашырэннем на беларускіх землях каталіцтва ў культуры хутка выявіліся заходнееўрапейскія рысы. Асноўным стылем у архітэктуры і мастацтве зрабілася готыка. Аснову літаратуры складалі рэлігійныя творы, аднак сталі карыстацца папулярнасцю і кнігі свецкага характару.

**Пытанні і заданні**

1. Якія стылі панавалі ў мастацтве і архітэктуры ВКЛ?
2. Што было характэрна для гатычнага стылю? У чым ён праяўляўся?
3. Што было ўласціва абарончаму дойлідству ВКЛ? Прывядзіце прыклады.

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Якія змены адбыліся ў культавай архітэктуры ВКЛ?
5. Як развівалася выяўленчае мастацтва ВКЛ у канцы XIV – XV ст.?
6. Што ўяўляла сабой літаратура ВКЛ Позняга сярэднявечча?
7. Вызначце, што з культурных дасягненняў беларускіх зямель Позняга сярэднявечча было спадчынай папярэдняга перыяду, а што — новай з'явай.

## Абагульненне

Вы скончылі вывучэнне гісторыі Беларусі канца XIV — XV ст. У гэты час Вялікае Княства Літоўскае, у склад якога ўваходзілі беларускія землі, стала адной з наймагутнейшых дзяржаў Еўропы. Яно ўключала беларускія, літоўскія, большасць украінскіх, частку рускіх і польскіх зямель. Тэрыторыя гэтай дзяржавы распасціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора. Яе ўплыў адчувалі многія суседнія краіны і народы.

Грунвальдская бітва 1410 г. паклала канец двухсотгадовай барацьбе з крыжацкай агрэсіяй. Быў разгромлены найбольш небяспечны і магутны вораг. Дасягнуць перамогі ўдалося дзякуючы палітычнаму саюзу з суседняй Польшчай. Крэўская унія 1385 г. аб'яднала сілы ВКЛ і Польшчы супраць Тэўтонскага ордэна. Адначасова яна спыніла палітычную ізаляцыю беларуска-літоўскай дзяржавы ў Еўропе. Хрышчэнне язычніцкай Літвы абумовіла ўваходжанне ВКЛ у супольнасць еўрапейскіх краін. Гэтую дзяржаву сталі не толькі баяцца, але і паважаць. Наладзіліся сталыя палітычныя, эканамічныя і культурныя кантакты з заходнімі суседзямі. Гэта спрыяла эканамічнаму і культурнаму ўздыму беларускіх зямель.

Значныя зрухі адбываліся ў сацыяльна-палітычнай сферы. Беларускія землі ўсё цясней уключаліся ў палітычную структуру дзяржавы. З сярэдзіны XV ст. улада вялікіх князёў паступова пачала слабнуць. Пазіцыі шляхты, наадварот, умацаваліся. Гэта прывяло да пачатку фарміравання ў ВКЛ шляхецкай дэмакратыі.

Аднак Крэўская унія мела і непажаданыя наступствы. Паводле яе ўмоў прывілеяванай канфесіяй у ВКЛ зрабілася каталіцтва.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Праваслаўнае насельніцтва беларускіх зямель апынулася ў нераўнапраўным становішчы. Гэта прывяло да ўнутранай барацьбы, якая аслабляла дзяржаву. Урэшце праваслаўныя атрымалі такія ж правы, як і каталікі. Аднак да таго часу ВКЛ страціла статус вядучага цэнтра збірання праваслаўных зямель Русі.

Няпроста складваліся адносіны з Польшчай. Былая саюзніца ВКЛ пачала прэтэндаваць на падпарадкаванне сабе беларуска-літоўскай дзяржавы. Барацьба з прэтэнзіямі Польшчы, якія ўвесь час узрасталі, зрабілася адным з галоўных напрамкаў палітыкі Вялікага Княства. У рэшце рэшт утварылася новая дзяржава — Рэч Паспалітая. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя, якую вы будзеце вывучаць у наступным годзе.

**Заданне 1.** Узгадайце, якія важныя падзеі адбыліся ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў прыведзеныя гады: 1399, 1410, 1413, 1430, 1435, 1447, 1468.

**Заданне 2.** Знайдзіце на картасхемах вучэбнага дапаможніка на форзацах або на с. 22–28 атласа:

а) месцы бітваў на рацэ Ворскла, каля Грунвальда, каля Вількаміра;

б) тэрыторыю, якую атрымала ВКЛ згодна з умовамі Торуньскага міру 1411 г.;

в) межы Вялікага Княства Літоўскага ў канцы ўладарання Вітаўта;

г) усходнюю мяжу Вялікага Княства Літоўскага, якая ўсталёўвалася ў 1449 г.;

д) суседзяў Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV ст.

**Заданне 3.** Складзіце ў вуснай форме кароткія паведамленні з выкарыстаннем паняццяў, якія даюцца ў дужках:

а) «Нязздзейсненая каранацыя Вітаўта» (каралеўская карона, польскі кароль, германскі імператар, польскія паны, еўрапейскія манархі);

Правообладатель Издательский центр БГУ

б) «Аблога Мальбарка ў 1410 г.» (крыжакі, польска-літоўскае войска, прускія гарады і замкі, аблога, мірнае пагадненне);

в) «Пасяджэнне Паноў-Рады» (вялікі князь, буйны́я феадалы, каталіцкія біскупы, вышэйшыя службовыя асобы, абмеркаванне праблемы, спрэчкі, вынясенне рашэння);

г) «Скліканне паспалітага рушэння» (феадалы, абавязак службы, заклік вялікага князя, коннікі, харугва).

**Заданне 4.** Растлумачце лагічныя ланцужкі:

перамога ВКЛ у «Вялікай вайне» → умацаванне незалежнасці ВКЛ;

хрышчэнне язычніцкай Літвы → эканамічны і культурны ўздым беларускіх зямель;

заключэнне Крэўскай уніі → узмацненне ўнутранай барацьбы ў ВКЛ;

узрастанне попыту на сельскагаспадарчыя прадукты на Захадзе → узнікненне новых гарадоў у ВКЛ.

**Заданне 5.** Раскажыце аб наступных гістарычных падзеях і з’явах:

а) паражэнне Вітаўта ў бітве на рацэ Ворскле;
б) заключэнне Торуньскага міру;
в) Вількамірская бітва;
г) выкананне павіннасцей сялян феадалу;
д) гандаль на таргу ў гарадах ВКЛ;
е) кіраванне ў гарадах з магдэбургскім правам.

**Заданне 6.** Падлічыце, колькі гадоў прайшло:

а) ад Крэўскай да Гарадзельскай уніі;
б) ад бітвы на рацэ Ворскла да Грунвальдскай бітвы;
в) ад пачатку да канца дынастычнай вайны ў ВКЛ;
г) ад выдання прывілея Казіміра Ягайлавіча да прыняцця Судзебніка Казіміра.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 7.** Вызначце наступствы:
а) Грунвальдскай бітвы;
б) Гарадзельскай уніі;
в) узмацнення заходніх уплываў у канцы XV ст.;
г) стварэння Віленскага біскупства.

**Заданне 8.** Параўнайце становішча розных саслоўяў у ВКЛ і зрабіце выснову.

| Саслоўе | Правы | Абавязкі |
|---|---|---|
| Феадалы | | |
| Мяшчане | | |
| Сяляне | | |

### Раім наведаць

Для замацавання сваіх ведаў рэкамендуем наведаць з настаўнікам ці бацькамі:

- Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь;
- Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей;
- Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі;
- турыстычны маршрут «Палацы і замкі Гродзеншчыны»;
- Лідскі замак;
- Музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі».

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Слоўнік гістарычных паняццяў

**Абра́ды** — спецыяльныя рытуальныя дзеянні, якімі суправаджаліся важныя падзеі ў жыцці людзей.

**Абшчы́на** — калектыў (невялікая група) людзей, якія вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі зямлёй.

**Амуле́т** — прадмет (невялікая рэч), які людзі насілі на целе. Людзі верылі, што ён засцерагае іх ад небяспекі, спрыяе поспеху ў гаспадарчай дзейнасці.

**Арцыбі́скуп** — старшы біскуп, адзін з найважнейшых царкоўных чыноў.

**Ба́лты** — плямёны індаеўрапейскага паходжання, продкі сучасных літоўцаў і латышоў. Да прыходу славян засялялі ўсю тэрыторыю Беларусі. Назва паходзіць ад назвы Балтыйскага мора.

**Ба́рысавы камяні́** — помнікі XII ст. у Беларусі: сем вялікіх валуноў з крыжамі і надпісамі, зробленымі па загадзе князя Барыса.

**Бая́ры** — нашчадкі радавой знаці ў Кіеўскай Русі, старшыя дружыннікі і буйны́я землеўласнікі. У перыяд раздробленасці — багатыя і ўплывовыя землеўласнікі.

**Берасця́ныя гра́маты** — лісты і дакументы на бяросце, выяўленыя пры раскопках старажытнарускіх гарадоў.

**Бо́ртніцтва** — збор мёду дзікіх пчол. Борцю ў славян называлася дупло ў дрэве, дзе сяліліся пчолы.

**Бурмі́стр** — кіраўнік рады горада ў ВКЛ.

**Буршты́н** — закамянелая смала старажытных дрэў, часта выкарыстоўваецца для вырабу ўпрыгажэнняў.

**Вара́гі** — старажытнаруская назва скандынаўскіх воінаў-вікінгаў.

**Ваяво́да** — 1) княжацкі военачальнік у Старажытнай Русі; 2) у XIV–XV стст. намеснік вялікага князя з судова-адміністрацыйнымі функцыямі, з XV ст. — член Паноў-Рады вялікага князя літоўскага і яго намеснік у вялікай правінцыі — ваяводстве, дзе быў ваенным і грамадзянскім кіраўніком.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Ваяво́д тва** — адміністрацыйная адзінка ў Вялікім Княстве Літоўскім, што ўзначальвалася ваяводам, які падпарадкоўваўся непасрэдна князю.

**Верв** — назва сельскай абшчыны ва ўсходніх славян; назва паходзіць ад слова «вяроўка».

**Ве́ча** — сход дарослых свабодных мужчын, які склікаўся для вырашэння важных спраў.

**Вітра́ж** — твор мастацтва з каляровага шкла, разлічаны на скразное асвятленне. Найчасцей прызначаны для аконнага праёма ў архітэктурным збудаванні.

**Войт** — прызначаны князем кіраўнік органа гарадской улады (лавы) у ВКЛ.

**Во́лак** — сухапутная частка воднага шляху гандлёвых зносін, якая ляжыць паміж дзвюма рэкамі. Па ім даводзілася цягнуць караблі.

**Во́ласць** — 1) ва ўсходніх славян у XI–XIII стст. тэрыторыя, падпарадкаваная ўладзе аднаго князя, княжацкае ўладанне; 2) зямельныя валоданні, якія належалі адной асобе ў ВКЛ; 3) адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ, населеная сялянамі-даннікамі.

**Волхв** — вяшчун, чараўнік, варажбіт; у часы Старажытнай Русі — язычніцкі жрэц, які праводзіў службы язычніцкім багам і прадказваў будучыню.

**Во́рыўнае земляро́бства** — від земляробства, які прыйшоў на змену матычнаму. Для апрацоўкі зямлі выкарыстоўваліся рала і саха.

**Во́ чына** — зямельнае ўладанне, якое перадавалася ў спадчыну.

**Вытво́рчая гаспада́рка** — гаспадарка, пры якой людзі самі рабілі тое, што неабходна для жыцця: гадавалі жывёл, вырошчвалі расліны.

**Гарадзі́шча** — умацаванае валамі, равамі і сценамі паселішча, якое ў Беларусі ўзнікла ў канцы бронзавага і пачатку жалезнага веку.

**Го́сці** — купцы, якія гандлявалі з замежжам, або замежныя купцы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Дані́на** — натуральны падатак (футра, мёд і г. д.), які плацілі князю падуладныя яму людзі; пазней — усе дзяржаўныя падаткі.

**Д ннік** — селянін, асноўнай павіннасцю якога была даніна, што выплачвалася прадуктамі.

**Дваяве́рства** — сітуацыя, калі некаторы час пасля прыняцця хрысціянства насельніцтва захоўвала веру ў язычніцкіх багоў ці атаясамлівала іх з хрысціянскімі святымі.

**Двухпо́лле** — сістэма апрацоўкі зямлі, пры якой па чарзе засявалася адна палова поля, а другой давалі адпачынак.

**Дзядзі́нец** — умацаваны цэнтр сярэднявечнага ўсходнеславянскага горада.

**Дружы́на** — атрад узброеных і спецыяльна падрыхтаваных да ваеннай справы людзей, дарадчыкаў князя. Дружыну ўзначальваў князь.

**Дым** — сялянская гаспадарка ў ВКЛ у XIV–XVIII стст., якая складалася з хаты, гаспадарчых пабудоў, розных сельскагаспадарчых угоддзяў, рабочай і прадукцыйнай жывёлы, гаспадарчага інвентару.

**Дэкараты́ўна-прыкладно́е маста́цтва** — стварэнне і мастацкае афармленне прадметаў, якія маюць практычнае прызначэнне ў побыце.

**Ева́нгелле** — раннехрысціянскі твор, у якім расказваецца пра жыццё Ісуса Хрыста.

**Епа́рхія** — хрысціянская царкоўна-адміністрацыйная адзінка ў межах пэўнай тэрыторыі (вобласці, зямлі, дзяржавы).

**Епі́скап** (у рымска-каталіцкай царкве — бі́скуп) — духоўнае званне ў хрысціянскай царкве.

**Жыцці́е** — апавяданне пра жыццёвы шлях і дзейнасць служыцеля царквы, рэлігійнага ці дзяржаўнага дзеяча.

**За́купы** — збяднелыя людзі, якія бралі ў феадала грашовую пазыку (ку́пу) і былі абавязаныя яе адпрацоўваць, пакуль не вернуць грошы.

**Знаць** — прывілеяваны, найбольш уплывовы пласт грамадства.

**Зямля́** — назва буйнога княства Старажытнай Русі, якое падзялялася на воласці.

**І́дал** — вобразная выява бога, якому пакланяліся язычнікі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Іка́напіс** — від жывапісу, прызначаны для стварэння святых выяў — абразоў.

**Індаеўрапе́йцы** — плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў, якія рассяліліся на вялікай тэрыторыі, у тым ліку і ў Еўропе. Пасля змешвання іх з мясцовым насельніцтвам утварыліся групы плямёнаў: балты, славяне, германцы і інш.

**Кага́л** — яўрэйская абшчына.

**Канфе́сія** — пэўнае веравызнанне; аб'яднанне вернікаў, якія прытрымліваюцца пэўнага веравызнання.

**К нцлер** — вышэйшая дзяржаўная пасада ў Вялікім Княстве Літоўскім; захоўваў дзяржаўную пячатку, сачыў за дзейнасцю пісараў і сакратароў, дакладваў гаспадару па ўсіх важных дзяржаўных справах, рыхтаваў паседжанні Рады.

**Ка́пішча** — свяцілішча (месца, дзе язычнікі ўшаноўвалі сваіх багоў і прыносілі ім ахвяры).

**Карчма́** — дом, дзе вандроўнік мог падсілкавацца і пераначаваць. Корчмы ставіліся на гандлёвых плошчах гарадоў, мястэчак, на гандлёвых шляхах, каля рачных пераправаў і прыстаняў і да т. п.

**Кастэ́ль** — чатырохвугольны ў плане ўмацаваны замак з муравансымі сценамі.

**Кля́штар** — каталіцкі манастыр.

**Князь** — першапачаткова ваенны правадыр плямені; пазней уладар княства.

**Контрфо́рс** — архітэктурная дэталь для падтрымкі сцен.

**Краманьёнец** — ранні прадстаўнік чалавека сучаснага тыпу.

**Крыжакі́** — воіны духоўна-рыцарскіх ордэнаў, якія ў мэтах пашырэння хрысціянскай веры ажыццяўлялі заваёўніцкія паходы.

**Курга́н** — земляны насып над магілай памерлага.

**Ла́ва** — гарадскі судовы орган у ВКЛ, які разглядаў крымінальныя справы. Узначальвалася войтам. Гарадская рада і лава сумесна ўтваралі магістрат.

**Ледаві́к** — велізарныя рухомыя масы лёду.

**Ле́тапіс** — пагадовыя запісы гістарычных падзей у Старажытнай Русі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Магдэбу́р скае пра́в** — права гарадоў на самакіраванне.

**Магістра́** — выбарны адміністрацыйны і судовы орган гарадскога самакіравання ў гарадах, якія атрымалі магдэбургскае права. У ВКЛ уводзіліся з канца XIV — XV ст.

**Мана́рхія** — форма кіравання, пры якой улада ў дзяржаве належыць аднаму асобнаму валадару і перадаецца ў спадчыну.

**Манасты́р** — рэлігійнае аб'яднанне манахаў ці манашак, а таксама комплекс будынкаў, які належыць гэтаму аб'яднанню.

**Мана́х** — член царкоўнай абшчыны, які даваў абяцанне весці строгі лад жыцця з адмаўленнем ад матэрыяльных выгод і жыццёвых уцех.

**Манго́лы** — абагульненая назва шэрагу качавых плямёнаў.

**Маты́чнае земляро́бства** — апрацоўка зямлі з дапамогай матык.

**Міжусо́бная вайна́** — узброеная барацьба паміж асобнымі князямі.

**Мініяцю́ра** — малюнак невялікага памеру, які змяшчаўся ў летапісах і іншых рукапісных кнігах.

**Місіяне́р** — прапаведнік, які пасылаецца царквой для перакавання ў перавагах свайго веравызнання.

**Мітрапалі́т** — адзін з кіраўнікоў хрысціянскай царквы.

**Мітрапо́лія** — царкоўная акруга, падпарадкаваная мітрапаліту.

**Міф** — аповед, у якім людзі перадаюць сваё разуменне навакольнага свету і яго паходжання, месца ў ім чалавека і жыцця багоў і герояў.

**Мнагабо́жжа** — вера ў шматлікіх багоў, галоўная рыса язычніцтва.

**Мурава́нае до́йлідства** — узвядзенне будынкаў з каменю і цэглы, змацаваных вапнавым растворам.

**Мястэ́чка** — невялікае пасяленне гарадскога тыпу. У ВКЛ мястэчкі ўзніклі ў XV ст.

**Мяшча́н** — карэнныя жыхары гарадоў, якія не былі залежныя ад феадалаў.

**Надзе́л** — зямля, якая апрацоўвалася сялянамі і была замацавана ў іх карыстанні.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Намéснік** — прадстаўнік вялікага князя, які надзяляўся адміністрацыйна-гаспадарчай, фінансавай, судовай уладай на тэрыторыі былых самастойных княстваў.

**Нарóднасц** — устойлівая супольнасць людзей, заснаваная на агульнасці мовы, тэрыторыі размяшчэння, гаспадарчага і культурнага жыцця.

**Натурáльная гаспадáрка** — тып гаспадарання, накіраваны на забеспячэнне ўласных патрэб, а не на продаж.

**Пагóст** — пункт для збору даніны ў старажытнарускі перыяд.

**Падсéчна-агнявóе (ля́днае) землярóбства** — форма земляробства ў лясной паласе, пры якой высякаўся і спальваўся на пэўным участку лес, карчаваліся пні, а попел служыў угнаеннем. Падсекай, ці лядам, называлася ачышчаная ад дрэў лясная дзялянка.

**Паліты́чная раздрóбленасць** — раздрабленне раней адзінай дзяржавы на некалькі самастойных дзяржаўных утварэнняў.

**Палóмніцкая літаратýра** — літаратурныя творы, у якіх апісваюцца падарожжы ў святыя мясціны.

**Палю́ддзе** — збор князем даніны з падуладнага яму насельніцтва; сама сабраная даніна.

**Панегіры́чная літаратýра** — літаратурныя творы хвалебнага зместу.

**Пáнцырныя бая́ры** — групы феадальна залежных людзей, якія неслі ваенную службу ў Вялікім Княстве Літоўскім і жылі ў велікакняжацкіх уладаннях. Былі абавязаны несці службу на кані і ў цяжкім («панцырным») узбраенні. Паходзілі са збяднелых баяр і сялян. Існавалі да канца XVI ст.

**Пáншчын** — павіннасць, якую адпрацоўвалі прыгонныя на карысць землеўладальніка за карыстанне зямлёй. Звычайна ўяўляла сабой бясплатную абавязковую сельскагаспадарчую працу.

**Паны́** — у XV ст. буйны́я феадалы ВКЛ, якія маглі займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

**Парáфія** — арганізацыйная адзінка ў каталіцкай царкве, якая аб’ядноўвае вернікаў пэўнай тэрыторыі. Цэнтрам яе з’яўляецца парафіяльны храм.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Паса́д** — паселішча рамеснікаў і гандляроў, якое размяшчалася каля ўмацаванага цэнтра горада — дзядзінца.

**Паса́днік** — намеснік князя з ліку буйны́х баяр-дружыннікаў, які па загадзе свайго гаспадара і ад яго імя кіраваў пэўным горадам з сялянскай акругай.

**Паспалі́тае рушэ́нне** — шляхецкае апалчэнне ў ВКЛ, у якое землеўласнік мусіў выставіць пэўную колькасць воінаў.

**Патрыярха́льнае (ха́тняе) ра́бства** — першапачатковая форма рабства, пры якой рабы ўспрымаліся як члены сям'і, звычайна жылі пад адным дахам з гаспадаром і выконвалі тую ж працу, што і свабодныя.

**Першабы́тны лад** — найбольш ранні перыяд у развіцці чалавечага грамадства, для якога былі характэрныя роўнасць усіх людзей, выкарыстанне прымітыўных прылад працы, адсутнасць дзяржаў.

**Печ-до́мніца** — гліняная печ для атрымання з балотнай руды порыстай масы (крыцы) і крычнага жалеза.

**Пле́мя** — трывалае аб'яднанне некалькіх родаў, звязаных агульнасцю паходжання.

**Племянно́е кня́жанне** — аб'яднанне саюзаў плямёнаў ці асобны саюз плямёнаў, у якім была моцная княжацкая ўлада, аднак пры гэтым яшчэ існавала народнае кіраванне.

**Правасл ўе** — адзін з галоўных кірункаў у хрысціянстве (разам з каталіцтвам і пратэстантызмам).

**Прарадзі́ма** — тэрыторыя, якую першапачаткова насяляў той або іншы народ.

**Пра́сліца** — невялікі грузік, які ўжываўся для пацяжэння ручнога верацяна.

**Прыва́тная ўла́снасць** — магчымасць і права неабмежаванага карыстання пэўнай маёмасцю, у тым ліку зямлёй, жывёлай і г. д.

**Прывіл й** — заканадаўчы акт ВКЛ, якім вялікія князі давалі ці пацвярджалі асаблівыя правы феадалаў або іншых груп насельніцтва.

**Прыго́н** — форма феадальнай залежнасці сялян: замацаванне іх на зямлі і падпарадкаванне ўладзе феадала.

**Прысво́йвальная (спажыве́цкая) гаспада́рка** — від гаспадаркі, пры якім старажытны чалавек браў ад прыроды ўсё неабходнае для жыцця ў гатовым выглядзе.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Пры́тча** — невялікі рэлігійны твор павучальнага зместу.

**Ра́да** — орган гарадскога самакіравання ў ВКЛ, які складаўся з выбраных радцаў. Узначальвалася бурмістрам.

**Ра́да ВКЛ (Паны́-Ра́да** — вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў ВКЛ у XV — першай палове XVI ст., у які ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы, каталіцкія біскупы, буйны́я феадалы. Сфарміравалася на аснове дарадчага органа пры вялікім князю. Пастаянна дзейнічала як выканаўча-распарадчы, заканадаўчы, кантрольны і судовы орган.

**Радава́я абшчы́на** — калектыў (невялікая група) старажытных людзей, якія былі звязаны паміж сабой сваёй роднасцю і агульнасцю паходжання, вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы.

**Разе́ц** — старажытная прылада працы, прызначаная для рэзання.

**Ра́ла** — прылада для апрацоўкі глебы.

**Расслае́нне грама́дства** — узнікненне сярод людзей маёмаснай няроўнасці, у выніку якой адбываецца падзел насельніцтва на пануючыя і залежныя пласты.

**Ра́ уша** — будынак, у якім размяшчаліся органы гарадскога самакіравання; месца пасяджэнняў рады.

**Род** — група людзей, аб'яднаных агульным паходжаннем.

**Рэлігі́йная цярпі́масць** — роўныя адносіны да розных рэлігій з боку дзяржаўнай улады.

**Сабо́р** — галоўная або вялікая царква горада.

**Саве́т старэ́йшын** — орган улады, які складаўся са старэйшын і вырашаў пытанні жыцця роду ці племені.

**Са́гі** — літаратурныя творы, якія расказваюць пра гісторыю і жыццё скандынаўскіх народаў. Былі створаны ў X–XI стст., але запісаны значна пазней.

**Сасл ўе** — сацыяльная група са спадчыннымі правамі і абавязкамі.

**Саха́** — сельскагаспадарчая прылада для ўзрыхлення зямлі.

**Свяці́лішча** — месца, дзе язычнікі ўшаноўвалі сваіх багоў і прыносілі ім ахвяры.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Се́лішча** — неўмацаванае паселішча, у якім жылі ў асноўным земляробы.

**Се́л ская абшчы́на** — форма арганізацыі жыцця сялян. Прыйшла на змену радавой абшчыне. У межах сельскай абшчыны рэгуляваліся адносіны паміж яе членамі і з феадалам, размяркоўваліся павіннасці.

**Славя́не** — плямёны індаеўрапейскага паходжання, продкі шэрагу сучасных народаў, у тым ліку беларусаў, рускіх, украінцаў. У Сярэднявеччы падзяліліся на тры вялікія групы — усходнюю, заходнюю і паўднёвую.

**Смерд** — часткова свабодны земляроб. Меў асабістую свабоду, аднак зямля, на якой ён працаваў, належала князю.

**Сойм** — саслоўна-прадстаўнічы орган у ВКЛ у XV — першай палове XVI ст., на які першапачаткова запрашалася ўся шляхта.

**Старэ́йшына** — кіраўнік роду або племені, самы вопытны і звычайна сталы чалавек.

**Стая́нка** — месца пасялення першабытнага чалавека.

**Сусе́дская абшчы́на** — калектыў людзей, якія жылі асобнымі сем'ямі і займаліся пераважна сельскагаспадарчай працай. У такую абшчыну акрамя родзічаў уваходзіла значная колькасць суседзяў.

**Ся́ляне-слу́гі** — група працоўнага насельніцтва ВКЛ.

**Та́бар** — група цыганскіх сямей, якая вяла качавы лад жыцця.

**Торг** — тое, што і рынак: месца гандлю або гандлёвая плошча, а таксама кірмаш.

**Трохпо́лле** — сістэма апрацоўкі зямлі, пры якой адна частка засявалася яравымі, другая — азімымі, а трэцяя «адпачывала».

**Ты́сяцкі** — кіраўнік гарадскога ваеннага апалчэння.

**Удзе́л (удзе́льнае кня́ства)** — буйное зямельнае ўладанне, княства, якое вылучалася ў межах дзяржавы (Вялікага Княства Літоўскага, Маскоўскага вялікага княства) прадстаўнікам кіруючай дынастыі. Як правіла, удзелы атрымлівалі браты, сыны або пляменнікі манарха.

**У́нія дзяржа́ўная** — аб'яднанне, саюз дзяржаў.

**У́нія персана́льная** — саюз дзяржаў пад уладай адзінага манарха пры захаванні імі некаторай самастойнасці ва ўнутранай і знешняй палітыцы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Феада́л** — землеўладальнік, які за права валодаць зямлёй служыў асобе, ад якой атрымаў гэтую зямлю.

**Фрэ́ска** — жывапіс вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы.

**Хало́п** — чалавек, які страціў асабістую свабоду і трапіў у поўную залежнасць ад феадала. Па сваім становішчы быў рабом.

**Хару́гва** — 1) назва сцяга ў войску ВКЛ; 2) асноўная адзінка шляхецкай кавалерыі.

**Ціву́н** — службовая асоба пры князю. Выконваў розныя даручэнні князя: вяршыў суд, збіраў даніну і г. д.

**Цэх** — аб'яднанне гарадскіх рамеснікаў адной ці некалькіх блізкіх прафесій дзеля наладжвання збыту сваёй прадукцыі.

**Ця́глы селяні́н** — селянін, асноўнай павіннасцю якога была паншчына.

**Чынш** — даніна, якая выплачвалася грашыма.

**Чы́ншавы селяні́н** — селянін, асноўнай павіннасцю якога быў чынш (грашовы аброк).

**Чэ́лядзь** — першапачаткова рабы, пазней людзі, якія трапілі ў залежнасць ад гаспадара, жылі пры яго двары і па яго загадзе выконвалі розныя гаспадарчыя работы.

**Шля́хта** — прывілеяванае саслоўе ў ВКЛ. Шляхецтва надавалася каралём, соймам або гетманам на полі бою. Прадстаўнікі шляхты не плацілі падаткаў, іх абавязкам быў удзел у войнах.

**Шматэтні́чная дзярж ва** — дзяржава, на тэрыторыі якой пражываюць розныя этнасы.

**Э́тнас (наро́д)** — група людзей, якая склалася гістарычна, аб'яднана агульным паходжаннем, тэрыторыяй, самасвядомасцю, мовай, бытам і культурай.

**Язы́чніцтва** — вера ў існаванне многіх багоў, што ўвасаблялі сілы прыроды, і пакланенне ім.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# Асноўныя даты па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.

| | |
|---|---|
| Каля 100 тыс. гадоў таму — канец 3-га тысячагоддзя да н. э. | Каменны век на тэрыторыі Беларусі |
| 35–40 тыс. гадоў таму | З'яўленне ў Еўропе краманьёнца — чалавека сучаснага тыпу |
| 24-е тысячагоддзе да н. э. | Найбольш старажытная стаянка чалавека ў Беларусі (вёска Юравічы) |
| 22–21-е тысячагоддзі да н. э. | Стаянка чалавека каменнага веку каля вёскі Бердыж |
| 3-е тысячагоддзе да н. э. | З'яўленне жывёлагадоўлі і земляробства на тэрыторыі Беларусі |
| Сярэдзіна 3-га тысячагоддзя да н. э. | З'яўленне першых індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі |
| Пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э. — канец VIII ст. да н. э. | Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі |
| VII ст. да н. э.— канец V ст. н. э. | Жалезны век на тэрыторыі Беларусі |
| Канец IV ст. | Прысутнасць славян на поўдні Беларусі |
| VI ст. | Першыя згадкі славян пад уласным імем у пісьмовых крыніцах |
| VIII–IX стст. | Утварэнне аб'яднанняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі: палачан, дрыгавічоў, радзімічаў |
| 862 г. | Першае ўпамінанне пра Полацк у летапісе |
| 882 г. | Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы (Кіеўскай Русі) |
| 960-я гг. — 980 г. | Княжанне ў Полацку Рагвалода |
| 980 г. | Першая згадка Турава ў летапісе |
| 988 г. | Хрышчэнне Русі. Пачатак княжання Святаполка ў Тураве. Пачатак кіравання дынастыі Ізяславічаў у Полацку |
| Каля 992 г. | Заснаванне епархіі ў Полацку |
| 1003–1044 гг. | Княжанне Брачыслава Ізяславіча ў Полацку |
| 1005 г. | Заснаванне епархіі ў Тураве |
| 1019 г. | Першая згадка Берасця ў летапісе |
| 1044–1101 гг. | Княжанне Усяслава Брачыславіча ў Полацку |
| 1067 г. | Бітва на Нямізе. Першае ўпамінанне ў летапісе Менска (Мінска) |
| 1101–1119 гг. | Княжанне Глеба Усяславіча ў Менску |



Правообладатель Издательский центр БГУ

| | |
|---|---|
| 1129 г. | Выгнанне полацкіх князёў у Візантыю |
| 1157 г. | Беспаспяховая аблога Турава войскамі кіеўскага князя і яго саюзнікаў |
| 1216 г. | Падрыхтоўка паходу полацкага князя Уладзіміра супраць нямецкіх рыцараў, раптоўная смерць Уладзіміра |
| 1237–1241 гг. | Мангольскае нашэсце на Русь |
| 1241 г. | Уварванне на Берасцейшчыну войска манголаў |
| 1253–1263 гг. | Уладаранне Міндоўга ў Вялікім Княстве Літоўскім |
| 1316–1341 гг. | Княжанне Гедзіміна |
| 1323 г. | Перанос сталіцы ВКЛ у Вільню |
| 1345–1377 гг. | Княжанне Альгерда |
| 1362 г. | Бітва на рацэ Сіняя Вада |
| 1377–1392 гг. | Княжанне Ягайлы |
| 14 жніўня 1385 г. | Крэўская унія |
| 1386–1434 гг. | Караляванне Ягайлы (Уладзіслава II) у Польшчы |
| 1387 г. | Хрышчэнне літоўцаў; стварэнне Віленскага біскупства; атрыманне Вільняй магдэбургскага права |
| 1390 г. | Атрыманне г. Берасце магдэбургскага права |
| 1392 г. | Востраўскае пагадненне |
| 1392–1430 гг. | Княжанне Вітаўта |
| 1399 г. | Бітва на рацэ Ворскла |
| 1401 г. | Віленска-Радамская унія |
| 1409–1411 гг. | «Вялікая вайна» |
| 15 ліпеня 1410 г. | Грунвальдская бітва |
| 1413 г. | Гарадзельская унія |
| 1430–1432 гг. | Княжанне Свідрыгайлы |
| 1432–1439 гг. | Дынастычная вайна ў ВКЛ |
| 1 верасня 1435 г. | Бітва пад Вількамірам |
| 1432–1440 гг. | Княжанне Жыгімонта Кейстутавіча |
| 1440–1492 гг. | Княжанне Казіміра |
| 1468 г. | Стварэнне Судзебніка Казіміра |
| 1492–1506 гг. | Княжанне Аляксандра |

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва ўстановы адукацыі)

| Вучэбны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Вучэбнае выданне

**Цемушаў** Сцяпан Мікалаевіч
**Бохан** Юрый Мікалаевіч

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАНЦА XV ст.**

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

Адказны за выданне *Т. Ф. Рослік*
Рэдактары *Н. Б. Кучмель, В. Р. Ермаковіч*
Дызайн вокладкі *Н. Ф. Овад*
Картасхемы *В. М. Цемушава*, *С. М. Цемушава*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка *А. Б. Грышына*
Карэктары *Н. Б. Кучмель, В. Р. Ермаковіч*

Падпісана ў друк 07.08.2023. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 16,38+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 11,1+0,40 форз. Тыраж 18 590 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Правообладатель Издательский центр БГУ